ажыўля́ць *гл* ажывіць

ажыццёўлены verwírklicht, dúrchgeführt, realisíert

ажыццявіць verwírklichen *vt*, dúrchführen *vt*; áusführen *vt*, realisíeren *vt*; in die Tat úmsetzen

ажыццяўле́нне *н* Verwírklichung *f*-; Dúrchführung *f*-; Realisíerung *f*- (*выкананне*)

ажыццяўля́льны realisíerbar

ажыццяўля́цца sich verwírklichen, sich erfüllen, in Erfüllung géhen*

ажыццяўля́ць *гл* ажыццявіць

ажыята́ж *м* **1.** Áufregung *f*-, -en; Rúmmel *m* -s, - **2.** *бірж*

Spekulatión *f*-, -en, Agiotage [aʒĭo´ta:ʒə] *f*-; ***бі́ржавы ~*** Börsenspekulation *f*

азагало́віць betíteln *vt*, benénnen* *vt*

аза́дак *м* **1.** (*задняя частка чаго-н*) Kéule *f*-, -n, Hínterteil *n* -s, -e; **2.** (*сядалішча*) Íntern *m* -, -; Hínterteil *n*; Po *m* -s, -s; Gesäß *n* -es, -e

азада́чанасць Betrétenheit *f*-, Betróffenheit *f*-, Bestürzung *f*-; Verlégenheit *f*- (*збянтэжанасць, сарамлівасць*)

азада́чаны betréten, betróffen, bestürzt; verlégen (*збянтэжаны, сарамлівы*)

азада́чваць, азада́чыць bestürzt [stútzig] máchen, verblüffen *vt*; verwírren *vt*; in Verlégenheit bríngen* [versétzen] (*збянтэжыць*)

азалаці́цца sich vergólden

азалаці́ць 1. vergólden *vt*; **2.** *разм* (*узнагародзіць*) mit Gold überschűtten; reich beschénken

азанава́ць ozonisíeren *vt*

аза́рт *м* Léidenschaft(lichkeit) *f*-; Éifer *m* -s; ◊ ***увайсці́ ў ~*** in Éifer geráten*, sich in *etw.* (*A*) hinéinsteigern

аза́ртн|ы léidenschaftlich, hítzig; ***~ая гульня́*** Glücksspiel *n* -s, -e

азары́|ць 1. (*асвяціць*) beléuchten *vt*; bestráhlen *vt*; erléuchten; **2.** *перан* (*пра думку, здагадку*) durchfáhren* *vt*; ***мяне́ ~ла*** ein Licht ging mir auf

азарэ́нне *н* Erléuchtung *f*-

азбе́ст *буд* Asbést *m* -es, -e

а́збука *ж* **1.** (*алфавіт*) Alphabét *n* -(e)s, -e, Abc [a:be:´tse:] *n* -, -; **2.** (*буквар*) Fíbel *f*-, -n; **3.** *перан* (*аснова чаго-н*) Gründlagen *pl f*; ABC [a:be:´tse:] *n* -; Einmaléins *n* -, -; ***~ Мо́рзе*** Mórsealphabet *n* -(e)s; ***но́тная ~*** Nótenschrift *f*-, -en

а́збучн|ы 1. alphabétisch.; **2.** *перан* elementár, állbekannt; ***~ая і́сціна*** Bínsenweisheit *f*-, -en

азва́цца *гл* абазвацца

азвяр|э́лы *разм* gráusam, brutál (*бязлітасны, люты*); entménscht, vertíert (*які страціў чалавечае аблічча*)

азвяр|э́ць rásend wérden; zur Bésti|e wérden; gráusam [brutál] wérden, verróhen *vi* (*s*)

азгле́|ць *разм абл* fríeren* *vi*; ***я ~ў*** ich fríere, mir ist kalt

аздабле́нне *н* **1.** (*дзеянне*) Áusschmückung *f*-, -en, Verschönerung *f*-, -en; **2.** (*рэч*) Schmuck (e)s, -e; Verzíerung *f*-, -en; ***ёлачнае ~*** (Chríst)báumschmuck *m* -(e)s; Báumbehang *m* -(e)s

аздабля́ць (áus)schmücken *vt*, verzíeren *vt*, dekoríeren *vt* (*дэкарыраваць*)

аздарав|і́ць 1. héilen *vt*; gesúnd máchen; **2.** (*палепшыць, зрабіць больш нармальным*) saníeren *vt*; verbéssern *vt*

аздараўле́нне *н* **1.** Gesúndung *f*-; **2.** (*паляпшэнне*) Saníerung *f*-, Verbésserung *f*-

аздараўле́нчы Gesúndungs-, Genésungs-, Héilungs-; *іран* Saníerungs-; ***~я мерапрые́мствы*** Saníerungsmaßnahmen *pl*

аздо́ба *ж* (*рэч*) Schmuck *m* -(e)s, -e, Verzíerung *f*-, -en; Zíerde *f*-, -n

аздо́блены verzíert

азелянене́нне *н* Begrünung *f*-

азелянёны mit Grün bepflánzt, begrünt

азеляні́ць Grün ánpflanzen, begrünen *vt*

азербайджа́нец *м* Aserbaidscháner *m* -s, -

азербайджа́нскі aserbaidschánisch

азёрны See(n)-; ***~ край*** Séengebiet *n* -es, -e

азі́м|ы *с.-г* Wínter-; ***~ая пшані́ца*** Wínterweizen *m* -s

азі́міна *ж*, **азі́мыя** *мн с.-г* Wíntersaat *f*-, -en; Wínterkulturen *pl*, Wíntergetreide *n* -s

а́зімут *м геагр, астр* Azimút *n* -(e)s, -e

азіра́цца 1. *гл* азірнуцца; **2.** (*дзейнічаць з асцярогай*) úmsichtig hándeln

азіра́ць 1. *гл* азірнуць; **2.** (*рабіць агляд чаго-н у думках*) *etw.* in Gedánken dúrchgehen*; sich (*D*) *etw.* ins Gedächtnis rúfen*

азірну́цца sich úmsehen*, sich úmschauen; zurückblicken *vi* (*назад*); um sich blícken (*вакол*); ◊ ***не паспе́ў ~, як...*** éhe er [man] sich's versáh; ≅ im Hándumdrehen

азірну́ць (*акінуць поглядам*) überblícken *vt*, éinen Blick wérfen*

азія́т *м* Asiát *m* -en, -en

азія́цкі asiátisch

азлабле́нне *н гл* азлобленасць

азлабля́ць, азло́біць *разм* erbíttern *vt*, erzürnen *vt*, erbósen *vt*

азло́бленасць *ж кніжн* Erbítterung *f*-, Grimm *m* -(e)s, Erbóstheit *f*-; Geréiztheit *f*- (*раздражнёнасць*)

азло́блены erbíttert, erbóst; grímmig

азмро́чваць, азмро́чыць verfínstern *vt*, verdúnkeln *vt*, verdüstern *vt*, überschátten *vt*

азнаёміцца sich bekánnt [vertráut] máchen (*з чым-н* mit *D*); kénnenlernen *vt*

азнаёміць bekánnt máchen, vertráut máchen; éinführen *vt* (*з чым-н* in *A*)

азнаёмлены bekánnt gemácht, vertráut gemácht; éingeführt (*з чым-н* in *A*)

азнаменава́цца gekénnzeichnet wérden; dénkwürdig sein

азнача́льны: ***~ арты́кль*** *грам* der bestímmte Artíkel

азна́чаны bezéichnet; óben genánnt

азнача́ць, азна́чыць 1. (*вызначаць*) bestímmen; **2.** (*мець значэнне*) bedéuten *vt*; bezéichnen *vt*

азначэ́нне *н* **1.** (*абагульненне*) Verallgeméinerung *f*-, -en; **2.** *лінгв* Attribút *n* -(e)s, -e, Béifügung *f*-, -en

азнаямле́нн|е *н* Bekánntmachen *n* -s, Bekánntschaft *f*-, Kénnenlernen *n* -s; Éinführung *f*-; ***дзе́ля пе́ршага ~я*** zur érsten Éinführung

азо́н *м хім* Ozón *n* -s

азо́раны erléuchtet

азо́т *м хім* Stíckstoff *m* -(e)s

азо́тн|ы Stíckstoff-; ***~ая кі́слата*** *хім* Salpétersäure *f*-; ***~ае ўгнае́нне*** *с.-г* Stíckstoffdünger *m* -s

азо́ціст|ы *хім* salpétrig; stíckstoffhaltig

азы́злы 1. (*тоўсты, апухлы*) schlaff, welk (*пра твар і г. д*); áufgedunsen (*набрынялы*); **2.** (*азяблы*) erfróren

азы́знуць (*ацячы, апухнуць*) (án)schwéllen* *vi* (*s*)

азя́бнуць fríeren* *vi*

азярро́д *м с.-г* Trócknungsanlage *f*-, -n

азярцо́ *н памянш*, **азярды́на** *ж* ein kléiner See

ай! *выкл* **1.** ach!, o weh!; **2.** (*папрок*) ach!, sieh an!; ◊ ***~ да хлапе́ц!*** was für ein Práchtkerl!

а́йва *ж бат* Quítte *f*-, -n (*плод*); Quíttenbaum *m* -(e)s, -bäume (*дрэва*)

а́йкаць, а́йкнуць *разм* **1.** auwéh áusrufen*; **2.** *перан* betrübt sein, sich grämen; jámmern, wéhklagen *vi*

а́йсберг *м* Éisberg *m* -(e)s, -e

айце́ц *м* **1.** *царк* Príester *m* -s, -; **2.** (*бацька*) Váter *m* -s, Väter

айчы́м *м* Stíefvater *m* -s, -väter, Adoptívvater *m* -s, -väter

айчы́на *ж* Váterland *n* -(e)s, Héimat *f*-, Héimatland *n*

айчы́нны váterländisch

акава́ць 1. (*куфар і г. д*) beschlágen* *vt*; **2.** (*льдом*) zúfrieren* *vi* (*s*), veréisen *vi* (*s*)

акадэмі́зм Akademísmus *m* -s; akadémischer [theorétischer] Charákter

акадэ́мік *м* Akademíemitglied *n* -(e)s, -er, Mítglied der Akademíe der Wíssenschaften

акадэмі́чны 1. akadémisch; **2.** der Akademíe der Wíssenschaften (zúgehörig)

акадэ́мія *ж* (*у розн. знач*) Akademíe *f*-, -i|en

аказа́нн|е *н* Erwéisung *f*-; ***дзе́ля ~я дапамо́гі*** zur Hílfeleistung

аказа́цца 1. *разм* (*апынуцца*) sich befínden*; (hín)geráten* *vi* (*s*); **2.** *разм* (*быць у наяўнасці*) vorhánden sein; **3.** (*азвацца*) ántworten *vt*, erwídern *vt*

аказа́ць erwéisen* *vt*, léisten *vt*; bezéigen *vt*; ***~ дапамо́гу***

Hílfe léisten; ~ ***паслу́гу*** éinen Dienst erwéisen*; ~ ***супрацíў*** Widerstand léisten; ~ ***уплы́ў*** Éinfluss áusüben [néhmen]

ака́зія *ж* **1.** (*зручны выпадак*) Gelégenheit *f* -, -en; **2.** *разм* (*нечаканае здарэнне*) Zúfall *m* -s, -fälle, (séltene) Begébenheit *f* -, -en, (séltener) Fall *m* -(e)s, Fälle

акайма́ваць umsäumen *vt*; *перан* umrähmen *vt*, umránden *vt*

акалаці́ць (*абтрэсці*) ábschütteln *vt*; ábklopfen *vt*

акале́лы **1.** (*змерзлы*) steif, starr, erstárrt, steif gefróren, erfróren; **2.** (*здохлы*) tot; veréndet; verréckt, krepíert (*разм*)

акале́ць **1.** (*замерзнуць*) erfríeren* *vi* (*s*), steif friéren* *vi* (*s*); **2.** (*здохнуць*) verénden *vi* (*s*) stérben* *vi* (*s*), verrécken *vi* (*s*), krepíeren *vi* (*s*) (*разм*)

акале́чыць verstümmeln *vt*, verkrüppeln *vt*, zum Krüppel máchen

ака́ліна *ж тэх* Zúnder *m* -(s), -; Hámmerschlag *m* -(e)s (*пры каванні*)

акалі́чнасц|ь *ж* **1.** Úmstand *m* -(e)s, -stände; ~***і*** *мн* Úmstände *pl*, Verhältnisse *pl*; ***жыццёвыя ~і*** Lébensverhältnisse *pl*; **2.** *грам* Adverbiálbestimmung [-v-] *f* -, -en; Adverbiále [-vər-] *n* -s, -li|en

акальцава́ны beríngt

акальцава́ць beríngen *vt*

акампанава́ць (*каму-н*) begléiten *vt*

акампанеме́нт *м* (musikálische) Begléitung *f* -, -en; ***пад ~ рая́ля*** mit Klavierbegleitung [-ˊviːr-]

акампані́раваць *гл* акампанаваць

акампанія́тар *м* Begléiter *m* -s, -

акамянéласць *ж* **1.** *геал* (*выкапень*) Verstéinerung *f* -; Fossíl *n* -s, -li|en (*тс перан*); **2.** (*нерухомасць*) Stárrheit *f* -, Erstárrung *f* -

акамянéлы **1.** verstéinert, zu Stein gewórden; **2.** (*нерухомы*) erstárrt, starr; verstéinert

акамянéнне *н* Verstéinerung *f* -; *гл* акамянець

акамянéць verstéinern *vi* (*s*), zu Stein wérden; *перан* erstárren *vi* (*s*); gefühllos wérden

аканапа́чаны ábgedichtet

аканапа́чваць (Fúgen) ábdichten, kalfátern *vt*,

акані́ца *ж* Fénsterladen *m* -s, - *i* -läden

а́канне *н фан* éine déutliche Áussprache des únbetonten Vokáls «a»

аканóм *м уст* (*кіраўнік гаспадаркі*) Verwálter *m* -s, -, Háusverwalter *m*

аканóмка *ж уст* Háushälterin *f* -, -nen, Wírtschafterin *f* -, -nen

акантава́ны éingerahmt, umrándet

акантава́ць, акантóўваць éinrahmen *vt*; umránden *vt*

акапа́цца **1.** *вайск* sich verschánzen, sich éingraben*; **2.** (*знайсці прытулак*) sich féstsetzen *аддз*; Fuß fássen

акапа́ць *гл* абкапаць

акардэані́ст *м* Akkordeonist *m* -en, -en

акардэóн *муз* Akkórdeon *n* -s, -s

акары́ць ábrinden *vt*, ábborken *vt*

акасцянéлы **1.** (*цвёрды*) verknöchert; **2.** (*акалелы*) erstárrt, starr; **3.** (*які перастаў развівацца*) erstárrt, verknöchert

акасцянéць **1.** (*ператварыцца ў косць*) verknöchern *vi* (*s*); **2.** (*акалець*) erstárren *vi* (*s*)

акаці́цца Júnge bekómmen*; (Júnge) wérfen*; lámmen *vi* (*пра авечак*)

ака́цыя *ж бат* Akázi|e *f* -, -n; Schótendorn *m* -(e)s, -e (*белая*)

аквала́нг *м спец* Táuchgerät *n* -(e)s, -e

аква́рыум *м* Aquárium *n* -s, -ri|en

аквары́ль *м* **1.** (*фарба*) Aquaréllfarbe *f* -, -n, Wásserfarbe *f*; **2.** (*карціна, малюнак*) Aquaréll *n* -s, -e, Aquaréllbild *n* -(e) s, -er

аквары́льны Aquaréll-, Wásserfarben-; ~ ***партрэ́т*** Porträt in Aquaréllteclinik; Aquaréllbildnis *n* -ses, -sse

акéнца *н* Fénsterchen *n* -s, -

акí нуць: ~ ***вóкам*** [***вачы́ма***] éinen Blick wérfen* (*што-н* auf *A*); mústern *vt* (*аглядаць*)

акісле́нне *н хім* Oxydatión [Oxidatión] *f* -, Oxydíerung [Oxidíerung] *f* -

акíслены *хім* oxydíert, oxidíert

акісліць *хім* oxydíeren [oxidíeren]

акісля́льнік *м хім* Oxidíermittel n -s,-; Oxidátor *m* -s, -tóren

акісля́цца *хім* oxydíeren [oxidíeren] *vt* (*s*)

акісля́ць *гл* акісліць

акія́н *м* Ózean *m* -(e)s, -e; ***з-за ~а*** aus Übersee; ***паве́траны ~*** Atmosphäre *f* -

акіянагра́фія *ж*, **акіянало́гія** *ж* Méereskunde *f* -, Ozeanographíe *f*

акіяні́чны Ózean-, Méeres-; ozeánisch; ~ ***кліма́т*** *геагр* Séeklima *n* -s, maritímes Klíma

акія́нскі ozeánisch, Ózean-; (Hóch)see-; ~ ***парахо́д*** Ózeandampfer *m* -s,-; Überseedampfer *m*, Hóchseedampfer *m*

акла́д *м* **1.** *бухг* (*зарплата*) Gehált *n* -(e)s, Gehälter; **2.** (*абраза, кнігі*) Beschlág *m* -(e)s, -schläge, Verkléidung *f* -, -en

аклі́каць, аклі́кнуць ánrufen* *vt*; beim Námen rúfen*

акліматызава́цца sich akklimatisíeren, sich éingewöhnen, héimisch wérden

акліматызава́ць akklimatisíeren *vt*, éingewöhnen *vt*, héimisch máchen

акно́ *н* **1.** Fénster *n* -s, -; ***слухавóе*** ~ Dáchfenster *n*; ***вы́кінуць у ~*** zum Fénster hináuswerfen*; **2.** *разм* (*паміж урокамі, заняткамі*) Fréistunde *f* -, -n, Zwíschenstunde *f*

акóвы *мн, тс перан* Kétten *pl*, Fésseln *pl*; Bánde *pl* (*высок*); ***скíнуць*** ~ die Kétten ábschütteln [ábstreifen]

акóнны Fénster-

акóнца *ж памянш гл* акéнца

акóп *м вайск* Gráben *m* -s, Gräben; Schützengraben *m*; ***гармáтны*** ~ Geschützgraben *m* -s, Geschützeinschnitt *m* -(e)s, -e; ***капáць ~ы*** Schützengraben áusheben*; schánzen *vt*

акóпванца *гл* акапацца

акóпн|ы *вайск* Gráben-; Schanz-; ***~ыя рабóты*** Schánzarbeiten *pl*; ***~ая вайнá*** Stéllungskrieg *m* -(e)s, -e

акóраны entríndet

акóрваць *гл* акарыць

акóрд *м муз* Akkórd *m* -(e)s, -e; ***узяць*** ~ éinen Akkórd gréifen*

акóрдн|ы *тс эк* Akkórd-; ***~ая рабóта*** Akkórdarbeit *f* -, Stücklohnarbeit *f*; ***~ая зарпла́та*** Akkórdlohn *m* -(e)s, Stücklohn *m* -(e)s

акóт *м* Wérfen *n* -s, Lámmen *n* -s (*авечак*)

акóўваць *гл* акаваць

акрабáт *м спарт* Akrobát *m* -en, -en

акрабáтыка *ж спарт* Akrobátik *f* -

акрабаты́чны akrobátisch

акрáец *м разм* (*хлеба, пірага і г. д*) Brótkanten *m* -s, -; ein Ränftchen Brot (*маленькі*)

акрáіна *ж* **1.** Rand *m* -(es), Ränder, Áußenbezirk *m* -(e)s, -e, Stádtrand *m* (*горада*); Peripherie *f* -, -rí|en; **2.** *уст* (*памежная вобласць*) Grénzgebiet *n* -(e)s, -e, Rándgebiet *n*

акрáйчык *м* Brótkanten *m* -s, -

акрамя́ *прыназ* áußer (*D*), áusgenommen (*A*); ~ ***тагó*** áußerdem; überdíes, darüber hináus; ~ ***тагó што...*** ábgesehen davón, dass...

акрапíць besprengen *vt*; benétzen *vt*

акрáса *ж* (*упрыгожанне*) Schmuck *m* -(e)s, -e, Verzíerung *f* -, -en

акру́га *ж* **1.** (*адміністрацыйнае падраздзяленне*) Bezírk *m* -(e)s, -e; Kreis *m* -es, -e; ***вы́барчая*** ~ Wáhlkreis *m* -es, -e; **2.** (*навакольле*) Umgébung *f* -, -en, Úmkreis *m* -es, -e

акру́гласць *ж* Rúndung *f* -; Rúndlichkeit *f* -

акру́глены rund, rúndlich; ábgerundet

акруглéць, акруглíць **1.** rund máchen; ábrunden *vt*; **2.** (*суму*) ábrunden *vt*, áufrunden *vt*

акруглíцца, акругля́цца sich (áb)rúnden, rund wérden

акру́глы rund, rúndlich; ábgerundet

акругóвы Kreis-, Bezírks-; ~ ***суд*** Bezírksgericht *n* -(e)s,-e

акру́жаны **1.** umgében, umríngt; *вайск* umzíngelt, éingekreist, éingekesselt; **2.** (*клопатам*) umgében

акружа́ць *гл* акружыць

акру́жнасць *ж*, **акру́жына** *ж матэм* Kreis *m* -es, -e, Kréislini|e *f*-, -n

акружн|ы́ Kreis-, Ring-; ***~а́я чыгу́нка*** Ríngbahn *f*-, -en; ***~а́я аўтадаро́га*** Áutobahnring *m* -(e)s, -e; ***~ы́ шлях*** Úmweg *m* -(e)s, -e

акружы́ць **1.** (*каго-н*, *што-н*) umgében* *vt*, umríngen *vt*; umfássen *vt*; **2.** *вайск* umzíngeln *vt*, éinkreisen *vt*, éinkesseln *vt*; **~ ро́вам** mit éinem Gráben umgében*; **3.** (*увагай*, *клопатам і г. д*) umgében* *vt*

акружэ́нн|е *н* **1.** *вайск* (*дзеянне*) Umríngen *n* -s; Umzíngelung *f*-; Éinkreisung *f*-, Éinkesselung *f*-; **тра́піць у ~е** in éinen Késsel geráten*; **вы́рвацца з ~я** aus dem Késsel áusbrechen*; **2.** (*абставіны*, *асяроддзе*, *атачэнне*) Umgébung *f*-, Úmwelt *f*-; Milieu [mi´ljø:] *n* -s, -s; **у ~і** (*каго-н*) umgében [umríngt] von (*D*), in Begléitung von (*D*)

акру́тн|ы *уст*, *кніжн* **1.** (*свавольны*) éigenmächtig, éigenwillig; éigensinnig; **2.** (*безвыходны*) áusweglos; áussichtslos; hóffnungslos; **тра́піць у ~ае стано́вішча** in éine áusweglose Situatión [in die Klémme] (*разм*) geráten*

акруці́ць *гл* абкруціць

акрыва́віць mit Blut beflécken [besúdeln]

акрыва́ўлены blútbefleckt, blútbesudelt, blútbespritzt; blútüberströmt (*заліты крывёю*); blútig (*крывавы*); blútdurchtränkt (*прасякнуты крывёю*)

акрыліць, акрыля́ць begéistern *vt*, beschwíngen *vt*, beflügeln *vt*

акрыя́ць (*пасля хваробы*) sich erhólen, wíeder auf den Béinen sein, zu Kräften kómmen*, wíeder áufkommen*; *перан* wíeder Mut fássen, sich ermánnen

акрэдытава́нне **1.** *фін* Akkreditíeren *n* -s, Akkreditíerung *f*-; **2.** *дып* Akkreditíerung *f*-; Begláubigung *f*-

акрэдытава́ць **1.** *фін* akkreditíeren vt, bevóllmächtigen *vt*; **2.** *дып* akkreditíeren *vt*; begláubigen *vt*

акрэдыты́ў *м фін* Akkreditív *n* -(e)s, -e, Kredítbrief *m* -(e)s, -e; Réisescheck *m* -(e)s, -e (*для прыватных асоб*); **безадзыўны́ ~** únwiderrufliches Akkreditív; **непацве́рджаны ~** únbestätigtes Akkreditív; **адзыўны́ ~** wíderrufliches Akkreditív; **перавадны́ ~** übertrágbares Akkreditív; **рэво́льверны ~** revolvierendes [-vɔl´vi:-] Akkreditív; **рэзерво́вы ~** Resérveakkreditiv [-v-] *n*

акрэдыты́ўн|ы *фін* Akkreditív-; Begláubigungs-; **~ая гра́мата** *дып* Begláubigungsschreiben *n* -s, -s

акрэ́сліваць *гл* акрэсліць

акрэ́сліцца **1.** (*аб становішчы*) sich klären; **2.** (*пра характар*) sich bílden, sich heráusarbeiten

акрэ́сліць (*вызначыць межы*, *аб'ём*, *памеры*) bestímmen *vt*, féstlegen *addз vt*, féstsetzen *addз vt*; **~ сфе́ру** [**кола́**] **дзе́яння** den Wírkungsbereich [Wírkungskreis] bestímmen

аксаміт *м тэкст* Samt *m* -(e)s, -e, Sámtstoff *m* -(e)s, -e; **рубча́сты ~** Kórdsamt *m*, Ríppelsamt *m*; **баваўня́ны ~** Báumwollsamt *m*, Manchester [man´ʃestər] *m* -s; **муа́равы ~** Schíllersamt *m*

аксамі́тавы, аксамі́тн|ы sámten, Samt-; *перан* Sámtweich; **~ая стужка** Sámtband *n* -(e)s, -bänder; **~ы го́лас** éine sámtweiche Stímme

аксамі́цісты sámtig, sámtweich, sámtartig (*падобны на аксаміт*)

акселера́цыя *ж псіхал* Akzeleratión *f*-

аксельба́нт *м* Áchselschnur *f*-, -schnüre

аксесуа́р *м* Zúbehör *n* -s, -e, Béiwerk *n* -(e)s, -e; **мо́дныя ~ы** (*дамскага туалета*) módisches Béiwerk

аксі́д *м хім* Oxíd [Oxýd] *m* -(e)s

аксіёма *ж матэм*, *філас* Axióm *n* -(e)s, -e, Gründsatz *m* -es, -sätze

акт *м* **1.** (*дзеянне*) Akt *m* -(e), -e, Aktión *f*-, -en; Hándlung *f*-, -en, Tat *f*-, -en (*учынак*); **~ ве́тлівасці** ein Akt der Höflichkeit; **тэрарысты́чны ~** Terrórakt *m*; **2.** *тэатр* Akt *m*, Áufzug *m* -(e)s, -züge; **каме́дыя на тры а́кты** ein Lustspiel in drei Ákten; **3.** *юрыд* (*дакумент*) Úrkunde *f*-, -n, Ákte *f*-, -n; **абві́наваўчы ~** Ánklageschrift *f*-, -en; **~ы грамадзя́нскага ста́ну** Persónenstandsregister *n* -s, -; **~ капітуля́цыі** Kapitulatiónsurkunde *f*; **~ аб карыста́нні зямлёй** Úrkunde für die Bódennutzung; **4.** (*апісанне ўстаноўленых фактаў*) *юрыд* Protokóll *n* -s, -e; **~ прыёмкі** Ábnahmeprotokoll *n*; **~ аб няшча́сным здара́нні** Únfallprotokoll *n*; **скла́сці ~ аб** *чым-н* ein Protokóll über *etw.* (*A*) áufnehmen*; **5.** (*святочны збор*) Akt *m* -(e)s, -e, Féierlichkeit

а́ктав|ы **1.** *юрыд*, *эк* áktenmäßig, Ákten-; Úrkunden-; **~ая по́шліна** Verwáltungsgebühr *f*-, -en; **~ая папе́ра** Áktenpapier *n* -s; **2.**: **~ая за́ла** Áula *f*-, -len

акта́ва *ж муз* Oktáve [-və] *f*-, -n

акто́р *м тэатр*, *кіно* Scháuspieler *m* -s, -; **камі́чны ~** Kómiker *m* -s , -; Komödiánt *m* -en, -en

акто́рскі *тэатр*, *кіно* scháuspielerisch

актры́са *ж тэатр*, *кіно* Scháuspielerin *f*-, -nen; **2.** *перан* Komödiántin *f*-, -nen

актуа́льн|ы aktuéll, zéitnah, zéitgemäß; **~ае пыта́нне** éine aktuélle [akúte, brénnende] Fráge

актуа́льнасць *ж* Aktualität *f*-, Zéitbezogeheit *f*-

актуа́льнасць *ж* Aktualität *f*-, Zéitnähe *f*-, Zéitbezogenheit; **спра́ва страці́ла сва́ю ~** die Sáche hat sich erlédigt

актыва́ваць aktivíeren *vt*

актывіст *м* Aktivist [-´vist] *m* -en, -en, Funktionär *m* -s, -e; aktíves [-´vəs] Mítglied

акты́нія *ж зоол* Aktínie *f*-, -n, Séerose *f*-, -n

акты́ў *м* **I** *зборн* Aktiv *n* -s, aktíve [-və] Mítglieder (*pl*); **партыйны ~** Partéiaktivist *n*; **бацько́ўскі ~** Élternbeirat *m* -(e)s, -räte

акты́|ў *м* **II** *фін* Aktíva [-va] *pl*, Aktívbestand *m* -(e)s; Gúthaben *n* -s, -, Aktívposten *m* -s, -; **~ў і пасі́ў** Aktíva und Passíva [-va]; **мець на ~е** gúthaben *addз vt*; **уну́траныя ~ы** Ínlandaktiva

акты́ўна *прысл гл* актыўны

акты́ўнасць *ж* Aktivität [-vi-] *f*-, Geschäftigkeit *f*-, Tätigkeit *f*-; Rührigkeit *f*-; **працо́ўная ~** Árbeitsaktivität *f*; **со́нечная ~** Sónnenaktivität *f*, Soláraktivität *f*; **праяўля́ць ~** Aktivität an den Tag légen; rührig sein

акты́ўн|ы aktív, geschäftig, tätig, rührig; **~ы працаўні́к** tätiger [aktíver] Árbeiter; Aktivíst [-´vist] *m* -en, -en; **~ы ўдзе́л** aktíver [-vər] [tätiger] Ánteil; **~ая барацьба́** aktíver [tátkräftiger] Kampf; **~а ўдзе́льнічаць у** *чым-н* an *etw.* (*D*) aktív téilnehmen*

аку́кліваццa, аку́кліцца *заал* sich verpúppen

аку́ла *м заал* Háifisch *m* -(e)s, -e, Hai *m* -(e)s, -e

акулі́раваць *бат* okulíeren *vt*, (áuf)pfrópfen *vt*

акулі́ст *м мед* Áugenarzt *m* -es, -ärzte

аку́льтны okkúlt

акульту́рванне *н с.-г* Kultivíerung [-´vi:-]; (*глебы*) Früchtbarmachung *f*-

акульту́рыць *с.-г* kultivíeren [-´vi:-] *vt*

акульты́зм *м* Okkultísmus *m* -

акуля́р *м фіз* Okulár *n* -s, -e

акуля́ры *мн* Brílle *f*-, -n; **ахо́ўныя ~** Schútzbrille *f*-; **со́нечныя ~** Sónnenbrille *f*-; **~ для чыта́ння** Lésebrille *f*; **дымча́тыя ~** Ráuchglasbrille *f*; **рагавы́я ~** Hórnbrille *f*; **~ ў залато́й спра́ве** Brílle mit Góldrand; **~ без апра́вы** rándlose Brílle; **надзява́ць ~** éine Brílle áufsetzen; **зняць ~** éine Brílle ábnehmen* [ábsetzen]; ◊ **глядзе́ць праз ружо́выя ~** álles durch die rósa(rote) Brílle séhen*

акумулява́ць akkumulíeren *vt*, spéichern *vt*, ánsammeln *vt*

акумуля́тар *м тэх* Akkumulátor *m* -s, -tóren, (Áuto)batterie *f*-, -ri|en, Ákku *m* -s, -s (*разм*)

акумуля́цыя *ж* Akkumulatión *f*-, Áufspeicherung *f*-; *эк* **~ капіта́лу** Akkumulatión des Kapitáls, Kapitálakkumulation *f*-

акуна́цца, акуну́цца úntertauchen *vi* (*s*); *перан* áufgehen* *vi* (*s*); **ён акунуўся з галаво́й у пра́цу** er ging in der Árbeit auf, er stürzte sich in die Árbeit.

акуна́ць, акану́ць éintauchen *vt*
аку́нь *м заал* Barsch *m* -es, -e
акупава́ны okkupíert, besétzt
акупава́ць okkupíeren *vt*, besétzen *vt*
акупа́нт *м* Besátzer *m* -s, -, Okkupánt *m* -en, -en; Éindringling *m* -s, -e (*захопнік*)
акупа́цца, акупі́цца sich rentíeren, sich bezáhlt máchen
акупа́цы|я *ж* Okkupatión *f*-, Besétzung *f*-; ***зо́на ~і*** Besátzungszone *f*-, -n
акупацы́йны Okkupatións-; Besátzungs-; ***~я ўла́ды*** *палiт* Besátzungsbehörden *pl*
акупі́раваны *гл* акупаваны
акупі́раваць *гл* акупаваць
акупі́цца sich décken, sich rentíeren, sich bezáhlt máchen
акупі́ць décken *vt*, áusgleichen* *vt*; ersétzen *vt*; ***~ выда́ткі*** die Áusgaben décken
аку́пнасц|ь *ж эк*: ***тэрмін ~і капіталаўкладання́ў*** Rückflussdauer der Investitiónen [-vɛs-]
акупункту́ра *ж* Akupunktúr *f*-
аку́рак *м* Zigaréttenstummel *m* -s, -; Kíppe *f*-, -n (*разм*); Zigárrenstummel *m* (*цыгарны*)
акура́т (*якраз*) genáu, präzís(e); pünktlich, präzís(e) (*пра час*)
акура́тна *прысл гл* акуратны
акура́тнасць *ж* Genáuigkeit *f*-, Pünktlichkeit *f*- (*пра час*); Sáuberkeit *f*- (*пра вопратку і г. д*)
акура́тны genáu, präzís(e) (*дакладны*); pünktlich (*пра час*); sórgfältig (*старанны*); sáuber (*ахайны, чысты*)
аку́рванне *н* Räucherung *f*-, Dúrchgasung *f*-; ***~ сі́рай*** Schwéfeln *n* -s, Schwéfelung *f*-
аку́рваць, акурыць beräuchern *vt*; ***~ сі́рай*** schwéfeln *vt*
аку́стыка *ж* Akústik *f*-
акусты́чны akústisch
аку́ты beschlágen
аку́чаны *с.-г* (án)gehäufelt
аку́чванне *н с.-г* Häufeln *n* -s
аку́чнік *м с.-г* Häufelpflug *m* -(e)s, -pflüge; Häufelmaschine *f*-, -n
акуш э́р *м мед* Gebúrtshelfer *m* -s, -
акуш э́рка *ж мед* Hébamme *f*-, -n
акуш э́рскі *мед* Gebúrtshilfe-, Entbíndungs-
акуш э́рства *н мед* Gebúrtshilfe *f*-
акцёр *м гл* актор
акцёрскі *гл* акторскі
а́кцы|я *ж* **1.** (*дзеянне*) Aktión *f*-, -en; ***дыпламаты́чная ~я*** diplomátische Aktión; **2.** *эк, фін* (*каштоўная папера*) Ákti|e *f*-, -n; ***~я на прад'я́ўніка*** Ínhaberakti|e *f*; ***звыча́йная [про́стая] ~я*** Stámmakti|e *f*, gewöhnliche Ákti|e; ***прывілеява́ная ~я*** bevórrechtliche Ákti|e; ***вы́пушчаныя ~і*** Ákti|enanteile *pl*
акцы́з *м фін* Akzíse *f*-, -n, Verbráuchsabgabe *f*-, -n
акцыяне́р *м эк* Aktionär *m* -s, -e; Ákti|eninhaber *m* -s, -
акцыяне́рны *эк* Ákti|en-; ***~ капіта́л*** Ákti|enkapital *n* -s, -e
акцэ́нт *м* **1.** (*націск*) Akzént *m* -(e)s, -e, Betónung *f*-, -en; ***зрабі́ць ~ на чым-н*** *перан etw.* besónders betónen [hervórheben*] **2.** (*інтанацыйнае вымаўленне*) Áussprache *f*-, -n
акцэнтава́ць *лінгв, тс перан* akzentuíeren *vt*, betónen *vt*
акцэ́пт *м* **1.** *юрыд, дып* Éinverständnis (*n*) zum Vertrágsabschluss; **2.** *фін* Akzépt *n* -es, -e; ***вэ́ксальны ~*** Wéchselakzept *n*; ***насту́пны ~*** náchfolgendes Akzépt; ***папярэ́дні ~*** vórläufiges [éinleitendes] Akzépt; ***чэ́кавы ~*** Bándakzept *n*
акцэптава́нне *н фін* Akzeptíeren *n* -s, Akzeptíerung *f*-
алава́ны Zinn-; zínnern; ***~ салда́цік*** [***жаўне́рык***] Zínnsoldat *m* -en, -en
алагі́чны únlogisch
алада́ка *ж* Pfánnkuchen *m* -s, -; Fláden *m* -s, - (*скавароднік*)
Алáх *м* Állah *m* -s
албáнец *м* Albáni|er *m* -s, -
албáнскі albánisch
алгарыт́м *м матэм, камп, тс перан* Algoríthmus *m* -, -men
а́лгебра *ж матэм* Álgebra *f*-
алгебраі́чн|ы *ж матэм* algebráisch; ***~ае ўраўне́нне, ~ы разве́зак*** algebráische Gléichung
але́ I *злучн* **1.** (*супраць*) áber, doch, jedóch; ***яна адка́звала ці́ха, ~ ўпэ́ўнена*** sie ántwortete léise, aber entschíeden; **2.** (*далуч*) áber; ***вёскі малы́я, ~ будынкі но́выя*** die Dörfer sind klein, aber die Häuser sind neu
але́ II *часц*: ***ці ўсе тут? – ~!*** sind alle da? – Ja!
алеа́ндр *м бат* Oleánder *m* -s, -
алеба́рда *ж гіст* Hellebárde *f*-, -n
алеба́стр *м мін* Alabáster *m* -s
алеба́стравы *мін* Alabáster-, alabástern
алегары́чна *прысл*; **алегары́чны** allegórisch, sínnbildlich
алего́рыя *ж літ, маст, фалькл* Allegoríe *f*-, -rí|en, Sínnbild *n* -es, -er
але́гра *муз* **1.** *прысл* allégro; **2.** *наз н* Allégro *n* -s, -s
але́исты ölig
але́|й *м* Öl *n* -s, -e, Pflánzenöl *n*; ***змя́зачны ~й*** Schmíeröl *n* -s; ***адпрацава́ны ~й*** Áltöl *n*; ◊ ***~ падлі́ць ~ю ў агóнь*** Öl ins Féuer gíeßen*
але́йны Öl-; ***~я расліны*** *бат* Ölpflanzen *pl*
але́невы Hirsch-, Réntier-; ***~я ро́гі*** Hírschgeweih *n* -(e)s, -e, Réntiergeweih *n*
аленегадо́ўля *ж* Hírschzucht *f*-
але́ніха *ж* Hírschkuh *f*-, -kühe
але́нь *м заал* Hirsch *m* -(e)s, -e; ***паўно́чны ~*** Réntier *n* -s, -e; Ren *n* -(e)s, -e; ***высакаро́дны ~*** Édelhirsch *m*
аленявó д *м* Réntierzüchter *m* -s, -
аленяня́ *н*, **аленянё** *н* júnger Hirsch, júnges Réntier
алергі́чны *мед* allérgisch
алергі́я *ж мед* Allergíe *f*-, -gí|en
але́шнік *м* (*лес*) Érlenwald *m* -(e)s, -wälder
але́шына *ж бат* Érle *f*-, -n
але́я *ж* Allée *f*-, -n
але́!, ало! *выкл* halló!
алжы́рац *м* Algéri|er *m* -s, -
а́лібі *нескл н юрыд* Álibi *n* -s, -s; ***даказа́ць сваё ~*** sein Álibi náchweisen*
алі́ва I *ж уст* (*машыннае масла*) Maschínenöl
алі́ва II *ж бат* Olíve [-və] *f*-, -n (*плод*); Olívenbaum [-vən-] *m* -(e)s, -bäume (*дрэва*)
алігáрхія *ж паліт, эк* Oligarchíe *f*-, -í|en
алігáтар *м заал* Alligátor *m* -s, -tóren, Káiman *m* -(e)s, -e
алілу́я 1. *выкл царк* hallelúja!; **2.** *наз ж* Hallelúja *n* - *i* -s, *pl* - *i* -s
алiме́нты *мн юрыд* Aliménte *pl*, Únterhaltskosten *pl*; ***плаці́ць ~*** Aliménte [Únterhalt] záhlen
алімпíйск|і *спарт* olýmpisch; Olýmpia-; ***Алімпíйскія гу́льні*** die Olýmpischen Spíele
алімпіяда *ж* Olympiáde *f*-, -n (*тс спарт*)
алітэра́цыя *ж літ* Alliteratión *f*-, -en, Stábreim *m* -(e)s, -e
алíўкавы 1. (*колер*) olívgrün; **2.** (*у дачыненні да алею*) Báumöl-, Olíven- [-vən-]
алкагалíзм *м* Alkoholísmus *m* -, Trúnksucht *f*-
алкагóлік *м* Alkohóliker *m* -s, -; Säufer *m* -s, - (*п'яніца*)
алкагóль *м* Álkohol [Alkohól] *m* -s
алкагóльны Álkohol-; alkohólisch; álkoholhaltig (*які ўтрымлівае алкаголь*); ***~я напóі*** alkohólische [álkoholhaltige] Getränke
алмáз *м* Diamánt *m* -en, -en; ***шкларэ́зны ~*** *тэх* Glásschneider *m* -s, -
алмáзны diamánten
алóвак *м* Bléistift *m* -(e)s, -e; ***каляро́вы ~*** Búntstift *m*; Fárbstift *m*; ***рознакаляро́вы ~*** Méhrfarbenstift *m*
алóнж *м фін* Allonge [ɑ´lɔ̃:ʒə] *f*-, -n
алтáец *м* Altái|er *m* -s, -

алта́р *м царк* Altár *m* -s, Altäre
алфавíт *м* Alphabét *n* -(e)s, -e; Abc [a:be:´tse:] *n* -, -
алфавíтны alphabétisch
алхíмік *м* Alchemíst *m* -en, -en
алхíмічны alchémisch
алхíмія *ж* Alchemíe *f* -
алычá *ж бат* Kirschpflaume *f* -, -n
альбатрóс *м заал* Álbatros *m* -, -se
альбíнос *м біял* Albíno *m* -s, -s
альбó *злучн гл* або
альбóм *м* **1.** Álbum *n* -s, Álben *і разм* -s; **~ *для мáрак*** Bríefmarkenalbum *n*; **~ *для рысавáння*** Zéichenblock *m* -(e)s, -s; **2.** (*гравюр, рэпрадукцый і г. д*) Bíldband *m* -(e)s, -bände
альбóмны Álbum-; **~ *фармáт*** Quérformat *n* -(e)s, -e, Bréitformat *n*
альбумíн *м хім* Albumín *n* -(e)s, -e, Éiweißstoff *m* -(e)s, -e
альманáх *м* Álmanach *m* -(e)s, -e, Jáhrbuch *n* -(e)s, -bücher
альпíйск|і Álpen; alpín; **~*ае двубóр'е*** *спарт* (*лыжы*) alpíne Kombinatión; **~*ая пáша*** Alm *f* -, -en, Álpe *f* -, -n
альпінíзм *м* Bérgsteigen *n* -s, Alpinísmus *m* -
альпінíст *м* Bérgsteiger *m* -s, -, Hóchgebirgswanderer *m* -s, -
альпінíсцкі: **~ *пахóд*** Hóchgebirgstour [-tur] *f* -, -en; **~ *лáгер*** Bérgsteigerlager *n* -s, -; **~ *рыштýнак*** Bérgsteigerrüstung *f* -
альт *м* **1.** *муз* Brátsche *f* -, -n, Áltgeige *f* -, -n; **2.** (*голас*) Alt *m* -(e)s, -e, Áltstimme *f* -, -n; ***спяваць ~ам*** Alt síngen*; **3.** (*той, хто спявае альтам*) Altíst *m* -en, -en; Altístin *f* -, -nen (*жанчына, якая спявае альтам*)
альтáнка *ж* Láube *f* -, -n, Gártenlaube *f*
альтруíзм *м* Altruísmus *m* -; Úneigennützigkeit *f* - (*бескарыслівасць*)
альтруíст *м* Altruíst *m* -en, -en, Ménschenfreund *m* -(e)s,-e
альтруíстычны altruístisch; úneigennützig (*бескарыслівы*)
альтэрнатывá *ж*- Alternatíve [-və] *f* -, -n
альтэрнатывýн|ы alternatív; ***~ае пытáнне*** Entschéidungsfrage *f* -, -n
áльф|а *ж* (*літара*) Álpha *n* - *і* -s, -s; ◊ ***~а і амéга*** das Álpha und das Ómega, das A und (das) O; ***ад ~ы да амéгі*** von A bis Z
áльфа-апрамянéнне *н фіз* Álphabestrahlung *f* -
áльфа-выпрамéньванне *н фіз* Álphastrahlung *f* -
áльфа-лíчыльнік *м фіз* Álphazähler *m* -s, -
áльфа-прамéнні *мн фіз* Álphastrahlen *pl*
áльфа-радыеактывýнасць *ж фіз* Álphaaktivität [-vi-] *f* -
áльфа-распáд *м ядзерн* Álphazerfall *m* -(e)s, Álphaumwandlung *f* -
áльфа-часцíнкі *мн ядзерн* Álphateilchen *pl*
альхóвы Érlen -
альянс *м* Alliánz *f* -, -en
альяс *м бат* Álo|e *f* -, -n
алюмíній *м хім* Alumínium *n* -s
алюр *м* Allüre *f* -, -en, Gángart *f* -, -en (des Pférdes)
аляпавáты geschmácklos
амазóнка *ж* **1.** (*жанчына-коннік*) Amazóne *f* -, -n; **2.** (*сукенка для язды вярхом*) Amazónenkleid *n* -(e)s, -er, Réitkleid *n*
амаладжэ́нне *н* **1.** Verjüngung *f* -, -en; **2.** (*пра дрэвы*) Ábholzung *f* -, -en
амаладзíць **1.** verjüngen *vt*; **2.** (*дрэвы*) ábholzen *vi*
амáль fast, beináhe, náhezu; **~ *што*** so gut wie, fast; **~ *нічóга*** fast nichts
амальгáма *ж хім* Amalgám *n* -(e)s, -e
аманімíчны *лінгв* homoným, homonýmisch
амáр *м заал* Húmmer *m* -s, -, Séekrebs *m* -(e)s, -e
амарáльнасць *ж* Únmoral *f* -, Síttenlosigkeit *f* -, Únsittlichkeit *f* -, Amoralität *f* -
амарáльны únmoralisch, únsittlich, síttenlos
амартызавáць **1.** *тэх* dämpfen *vt*, ábschwächen *vt*; **2.** *эк* amortisíeren *vt*; ábschreiben* *vt*
амартызáтар *м тэх* Dämpfer *m* -s, -, Púffer *m* -s, -, Stóßdämpfer *m*
амартызацы́йн|ы *эк* Amortisatións-; ***~ая вы́плата*** Amortisatiónszahlung *f*; ***~ыя адлíчэ́ннi*** Amortisatiónsabführung *f*; ***сýма ~ых адлíчэ́нняў*** Amortisatiónsbetrag *m*
амартызáцы|я *ж* **1.** *тэх* Dämpfung *f* -, Stóßdämpfung *f* -; **2.** (*зношванне*) Verschléiß *m* -(e)s, -e; Verwóhntheit *f* - (*пра жыллое памяшканне*); **3.** *эк* Amortisatión *f* -; ***нóрма ~і*** Amortisatiónsquote *f*
амáтар *м* **1.** (*ахвотнік да чаго-н*) Líebhaber *m* -s, -; Freund *m* -(e)s, -e; **~ *мýзыкі*** Musíkliebhaber *m* -s, -; ***ён не ~ гавары́ць*** *разм* er ist nicht gesprächig; er ist máulfaul; **2.** (*не прафесіянал*) Amateur [-´tø:r] *m* -s, -e; Bástler *m* -s, -; ***актор-~*** Láienspieler *m* -s, -
амáтарка *ж* Líebhaberin *f* -, -nen, Fréundin *f* -, -nen
амáтарскі líebhaberisch, Líebhaber-; Amateur- [-´tø:r-]; **~ *спектáкль*** Láienspiel *n* -s, -e, Líebhaberaufführung *f* -, -en
амáтарства *н* Liebhaberéi *f* -
амбасáда *ж дып* Bótschaft *f* -, -en
амбасáдар *м дып* Bótschafter *m* -s, -
амбіцы́йны **1.** éhrgeizig, strébsam, ambitioníert, ambitiös; **~ *арты́кул*** subjektíver Artíkel; Artíkel, der die Méinung des Áutors verabsolutíert
амбíцыя *ж* **1.** Ambitión *f* -; Éhrgeiz *m* -es; **2.** Hóchnäsigkeit *f* - (*самалюбства*); ***чалавéк з ~й*** hochnäsiger [éingebildeter] Mensch
амбóн *м царк* Altárvorraum *m* -(e)s, -räume
амбразýра *ж* **1.** *вайск* (*байніца*) Schíeßscharte *f* -, -n; **2.** *буд* (*праём*) Nísche *f* -, Fénsternische *f* (*для акна*); Türnische *f* (*для дзвярэй*)
амбулатóрны ambulánt; **~ *хвóры*** ein ambulánter Pati|ént
амбулатóрыя *ж* Ambulánz *f* -, -en; Ambulatórium *n* -s, -ri|en (*рэдка*)
амéг|а *ж* Ómega *n* -s *і* -, -s; ◊ ***áльфа і ~а*** das Álpha und das Ómega, das A und (das) O; ***ад áльфы да ~і*** von A bis Z
амерыкáнец *м* Amerikáner *m* -s, -
амерыкáнка *ж* Amerikánerin *f* -, -nen
амерыкáнскі amerikánisch; **~*я гóркі*** (*атракцыён*) Áchterbahn *f* -, -en
аметы́ст *м мін* Amethýst *m* -(e)s, -e
амёба *ж заал* Amöbe *f* -, -n
амінакíслоты *мн хім* Amínosäuren *pl*
амíнь ámen; Ámen *n* -s
амíяк *хім* Ammoniák *n* -s
амія́чн|ы *хім* ammoniakálisch, Ammoniák-; **~*ая вадá*** Ammoniákwasser *n* -s
амлéт *м* Omelétt *n* -(e)s, -e, Omelétte *f* -, -n (*рэдка*); Éierkuchen *m* -s, -
амнезíя *ж мед* Amnesíe *f* -, Gedächtnisschwund *m* -(e)s, Gedächtnisverlust *m* -es
амнíсты|я *ж* **1.** Amnestíe *f* -, -tí|en; Begnádigung *f* -, -en (*памілаванне*); ***трапíць пад ~ю*** únter die Amnestíe fállen*
амнісцíраваны amnestíert, begnádigt
амнісцíраваць éine Amnestíe zúbilligen (*D*), amnestíeren *vt*, begnádigen *vt*
амóнім *м лінгв* Homoným *n* -(e)s, -e
амóрфнасць *ж* Amorphíe *f* -, Fórmlosigkeit *f* -, Gestáltlosigkeit *f*
амóрфны amórph, gestáltlos, gefügelos, struktúrlos
ампéр *м эл* Ampere [am´pɛ:r] *n* - *і* -s, - (*скар A*)
ампермéтр *м эл* Amperemeter [am´pɛ:r-] *n* -s, -, Strómmesser *m* -s, -
ампíр *м* (*мастацкі стыль*) Empíre [-´pi:r] *n* -s; Empírestil *m* -(e)s; Biedermeierstil *m* (*у Нямеччыне ў першай палове XIX ст.*)
амплітýда *ж фіз* Amplitúde *f* -, -n, Áusschlag *m* -(e)s; **~ *вагáнняў*** Schwíngung *f* -, -n, Schwíngungsweite *f* -, -n
амплуá *нескл н* **1.** *тэатр* Rólle f -, -n; **2.** *перан* (*круг заняткаў*) Beschäftigung *f* -, -en

а́мпула *ж спец* Ampúlle *f*-, -n
ампутава́ны (*адрэзаны пры аперацыі*) *мед* amputíert, ábgenommen
ампутава́ць *мед* amputíeren *vt*, ábnehmen* *vt*
ампута́цыя *ж мед* Amputatión *f*-, -en
амуле́т *м* Amulétt *n* -(e)s, -e
амуні́цыя *ж* **1.** *вайск уст* Léderzeug *n* -(e)s, -e; **2.** Ausrüstung *f*-, -en
аму́р *м міф, паэт* Ámor *m* -s
аму́рны *разм* Líebes-; Hérzens-; ***~я спра́вы*** *разм* Hérzensangelegenheit *f*-, -n; Líebesgeschichte *f*-, -n
а́мфара *ж* Amphóra *f*-, -phóren, Amphóre *f*-, -n
амфі́бія *ж* **1.** *заал* Amphíbi|e *f*-, -n, Lurch *m* -(e)s, -e; **2.** *вайск* Amphíbi|enfahrzeug *n* -(e)s, -e; ***самалёт-~*** Amphíbi|enflugzeug *n* -(e)s, -e
амфітэа́тр *м* Amphítheater *n* -s, -
амшы́ць mit Móos ábdichten
амярцве́лы **1.** (*мёртвы – пра клеткі і г. д*) ábgestorben; **2.** (*нерухомы*) erstárrt; réglos, léblos
амярцве́нне *н* Ábsterben *n* -s
амярцве́ць **1.** (*страціць адчувальнасць*) ábsterben* *vi* (*s*); **2.** (*страціць рухомасць, заціхнуць*) erstárren *vi* (*s*)
амяшча́ніцца, амяшча́ньванцца *разм* spießbürgerlich [spíeßig] wérden; zum Spíeßbürger [Spíeßer] wérden
анабіёз *м біял* Anabióse *f*-
анава́ць gründen *vt*; stíften vt (*заснаўваць*); **~ го́рад** éine Stadt gründen [ánlegen]
ана́лаг *м* Análogon *n* -s, -ga
аналагі́чна *прысл* analóg
аналагі́чнасць *ж* Gléichartigkeit *f*-
аналагі́чны gléichartig; ähnlich; **~ вы́падак** Análogon *n* -s, -ga, ähnlicher Fall
ана́ліз *м* **1.** Analýse *f*-, -n; Zerlégung *f*-, -en (*раскладанне*); ***я́касны ~*** qualitatíve [-və] Analýse; ***ко́лькасны ~*** quantitatíve [-və] Analýse; **~ *крыві*** Blútbild *n* -(e)s, -er; Blútuntersuchung *f*-, -en (*на ўтрыманне алкаголю*); **~ *уро́ка*** Áuswertung éiner Stúnde
аналізава́ць analysíeren *vt*; zerlégen *vt* (*раскладаць*); áuswerten *vt* (*досвед і г. д*)
аналі́тык *м* Analýtiker *m* -s, -
аналі́тычны analýtisch
аналогі|я *ж* Analogíe *f*-, -gí|en; ***па ~і*** analóg, entspréchend; ***правадзіць ~ю*** éinen Vergléich ánstellen
аналой *м царк* Analógion *n* -s, -gia, Pult *n* -(e)s, -e
ана́лы *мн* Annálen *pl*
анама́лія *ж* Anomalíe *f*-, -lí|en, Régelwidrigkeit *f*-, -en; ***магні́тная ~ геал*** Magnétanomalie
анама́льны anomál, régelwidrig
анама́стыка *ж лінгв* Námenkunde *f*-, Onomástik *f*-
ананас *м бат* Ánanas *f*-, - *або* -se
ананасавы Ánanas-
ананізм *м* Onanie *f*-, Onanísmus *m* -
ананім *м* **1.** (*аўтар*) anonýmer [námentlich nicht genánnter] Verfásser [Áutor], Anónymus *m* -, -mi; **2.** (*твор*) anonýme Schrift, anonýmes Werk
ананімнасць *ж* Anonymität *f*-
ананімны anoným, námenlos, úngenannt
анансава́ць ánkündigen *vt*, annoncieren [anõ´si:-] *vt*, ánzeigen *vt*
ана́пест *м літ* Anapäst *m* -(e)s, -e
анархізм *м паліт* Anarchísmus *m* -
анархі́ст *м паліт* Anarchíst *m* -en, -en
анархі́чны **1.** (*які мае дачыненне да анархіі*) *паліт* anarchístisch; **2.** (*схільны да анархіі*) anárchisch
ана́рхія *ж* Anarchíe *f*
анатава́нне *н* Verfássen éiner kúrzen Ínhaltsangabe
анатава́ць éine kúrze Ínhaltsangabe verfassen
ана́там *м* Anatóm *m* -en, -en
анатамі́раванне *н* Sezíeren *n* -s, Anatomíeren *n* -s
анатамі́раваць sezíeren *vt*, anatomíeren *vt*; zerglíedern *vt*
анатамі́чны anatómisch
ана́тацыя *ж* kúrze Ínhaltsangabe
анато́мія *ж* Anatomíe *f*-
ана́фара *ж літ* Anápher *f*-, -n, Anáphora *f*-, -rä
ана́фе|ма *ж царк* Bánnfluch *m* -(e)s, -flüche, Kírchenbann *m* -(e)s, -e; ***абвяшча́ць ~му*** den Kírchenbann verhängen (*каму-н* über A)
анахранізм *м* Anachronísmus [-kro-] *m* -, -men
анахрані́чны anachronístisch [-k-]
ангажава́ць engagíeren [ãgaˊʒi:-] *vt*, verpflíchten *vt*
ангажэме́нт *м* Engagement [ãgaʒəˊmã:] *n* -s, -s
анга́р *м ав* Hangár *m* -s, -s, Flúgzeughalle *f*-, -n
англе́лец *м гл* англічанін
англе́льскі *гл* англійскі
англі́на *ж мед* Angína *f*-, -nen Mándelentzündung *f*-, -en
англасаксо́нскі *гіст* ángelsächsisch
англі́йскі énglisch
англіка́нскі *рэл* anglikánisch
англіча́нін *м* Éngländer *m* -s, -
анго́льскі angolánisch
андатра *ж заал* Bísamratte *f*-, -n
анекдатычны anekdótenhaft, anekdótisch
анекдо́т *м* **1.** Witz *m* -(e)s, -e; **2.** (*пра гістарычную асобу*) Anekdóte *f*-, -n
анексава́ць, анексі́раваць annektíeren *vt*, gewáltsam éinverleiben
анексія *ж паліт* Annexión *f*-, -en, Annektíerung *f*-, -en; gewáltsame Éinverleibung
анемія *ж мед* Anämíe *f*-, Blútarmut *f*-
анемо́метр *м спец* Anemométer *n* -s, -, Wíndmesser *m* -s, -
анестэзіраваць, анестэзіява́ць *мед* anästhesíeren *vt*
анестэзія *ж мед* Anästhesíe *f*-, Schmérzbetäubung *f*-; ***агу́льная ~*** Vóllnarkose *f*-; ***мясцо́вая ~*** örtliche Betäubung *f*-, Lokálanästhesie *f*
анёл *м* Éngel *m* -s, -
анёльскі Éngels-, éngelsgleich, éngelhaft; **~ го́лас** Éngelsstimme *f*-, -n
ані I *прысл* (*нікольки, зусім*) überháupt nicht; gar nicht; kéine Spur
ані II *часц*: **~ кро́плі** kein éinziges Krümelchen; kein bísschen
анівво́дзін, анівво́дны kéiner, kein éinziger
анідзе́ *прысл разм* (*нідзе, зусім нідзе*) nírgends
анікі́лі *прысл разм* (*зусім ніколі, век*) niemals, nie; **~ ў жыцці́** nie im Lében, nie und nímmer
анікі́лькі *прысл разм* (ganz und) gar nicht, nicht im Geríngsten; überháupt nicht; kéinesfalls
аніліна *м хім* Anilín *n* -s -
анімізм *м* Animísmus *m* -
анімісты́чны animístisch
аніс *м бат* **1.** (*расліна*) Ánis [Anís] *m* -es, -e; **2.** (*плод*) Ánisapfel *m* -s, -äpfel
аніхто́ *займ разм* níemand, kéiner, kein éinziger
анічо́га *прысл разм* (*зусім нічога*) überháupt nicht [nichts]
анішто́ *займ разм* (*зусім нішто*) nichts
аніяк *прысл разм* (*зусім ніяк*) in kéiner Wéise
анкалагі́чн|ы *мед* onkológisch, Onkologíe-, Geschwúlst-; **~ае захво́рванне** Geschwúlsterkrankung *f*-, -en; **~ы хво́ры** Geschwúlstkranke (*sub*) *m* -n, -n, Krébskranke (*sub*) *m* -n, -n
анкало́гія *ж мед* Onkologíe *f*-
а́нкер *м тэх* Ánker *m* -s, -
а́нкерны *тэх* Ánker-; **~ *болт*** Stéinschraube *f*-, -n, Ánkerbolzen *m* -s, -
анке́т|а *ж* (*апытальны ліст*) Frágebogen *m* -s, - *і* -bögen; Formulár *n* -s, -e; Personálbogen *m*; ***запо́ўніць ~у*** éinen Frágebogen áusfüllen

анкетава́нне *н* (*апытанне*) Úmfrage *f*-, -n;
анкетава́ць úmfragen *vt*
анке́тны Frage-, Frágebogen-, Personál-; ***~я звёсткі*** Personáli|en *pl*
анко́лаг *м мед* Onkológe *m* -n, -n; (*даследчык*) Krébsforscher *m* -s, -
ано́д *м эл* Anóde *f*-, -n
ано́нс *м* Anzeige *f*-, -n; Annónce [a´nɔ̃:sə] *f*-, -n; Inserát *n* -(e)s, -e (*у друку*); ***зрабі́ць ~ пра што-н*** *etw.* bekánnt geben*; ánkündigen *vt*; annoncíeren [anɔ̃:´si:-] *vt*, ánzeigen *vt* (*y друку*)
ансáмбль *м* **1.** Ensemble [ã´sã:bl] *n* -s, -s (*высок*); Gesámtbild *n* -(e)s, -er (*архітэктурны і г. д*); **2.** (*мастацкі калектыў*) Ensemble [ã´sã:bl] *n* -s, -s, (Kultúr)grúppe *f*-, -n; ***~ пе́сні і та́нца*** Vólkstanzensemble *n*; ***інструмента́льны ~*** (*аркестр*) Klángkörper *m* -s, -
антагані́зм *м філас, тс перан* Antagonísmus *m* -, -men; únversöhnlicher Wíderspruch
антагані́ст *м* Antagoníst *m* -en, -en
антаганісты́чны antagonístisch
антало́гія I *ж* Anthologíe *f*-, -gí|en; Gedíchtsammlung *f*-, -en
антало́гія II *ж філас* Ontologíe *f*-
антанімі́чны *лінгв* antonýmisch
антаркты́чны antárktisch
анто́наўка *ж* (*гатунак яблыкаў*) Antónauka *f*-, -ki, Ántonäpfel *pl*
анто́нім *м лінгв* Antoným *n* -(e)s, -e; Gégenteil *n* -s, -e; Gégensatz *m* -(e)s, -sätze
антра́кт *м* **1.** *тэатр* Páuse *f*-, -n; **2.** *муз* Zwíschenspiel *n* -s, -e
антрапалагі́чны anthropológisch
антрапало́гія *ж* Anthropologíe *f*-, Ménschenkunde *f*-
антрапамо́рфны *спец* antropomórph, ménschenähnlich
антрапо́лаг *м* Anthropológe *m* -n, -n
антраці́т *м мін* Anthrazít *m* -(e)s, -e, Anthrazítkohle *f*-, -n
антраці́тавы Anthrazít-
антрэпрэнёр *м тэатр* Impresário *m* -s, -s *i* -ri|en, -ri
антрэсо́лі *мн* 1. Zwíschengeschoss *n* -es, -e, Zwíschenstockwerk *n* -(e)s, -e; **2.** *разм* ein Regál únter der Décke
антыбіётык *м фарм* Antibiótikum *n* -s, -ka
антыва́енны Antikríegs-
антыгістары́чны antihistorisch
антыграма́дскі asoziál
антыгума́нны ménschenfeindlich
антыдэмакраты́чны ántidemokrátisch
антыканстытуцы́йны verfássungswidrig, verfássungsfeindlich
антыкаразі́йн|ы *спец* Róstschutz-, Korrosiónsschutz-; ***~ае пакрыццё*** Róstschutzfarbe *f*-, -n; ***~ая сталь*** róstfreier [korrosiónsbeständiger] Stahl
антыква́р *м* Antiquitätenhändler *m* -s, -
антыква́рны antiquárisch; ***~я рэ́чы*** Antiquitäten *pl*
антыкварыя́т *м* Antiquariát *n* -s, -e, Antiquitätenhandel *m* -s
антыло́па *ж заал* Antilópe *f*-, -n
антыманапо́льны: ~ зако́н Antikartellgesetz *n* -es, -e
антымілітары́сцкі antimilitarístisch
антынавуко́вы únwissenschaftlich, wíssenschaftsfeindlich
антынаро́дны vólksfeindlich; vólksfremd
антыпартыйны partéifeindlich, partéiwidrig
антыпа́ты|я *ж* Antipathíe *f*-, Ábneigung *f*-; Wíderwille(n) *m* -(n)s; ***мець ~ю да каго-н, чаго-н*** éine Ábneigung háben (gegen *A*)
антыпо́д *м* **1.** *геагр* Antipóde *m* -n, -n; **2.** *перан* (*праціўнік*) Antipóde *m*, Wídersacher *m* -s, -, Gégner *m* -s, -
антырэлігійны antireligiös, gláubensfeindlich
антысанітарны únhygi|enisch; ~ ***стан*** únhygi|enische Verhältnisse
антысемі́т *м* Antisemít *m* -en, -en
антысемі́тызм *м паліт* Antisemitísmus *m* -
антысемі́цкі antisemítisch
антысепты́чны *фарм* antiséptisch
антыстаты́чны *спец* antistátisch
антытэ́за *ж*, **антытэ́зіс** *м філас* Antithése *f*-, -n, Gégenbehauptung *f*-, -en
антыфашы́ст *м* Antifaschíst *m* -en, -en
антыфашы́сцкі *паліт* antifaschístisch
анты́хрыст *м* Ántichrist [-krist] *m* -en, -en
антыцэ́лы *мн мед* Antikörper *pl*
антыцыкло́н *м метэар, геагр* Hoch *n* -s, -s, Hóchdruckgebiet *n* -(e)s, -e, Antizyklóne *f*-, -n
антыцыпа́цыя *ж псіхал* Antizipatión *f*-
анты́чнасць *ж гіст* Antíke *f*-
анты́чны antík; ~ ***свет*** *гіст* Antíke *f*-, Áltertum *n* -s
анто́на *ж спец* Anténne *f*-, -n
ану́! *выкл* **1.** *разм* los!, dálli; **2.** (*адвяжыся, адчапіся*) ≅ lass(t) mich in Rúhe [Fríeden]!; bléib(t) mir vom Léib(e)! (*высок*)
анулява́нне *н* Annullíerung *f*-, Úngültigkeitserklärung *f*-, Níchtigkeitserklärung *f*
анулява́ны annullíert, für úngültig erklärt
анулява́ць annullíeren *vt*, für úngültig erklären; ~ ***зака́з*** [***замо́ву***] éine Bestéllung rückgängig máchen [annullíeren *vt*], éinen Áuftrag zurückziehen*
ану́ча *ж* **1.** (*кавалак тканіны*) Láppen *m* -s, -; **2.** (*старое адзенне*) Lúmpen *pl*; **3.** (*для ног*) Fúßlappen *m* -s, -; **4.** *разм* (*бесхарактарны чалавек*) Wáschlappen *m* -s, -; Jámmerlappen *m*
ану́чка *ж* Pútzlappen *m* -s, -
ану́чнік *м* Lúmpenhändler *m* -s, -, Lúmpensammler *m* -s, -
анямé|ць 1. (*страціць мову*) stumm wérden; *перан* verstúmmen *vi* (*s*), die Spráche verlíeren*; **2.** (*амярцвець*) erstárren *vi* (*s*), ábsterben* *vi* (*s*) (*ад холаду*); ***у мяне́ ~ла рука́*** mir ist der Arm éingeschlafen
анямéлы 1. (*знямелы*) stumm, spráchlos; **2.** (*амярцвелы, нечулівы*) erstárrt, ábgestorben
анямéнне *н* (*амярцвенне*) Erstárrung *f*-, Ábsterben *n* -s
а́орта *ж анат* Aórta *f*-, -ten, Háuptschlagader *f*-, -n
а́орыст *м грам* Aoríst *m* -(e)s, -e
апавіва́ць, апавіць 1. (*абматаць, абкруціць*) umwíckeln *vt* (*чым-н* mit *D*); umschlíngen* *vt*; umwínden* *vt*; **2.** (*ахутаць*) éinwickeln *vt*, éinhüllen *vt* (*чым-н* in *A*); umhüllen *vt* (mit *D*)
апавядáльнік *м* Erzähler *m* -s, -
апавядáльны erzählend; ~ ***сказ*** *грам* Áussagesatz *m* -es, -sätze
апавяда́нне *н* **1.** (*дзеянне*) Erzählen *n* -s; **2.** (*твор*) Erzählung *f*-, -en, Geschíchte *f*-, -n
апавяда́ць erzählen *vt* (*пра што-н* von *D*, über *A*)
апавясці́ць, апавяшча́ць benáchrichtigen *vt*, in Kénntnis sétzen (*каго-н A*); verkünden, bekánnt geben*, mítteilen (*пра што-н A*)
апавяшчэ́нне *н* **1.** Benáchrichtigung *f*-, -en; Bekánntmachung *f*-, -en; Bekánntgabe *f*-, -n; **2.** *вайск* Wárnung *f*-, -en
апага́ніць, апага́ньваць *разм* besúdeln *vt*, durch den Schmutz zíehen*; entwéihen *vt*, schänden *vt* (*царкву, магілу і г. д*)
апагéй *м* **1.** *астр* Apogä|um *n* -s, -gäen, Érdferne *f*-; **2.** *перан* Glánzpunkt *m* -(e)s, -e, Höhepunkt *m*
апа́д *м* Fállobst *n* -es
апада́ць 1. *гл* апасці; **2.** (*спускацца ўніз, даваць нахіл убок*) sich néigen
апа́дк|і *мн* **1.** *метэар* (*атмасферныя*) Níederschläge *pl*; ***мо́цныя ~і*** stárke [héftige] Níederschläge; ***невялі́кія ~і*** geringe Níederschläge; ***без ~аў*** níederschlagsfrei; **2.** *гл* апад
апа́дкавы *метэар* Níederschlags-
апазіцы́йны *паліт* oppositionéll, Oppositións-
апазі́цыя *ж паліт* Oppositión *f*-, -en
апазіцыянéр *м паліт* Oppositionélle (*sub*) *m* -n, -n
апазнава́льны Erkénnungs-; ~ ***знак*** *вайск* Erkénnungszeichen *n* -s, -
апазнава́ць erkénnen* *vt*; *юрыд* identifizíeren *vt*
апазна́ны erkánnt; *юрыд* identifizíert

апазна́ць *гл* апазнаваць
апаі́ць 1. (*напаіць празмерна*) zu stark tränken, zu viel zu trínken geben*; **2.** (*чым-н хмяльным*) betrúnken máchen; **3.** (*атруціць*) vergíften *vt*
апака́ліпсіс *м рэл* Apokalýpse *f* -
апакаліпты́чны apokalýptisch
апа́л *м мін* Opál *m* -s, -e
апа́л|а *ж* Úngnade *f* -; Acht *f* -; ***у ~е*** in Úngnade; ***трапі́ць у ~у*** in Úngnade fállen*; ***падвярга́ць ~е*** in Acht und Bann tun*, ächten *vt*
апалаге́т *м* Apologét *m* -en, -en (*высок*), Vertéidiger *m* -s, -, Verféchter *m* -s, -
апалагетычны apologétisch
апаласка́ць áusspülen *vt*; (áb)wáschen* *vt*; ábspülen *vt*;
апаласну́ты ábgespült; (áb)gewáschen
апаласну́ць *гл* апаласкаць
апа́лены verbránnt
апалі́тычны únpolitisch, ápolitisch (*высок*)
апалі́ць *гл* абпаліць
апало́нік *м* **1.** *разм* Schöpflöffel *m* -s, -; **2.** *заал* Káulquappe *f* -, -n
апа́лубка *ж тэх, буд* Verschálen *n* -s; Verschálung *f* -
апалчы́цца (*супраць каго-н, чаго-н*) lószíehen* *vi* (*s*), áufgebracht sein (gegen *A*)
апалчэ́нец *м гіст* Ländwehrmann *m* -s, -männer *i* -leute, Ländsturmmann *m*
апалчэ́нне *н гіст* Ländsturm *m* -(e)s, Ländwehr *f* -; ***наро́днае ~*** Vólksaufgebot *n* -(e)s
апалчэ́нскі Ländwehr-, Ländsturm-
апа́лы 1. ábgefallen; **2.** (*схуднелы*) ábgemagert
апа́льванне *н* **1.** Behéizung *f* -; **2.** *тэх* Glühen *n* -s; Brénnen *n* -s (*цэглы і пад.*); Rösten *n* -s, Kalzinieren *n* -s (*метала*)
апа́льваць (*хату*) (be)héizen *vt*
апа́льны in Úngnade gefállen; *у знач наз м* Geächtete (*sub*) *m* -n, -n
апа́льшчык *м* Héizer *m* -s, -
апа́мятацца 1. (*апрытомнець*) zu sich kómmen*, zur Besínnung kómmen*; sich fássen (*супакоіцца*); **2.** (*адумацца*) zur Vernúnft kómmen*
апанава́|ць 1. (*ахапіць, авалодаць*) ergréifen* *vt*, überkómmen* *vt*, befállen* *vt*, pácken *vt*, (er)fássen *vt*; ***страх ~ў мяне́*** Angst befíel [páckte, überkám] mich; **2.** (*напасці, акружыць зусім бакоў*) überfállen* *vt*; hérfallen* *vi* (*s*) (*на каго-н, што-н* über *A*)
апане́нт *м* Opponént *m* -en, -en; ***~ пры абаро́не дысерта́цыі*** Prüfer beim mündlichen Exámen zur Promotíonsschrift [Dóktorarbeit]
апані́раваць opponíeren *vt*; als Opponént áuftreten*
апано́ўваць *гл* апанаваць
апанта́насць *ж* Beséssenheit *f* -, Sucht *f* -
апанта́ны 1. beséssen (*чым-н* von *D*); süchtig; **2.** *у знач наз* Beséssene (*sub*) *m* -n, -n
апаплексі́чны *мед* apopléktisch; ***~ ўдар*** Gehírnschlag *m* -(e)s, -schläge, Schlag *m*
апаражне́нне *н* Léerung *f* -
апаражні́цца sich léeren, leer wérden
апаражні́ць leer máchen; (ent)|léeren *vt*
апа́раны *разм* verbrüht
апарасі́цца férkeln *vi*, Férkel wérfen*
змацаванне *н* **1.** Beféstigung *f*-; **2.** (*подпісам*) Gégenzeichnung *f*-; Besíegelung *f*- (*пячаткай*); **3.** *тэх* Verbíndung *f*-, -en

змацавáць, змацóўваць 1. verbínden* *vt*, befestigen *vt*; *тэх* verschráuben *vt* (*балтамі*); **2.** (*засведчыць*): ***~ падпíсам*** durch Únterschrift bekräftigen; ***~ пячáткай*** besíegeln *vt*, mit éinem Síegel [Stémpel] bekräftigen

змеепадóбны schlángenförmig, schlángenähnlich, schlángenartig; geschlängelt (*звілісты*)

змей *м* **1.** *міфал* Dráche *m* -ns, -n; **2.** (*паветраны*) (Papíer)drachen *m* -s, -; ***запускáць змéя*** éinen Drachen stéigen lássen*

змéлены gemáhlen

змéна *ж* **1.** (*дзеянне*) Wéchsel *m* -s; Ábfolge *f*- (*падзей і г. д*); Áblösung *f*-, -en (*дзяжурных і г. д*); Ersátz *m* -es (*замена*); ***~ вартавы́х*** Wáchablösung *f*; ***~ рабóчых*** Schíchtwechsel *m*; **2.** (*на заводзе і г. д*) Schicht *f*-, -en; ***начнáя ~*** Náchtschicht *f*; ***ранíшняя ~*** Frühschicht *f*; **3.** *перан* (*маладое пакаленне*) Náchwuchs *m* -(e)s; die júnge Generatión; **4.:** ***~ бялíзны*** Wäschegarnitur *f*-, -en, Wäsche zum Wéchseln

змéнлівасць *ж* Únbeständigkeit *f*-, Veränderlichkeit *f*-

змéнлівы únbeständig, schwánkend; labíl, veränderlich

змéнн|ы 1. *тэх* ersétzbar, áustauschbar, áuswechselbar; **2.** (*што адбываецца па зменах*) Schicht-, in Schíchten; ***~ая выпрацóўка*** Schíchtleistung *f*-, -en

змéншыць 1. verríngern *vt*, vermíndern *vt*; **2.** (*па сіле, ступені*) verkléinern *vt*; herábsetzen *vt*, (er)mäßigen *vt* (*цэны*)

змéншыва *н матэм* Minu|énd *m* -en, -en

змéншыцца sich verríngern, kléiner wérden

змéраць (áb)méssen* *vt*, áusmessen* *vt*; ◊ ***~ каго-н пóзіркам*** *j-n* mit éinem Blick méssen*, taxíeren

змéрзнуць 1. (*моцна азябнуць, акалець*) fríeren* *vi* (*s*), dúrchfrieren* *vi* (*s*); **2.** (*сапсавацца ад холаду*) erfríeren* *vi* (*s*)

змест *м* **1.** (*кнігі і г. д*) Ínhalt *m* -(e)s, -e; **2.** (*сэнс чаго-н*) Sinn *m* -(e)s, -e

змéсці 1. wégfegen *аддз vt*, ábfegen *vt*; ***~ пыл з чаго-н*** *etw.* ábstauben; **2.** (*у гурбу*) zusámmenfegen *etw.*; ◊ ***~ з твáру зямлí*** dem Érdboden gleich máchen, vom Érdboden tílgen

змéсціва *н* Ínhalt *m* -(e)s

змéшаны *гл* змяшаны

змéшвальнік *м тэх* Mischer *m* -s, -; Míschapparat *m* -(e)s, -e

змéшванне *н* **1.** Verméngung *n* -s, Vermíschung *f*-, **2.** (*блытаніца*) Verwírrung *f*-, Wírrwarr *m* -s; ***~ моў*** Spráchverwírrung *f*-, ***~ паняццяў*** Begríffsverwirrung *f*-

змéшваць 1. (*для атрымання сумесі*) (ver)míschen *vt*, zusámmenmischen *vt*, **2.** verwírren *vt*; in Únordung bríngen*; **3.** (*блытаць*) verwéchseln *vt*

змеявік *м* **1.** *тэх* Róhrschlange *f*-, -n; **2.** *мін* Serpentín *m* -s, -e, Serpentínstein *m* -(e)s, -e

змеянё *н*, **змеяня** *н разм* júnge Schlánge

змізарнéць 1. (*схуднець*) ábmagern *vi* (*s*); **2.** *перан* (*страціць веліч*) an Größe [Bedéutung] verlíeren*

змікíціць *разм* begréifen* *vt*, kapíeren *vt*; ◊ ***~, у чым спрáва*** den Bráten ríechen*, Lúnte ríechen*

змíлавацца *разм гл* злітавацца

змірыцца sich unterwérfen*, klein béigeben*; sich schícken, sich ergében* (*з чым-н* in *A*)

змóв|а *ж* Verschwörung *f*-, -en, Komplótt *n* -(e)s, -e; ***таéмная ~а*** gehéime Ábmachung; ***у ~е з кім-н*** im Éinvernehmen mit *j-m*

змóвіны *мн* Verlobung *f*-, -en

змóвіцца Ábmachung tréffen*, ábmachen *vt*, zu éinem Éinverständnis kómmen*, sich éinigen

змóг|а *ж разм* **1.:** ***што ёсць ~і*** aus Léibeskräften; **2.** (*стомленасць*) Müdigkeit *f*-, Erschöpfung *f*-, Entkräftung *f*-; ***да ~і*** bis zur Erschöpfung

змóклы nass, durchnässt

змóк|нуць durchnässt wérden*; nass wérden; ***я зусíм ~*** ich bin durch und durch nass (geworden)

змóлаты gemáhlen

змóра *ж*, **змóранасць** *ж* Müdigkeit *f*-; Erschöpfung *f*-, Ermáttung *f*-, Ermüdung *f*

змóраны ermüdet, ermáttet, erschöpft, ábgespannt

змóрваць *гл* змарыць

змóршчаны rúnzelig, verrúnzelt; zusámmengeschrumpft; vertrócknet (*высахлы*)

змóршчына *ж* Fálte *f*-, -n, Rúnzel *f*-, -n; Fúrche *f*-, -n

змóтваць *гл* змотаць

змóўк|нуць, змóўчаць (still)schwéigen* *vt*, nicht mehr spréchen*; nichts mehr ságen, verhállen *vi* (*s*) (*пра гукі*); ***размóва ~ла*** das Gespräch brach ab; ***пéсня ~ла*** das Lied verhállte

змóўніцкі, змóўшчыцкі verschwörerisch, Verschwörer-; gehéimnisvoll (*таямнічы*)

змóўшчык *м* Verschwörer *m* -s, -

змрок *м* **1.** Dúnkel *n* -s; Hálbdunkel *n* -s (*прыцемак*); Dämmerung *f*- (*перад заходам ці ўсходам сонца*); **2.** *перан* (*атмасфера безнадзейнасці*) Dúnkel *n* -s, Fínsternis *f*-, -se

змрóкам *прысл* in der Dämmerung, im Hálbdunkel

змрóчнасць *ж* Fínsternis *f*-, -se; Dúnkel *n* -s, -, Dúnkelheit *f*-, -en; *перан* Düsterkeit *f*-; Míssmut *m* -(e)s, Schwérmut *f*-

змрóчн|ы 1. (*цёмны*) dúnkel; ***~ае памяшкáнне*** ein dúnkler Raum; ***~ае надвóр'е*** trübes Wétter; **2.** (*пануры*) fínster; **3.** *перан* (*цяжкі, беспрасветны*) hóffnungslos

змýльваць, змýляць sich (*D*) *etw.* wund réiben*

змýсіць *гл* змушаць

змуціць trüben *vt*

змýчаны ásgemergelt; erschöpft, ábgezehrt; ábgearbeitet (*змораны*); ***у ягó ~ вы́гляд*** er sieht ábgezehrt aus

змýчыцца sich ábquälen; sich ábrackern (*разм*); *гл* мучыцца

змýшаны gezwúngen, erzwúngen

змушáць zwíngen* *vt*, ábzwingen* *vt*, erzwíngen* *vt*, ábnötigen *vt*

змы|ва́цца 1. (*мыццём*) ábgehen* *vi* (*s*), heráusgehen* *vi* (*s*); ***пля́ма ~лася*** der Fleck ist heráusgegangen; **2.** *пера́н разм* (*уцякаць*) verdúften *vi* (*s*), sich verdrücken

змыва́ць 1. ábwaschen* *vt*, ábspülen *vt*; ~ ***га́ньбу*** die Schánde tílgen; **2.** (*зносіць вадой*) fórtschwemmen *vt*, wégspülen *vt*; ◊ ***як вадо́й змы́ла*** wie wéggeblasen

змыка́цца 1. sich schlíeßen*; *вайск* sich zusámmenschließen*; **2.** (*пра вочы*) zúfallen *vi* (*s*)

змы́лак *м* Séifenrest *m* -(e)s, -e, Séifenstummel *m* -s, -

змы́цца *гл* змывацца

змыць *гл* змываць

змы́чка *ж* **1.** *тэх* Zusámmenfügung *f* -, -en, Zusámmenfügen *n* -s, **2.** *пера́н* Bündnis *n* -ses, -se, Zusámmenschluss *m* -es, -schlüsse

змяі́н|ы 1. Schlángen-; ***~ы яд*** Schlángengift *n* -(e)s, -e; ***~ае джа́ла*** gespáltene Zúnge der Schlánge; ***~ы ўкус*** Schlángenbiss *m* -es, -e; ***~ае ко́дла*** Schlángenbrut *f* -, en; **2.** *пера́н* (*вераломны*) (héim)tückisch, hämisch

змя́ркчальны míldernd, líndernd

змя́ркчаны 1. (*падатлівы*) mild, weich, sanft; **2.** *фан* (*пра гукімовы*) palatál

змякча́цца, змякчы|цца 1. weich wérden; **2.** *пера́н* sich míldern, náchlassen* *vi*; ábflauen *vi*; ***маро́з ~ўся*** der Frost ließ nach; **3.** (*пра каго-н*) sich erwéichen lássen*; náchgeben* *vi*

змякча́ць, змякчы́ць 1. weich máchen, erwéichen *vt*; enthärten *vt* (*ваду*); **2.** *пера́н* míldern *vt*, líndern *vt*; mäßigen *vt* (*паменшыць*); ábschwächen *vt*, dämpfen *vt* (*удар*); ~ ***гнеў*** den Zorn mäßigen; ~ ***прысу́д*** ein Úrteil míldern; **3.** (*каго-н*) erwéichen *vt*, wéicher [mílder] stímmen; **4.** *лінгв* palatalisíeren *vt*

змякчо́ць *гл* змякчацца

змякчэ́нне *н* **1.** Erwéichung *f* -; Enthärtung *f* - (*вады*); **2.** Mílderung *f* -; Línderung *f* -; Mäßigung *f* -, -en; Ábschwächung *f* -, Dämpfung *f* -, -en (*удару*); ~ ***пакара́ння*** die Herábsetzung [Mílderung] der Stráfe; **3.** *фан* (*гука*) Palatalisíerung *f* -

змяне́нн|е *н* Änderung *f* -, -en, Veränderung *f* -, -en, Wéchsel *m* -s; Wándlung *f* -, -en; Wándel *m* -s (*перамена*); ***~е значэ́ння*** *лінгв* Bedéutungswandel *m*; ***~е надво́р'я*** Wétterveränderung *f* -; Wétterumschwung *m* -(e)s, Wétterumschlag *m* -(e)s (*раптоўнае*); ***~е палі́тыкі*** Politíkwechsel; ***~е фармулёўкі*** die Ábänderung éiner Formulíerung; ***унёсці ~і*** Änderungen vórnehmen*

змяні́|цца 1. sich verändern; ***абста́віны ~ліся*** die Úmstände háben sich verändert; **2.** (*мяняцца, чаргавацца*); ábgelöst wérden; ***караву́л ~ўся*** die Pósten wurden ábgelöst; ◊ ***~цца з тва́ру*** die Fárbe wéchseln

змяні́ць, змяня́ць 1. (*перамяніць*) verändern *vt*, ábändern *vt*; **2.** (*заступіць на чыё-н месца*) áblösen *vt*; **3.** (*зняць з пасады*) (áus)wechseln *vt*, ersétzen *vt*; **4.** (*з'явіцца на месцы каго-н, чаго-н*) áuftauchen *vi* (*s*), áuftreten* *vi* (*s*), áufkommen* *vi* (*s*); vertréten* *vt* (*каго-н*); **5.** (*перастаць карыстацца*) wéchseln *vt*

змянша́ць *гл* зменшыць

змянша́цца sich verríngern, kléiner wérden; zusámmenschrumpfen *vi* (*s*) (*скарачэнне, паменшыцца*); ábnehmen* *vi*; zurückgehen* *vi* (*s*) (*паслабець, зрабіцца меншым*)

змяншэ́нне *н* Verkléinerung *f* -, -en, Verríngerung *f* -, -en, Vermínderung *f* -, -en; Ábnahme *f* - (*спад*); Rückgang *m* -(e)s (*скарачэнне*); Ermäßigung *f* - (*цаны і г. д*)

змяня́льны *гл* зменны **1**

змярза́цца *гл* змерзнуць

змярка́|цца *безас разм*: ***~ецца*** es dämmert, es wird dúnkel, die Dämmerung bricht heréin; *безас*: ***на дварэ́ ~лася*** dráußen dämmerte es

змярка́нне *н разм* Dämmerung *f* -

змярцве́лы erstárrt; réglos; ábgestorben; léblos (*нежывы*)

змярцве́нне *н* Ábsterben *n* -s

змярцве́ць 1. (*страціць чуллівасць*) ábsterben* *vi* (*s*); **2.** (*здранцвець*) erstárren *vi* (*s*); **3.** (*апусцець*) veröden *vi* (*s*)

змясто́ўна *прысл*; **змясто́ўны** ínhaltsreich, geháltvoll; réichhaltig; áufschlussreich

змясто́ўнасць *ж* Ínhaltsreichtum *m* -s, Réichhaltigkeit *f* -

змясці́цца 1. (*умясціцца*) Platz fínden* [háben]; hinéingehen* *vi* (*s*); **2.** *разм* (*пасяліцца*) sich éinquartieren, sich níederlassen*, éine Wóhnung finden*

змясці́ць 1. (*умясціць*) fássen *vt*, áufnehmen* *vt*; **2.** (*пасяліць*) únterbringen* *vt*, éinquartieren *vt*; **3.** (*надрукаваць*) veröffentlichen *vt*, publizíeren *vt*; **4.** *разм* (*звольніць*) entlássen* *vt*

змята́ць *гл* змесці

змяць 1. zerknittern *vt*, zerknüllen *vt*; **2.** *тэх* quétschen *vt*, zusámmenpressen *vt*; **3.** *вайск* erdrücken *vt*, zermálmen *vt*; ~ ***во́рага*** den Feind überrénnen*

змяша́льнік *м тэх* Míscher *m* -s, -

змяша́ны vermíscht; gemíscht; ~ ***лік*** *матэм* gemíschte Zahl; ~ ***лес*** *геагр* Míschwald *m* -(e)s, -wälder

змяша́цца 1. sich vermíschen, sich verméngen; ~ ***з нато́ўпам*** in der Ménge verschwínden* [úntertauchen]; **2.** (*прыйсці ў беспарадак*) in Únordnung geráten*; sich verwíckeln (*пераблытацца*); **3.** *разм* (*збянтэжыцца*) in Verwírrung [Verlégenheit] geráten*, verlégen wérden

змяша́ць *гл* змешваць

змяшча́льнасць *ж* Ráuminhalt *m* -(e)s, -e, Fássungsvermögen *n* -s; Geräumigkeit *f* -, Größe *f* -

змяшча́льны geräumig, groß

змяшча́цца 1. (*знаходзіцца*) sich befínden*; **2.** (*уваходзіць, знаходзіць месца*) Platz fínden* [haben], hinéingehen* *vi* (*s*); *гл* змясціцца; **3.** (*утрымлівацца*) enthálten sein

змяшча́ць 1. *гл* змясціць; **2.** (*утрымліваць, заключаць у сабе*) enthálten* *vt*

змяшчэ́нне *н* Únterbringung *f* -; ~ ***капіта́лу*** *эк* Kapitálanlage *f* -, Kapitálinvestierung [-vɛs-] *f* -

змя|я́ *ж* Schlánge *f* -, -n; ***ядавіта́я ~я́*** Giftschlange *f* -, ***грымучая ~я́*** Klápperschlange *f*; ***слі́зкі*** [***выкру́тлівы***] ***як ~я́*** lístig wie éine Schlánge; ◊ ***сагрэ́ць ~ю на грудзя́х*** éine Schlánge am Búsen nähren; ***~я́ ~ю не кусáе*** ≅ éine Krähe hackt der ánderen kein Áuge aus

зна́вец *м разм гл* знаўца

знадво́рку 1. (*звонку*) von áußen (her); **2.** (*з вуліцы*) von dráußen (her)

знадво́рны (*вонкавы, знешні*) Áußen-; äußer; ~ ***вы́гляд*** die Áußenseite, das Äußere

знаёміцца 1. sich (einánder) vórstellen, sich (miteinánder) bekánnt máchen; (*з кім-н*) *j-n* kénnen lérnen; **2.** (*з чым-н*) sich bekánnt [vertráut] máchen (mit *D*)

знаёміць 1. (*каго-н з кім-н*) bekánnt máchen (mit *D*); vórstellen *vt* (*з кім-н D*); **2.** (*з чым-н*) bekánnt [vertráut] máchen (mit *D*); éinführen *vt* (in *A*)

знаёмства *н* **1.** Bekánntschaft *f* -, -en (*з кім-н* mit *D*); ***завяза́ць ~ j-s*** Bekánntschaft máchen, éine Bekánntschaft ánknüpfen; **2.** (*кола знаёмых*) Bekánntenkreis *m* -es, -e; **3.** (*з чым-н*) Kénntnis *f* -, -se (*G*), Vertráutheit *f* - (mit *D*)

знаёмы 1. bekánnt, vertráut; **2.** *у знач наз м* Bekánnte (*sub*) *m* -n, -n; ***мой да́ўні ~*** ein álter Bekánnter von mir; ***выпадко́вы ~*** ein zúfälliger Bekánnter

зна́йда *м*, **знайдзён** *м*, **зна́йдыш** *м* Fíndling *m* -s, -e

зна́йка *м разм іран* Bésserwisser *m* -s, -

знайсці́ 1. (*адшукаць*) fínden* *vt*, áusfindig máchen; **2.** (*убачыць, заўважыць*) vórfinden* *vt*, (án)tréffen* *vt*

знай|сці́ся 1. sich fínden*; ***кні́га напэ́ўна знойдзецца*** das Buch wird sich schon fínden; **2.** *пера́н* (*не разгубіцца*) sich zurécht-finden* *аддз*; ***ён тут жа ~шо́ўся*** (*што сказаць, зрабіць і г. д*) er fand sich sofórt zurécht, ***ён не ~шо́ўся, што мне адказа́ць*** er blieb mir die Ántwort schúldig

знак *м* **1.** (*пазнака*) Zéichen *n* -s, -; **2.** (*след, шнар*) Spur *f* -, -en; Zéichen *n* -s, -; ***грашо́вы ~ фін*** Bánknote *f* -, -n; ***тава́рны ~ камерц*** Wárenzeichen *n* -s, -; ***фі́рменны*** [***фірмо́вы***] ~ Fírmenzeichen *n*, Fírmenmarke *f* -, -n; ***распазнава́льны ~*** Erkénnungszeichen *n*; ***пада́ць ~*** éinen Wink gében*

знакамі́тасць *ж* Berühmtheit *f*-, -en
знакамі́ты berühmt, bekánnt
знамяна́льны 1. (*важны*) wíchtig, bedéutend, dénkwürdig; bedéutungsvoll (*шматзначны*); **2.** *лінгв* áutosemantisch; ***~я сло́вы*** áutosemantische Wörter
зна́ны (*знакамі́ты ў якой-н справе*) ángesehen, námhaft
знаро́к *прысл* ábsichtlich, mit Ábsicht; vórsätzlich; ◊ ***як ~*** als ob sich álles gégen mich [uns, ihn *i г. д*] verschwóren hätte
знасі́цца 1. sich ábnutzen, ábgenutzt sein; verschléißen* *vi* (*s*), sich verschléißen*; ábgetragen sein, schäbig sein [werden] (*пра вопратку*); **2.** *разм* (*састарыцца*) alt wérden [áussehen*]
знасі́ць I (*абутак, адзенне*) ábtragen* *vt*, ábnutzen *vt*
знасі́ць II (*у адно месца*) hínbringen* *vt*, híntragen* *vt*; fórttragen* *vt*, fórtbringen* *vt*
зна́тны 1. (*высакародны, шляхецкі*) ád(e)lig; **2.** (*выдатны паводле сваёй дзейнасці*) ángesehen, námhaft
зна́ўц|а *м* Kénner *m* -s, -; Sáchverständige (*sub*) *m*, *f* -n, -n; Fáchmann *m* -(e)s, -männer *i* -leute; ***~ сваёй спра́вы*** Sáchkenner *m* -s, -; Kénner séines Fachs; ***по́зіркам ~ы*** mit Kénnerblick
знаха́р *м* Quácksalber *m* -s, -, Kúrpfuscher *m* -s, -, Wúnderdoktor *m* -s, -en
знаха́рка *ж* Kúrpfuscherin *f*-, -nen; Gesúndbeterin *f*-, -nen
знаха́рства *н* Kurpfuscheréi *f*-, Quacksalberéi *f*-
знаха́рыць quácksalbern *неаадз vi*
знахо́д|ка *ж* **1.** (*дзеянне*) Fínden *n* -s; Áuffinden *n* -s; (*знойдзеная рэч*) Fund *m* -(e)s, -e; Fúndsache *f*-, -n; ***бюро́ ~ак*** Fúndbüro *n* -s, -s, Fúndstelle *f*-, -n; ***гэ́та для мяне́ сапра́ўдная ~ка*** das ist ein glücklicher Fund für mich [ein gefúndenes Fréssen – *разм*]
знахо́джанне *н* **1.** (*дзеянне*) Áuffinden *n* -s; Fínden *n* -s; **2.** (*стан*) Áufenthalt *m* -(e)s, -e
знахо́дзіцца 1. (*знайсціся*) sich fínden*; gefúnden wérden; **2.** (*змяшчацца*) sich befínden*; úntergebracht sein
знахо́дзіць *гл* знайсці
знахо́длівасць *ж* Fíndigkeit *f*-; Schlágfertigkeit *f*- (*у размове*)
знахо́длівы fíndig; wítzig, géistreich; schlágfertig (*разм*)
зна́цца 1. (*з кім-н*) *разм* mit *j-m* verkéhren; ***я з табо́ю не хачу́*** ~ ich will dich nicht kénnen; **2.** (*быць знаўцам чаго-н*) Kénner sein; sich áuskennen* (*у чым-н* in *D*)
знаць I *разм* **1.** (*ведаць*) wíssen* *vt*; kénnen* *vt* (*каго-н, мець веды*); ***~ на па́мяць*** áuswendig kénnen*; ***яго́ ўсе зна́юць*** ihn kénnen álle; ***~ каго-н у твар*** wíssen* wie jémand áussieht, *j-n* vom Séhen kénnen*; **2.** (*умець*) kénnen* *vt*, können* *vt*, verstéhen* *vt*; ***ён зна́е сваю́ спра́ву*** er verstéht séine Sáche; ◊ ***даць аб сабе́ ~*** von sich hören lássen*; ***~ не зна́ю*** *разм* mein Náme ist Háse, ich weiß von nichts; ***не ~ ме́ры*** kein Maß und Ziel [kéine Grénzen, kéine Schránken] kénnen*; ***~ ме́ру*** Maß hálten*; ***зна́ем мы ва́шага бра́та!*** ich kénne méine Páppenheimer!
знаць *ж* **II** *гіст* Ádel *m* -s, Aristokratíe *f*-; ***фіна́нсавая ~*** Hóchfinanz *f*-
зна́чна *прысл;* **зна́чн|ы 1.** bedéutend, ánsehnlich, beträchtlich; ***~ае паляпшэ́нне*** beträchtliche [bedéutende] Verbésserung; ***у ~ы́ ме́ры*** [***ступе́ні***] in bedéutendem Máße; **2.** *разм* (*бачны, прыкметны*) bedéutend, bemérkbar, bemérkenswert
зна́чнасць *ж* **1.** (*вялікі памер*) Beträchtlichkeit *f*-; Ánsehnlichkeit *f*-; **2.** (*значэнне*) Bedéutung *f*-; Wíchtigkeit *f*-
значо́к *м* **1.** (*нагрудны*) Ábzeichen *n* -s, -; Plakétte *f*-, -n; Ánstecknadel *f*-, -n; **2.** (*пазнака*) Zéichen *n* -s, -; Kénnzeichen *n* -s, -; Mérkzeichen *n* -s, -; ***паставі́ць ~ на поля́х*** ein Zéichen [Häkchen] am Rand máchen
зна́чыцца I éingetragen sein; enthálten sein, éingeschlossen sein (*утрымлівацца*); ***~ ў спі́се*** auf der Líste stéhen*
зна́чыцца II, зна́чыць I *пабочн. слова разм* álso, dahér; déshalb, fólglich (*такім чынам*)
зна́чыць II 1. (*абазначаць*) bedéuten *vt*, Bedéutung háben; ***што гэ́та ~?*** was bedéutet [heißt] das?, was hat das zu bedéuten?, was soll das héißen; ***гэ́та нічо́га не ~*** das hat nichts zu ságen, das tut nichts zur Sáche; ***гэ́та што-н ды ~!*** das will schon (et)was héißen!, das ist schon (et)was!; **2.** (*мець значэнне, сілу, вагу*) wert sein, bedéuten *vt*, Éinfluss háben
значэ́нне *н* **1.** (*сэнс, змест*) Bedéutung *f*-, -en, Sinn *m* -(e)s; **2.** (*важнасць*) Bedéutung *f*-, -en, Bedéutsamkeit *f*-; Wíchtigkeit *f*; Wert *m* -(e)s, -e; ***сусве́тнае ~*** Wéltbedeutung *f*; ***набы́ць ~*** an Bedéutung gewínnen*; ***гэ́та ма́е вялі́кае ~*** das ist von gróßer Bedéutung
зневажа́льнасць *ж* Geríngschätzigkeit *f*-, Verächtlichkeit *f*-; Níchtbeachtung *f*-
зневажа́льнік *м* Beléidiger *m* -s, -
зневажа́льны respéktlos, verächtlich, geríngschätzig, beléidigend, kränkend
зневажа́нне *н* Beléidigung *f*-, -en, Kränkung *f*-, -en, Verlétzung *f*-, -en; ***~ дзе́яннем*** *юрыд* tätliche Beléidigung, Reálinjuri|en *f*-, -n; ***~ сло́вам*** *юрыд* Beléidigung mit Wórten, Verbálinjuri|e [vɛr-] *f*
зневажа́ць beléidigen *vt*, kränken *vt*, erníedrigen *vt*, geríngschätzig behándeln, herábwürdigen *vt*
знемага́цца, знемагчы́ся verschmáchten *vi* (*s*), vergéhen* *vi* (*s*) (*ад чаго-н* vor *D*); von Kräften kómmen*; ***~ ад сто́мленасці*** vor Müdigkeit úmfallen*; ***~ пад цяжа́рам*** *чаго-н* éiner Last erlíegen*
знемага́ць, знемагчы́ ermüden *vi* (*s*) (*стаміцца*), erschláffen *vi* (*s*); verschmáchten *vi* (*s*), vergéhen* *vi* (*s*) (*ад голаду і пад.*)
знемаж|э́нн|е *н разм* Müdigkeit *f*-, Erschöpfung *f*-, Entkräftung *f*-; ***да ~я*** bis zur Erschöpfung, bis zum Úmfallen; ***гаварыць да ~я*** sich héiser réden; sich den Mund fússelig [fránsig] réden (*разм*)
зненави́дзець hássen *vt*; zu hássen begínnen*; Hass gégen *j-n* hégen
знепрыто́мнець bewússtlos wérden, das Bewússtsein verlíeren*
знерваваны nervös [-ˊvø:s]; níedergeschlagen, verstímmt, míssgestimmt, míssmutig
знерваваца nervös [-ˊvø:s] wérden; die Nérven [-fən] verlíeren*; ***яна́ зусі́м знервавалася*** sie ist mit den Nérven völlig am Énde; sie ist völlig entnérvt
знерухо́м|е|ць *разм* erstárren *vi* (*s*); baff sein, bestürzt sein, perplex sein
знеслаўле́нне *н* Entéhrung *f*-; Schmähung *f*-, -en, Míssbiligung *f*-, -en
зне́сці 1. (*у адно месца*) zusámmentragen* *vt*, zusámmenbringen* *vt*; **2.** (*уніз*) hinúntertragen* *vt*, hinúnterbringen* *vt*; **3.** (*перамясціць, знішчыць – вадой, ветрам*) wégreißen* *vt*; fórtschwemmen *vt*; wégwehen *vt* (*ветрам*); **4.** (*разбурыць*) ábreißen* *vt*, níederreißen* *vt*, ábbrechen* *vt*, ábtragen* *vt*; **5.** (*забраць, украсці*) wégtragen* *vt*, fórtschaffen *vt*, fórtbringen* *vt*; **6.** *перан разм* (*сцярпець, перанесці*) erdúlden *vt*, ertrágen* *vt*; **7.** (*пра птушку*); ***~ яйцо́*** ein Ei légen
зне́шнасць *ж кніжн* Äußere (*sub*) *n* -n, -n
зне́шне *прысл разм* äußerlich; dem Äußeren nach (*паводле знешняга выгляду*)
знешнегандлёвы Áußenhandels-
знешнепалі́тычны áußenpolitisch
знешнеэканамі́чны áußenwirtschaftlich, Áußenwirtschafts-
зне́шні 1. (*звонку*) äußerer, äußerlich; Áußen-; ***~ вы́гляд*** die Áußenseite; das Äußere (*sub*) (*чалавека*); **2.** (*які не закранае сутнасці*) äußerlich, óberflächlich; *гл* вонкавы; **3.** (*замежны*) áuswärtig; Áußen-; ***~ га́ндаль*** Áußenhandel *m* -s
зніжа́цца 1. sich sénken; sínken* *vi* (*s*), fállen* *vi* (*s*), zurückgehen* *vi* (*s*) (*пра цэны, тэмпературу, ваду і г. д*); sich vermíndern (*памяншацца*); **2.** *ав* herúntergehen* *vi* (*s*)
зніжа́ць sénken *vt*; herábsetzen *vt*, herábmindern *vt*; ermäßigen *vt* (*кошт*); kürzen *vt* (*паменшыць*); ábbauen *vt* (*цэны, пада-*

ткі і пад.); ~ ***заработную плату*** die Löhne ábbauen [sénken, drücken]; ~ ***тон*** die Stímme sénken, rúhiger spréchen*

зні́жка *ж камерц* Rabátt *m* -s, -e, Préisabschlag *m* -(e)s, -schläge

зніжэ́нне *н* **1.** Sénkung *f*-, -en; Sínken *n* -s; Herábsetzung *f*-, -en; Ermäßigung *f*-, -en (*падаткаў*); Kürzung *f*-, -en, Ábnahme *f*- (*памяншэнне*); ~ ***заработнай платы*** Lóhnabbau *m* -(e)s, Lóhnsenkung *f*-, Lóhnkürzung *f*-, Lóhndrücken *n* -s; ~ ***якасці*** Qualitätsminderung *f*-; ~ ***цэн*** Préissenkung *f*-, Préisherabsetzung *f*-, Préisreduzíerung *f*-, -en, Préisabbau *m* -(e)s; ~ ***ў пасадзе*** Versétzung in éine níedrigere Stéllung; **2.**: ***вясці самалёт на ~ ав*** das Flúgzeug zur Lándung sétzen

зні́зіцца *гл* зніжацца

зні́зіць *гл* зніжаць

зні́зу *прысл* **1.** (*з ніжняга боку*) von únten; **2.** (*унізе*) únten; **3.** (*у напрамку знізу ўверх*) von únten nach óben

зніка́ць 1. (*перастаць існаваць*) (ver)schwínden* *vi* (*s*); **2.** (*з поля зроку*) sich verlíeren*; aus dem Blíckfeld verschwínden*

знікне́нн|е *н* Verschwínden *n* -s; Schwúnd *m* -es; ***заява аб ~і*** (*каго-н*) *юрыд* Vermísstenanzeige *f*-, -n, Verschóllenenmeldung *f*-, -en

зні́к|нуць *гл* знікаць; ***ён ~ у натоўпе*** er táuchte im Gedränge únter

зні́ма́цца *гл* зняцца

зні́ма́ць *гл* зняць

зніта́ва́ны *тэх* verbólzt; beféstigt

зніта́ва́ць, зні́тоўваць 1. (*злучыць*) verbínden* *vt*, beféstigen *vt*, verschráuben *vt* (*балтамі*); **2.** *перан* (*з'яднаць*) éinigen *vt*, verbínden* *vt*; zusámmenschweißen *vt*

зні́чка *ж* Stérnschnuppe *f*-, -n

зніштожыць *разм гл* знішчаць, знішчыць

знішча́льнасць *ж* Zerstörung *f*-, Vernichtung *f*-, Zerschmétterung *f*-

знішча́льнік *м вайск* **1.** Vernichter *m* -s, -, Zerstörer *m* -s, -; **2.** *ав* (*самалёт*) Jágdflugzeug *n* -(e)s, -e; ***рэактыўны ~*** Düsenjäger *m* -s, -; ***~-бамбардзіро́ўшчык*** Jágdbomber -s, -; ***~-перахва́тчык*** [***перахо́пнік***] Ábfangjäger *m*

знішча́льны 1. (*смяротны*) vernichtend, níederschmetternd; zerstörerisch, verhéerend; ~ ***по́зірк*** vernichtender Blick; **2.** (*прызначаны да знішчэння*) Vertílgungs-

знішча́ць, зні́шчыць 1. vernichten *vt*, zunichte máchen; vertílgen *vt* (*насякомых і г. д*); ausmerzen *vt*; zerstören *vt* (*разбурыць*); **2.** (*ліквідаваць*) áufheben* *vt*, ábschaffen *vt*; beséitigen *vt*

знішчэ́нне *н* **1.** Vertílgung *f*-, Vernichtung *f*-; Zerstörung *f*-, -en (*разбурэнне*); **2.** (*ліквідаванне*) Áufhebung *f*-, Ábschaffung *f*-; Beséitigung *f*-

зно́йдзены gefúnden

знос I *м* (*разбор, разбурэнне*) Ábbruch *m* -(e)s, Ábbrüche, Ábriss *m* -es, -e, Ábtragen *n* -s; ***купіць на ~*** auf Ábbruch káufen

знос II *м тэх* Verschléiß *m* -es; Ábnutzung *f*-, Ábnützung *f*-, Verbráuchen *n* -s; ***маральны ~*** morálischer Verschléiß der Áusrüstung; ***натуральны ~*** natürlicher Verschléiß; ***фізічны ~*** phýsischer Verschléiß; ***эксплуатацыйны ~*** téchnischer Verschléiß; ◊ ***гэтым ботам нямá ~у*** diese Stíefel sind únverwüstlich

зносатрыва́ласць *ж тэх* Ábnutzungsbeständigkeit *f*-, Ábnutzungsfestigkeit *f*-

зно́сін|ы *мн* **1.** (*узаемныя адносіны*) Beziehungen *pl*, Úmgang *m* -(e)s; ***сро́дкі ~*** Verständigungsmittel *n* -s, -; ***~ы з людзьмі*** Úmgang mit Ménschen; ***падтры́мліваць ~ы з кім-н*** mit *j-m* verkéhren, mit *j-m* in Verbíndung stehen*; ***дыпламаты́чныя ~ы*** diplomátische Beziehungen

зно́сіць *гл* знесці

зно́ска *ж палігр* Fúßnote *f*-, -n

зно́сны léidlich, erträglich, passábel

зноў *прысл* **1.** (*яшчэ раз*) wíeder, wíederum, nóchmals, ernéut; **2.** (*таксама*) auch; áußerdem, noch dazú, ándererseits

зно́шанасць *ж спец* Ábnutzungsgrad *m* -(e)s, Grad der Ábnutzung [des Verschléißes], Ábnutzung *f*-, Verschléiß *m* -es

зно́шаны 1. ábgenutzt; verschlíssen (*пра механізм*); ábgetragen, schäbig, ábgeschabt (*пра вопратку*); dúrchgelaufen (*пра падэшву*); **2.** *разм* (*састарэлы*) frühzeitig geáltert, hínfällig

зно́шваць *гл* знасіць

зну́дзіцца *разм* sich séhnen, vor Séhnsucht vergéhen* (*па кім-н, чым-н*, nach *D*)

знутры́ *прысл* von ínnen

зню́хацца einánder beschnüffeln; einánder beschnúppern (*пра сабак*); *перан пагард* geméinsame (kaum akzeptáble) Interéssen fínden*

знябы́цца *разм* müde wérden, ermüden *vi* (*s*), ermátten *vi* (*s*); sich überánstrengen

знява́га *ж* Beléidigung *f*-, -en, Kränkung *f*-, -en, Verlétzung *f*-, -en; ~ ***дзе́яннем*** *юрыд* tätliche Beléidigung; ***асабі́стая ~*** persönliche Beléidigung [Kränkung]; ~ ***сло́вам*** Beléidigung mit Wórten

знява́жаны beléidigt, gekränkt, erníedrigt, gedémütigt

знява́жлівасць *ж* Geríngschätzigkeit *f*-, Verächtlichkeit *f*-, Respéktlosigkeit *f*-

знява́жлівы geríngschätzig, verächtlich; náchlässig (*нядбайны*)

знява́жыць *гл* зневажаць

зняве́рвацца, зняве́рыцца *разм* den Gláuben [das Vertráuen] verlíeren* (*у кім-н, чым-н* an *A*)

зняве́чанне *н* Verstümmeln *n* -s; Verstümmelung *f*-, -en, Verkrüppeln *n* -s; Verkrüpp(e)lung *f*-, -en; Verdérben *n* -s, Verdérb *m*, *n* -(e)s

зняве́чаны verstümmelt, verkrüppelt (*тс перан*)

зняве́чвацца, зняве́чыцца verstümmelt wérden, verkrüppelt wérden, zum Krüppel wérden, entstéllt wérden

зняве́чваць, зняве́чыць verstümmeln *vt*, verkrüppeln *vt*, zum Krüppel máchen, entstéllen *vt*

зняво́ленне *н* **1.** Verháftung *f*-, -en, Inhaftíerung *f*-, -en; **2.** (*знаходжанне ў турме*) Haft *f*-; Fréiheitsentzug *m* -(e)s, -züge; ***адзіно́чнае ~*** Éinzelhaft *f*; ***папярэ́дняе ~*** Untersúchungshaft *f*; ***адбыва́ць ~*** inhaftíert sein

зняво́лены 1. verháftet (*арыштаваны*); éingekerkert, éingesperrt (*пасаджаны ў турму*); **2.** *наз м* Häftling *m* -s, -e; Gefángene (*sub*) *m* -n, -n; *гл* вязень

зняво́ліць, зняво́льваць éinkerkern *vt*, ins Gefängnis wérfen*; éinschließen* *vt*, éinsperren *vt*; der Fréiheit beráuben

знямо́елы 1. (*нямы*) taub; sprách los; **2.** (*змярцвелы*) erstárrt, ábgestorben

знямо́|ець 1. stumm wérden; *перан* verstúmmen *vi* (*s*), die Spráche verlíeren*; **2.** (*змярцвець*) gefühllos wérden; erstárren *vi* (*s*), steif wérden (*ад холаду*); ***у мяне́ ~ла нага́*** mir ist der Fuß éingeschlafen; mein Fuß ist éingeschlafen

знямо́г|а *ж* Müdigkeit *f*-, Erschöpfung *f*-; Entkräftung *f*-; ***да ~і*** bis zur völligen Erschöpfung, bis zum Úmfallen

знямо́г|лы, знямо́жаны müde, erschöpft, entkräftet; kapútt, gróggy [-gi] (*разм*)

знямо́жанасц|ь *ж* Müdigkeit *f*-, Erschöpfung *f*-, Entkräftung *f*-; ***да ~і*** bis zur völligen Erschöpfung *f*-, bis zum Úmfallen; ***гаварыць да ~і*** sich héiser spréchen*; sich den Mund fússelig [fránsig] réden (*разм*)

знянáцку *прысл* plötzlich; únerwartet (*нечакана*), überráschend

знясі́ленн|е *н* Erschöpfung *f*-; ***вайна́ да ~я*** Krieg bis zur Erschöpfung des Gégners; Ermáttungskrieg *m* -(e)s, -e, Zermürbungskrieg *m*

знясі́лен|ы 1. erschöpft, ábgezehrt; áufgebraucht; **2.** (*зняможаны*) únterernährt, erschöpft, entkräftet, ábgezehrt; ***~ае дзіця́*** ein únterernährtes Kind

знясі́лець ermüden *vi* (*s*), ermátten *vi* (*s*), kráftlos wérden; vergéhen* *vi* (*s*) (*ад голаду і г. д* vor *D*)

знясíліцца, знясíльвацца áufgebraucht [verbráucht, áufgezehrt] sein; erschöpft sein

знясíліць, знясíльваць entkräften *vt*, erschöpfen *vt*; zéhren *vi* (an *D*); ~ ***сябé прáцай*** sich ábarbeiten

знясла́віць, знеслаўляць in Verrúf bríngen*, verléumden *vt*; durch den Schmutz zíehen*

знясла́ўлены entéhrt; mit Schánde bedéckt, in Mísskredit [in üblen Ruf, in bösen Léumund] gebrácht

зня́ты 1. (*звольнены*) séines Ámtes [Póstens] enthóben; ábgesetzt; ~ ***ад улáды*** entmáchtet; **2.** (*ураджай*) ábgeerntet; die ábgebrachte Érnte; **3.** *фота* áufgenommen; **4.** (*памяшканне*) gemíetet, vermíetet

зня́цца 1. *фота* sich áufnehmen* [fotografíeren; knípsen (*разм*)] lássen*; **2.:** ~ ***з мéсца*** sich auf den Weg máchen; ~ ***з я́кара*** den Ánker líchten [éinholen*]; ~ ***з мéлі*** flott wérden; ~ ***з улíку*** sich ábmelden

зня́цце *н* Ábnahme *f*-; ~ ***з працы*** Entlássung *f*-, -en; Ábsetzung *f*-, -en; ~ ***ўраджáю*** die Bérgung der Érnte; ~ ***пакарáння*** *юрыд* Stráferlass *m* -es, -lässe, Erláss der Disziplinárstrafe; ~ ***блакáды*** *вайск* Áufhebung éiner Blockáde; ~ ***з мéлі*** *марск* Flóttmachung *f*-; ~ ***судзíмасці*** *юрыд* Stráftilgung *f*-; ~ ***кóпіі*** Ánfertigung éiner Ábschrift; ~ ***забарóны*** Áufhebung des Verbótes; ~ ***з забеспячэ́ння*** Stréichung aus der Verpflégung; ~ ***з улíку*** Ábmeldung *f*-, -en

зняць 1. ábnehmen* *vt*; áusziehen* *vt* (*вопратку, абутак*); áblegen *vt*, áusziehen* *vt* (*паліто*); ábnehmen* *vt*, ábsetzen *vt* (*галаўны ўбор*); ábnehmen* *vt* (*гадзіннік, пярсцёнак, гальштук*); ~ ***тэлефóнную трýбку*** [***слýхаўку***] den Hörer ábnehmen*; **2.** (*вызваліць з пасады*) entlássen* *vt*; ábsetzen *vt* (*напр урад*); **3.** (*ураджай*) érnten *vt*, die Érnte éinbringen*; **4.** *фота* fotografíeren *vt*; knípsen *vt* (*разм*); éine Áufnahme máchen (*каго-н, што-н* von *D*); **5.** (*кватэру і г. д*) míeten *vt*; **6.** *карт* ábheben* *vt*; ~ ***аблóгу*** *вайск* die Belágerung áufheben*; ~ ***што-н з вытвóрчасці*** *эк* die Produktión von *etw.* éinstellen, *etw.* aus der Produktión néhmen*; ~ ***кóпію*** éine Kopíe [Ábschrift] ánfertigen [machen]

знячэ́ўку *прысл разм гл* знянацку

зóлак *м* Mórgengrauen *n* -s, Mórgendämmerung *f*-, -en; ***на зóлку*** bei Tágesanbruch, in áller Frühe

зóлата *н* **1.** (*метал*) Gold *n* -(e)s; ***чырвóнае*** [***чы́стае***] ~ Dukátengold *n*; ***самарóдак*** ~ Góldklumpen *m* -s, -; **2.** *геран* (*пра каго-н*) Pérle *f*-, -n; ◊ ***на вагý*** ~ das ist Gold(es) wert; ***не ўсё тóе ~, што блішчы́ць*** es ist nicht álles Gold, was glänzt; der Schein trügt

золаташука́льнік *м* Góldgräber *m* -s, -

зóлкі 1. (*пра паветра, пах*) dúmpf(ig), múffig; mód(e)rig; **2.** (*пра надвор'е*) násskalt, feucht

золь *ж разм* násskaltes Wétter

зóмбі *м, ж нескл псіхал* Zómbie *m* -s, -s

зóна *ж* Zóne *f*-, -n; Región *f*-, -en; Raum *m* -(e)s, Räume, Gebíet *n* -(e)s, -e, Beréich *m* -(e)s, -e (*галіна, сфера*); ***забарóнная*** ~ Spérrgebiet *n*; ***памéжная*** ~ Grénzzone *f*, Grénzgebiet *n*; ~ ***акупáцыі*** Besátzungszone *f*; ***бяз'я́дзерная*** ~ *паліт* átómwaffenfreie [kérnwaffenfreie] Zóne; ***дэмілітарызавáная*** ~ *паліт* entmilitarisíerte Zóne; ~ ***адпачы́нку*** Erhólungsgebiet *n*; ***кліматы́чная*** ~ *геагр* Klímazone *f*; ***валю́тная*** ~ *эк* Währungsgebiet *n*; ~ ***свабóднага прадпрымáльніцтва*** *камерц* Zóne des freíen Unternéhmertums; ~ ***свабóднага гáндлю*** *камерц* Fréihandelszone *f*

зонд *м* **1.** *мед, тэх* Sónde *f*-, -n; ***страўнікавы́*** ~ Mágensonde *f*; **2.** *метэар* (*аэрастат*) Sondíerballon [-lɔŋ] *m* -s, -s

зóрачка *ж памянш* Stérnchen *n* -s, -; ***пазнáчыць ~й*** durch ein Stérnchen kennzéichnen *vt*

зорачкападóбны stérnförmig; ~ ***рухавíк*** Stérnmotor *m* -s, -tóren

зóрка *ж* **1.** Stern *m* -(e)s, -e; **2.** *геран* (*славутасць*) Star *m* -s, -s; ◊ ***ён зóрак з нéба не хапáе*** *разм* er hat das Púlver nicht erfúnden; er ist kéine gróße Léuchte

зóркасць *ж разм* Schárfsichtigkeit *f*-, Schärfe *f*-, Wáchsamkeit *f*- (*пільнасць*)

зóркі *разм* schárfsichtig; wáchsam (*пільны*)

зóрны 1. (*у дачыненні да зорак*) Stern-; stern-; **2.** (*абсыпаны зоркамі*) stérnübersät, stérnklar, stérnhell

зóрчаты stérnförmig

зóрыць *безас высок* sich röten

з-пад *прыназ* **1.** únter (*D*)... hervór; ~ ***сталá*** únter dem Tisch hervór; **2.** (*для, ад – перакладаецца пры дапамозе складанага слова*) ***бутэ́лька ~ малакá*** (léere) Mílchflasche *f*-, -n; **3.** (*пры ўказанні на мясцовасць*): ***ён ~ Гóмеля*** er kommt [stammt] aus der Nähe von [éinem Ort bei] Hómel; ◊ ~ ***нóса*** vor der Náse weg; ~ ***бізунá*** gezwúngen, gezwúngenermaßen, únter Zwang

зрабí|цца 1. (*стаць*) wérden; ***надвóр'е ~лася дрэ́нным*** das Wétter ist schlecht gewórden; **2.** *зал. стан* gemácht wérden, getán wérden; hérgestellt wérden, gebástelt wérden, gebáut wérden; erfüllt wérden; ***рабóта ~лася*** die Árbeit wúrde gemácht [erfüllt]

зрабíць *гл* рабіць

зразáць ábschneiden* *vt*; ábsägen *vt* (*спілаваць*); ~ [***зрэ́заць***] ***на экзáмене*** *разм* in der Prüfung dúrchfallen [dúrchfliegen] lássen*

зрáзу *прысл разм* sofórt, gleich, únverzüglich, auf éinmal

зрáзы *кул* Klópse mit Grützenfüllung

зразумéла 1. *прысл* verständlich; ***гэ́та самó сабóй*** ~ das ist sélbstverständlich; **2.** *пабочн. слова разм* sélbstverständlich; es verstéht sich

зразумéласць *ж* Verständlichkeit *f*-, Begréiflichkeit *f*-; Fássbarkeit *f*-

зразумéлы verständlich, begréiflich; klar

зразумéты verstánden, wóhlverstanden

зразумéць verstéhen* *vt*, begréifen* *vt*; fássen *vt*; sich (*D*) über *etw.* (*A*) klar wérden (*усвядоміць*)

зрáнку, зрáння *прысл* mórgens, am Mórgen, früh

зраста́нне *н* **1.** Verwáchsung *n* -s; Zusámmenwachsen *n* -s; *мед* Verwáchsung *f*-, -en; *эк* Verfléchtung *f*-, -en; **2.** *спец* Verbíndung *f*-, -en; ***фразеалагíчнае*** ~ *лінгв* erstárrte Rédewendung, stárre phraseológische Verbíndung

зраста́цца verwáchsen* *vi* (*s*), zusámmenwachsen* *vi* (*s*); héilen *vi* (*s*) (*пра рану*); vernárben *vi* (*s*) (*загаіцца*)

зрасцíць 1. zusámmenwachsen lássen*; **2.** *тэх* (*злучыць*) verbínden* *vt* (*з чым-н* mit *D*); zusámmenfügen *vt*; **3.** *геран* (*аб'яднаць*) fusioníeren *vt*, zusámmenschließen* *vt* (*банкі, канцэрны і г. д*)

зраўнава́цца ében wérden (*стаць роўным*); glatt wérden (*стаць гладкім*)

зраўнава́ць, зраўнóўваць ébnen *vt*, éinebnen *vt*; ◊ ~ ***з зямлёю*** dem Érdboden gléichmachen

зрачы́ся, зракáцца verzíchten vi (*каго-н, чаго-н* auf *A*); sich lóssagen (von *D*), áufgeben* *vt*

зрашэ́ціць, зрашэ́чваць (*кулямі і г. д*) durchlöchern *vt*

зрóду (не...) *прысл разм* nie im Lében

зрок *м* Gesíchtssinn *m* -(e)s; Séhkraft *f*-, Séhvermögen *n* -s; Áugenlicht *n* -(e)s; ***мець дóбры*** ~ gute Áugen háben; ***пóле ~у*** *мед* Gesíchtsfeld *n* -(e)s, -er; Séhfeld *n*, Blíckfeld *n*

зрóкав|ы visu|éll [vi-] Seh-; Gesíchts-; ***~ая пáмяць*** visu|élles Gedáchtnis

зрóшчванне *н* **1.** Verwáchsen *n* -s, Zusámmenwachsen *n* -s; **2.** *тэх* (*злучэнне*) Verbíndung *f*-; Verschmélzung *f*-; **3.** *геран* (*аб'яднанне*) Fusión *f*-, Zusámmenschluss *m* -es (*банкаў, канцэрнаў і г. д*)

зрóшчваць *гл* зрасціць

зруб *м* **1.** *буд* Blóckbau *m* -es, -ten, Hólzwerk *n* -(e)s; Hólzgerüst *n* -(e)s, -e (*еines Hauses*); ***калóдзежны*** ~ Brúnnenkasten *m* -s, -; **2.:** ***прадáць лес на*** ~ den Wald zum Ábholzen verkáufen

зрудзе́лы áusgeblichen (*пра вопратку*)

зруйнава́нне *н* Zerstörung *f* -, Zerstören *n* -s; Vernichtung *f* -, Vernichten *n* -s (*знішчэнне*)
зруйнава́ны ruiníert, zerstört
зруйнава́цца 1. ruiníert sein, zugrúnde [zu Grúnde] geríchtet sein; herúnterkommen* *vi* (*s*); **2.** (*пра страту маёмасці, уласнасці і г. д*) verármen *vi* (*s*); Pléite géhen* *vi* (*s*)
зруйнава́ць zerstören *vt*, zunichte máchen, vernichten *vt*; ~ ***здаро́ўе*** die Gesúndheit ruiníeren; ~ ***экано́міку*** die Wírtschaft ruiníeren
зрух *м* **1.** Ruck *m* -(e)s, -e, Verschíebung *f* -, -en; **2.** *геал* Érdrutsch *m* -(e)s, -e; **3.** *перан* Úmschwung *m* -(e)s, -schwünge; Fórtschritt *m* -(e)s, -e (*прагрэс*); Wándel *m* -s, -, Wándlung *f* -, -en (*перамены*) ***вялі́кія ~і ў свядо́масці людзе́й*** éinschneidende Wándlungen im Bewússtsein der Ménschen
зру́чна *прысл* **1.** bequém, pássend, recht; **2.** *у знач выказн безас* es passt, es ist ángenehm (*гэта падыходзіць*); es gehört sich, es schickt sich, es ist am Plátze; ***калі гэ́та вам*** ~ wenn es Íhnen passt
зру́чнасць *ж* Bequémlichkeit *f* -, -en; Komfórt [-ˊfo:r] *m* -s
зручне́й *прысл* (*выш. ступ ад* зручна) bequémer; pássender, händlicher; günstiger; *гл* зручны
зру́чны 1. bequém; **2.** (*які падыходзіць, пасуе*) pássend, geéignet; ángemessen; händlich (*у абыходжанні*); ~ ***мо́мант*** günstiger [pássender] Áugenblick, günstige [pássende] Gelégenheit
зру́шваць *гл* зрушыць
зру́шы|цца 1. sich verschíeben*; sich in Bewégung sétzen (*пачаць рухацца*); **2.** (*наблізіцца*) zusámmenrücken *vi* (*s*); ◊ ***не ~цца з ме́сца*** nicht vom Fleck [von der Stélle] kómmen*; ***спра́ва не ~лася з ме́сца*** die Sáche kam nicht vom Fleck
зру́шыць rücken *vt*, schíeben* *vt*, verschíeben* *vt*; sich in Bewégung setzen (*скрануцца з месца*)
зрушэ́нне *н гл* зрух
зрына́ць, зры́нуць 1. (*зваліць уніз*) hinábwerfen* *vt*; **2.** *перан* (*пазбавіць улады*) stürzen *vt*; zu Fall bríngen*
зрысава́ць ábzeichnen *vt*
зрыў *м* **1.** Veréitelung *f* -, -en, Desorganisíerung *f* -, -en, Spréngung *f* -, -en, ~ ***схо́ду*** die Spréngung éiner Versámmlung; ~ ***пла́на*** Durchkréuzung [Veréitelung] éines Plans; ~ ***ата́кі вайск*** die Verhínderung éines Ángriffs; ~ ***стра́йку*** Stréikbruch *m* -(e)s, -brüche; **2.** *тэх* Áblösung *f* -, -en, Ábreißen *n* -s
зрэ́б'е *н* **1.** gróbes Spínngarn; **2.** (*палатно*) Háusgewebtes (*sub*) *n* -n, -n; gróbes Tuch [Léintuch]
зрэ́бны derb; Hanf-, hánfen, hänfen
зрэ́дку *прысл* mánchmal, biswéilen, zuwéilen; von Zeit zu Zeit; zéitweise, hin und wíeder, dann und wann (*час ад часу*)
зрэз *м* **1.** (*дзеянне*) Schnéiden *n* -s, Schnitt *m* -(e)s; **2.** (*месца*) Schníttstelle *f* -, -n, Schnitt *m*
зрэ́зацца 1. (*пра інструмент, механізм і пад.*) sich ábnutzen, verschléißen* *vi* (*s*); **2.** *разм* (*на экзамене*) dúrchfallen* *vi* (*s*), dúrchflíegen* *vi* (*s*)
зрэ́заць, зрэ́зваць 1. ábschneiden* *vt*, ábsägen *vt* (*спіліць*); **2.** *перан* (*на экзамене*) dúrchfallen lássen*; *гл тс* рэзаць
зрэ́нка *ж анат* Pupílle *f* -, -n
зрэ́шты *злучн, пабочн. слова* übrigens, im Übrigen; schlíeßlich
зуб *м* **1.** Zahn *m* -(e)s, Zähne; ***карэ́нны*** ~ Báckenzahn *m*; ***малы́чны*** ~ Mílchzahn *m*; ~ ***му́драсці*** Wéisheitszahn *m*; ◊ ~ ***за*** ~ Zahn um Zahn; ***вастры́ць на што-н ~ы*** ganz verséssen sein auf *etw.* (*A*); ***мець*** ~ ***на каго-н ј-п*** auf dem Kíeker háben (*разм*); *ј-п* nicht léiden können*; gégen *ј-п* vóreingenommen sein; ***трыма́ць язык за ~а́мі*** *разм* séine Zúnge im Zaum hálten*, séine Zúnge zügeln; das Maul [den Schnábel] hálten* (*груб*); ***накла́сці ~ы на пали́цу*** *разм* am Húngertuch nágen; nichts zu béißen háben; ***узбро́ены да ~о́ў*** bis an die Zähne bewáffnet; **2.** *тэх* Zahn *m* -(e)s, Zähne
зубаска́ліць *разм* grínsen *vi*; witzen *vi*, Witze réißen*; féixen *vi* (*зларадна*); spótten *vi* (*здзекавацца*)
зубаска́льства *н разм* Witzeléi *f* -, -en
зуба́сты *разм* **1.** mit lángen [schárfen, spítzen] Zähnen; bíssig (*пра сабаку*); **2.** (*дзёрзкі*) bíssig, mit éiner schárfen Zúnge; ◊ ***быць ~м*** Háare auf den Zähnen háben
зубачы́стка *ж* Záhnstocher *m* -s, -
зубе́ц *м* **1.** *тэх* (*востры выступ на інструменце і г. д*) Zahn *m* -(e)s, Zähne; **2.** *архіт* (*надбудова на сцяне*) Zínne *f* -, -n
зубі́ла *н тэх* Méißel *m* -s, -
зубі́ць *тэх* éinkerben *vt*, éinschneiden* *vt*
зубны́ 1. Zahn-; ~ ***боль*** Záhnschmerzen *pl*, Záhnweh *n* -s; **2.:** ~ ***гук*** *лінгв* Dentállaut *m* -(e)s, -e, Záhnlaut *m*
зубо́к *м* **1.** Zähnchen *n* -s, -; ◊ ***папа́сці*** *каму-н* ***на*** ~ das Ópfer von *ј-s* Gespött [Schikáne] wérden; **2.** (*часнаку*) Knóblauchzehe *f* -, -n; **3.** *гл* зубец
зубо́ўны: ~ ***скрыгат*** Zähneknirschen *n* -s
зубр *м заал* Wísent *m* -(e)s, -e
зубро́ўка *ж* Subróuka *m* -s (*ein Alkoholgetränk in Belarus und Polen*)
зубры́ла *м, ж разм* Óchser *m* -s, -, Büffler *m* -s, -; Büfflerin *f* -, -nen (*пра асобу жаночага полу*)
зубры́ць *разм* páuken *vt*, *vi*, óchsen *vt*, *vi*, büffeln *vt*, *vi*, sich (*D*) *etw.* éinpauken
зубча́(с)т|ы 1. (*з зубцамі або зазубрынамі*), gezáhnt, gezähnt, gezáckt, záckig, áusgezahnt; mit Zínnen bewéhrt; ***~ая сцяна́*** die zínnenbewehrte Máuer; ***~ы ліст*** *бат* gezácktes Blatt; **2.** *тэх* Zahn-, Záhnrad-; ***~ае ко́ла*** Záhnrad *n* -(e)s, -räder, ***~ая перада́ча*** Záhnradgetríebe *n* -s
зубча́тка *ж тэх* Záhnrad *n* -(e)s, -räder
зу́мканне *н* Gesúmm *n* -(e)s, Gesúmme *n* -s
зу́мка|ць *разм* súmmen *vi*; ***пчо́лы ~юць*** die Bíenen súmmen
зусі́м *прысл* **1.** (*поўнасцю*) völlig, ganz, vollkómmen; ~ ***не*** ganz und gar nicht; **2.** *разм* (*назаўсёды*) für ímmer; **3.** (*вельмі*) sehr; ~ ***не*** durcháus nicht
зух *м разм* gewándter [geschíckter] Kerl; Táusendsassa *m* -s, -s; Téufelskerl *m* -s, -e
зухава́тасць *ж* Töllkühnheit *f* -, Verwégenheit *f* -, Schnéidigkeit *f* -, Schneid *m* -(e)s *i f* -
зухава́ты verwégen, (töll)kühn; flott
зыб *м* Kräuseln *n* -s (*на рацэ*); Séegang *m* -(e)s, Dünung *f* - (*на моры*); ***мо́цны*** ~ schwérer Séegang
зы́баць scháukeln *vt*, schwíngen* *vt*; wíegen *vt* (*дзіця*)
зы́знуць *разм* (*апухнуць*) (áuf)schwéllen* *vi*
зы́кнуць: ~ ***на*** *каго-н разм ј-п* ánschreien* [ánfahren*, ánraunzen]
зы́ркасць *ж паэт* (*святла, фарбаў*) Grélllheit *f* -; Hélligkeit *f* -, Hélle *f* -; Léuchtkraft *f* -, Léuchtdichte *f* -
зы́ркі *паэт* grell, bléndend, hell, léuchtend
зыхо́д *м* **1.** (*вынік*) Áusgang *m* -(e)s, Áusfall *m* -s, Ergébnis *n* -ses, -se, Resultát *n* -(e)s, -e; ~ ***барацьбы́*** Áusgang [Ergébnis] des Kámpfes; **2.** (*скон*) Áusgang *m* -(e)s, -gänge, Énde *n* -s, Néige *f* -; ***на ~зе дня*** gégen Ábend; ***дзень на ~зе*** der Tag geht zur Néige; ***на ~зе пе́ршага ме́сяца*** vor Áblauf des érsten Mónats; ***быць на ~зе*** áusgehen* *vi* (*s*); ***гро́шы на ~зе*** das Geld geht zu Énde
зыхо́дзіць (*грунтавацца*) áusgehen* *vi* (*s*) (*з чаго-н* von *D*), sich gründen (auf *A*); basíeren *vi*, sich stützen (auf *A*)
зыхо́дны Áusgangs-; ~ ***пункт*** Áusgangspunkt *m* -(e)s, -e; ***~я зве́сткі*** Áusgangsdaten *pl*
зычлі́васць *ж* Gútherzigkeit *f* -; Güte *f* -
зычлі́вы gútherzig, gut (*да чаго-н* zu *D*)
зы́чны 1. (*гучны*) laut, klángvoll; ~ ***го́лас*** kräftige [schállende] Stímme; **2.** *лінгв* (*гук*) Konsonánt *m* -en, -en
зы́чыць 1. wünschen *vt*; **2.** (*абяцаць, прадказваць*) verspréchen* *vt*, verhéißen* *vt*
зычэ́нне *н разм* Wunsch *m* -es, Wünsche
зэ́длік *м разм* Bänkchen *n* -s, -; Schémel *m* -s, -
зэканоміць éinsparen *vt*
зэканомлены éingespart

зюйд *м марск* **1.** (*напрамак*) Süd, Süden *m* -s; **2.** (*вецер*) Süd *m* -(e)s, -e, Südwind -(e)s, -e

зюйд-вёст *м марск* **1.** (*напрамак*) Südwest, Südwésten *m* -s; **2.** (*вецер*) Südwést *m* -(e)s, -e, Südwéstwind *m* -(e)s, -e

зюйд-о́ст *м марск* **1.** (*напрамак*) Südóst, Südósten *m* -s; **2.** (*вецер*) Südóst *m* -(e)s, -e, Südóstwind *m* -(e)s, -e

зя́бкі verfróren

зя́бліва *н* Hérbstacker *m* -s, -

з'я́ва *ж* (*праяўленне*) Erschéinung *f*-, -en; ~ ***прыро́ды*** Natúrerscheinung *f*; **2.** (*падзея*) Eréignis *n* -ses, -se; (Vór)fall *m* -s, -fälle; Begébenheit *f*-, -en; **3.** (*частка драм. твора*) Áuftritt *m* -(e)s, -e

з'яві|цца 1. (*прыйсці, прыбыць*) kómmen* *vi* (*s*); erschéinen* *vi* (*s*), áuftauchen *vi* (*s*), sich éinstellen; *вайск* sich mélden, sich ánmelden; ***~цца ў суд*** vor Gerícht erschéinen*; ***~цца ў прызна́чаны час*** sich zur ángegebenen Zeit éinstellen; **2.** (*узнікнуць, паказацца*) sich zéigen, áuftauchen *vi* (*s*); **3.** *афіц, канц* (*быць, зрабіцца, аказацца*) sein *vi* (*s*), sich erwéisen* (als); ***гэ́та ~лася прычы́най яго́ сме́рці*** das war die Úrsache séines Tódes

з'я́вішча *гл* з'ява **1.**

з'ядна́ць áuf|essen* *vt*; verschlíngen* *vt* (*сквапна*)

з'ядна́цца, з'яднаўва́цца (*утварыць адзінае цэлае*) sich zusámmenschließen, sich veréinigen; sich schären (*вакол чаго-н* um *A*)

з'ядна́ць, з'яднаўва́ць *гл* аб'яднаць

з'язджа́ць ábfahren* *vi* (*s*), wégfahren* *vi* (*s*), ábreisen *vi* (*s*)

зязю́лька *ж* (*ласкальны зварот*) (mein) Líebchen *n* -s, -; méine Béste

зязю́ля *ж заал* (*птушка*) Kúckuck *m* -(e)s, -e; ~ ***куку́е*** der Kúckuck ruft

зяле́ніва *н разм зборн* Grünkram *m* -s, Grünkraut *n* -(e)s; Gemüse *n* -s, -

зяле́ніўшчык *м разм* Grűnkramhändler *m* -s, -; Geműsehändler *m* -s, -

зялёнка I *бат* (*грыб*) grüner Täubling (*ein Pilz*)

зялёнка II (*антысептык*) Brillántgrün *n* -s (*Antiseptikum mit Spiritus*)

зялёны 1. (*колер*) grün, von grüner Fárbe; **2.** (*няспелы*) grün, únreif; blútjung, únerfahren; ~ ***корм*** *с.-г* Grásfutter *n* -s, Grünfutter *n* -s; ~ ***тэ́атр*** Fréilichtbühne *f*-, -n

з'ялча́ць, з'ялчэ́ць ránzig wérden

зяме́льн|ы Land-, Bóden-, Grund-; ***~ы ўча́стак*** Gründstück *n* -(e)s, -e; ***~ы надзе́л*** *с.-г* Bódenanteil *m* -s, -e; ***~ая ўла́снасць*** Gründbesitz *m* -es, Bódenbesitz *m*; **2.** (*аграрны*) agrárisch, Agrár-; ***~ая рэфо́рма*** Bódenreform *f*-, -en, Agrárreform *f*; ***~ая ре́нта*** *эк* Gründrente *f*-, -n; ***~ы банк*** Agrárbank *f*-, -en

зямл|я́ *ж* **1.** Érde *f*-; Érdball *m* -s; ***абаро́т вако́л ~і́*** Érdumkreisung *f*-, -en, Érdumrundung *f*-, -en; ***адлегласць ад ~і*** Entférnung von der Érde; **2.** (*суша*) Féstland *n* -(e)s, féstes Land; **3.** (*глеба*) Érde *f*, (Érd)boden *m* -s; **4.** (*уладанне*) Land *n* -es, Grund *m* -(e)s, Grund und Bóden, Grundstück *n* -(e)s -e; **5.** (*краіна*) Land *n* -(e)s, Länder; ***дзяржа́ўная ~я*** Stáatsland *n*; ***грама́дская ~я*** Geméindeland *n*; ***памéшчыцкая ~я*** *гіст* Grófsgrundbesitz *m* -es; ***прысядзі́бная ~я*** Hófland *n*; ***нічы́йная ~я*** Níemandsland *n*; ***цалі́нная ~я*** Néuland *n*

зямлі́сты 1. érdig, érdartig; **2.** (*колер*) érdfahl; áschfahl, áschgrau; ~ ***ко́лер тва́ру*** fáhle Gesíchtsfarbe

зямля́к *м* Ländsmann *m* -(e)s, -leute

зямля́нка *ж* Érdhütte *f*-, -n; *вайск* Wóhnhütte *f*

зямля́цкі ländsmannschaftlich

зямля́цтва *н* Ländsmannschaft *f*-, -en

зямля́чка *ж* Ländsmännin *f*-, -nen

зямн|ы́ 1. Erd-; ***~ы́ шар*** [***~а́я ку́ля***] Érdkugel *f*-, Érdball *m* -s; ***~а́я вось*** Érdachse *f*-; ***~а́я кара́*** *геагр* Érdrinde *f*-; ***~о́е прыцягне́нне*** *фіз* Érdanziehung *f*-; **2.** *перан* írdisch; ***~ы́я багáцці*** írdische Güter; ***~ы́я спра́вы*** das Írdische (*sub*); ~ ***паклó́н*** éine Verbéugung bis zur Érde

зя́па *ж разм* Maul *n* -s, Mäuler, Ráchen *m* -s, -; *перан* Schlund *m* -(e)s, Schlünde

зярні́ст|ы körnig, gekörnt; ***~ая ікра́*** körniger Káviar

зярня́тка *н* **1.** Körnchen *n* -s, -; **2.** (*плода*) Kern *m* -(e)s, -e

зярня́ты Körner *pl*

з'яўле́нне *н* Erschéinen *n* -s, -, Áuftauchen *n* -s, -; Áufkommen *n* -s, -

з'яўля́цца *гл* з'явіцца

зяцёк *м памянш* Schwíegersöhnchen *n* -s, -

зяць *м* Schwíegersohn *m* -(e)s, -söhne

І

і I *злучн* **1.** (*далучэнне*) und; ***на дварэ́ хало́дна ~ мо́кра*** dráußen ist es kalt und nass; ***дагна́ць ~ перагна́ць*** éinholen und überhólen; **2.** (*менавіта*) geráde, ében; ***гэ́та я ~ хацéў зрабíць*** das geráde [ében] wóllte ich tun; **3.** (*хоць*) obgléich, obwóhl, zwar, wenn auch; ~ ***трэ́ба было́ б паéхаць у гора́д, ды я не магу́*** ich müsste zwar in die Stadt fáhren, aber ich kann nicht; **4.** (*пры паўтарэнні*): ~ ...~ und...und, sowohl...als auch, sowóhl...wie auch; ~ ***брат ~ сястрá*** sowóhl der Brúder als auch die Schwéster; ~ ***гэ́тае ~ мóе*** sowóhl dies als [wie] auch jénes; ◊ ~ ***гэ́так дале́й*** (*скар* і г. д.) und so wéiter (*скар* usw.), und so fort (*скар* usf.); ~ ***да тагó падóбнае*** (*скар* і да т. п., і пад.) und desgléichen mehr (*скар* dgl. m.)

і II (*узмацняльная часціца*) **1.** (*таксама*) auch; ~ ***ў гэ́тым вы́падку*** auch in díesem Fall; **2.** (*яшчэ нават*) sogár, nicht éinmal, sélbst; ***ты ~ гэ́тага не ве́даеш?*** nicht einmal das weißt du?; ***ён ~ гэ́тага не ве́дае*** sogar [selbst] er weiß es nicht; ***ён ~ не падýмаў даць адказ*** er dáchte gar nicht dáran zu antworten

іанасфе́ра *ж фіз* Ionosphäre *f*-

іанізава́ць *фіз, мед* ionisíeren *vt*

іанізáцыя *ж фіз, мед* Ionisíerung *f*-, -en, Ionisatión *f*-, -en

іані́чны iónisch; ~ ***о́рдар*** *архіт* iónischer Stil

і́біс *м заал* (*птушка*) Íbis *m* -ses, -se, ägýptischer Storch

і́валга *ж заал* (*птушка*) Piról *m* -s, -e, Góldamsel *f*-, -n, Kírschvogel *m* -s, -vögel

іглі́сты nádelförmig, stáchelig

іглі́ца *ж* **1.** *бат* Nádel *f*-, -n; **2.** (*лісце хвойных дрэў, кустоў*) Nádelbaumzweig *m* -(e)s, -e

ігнараванне *н* Ignoríeren *n* -s

ігнараваць ignoríeren *vt*; sich hinwégsetzen (*што-н* über *A*), überséhen* *vt*; nicht beáchten (*не заўважаць*); kéine Notíz néhmen* (*што-н* von *D*)

ігóлачнік *м* Nádelbüchse *f*-, -n (*скрыначка*); Nádelkissen *m* -s, - (*падушачка*)

ігóлк|а *ж*, **ігла́** *ж* Nádel *f*-, -n; Nähnadel *f* (*для шыцця*); ***гуказдыма́льная ~а*** Tónabnehmernadel *f*; ***нýмар*** [***таўшчыня́***] ***~і*** *кравец* Nádelstärke *f*-, -n; **2.** (*хвойная*) Nádel *f*-, -n; **3.** (*у жывёл*) Stáchel *m* -s, -n

ігóлкападóбны Nádel-, nádelförmig

ігóлкаўкóлванне *н мед* Nádelstichtherapie *f*-

ігóльнік *м* Nádelbüchse *f*-, -n, Nádelkissen *n* -s, -

ігрá *ж муз, тэатр, кіно кніжн* Spiel *n* -s, -e; Spíelen *n* -s (*працэс*); ~ ***на скры́пцы*** Géigenspiel *n* -s

ігрáць 1. (*на чым-н*) spíelen *vt*; ~ ***на рая́лі*** Klavier [-ˊviːr] spíelen; ~ ***на трубé*** Trompéte blásen*, trompéten *vi*; **2.** (*у тэатры, кіно*) spíelen *vt*; ~ ***пéршую скры́пку*** (*тс перан*) die erste Géige spíelen

ігрóк *м* Spíeler *m* -s, -; *спарт* ***першакла́сны*** ~ Spítzenspieler *m*; ***запасны́*** ~ Ersátzmann *m* -(e)s, -männer; *гл* гулец

ігру́ша *ж* **1.** (*плод*) Bírne *f*-, -n; ***дзі́кая*** ~ Hólzbirne *f*; **2.** (*дрэва*) Bírnbaum *m* -(e)s, -bäume
ма́сав|ы Mássen-; **~ая *арганізацыя*** Mássenorganisation *f*-, -en; **~ая *вытво́рчасць*** Mássenproduktion *f*-; ***тавары́ ~ага по́пыту*** Mássenbedarfsartikel *pl*; ***зброя́ ~ага зні́шчэння*** Mássenvernichtungswaffen *pl*; ***сро́дкі ~ай інфармацыі*** Médi|en *pl*, Mássenmedi|en *pl*

маса́ж *м* Masságe [-ʒə] *f*-, -n; Knéten *n* -s

масажава́ць massíeren *vt*

масажы́ст *м* Masseur [-ˊsø:r] *m* -s, -e

масажы́стка *ж* Masseuse [-ˊsø:zə] *f*-, -n, Masseurin [-ˊsø:-rin] *f*-, -nen

масі́раваць I (*рабіць масаж*) massíeren *vt*

масі́раваць II *вайск* (*канцэнтраваць у адным месцы*) massíeren *vt*, zusámmenziehen, massíert éinsetzen

масі́ў *м* Massív *n* -s, -e; ***го́рны ~*** *геагр* Gebírgsmassiv *n*, Gebírgsstock *m* -(e)s, -stöcke; **~ *звёстак*** *камп* Dátenfeld *n* -(e)s, -er

масі́ўны Massív-, massív; schwer; solíde

ма́ск|а *ж* **1.** Máske *f*-, -n; Lárve [-və] *f*-, -n (*пеpан*); **~а *супрацьга́за*** *вайск* Gásmaske *f*; ***касме́тычная ~а*** (*для твару*) Gesíchtsmaske *f*, Teintmaske [ˊtɛ̃:-] *f*, **2.** (*адліўка з гіпсу з твару памерлага*) Tótenmaske *f*; ◊ ***зняць [скі́нуць] (з сябе́) ~у*** die Máske ábwerfen* [fállen lássen*], sein wáhres Gesícht zéigen; ***сарва́ць ~у з каго-н*** *j-m* die Máske [die Lárve] vom Gesícht réißen*; *j-n* entlárven [-vən]

маска́ль *м гіст, пагард* Gróßrusse *m* -n, -n, Moskowíter *m* -s, -

маскара́д *м* **1.** Máskenball *m* -s, -bälle; Kostümfest *n* -(e)s, -e; **2.** *пеpан* Heucheléi *f*-, -en, Verstéllung *f*-, -en, Maskíerung *f*-, -en

маскара́дны Másken(ball)-; **~ *касці́юм*** Máskenkostüm *n* -s, -e

маскатэ́ль *м* Málerbedarf *m* -(e)s, Fárben und Lácke *pl*; Fárbenhandlung *f*- (*крама*)

маскатэ́льн|ы: ~ая *ла́ўка* Drogeríe *f*-, -ri|en, Drogeríehandlung *f*-, -en, Fárbenhandlung *f*-, -en

масквічы́ *м* **1.** (*жыхар*) Móskauer *m* -s, -; **2.** (*расійская марка аўто*) Móskwitsch *m* -(e)s, -e

маскірава́цца 1. sich maskíeren, sich verkléiden; **2.** *пеpан* sich verstéllen; **3.** *вайск* sich tárnen

маскірава́ць 1. maskíeren *vt*; verkléiden *vt*; **2.** *пеpан* verbérgen* *vt*; verschléiern *vt*; **3.** *вайск* tárnen *vt*

маскіро́вачн|ы *вайск* Tárn(ungs)-; **~ы *халáт*** Tárnhemd *n* -e(*s*), -en; Schnéehemd *n* (*белы*); **~ая *кама́нда*** Tárntrupp *m* -s, -s

маскіро́ўка *ж* **1.** Maskíerung -, -en; **2.** *пеpан* Verstéllung *f*-, -en, Heucheléi *f*-, -en; **3.** *вайск* Tárnung *f*-, -en; ***дымава́я ~*** Nébeltarnung *f*

маскі́т *м заал* Moskíto *m* -s, -s

ма́сл|а *н* **1.** Bútter *f*-; (***сметанко́вае***) **~а** Táfelbutter *f*-; ***то́пленае ~а*** Schmélzbutter *f*; ***біць ~а*** búttern *vi*; **2.** *тэх* Öl *n* -s, -e; Maschínenöl *n*; ◊ ***кача́цца як сыр у ~е́*** ≅ lében wie die Máde im Speck; ***падлі́ць ~а ў агонь*** Öl ins Féuer gíeßen [schütten]; ***як па ~е*** es geht wie geschmíert [wie am Schnürchen]; ***як ~ам па сэ́рцы*** áußerordentlich ángenehm, éine Wóhltat

маслазаво́д *м* Molkeréi *f*-, -en

ма́сленіца I *ж* (*сасуд пад масла*) Bútterdose *f*-, -n

ма́сленіца II *ж* (*свята*) Fástnachtswoche *f*-, -n; Fásching *m* -s, -e *i* -s; ◊ ***ямý не жыццё, а ~*** er lebt wie die Máde im Speck; ***не ўсё катý ~*** es ist nicht álle Tage Sónntag [Kírmes, Wéihnachten]; man kann nicht álles háben

ма́слены Bútter-, bútt(e)rig; Fett-, fett(tig) (*пра пляму*); **~ *го́лас*** schméichlerische Stímme; **~я *во́чы*** schmáchtender Blick; schmáchtende Áugen; Schláfzimmerblick *m* (*у жанчыны*)

маслёнка *ж* **1.** Búttermilch *f*-; **2.** (*сасуд пад масла*) Bútterdose *f*-, -n; **3.** *тэх* Öler *m* -s, -, Ölkanne *f*-, -n

масліна *ж* **1.** (*плод*) Olíve [-və] *f*-, -n; **2.** (*дрэва*) Ölbaum *m* -(e)s, -bäume, Olívenbaum [-vən-] *m*

маслі́сты fett; ölig; bútterreich

масля́к *м бат* (*грыб*) Bútterpilz *m* -es, -e

масні́ца *ж*, **масні́чына** *ж* Díelenbrett *n* -(e)s, -er, Fúßbodenbrett *n*; Bóhle *f*-, -n (*брусок*)

масо́н *м* Fréimaurer *m* -s, -

масо́нства *н* Freimaurereí *f*-

масо́ўка *ж разм* **1.** (*сходка*) Versámmlung *f*-, -en, Zusámmenkunft *f*-, -künfte, Tréffen *n* -s, -; **2.** (*масавая экскурсія*) Mássenausflug *m* -(e)s, -flüge; **3.** *тэатр, кіно* Mássenszene *f*-, -n

маставáя *ж разм гл* брук, брукаванка

маста́к *м* **1.** (*жывапісец, графік, скульптар*) Máler *m* -s, -; Gráphiker [Gráfiker] *m* -s, -, Bíldhauer *m* -s, -; **2.** (*у галіне літаратуры*) Künstler *m* -s, -; **~ сло́ва** [Méister] Künstler des Wórtes; **3.** (*хто дасягнуў высокай дасканаласці*) *разм* Méister *m* -s, -, Könner *m* -s, -

маста́цк|і künstlerisch, Kunst-; Künstler-; kúnstvoll (*пра ігру, працу*); **~і твор** Kúnstwerk *n* -(e)s, -e; **~ая літарату́ра** die schöne [schöngeistige] Literatúr; **~і фільм** Spíelfilm *m* -s, -e; **~ія вы́рабы** Künsterzeugnisse *pl*; **~ая самадзе́йнасць** Láienkunst *f*-

маста́цтва *н* **1.** Kunst *f*-, Künste; ***выяўле́нчае ~*** die dárstellende [bíldende] Kunst; ***наро́днае ~*** Vólkskunst *f*; ***эстра́днае ~*** Unterháltungskunst *f*; ***ужытко́вае [прыкладно́е] ~*** ángewandte Kunst; ***займа́цца ~м*** künstlerisch tätig sein; **2.** (*майстэрства, умельства*) Kunst *f*-, Künste; Fértigkeit *f*-, -en; ◊ ***па ўсіх пра́вілах ~*** nach állen Régeln der Kunst; kúnstgerecht (*па-майстэрску*)

мастацтвазна́вец *м*, **мастацтвазна́ўца** *м*, *ж* Kúnstwissenschaftler *m* -s, - (*пра мужчыну*), Kúnstwissenschaftlerin *f*-, -nen (*пра жанчыну*)

мастацтвазна́ўства *н* Kúnstwissenschaft *f*-

масто́к *м* kléine Brücke; Steg *m* -(e)s, -e (*пешаходны*)

масці́ка *ж* **1.** *буд* (*для падлогі*) Bóhnerwachs *n* -(e)s, -e; **2.** (*смала*) Mástix *m* -es *або* -

масці́ты *разм* éhrwürdig, éhrbar; ánerkannt

масці́цца 1. (*размяшчацца*) Platz finden*; únterkommen* *vi* (*s*) (*уладкавацца*); Plätze éinnehmen* (*заняць месцы*)

масці́ць 1. (*падлогу*) díelen *vt*, mit Díelen belégen; (*брукаваць*) pflástern *vt*; **2.** *разм* (*размяшчаць*) únterbringen* *vt*; áuslegen *vt* (*высцілаць*) (*чым-н* mit *D*)

масць *ж* **1.** (*жывёл*) Fárbe *f*-, -n; Färbung *f*-, -en, Féllfarbe *f*; **2.** *карт* Fárbe *f*-, -n

масянжо́вы *гл* латунны

мат I *м* matt; ***шах і ~!*** Schach und matt!; ***паста́віць ~ каму-н*** *j-n* matt sétzen; **~ у *тры ходы́*** matt in drei Zügen

мат II *м* (*лаянка*) *гл* мацюкі; ◊ ***крыча́ць благі́м ~ам*** *разм* aus Léibeskräften schréien*; wie am Spieß brüllen

ма́та *ж* (*пасцілка, занавеска*) Mátte *f*-, -n; Bódenbelag *m* -(e)s, -läge

ма́тавасць *ж* Máttigkeit *f*-; Máttheit *f*-

матавíла *м* **1.** *тэкст* Háspelmaschine *f*-, -n; **2.** *с.-г* Háspel *f*-, -n

ма́тавы matt, mattíert; **з ~ага шкла** máttgläsern

матадо́р *м* Matadór *m* -s *i* -en, -e *i* -en

матарызава́н|ы motorisíert; Mótor-; **~ая артыле́рыя** *вайск* motorisíerte Artilleríe

матарызава́ць motorisíeren *vt*

матары́ст *м марск* Eléktromotorist *m* -en, -en; *ав* Tríebwerktechniker *m* -s, -; Motoríst *m* -en, -en

матацы́кл *м* Mótorrad *n* -(e)s, -räder, Kráftrad *n*; Krád *n* -(e)s, Kräder; ~ ***з каля́скай*** Mótorrad mit Béiwagen

матацыкліст *м* Mótorradfahrer *m* -s, -, Kráftradfahrer *m*, Krádfahrer *m*

мата́ць **1.** (*віць, навіваць*) háspeln *vt*, spúlen *vt*; áufwickeln *vt*, wíckeln *vt* (*у клубок*); **2.** *разм*: ~ ***галаво́й*** *гл* матляць; ◊ ~ (***сабе́***) ***на вус*** *разм* ≅ sich (*D*) *etw.* hínter die Óhren schreiben*

ма́тачка *ж гл* мамачка

ма́тка *ж* **1.** (*маці*) Mútter *f* -, Mütter; **2.** (*самка жывёл, насякомых*) Wéibchen *n* -s, -; Wéisel *f* -; -n; (Bíenen)königin *f* -, -nen, Stóckmutter *f* (*у пчол*); **3.** *анат* Gebärmutter *f* -, -mütter, Úterus *m* -, -ri

матлашы́ць *разм* **1.** (*рваць на шматкі*) zerréißen* *vt*, zerfétzen *vt*; **2.** (*біць, нішчыць*) prügeln *vt*, verdréschen* *vt*; vernichten *vt*

матляну́|цца erschéinen* *vi* (*s*); áuftauchen *vi* (*s*); vorbéihuschen *vi* (*s*) (*прамільгнуць*); ***мі́ма акна́ ~ўся цень*** ein Schátten húschte am Fénster vorbéi

матля́цца *разм* **1.** (*вісець*) báumeln *vi*, hín- und hérschaukeln *vi*; **2.** (*хістацца*) schwánken *vi*; schwíngen* *vi*

матля́ць **1.** *разм*: ~ ***галаво́й*** den Kopf schütteln; **2.** (*хістаць*) scháukeln *vt*, schwíngen* *vt*; hín- und hérbewegen *vt*

матну́ць *гл* матаць

мато́р *м тэх* Mótor *m* -s, -tóren

мато́к *м* Dócke *f* -, -n; Wíckel *m* -s, -; ~ ***пра́жы*** Gárndocke *f*

маторабудава́нне *н* Motórenbau *m* -es

маторабудаўні́чы Motórenbau-; ~ ***завóд*** Motórenbauwerk *n* -(e)s, -e

мато́рка *ж разм* (*лодка*) Mótorboot *n* -(e)s, -e

мато́рн|ы I *тэх* Mótor-; ~***ы вагóн*** Tríebwagen *m* -s, -; ~***ая ло́дка*** Mótorboot *n* -(e)s -e

мато́рн|ы II *фізіял* motórisch; ~***ая па́мяць*** *псіхал* motórisches Gedächtnis

матра́ц *м* Matrátze *f* -, -n; ***саламя́ны*** ~ Stróhsack *m* -(e)s, -säcke, stróhgefüllte Matrátze; ***спружы́нны*** ~ Sprúngfedermatratze *f*; ***надзіма́ны*** ~ Lúftmatratze *f*

матро́с *м марск* Matróse *m* -n, -n

матро́на *ж* Matróne *f* -, -n

матро́ска *ж* Martósenbluse *f* -, -n

матро́скі Matrósen-; ~ ***та́нец*** Matrósentanz *m* -(e)s, -tänze

матро́шка *ж*, **матру́нка** *ж* (*лялька*) Matr(j)óschka *f* -, -s

матры́кул *м уст* Matríkel *f* -, -n

ма́трыца *ж* **1.** *палігр* Matríze *f* -, -n; Máter *f* -, -n; **2.** *матэм* Mátrix *f* -, -trízen; **3.** *тэх* Stánzform *f* -, -en

ма́трычн|ы Mátrix-; ~***ы пры́нтар*** [~***ая друка́рка***] Mátrixdrucker *m* -s, -

матрыярха́т *м гіст, тс* перан Matriarchát *n* -(e)s

матýз *м* Schnur *f* -, Schnüre, Schnürchen *n* -s, -

матýля *ж гл* маці

ма́тухна *ж разм* **1.** (*з адценнем павагі*) Mútter *f* -, Mütter; **2.** (*ласкава-фамільярна да пажылой жанчыны*) Mütterchen *n* -s, -, Mútchen *n* -s

матч *м спарт* Spiel *n* -(e)s, -e; ~ ***на першынство́ све́ту па футбо́ле*** Fúßball-Wéltmeisterschaftsspiel *n*; ~***-турні́р*** *шахм* Turníer *n* -s, -e, Scháchturnier *n*

матч-рэва́нш *м спарт* Rückspiel *n* -(e)s, -e

ма́тчын **1.** (*уласцівы мацеры*) mütterlich, Mútter-; ~***а любо́ў*** Mútterliebe *f* -; **2.** (*які належыць маці*) *гл* мамін

матыва|ва́ць motivieren [-´vi:-] *vt*, begründen *vt*

матыва́цыя *ж* Motivatión [-va-] *f* -, -en

матывіро́ўка *ж* Motivierung [-´vi:-] *f* -, -en, Begründung *f* -, -en

маты́ка *ж с.-г* Hácke *f* -, -n; Háue *f* -, -n (*абл*)

матылёк *м*, **матыль** *м заал* Fálter *m* -s, -, Schmétterling *m* -s, -e; ***начны́*** ~ Náchtfalter *m*

матыў *м* **1.** *муз* Motív *n* -s, -e, Melodíe *f* -, -dí|en; **2.** (*прычына*) Motív *n* -s, -e, Bewéggrund *m* -(e)s, -gründe; **3.** *літ* Motív *n* -s, -e

матычыць *с.-г* mit der Hácke beárbeiten

матóль *м* Motél *n* -s, -s

матэма́тык *м* Mathemátiker *m* -s, -

матэма́тыка *ж* Mathematík *f* -

матэматы́чна *прысл*; **матэматы́чн|ы** mathemátisch; ~***ая лінгві́стыка*** mathemátische Linguístik; ~***ай дакла́днасцю*** mathemátisch genáu

матэ́ры|я *ж* **1.** *філас, тс* перан Matéri|e *f* -, Gründstoff *m* -(e)s, Úrstoff *m*; ◊ ***гаварыць пра высо́кія ~і*** über geléhrte [abstrákte] Dínge réden; **2.** (*тканіна*) Stoff *m* -(e)s, -e, Textílware *f* -, -n

матэрыя́л *м* **1.** (*прадмет, рэчыва*) Materiál *n* -s, -i|en, Stoff *m* -(e)s, -e; Wérkstoff *m*; ***будаўні́чы*** ~ Báustoff *m*, Báumaterial *n*; ***гару́чы*** ~ Brénnstoff *m*; ***пасáдачны*** ~ *с.-г* Pflánzgut *n* -(e)s, Sétzgut *n*; ***пасяўны́*** ~ Sáatgut *n*; ***змáзачны*** ~ Schmíerstoff *m*; ***перавя́зачны*** ~ Verbánd(s)zeug *n* -(e)s, Verbándstoff *m*; ***супраці́ўлéнне ~аў*** (*супрамат*) Féstigkeit *f* -; Féstigkeitslehre *f* - (*вучэбная дысцыпліна*); **2.** (*тканіна*) Stoff *m* -(e)s, -e; ***падкла́дачны*** ~ Fútter *n* -s; Fútterstoff *m*; **3.** (*звесткі*) Materiál *n* -s, -i|en; Stóff *m* -(e)s, -e; ***лі́чбавы*** ~ Záhlenmaterial *n*; ***вучэ́бны*** ~ Léhrstoff *m*, Únterrichtsstoff *m*; ***ко́лькасць вучэ́бнага ~у*** (*вучэбнай праграмы*) *пед* Pénsum *n* -s, -sen *або* -sa

матэрыялізáцыя *ж* Materialisatión *f* -

матэрыялі́зм *м* Materialísmus *m* -

матэрыялі́ст *м* **1.** *філас* Materialíst *m* -en, -en; **2.** (*чалавек, зацікаўлены ў матэрыяльных выгодах*) práktischer, [gewínnsüchtiger] Mensch, Materialíst *m*

матэрыялісты́чны materialístisch

матэрыя́льна *прысл* materi|éll

матэрыя́льн|ы **1.** Materiál-, materi|éll; ~***ая ва́ртасць*** Materiálwert *m* -(e)s, -e; ~***а адка́зная асо́ба*** für materi|élle Wérte verántwortliche Persón; **2.** *філас* stófflich, materi|éll

маўзалéй *м* Mausolé|um *n* -s, -lé|en

ма́ўзер *м вайск* Máuserpistole *f* -, -n (*пісталет*); Máusergewehr *n* -s, -e (*вінтоўка*)

маўкліва *прысл* schwéigend, wórtlos, stumm; im Stíllen (*ціхком*)

маўкліва́сць *ж* Schwéigsamkeit *f* -, Verschwíegenheit *f*; Wórtkargheit *f* - (*негаварлівасць*)

маўкліў|ы schwéigsam, wórtkarg, éinsilbig, verschwíegen; ~***ая згóда*** stíllschweigendes Éinverständnis

маўля́ў *часц разм* sagt er [sie] (*не перакладаецца*); ***ён, ~, гэ́тага не ве́даў*** er hat es nicht gewússt, sagt er; er soll das nicht gewússt háben; er hat es ángeblich nicht gewússt

маўр *м* **1.** Máure *m* -n, -n; **2.** Mohr *m* -en, -en (*разм негр, афраамерыканец*)

маўрыта́нскі **1.** (*у адносінах да дзяржавы*) mauretánisch; **2.** *гіст* máurisch; ~ ***стыль*** máurischer Stil

маўча́нне *н* Schwéigen *n* -s, Stíllschweigen *n*-s; ***абысці́ ~м*** *што-н etw.* stíllschweigend [mit Schwéigen] übergéhen*; ***пару́шыць*** ~ das Schwéigen bréchen*; ◊ ~ – ***знак згóды́*** ≅ wer schweigt, stimmt zu

маўча́ць schwéigen* *vi*, [stíll schwéigen*]; ***упа́рта*** ~ hártnäckig schwéigen*; ~***!*** still!, sei [seid, séien Sie] still!; halt's Maul! (*груб*); ***прымýсіць*** *каго-н* ~ *j-n* múndtot máchen

маўчýн *м разм* schwéigsamer Mensch

ма́фія *ж* Máfia *f* -, -s, Máffia *f* -, -s

мах *м* Schwung *m* -(e)s, Schwünge; Schwíngung *f* -, -en; ◊ ***адны́м ~ам*** mit [in] éinem Zug; mit éinem Schlag; ***да́ць ~у*** éinen Féhler máchen; éinen Bock schíeßen*; ***ён ~у не да́сць*** bei ihm klappt álles; ***з усяго́ ~у*** (*размахнуўшыся*) mit vóller Kraft áusholend (zum Schlag)

махавік *м тэх* Schwungrad *n* -(e)s, -rader; Handrad *n*

ма́хам *прысл гл* мах

маханýць *разм гл* махнуць **2**

маха́ць **1.** schwíngen* *vt*, schwénken *vt*; ~ ***крыламі*** mit den Flügeln schlágen*; ~ ***хвастóм*** mit dem Schwanz wédeln; ~ ***рукóй*** (*развітваючыся*) wínken *vi*, zúwinken *vi* (*D каму-н*); **2.** *разм* (*хутка ісці, шыбаваць*) schnell géhen*

махе́р *м тэкст* Mohär *n* -s, -s
махі́на *ж разм* gróßer, schwérer Gégenstand; Kolóss *m* -es, -e; Úngeheuer *n* -s, -, Úngetüm *n* -s, -e
махіна́тар *м* Betrüger *m* -s, -, Mácher *m* -s, -; Gáuner *m* -s, -, Spítzbube *m* -n, -n; Schúrke *m* -n, -n; Schelm *m* -(e)s, -e (*жартлівы*)
махіна́цыі *мн разм* Máchenschaften *pl*; Ränke *pl* (*інтрыгі*)
махлява́ць betrügen* *vt*, begáunern *vt*
махля́р *м* Betrüger *m* -s, -; Gáuner *m* -s, -, Spítzbube *m* -n, -n (*жулік*)
махля́рскі spítzbübisch, schúrkisch, gáunerhaft
махля́рства *н* Schurkeréi *f* -, -en, Gauneréi *f* -, -en, Prelleréi *f* -, -en; Schwíndel *m* -s, - (*ашуканства*)
махля́рыць *разм* betrügen *vt*, beschwíndeln *vt*, préllen *vt*; gáunern *vi*
махна́ты *разм* zóttig (*пра звяроў*); fláuschig, wóllig (*пра матэрыю*); ~ ***ручні́к*** Frottíerhandtuch *n* -(e)s, -tücher, Frottéehandtuch *n*
махну́|ць **1.** *гл* махаць; **2.** *разм* (*адправіцца, паехаць*) sich áufmachen, sich auf den Weg máchen, lósziehen* *addz vi* (*s*), auf und davón géhen*; ***ён ~ў на по́ўдзень*** er ist nach dem Süden auf und davón; **3.** (*кінуцца*) springen* *vi*, sich schwíngen* (*цераз што-н* über *A*); ***ён ~ў це́раз плот*** er sprang über den Zaun; ◊ ***~ць руко́й на каго-н, на што-н*** *j-n, etw.* áufgeben*
махо́рка *ж*, **махра́** *ж* Machórka *f* -, Knáster *m* -s, -
махро́в|ы **1.** (*пра тканіну*): ***~ы ручні́к*** Frottíerhandtuch *n* -(e)s, -tücher, Frottéehandtuch *n*; ***~ая ткані́на*** Frottée *n*, *m* - *i* -s, -s; **2.** *разм* (*заўзяты, страшэнны*) Erz-; éingefleischt, erbíttert; ~ ***рэакцыяне́р*** Érzreaktionär *m* -s, -e
махры́ст|ы **1.** *бат* gefüllt; ***~ая кве́тка*** gefüllte Blüte; **2.** *гл* махровы **1.**
мацá *ж кул* (*тонкія праснакі*) Mátze *f* -, -n, Mátzen *m* -s, -
мацава́нне *н* **1.** (*дзеянне*) Beféstigung *f* -, -en, **2.** *горн* Hálterung *f* -, Ábspreizung *f* -, -en; Zímmerung *f* -, -en (*драўлянае*); **3.** (*лыжнае*) Bíndung *f* -, -en
мацава́ць **1.** (*прымацаваць*) beféstigen *vt* (*да чаго-н* an *A*), fest máchen; **2.** (*здароўе*) stärken *vt*, kräftigen *vt*; **3.** *перан* (*уладу, дружбу*) féstigen *vt*; **4.** *вайск* beféstigen *vt*
мацáк *м разм* kráftstrotzender [kérngesunder] Mensch
мáцаць befühlen *vt*, betásten *vt*; ~ ***пульс*** den Puls fühlen; tástend súchen
мацерыко́вы *геагр, геал* kontinentál, féstländisch, Féstland-
мацёры **1.** (*сталы, поўны сіл*) groß, erwáchsen, stark; ~ ***воўк*** áusgewachsener Wolf; **2.** *разм* (*закаранелы*) éingefleischt, áusgekocht, Erz-; ~ ***во́раг*** Érzfeind *m* -(e)s, -e
мáці *ж* Mútter *f* -, Mütter; ***шматдзе́тная*** ~ kínderreiche Mútter; ***~-адзіно́чка*** alléinstehende Mútter
мацне́|ць erstárken *vi* (*s*), stark wérden, sich féstigen; ***маро́з ~е*** es wird (ímmer) kälter, der Frost nimmt zu [verschärft sich]
мацу́нак *м* **1.** (*моц, трываласць*) Féstigkeit *f* -, Dáuerhaftigkeit *f* -; **2.** (*напояў, растворaў*) Stärke *f* -; Alkohólgehalt *m* -(e)s, -e (*віна*); **3.** (*што можна з'есці*) Stärkung *f* -; Erfríschung *f* - (*піццём*)
мацыёла *ж бат* Levkóje *f* -, *-n*
мацыён *м* Spazíergang *m* -(e)s, -gänge; ***для ~у*** um sich (*D*) Bewégung zu verschäffen [zu máchen]; ***рабі́ць ~*** sich (*D*) Bewégung verschäffen
мацюка́цца *груб* Schímpfworte im Múnde führen; (*з кім-н*) sich [einánder] Schímpfworte an den Kopf wérfen*
мацюкі́ *мн разм* únflätiges Flúchen
мацяру́шка *ж бат* Dost *m* -(e)s, -e, Dóstkraut *n* -(e)s
мацяры́к *м геагр, геал* Féstland *n* -(e)s, -länder; Kontinént *m* -(e)s, -e
мацяры́нск|і mütterlich, Mútter-; ***~ая любо́ў*** Mútterliebe *f* -
мацяры́нства *н* Mútterschaft *f* -; ***ахо́ва ~*** Mútterschutz *m* -es
ма́ча I *м нескл разм* Mácho [-ʧo] *m* -s, -s
мач|а́ II *ж фізіял* Harn *m* -(e)s, Urín *m* -s, -e; ***нетрыма́нне ~ы*** *мед* Inkontinénz *f* -; Enurésis *f* -; Béttnässen *n* -s (*у час сну*)
мачавы́ *фізіял* Harn-; ~ ***пузы́р*** *анат* Hárnblase *f* -, -n; ***~я камяні́*** *мед* Hárnstéine *pl*, Blásenstéine *pl*; ~ ***пясо́к*** Hárngrieß *m* -es
мача́ла *н* Bast *m* -es, -e; Bástfaden *m* -s, -fäden
мача́лка *ж* Bástwisch *m* -(e)s, -e
мача́нка *ж* (*страва*) Matschánka *f* - (*Stückchen Speck, Schweinefleisch und Wurst, gebraten mit Mehlzusatz*)
мачато́чнік *м анат* Hárnleiter *m* -s, -
ма́чаха *ж* Stíefmutter *f* -, -mütter
мача́ць táuchen *vt*, éintauchen *vt*; túnken *vt*, éintunken *vt*; stíppen *vt* (*напр хлебу малако*)
ма́чта *ж* Mast *m* -es, -e *i* -en; Mástbaum *m* -(e)s, -bäume
ма́чыха *ж гл* мачаха
мачы́цца **1.** uriníeren *vt*; hárnen *vi*; **2.** *зал. стан* benétzt wérden, nass wérden
мачы́ць **1.** (*змочваць*) ánfeuchten *vt*, befeúchten *vt*, wässern *vt*; nass máchen; benétzen *vt* (*высок*); **2.** (*вымочваць*) éinweichen *vt* (*бялізну*), rösten *vt* (*лён*)
машасто́вы *гл* замшавы
машкара́ *ж разм* Schnáken *pl*
машна́ *ж разм* Börse *f* -, -n; *перан* Géldsack *m* -(e)s, -säcke
машо́нка *ж* 1. *анат* Hódensack *m* -(e)s, -säcke; **2.** *уст* Géldbeutel *m* -s, -
машта́б *м* Máßstab *m* -(e)s, -stäbe; *перан тс* Maß *n* -es, -e, Áusmaß *n*; Dimensiónen *pl*; ***у грандыёзных ~ах*** in ríesigen Áusmaßen; ***у міжнаро́дным ~е*** auf internationáler Ébene; ***у малы́м ~е*** im Kléinen, im kléinen Maßstab, in kléinem Úmfang
машта́бны **1.** Máßstabs-; máßstabgerecht; **2.** *перан* groß ángelegt
машчы́нне *н разм* Pflástern *n* -s, Pflásterung *f* -
машы́на *ж* **1.** Maschíne *f* -, -n: ***шве́йная*** ~ Nähmaschine *f*; ***пра́льная*** ~ Wáschmaschine *f*; ***пасудамы́йная*** ~ Geschírrspülmaschine *f*, Geschírrspüler *m* -s, -; ***электро́нна-вылічы́льная*** ~ (*уст, скар* ЭВМ), Computer [kɔmp´ju:tər] *m* -s, -; ~ ***з праграмным кіраваннем*** prográmmgesteuerte Maschíne; **2.** (*аўтамабіль*) Áuto *n* -s, -s, Wágen *m* -s, -, Automobíl *n* -s, -e; ***грузава́я*** ~ LKW [ˌɛlkɑ´ve:] *m* -s, -s, Lást(kraft)wagen *m* -s, -; ***легкава́я*** ~ PKW [ˌpekɑ´ve:] *m* -s, -s, Persónen(kraft)wagen *m* -s, -; ***санітáрная*** ~ Kránkenwagen *m*; ***пажа́рная*** ~ Löschfahrzeug *n* -(e)s, -e; ***вае́нная*** ~ Kríegsmaschinerie *f* -; ***дзяржа́ўная*** ~ Stáatsmaschinerie *f* -
машынабудава́нне *н* Maschínenbau *m* -(e)s; ***цяжко́е*** ~ Schwérmaschinenbau *m*; ***хімі́чнае*** ~ Chemíeanlagebau *m*
машынабудаўні́ч|ы Maschínenbau -; ***~ае прадпрые́мства*** Maschínenbaubetrieb *m* -(e)s, -e
машыназна́ўства *н* Maschínenkunde *f* -
машына́льна *прысл;* **машына́льн|ы** mechánisch, maschinéll; ***~ыя ру́хі*** mechánische Bewégungen
машы́напіс *м* **1.** Maschíneschreiben *n* -s; **2.** (*тэкст*) Maschíne geschríebenes Manuskript
машынапі́сн|ы in Maschínenschrift, Maschíne geschríeben (*пра тэкст*); ***~ае бюро́*** Schréibbüro *n* -s, -s; ***~ая ко́пія*** Dúrchschlag *m* -(e)s, -schläge
машыні́ст *м* **1.** (*цягніка*) Lokomotívführer *m* -s, -, Lókführer *m*; **2.** (*механік*) Maschiníst *m* -en, -en; ~ ***экскава́тара*** Bággerführer *m* -s, -
машыні́стка *ж уст* Schréibkraft *f* -, -kräfte, Maschíne(n)schreiberin *f* -, -nen
машы́н|ка *ж* **1.** *разм* (*друкавальная*) *уст* Schréibmaschine *f* -, -n; ***друкава́ць на ~цы*** típpen *vt*; Maschíne schreiben*; ***яна́ друку́е на ~цы*** sie tippt [schreibt Maschíne]; **2.** (*швейная*) Nähmaschine *f* -, -n; **3.** (*для стрыжкі валасоў*) Háarschneidemaschine *f* -, -n
машы́нн|ы **1.** mechánisch; ***~ая апрацо́ўка*** maschinélle Beárbeitung; **2.** (*у дачыненні да машын*) Maschínen-; maschínenmäßig, maschinéll; ***~ае абсталява́нне*** maschinélle Éinrichtung; ***~ае аддзяле́нне*** Maschínenabteilung *f* -, -en
маэ́стра *м* Ma|éstro *m* -s, -s, Méister *m* -s, -

мая́к *м* **1.** Léuchtturm *m* -(e)s, -türme; Léuchtfeuer *n* -s, -; **2.** *перан* (léuchtendes) Vórbild *n* -(e)s, -er; Schríttmacher *m* -s, -
маянэ́з *м кул* Majonäse [Mayonnaise] [-ˊnɛ:-] *f* -, -n
маяра́н *м бат* Majorán *m* -(e)s, -e
ма́ятнік *м* Péndel *n* -s, -; Úhrenpendel *n* (*у гадзінніка*)
мегаге́рц *м фіз* Mégahertz *n* -, - (*скар* MHz)
мегафо́н *м* Mégaphon [Megafón] *n* -s, -e; Spráchrohr *n* -s, -e
мегéра *ж разм* Megäre *f* -, -n, Háusdrachen *m* -s, -
медаву́ха *ж* Met *m* -(e)s, Hónigwein *m* -(e)s
медалі́ст *м* **1.** Träger éiner Medaille [meˊdaljə], Medaillenträger *m* -s, -; *спарт* Medaillengewinner *m* -s, -; **2.** (*жывёла*) préisgekrönтes Tier
медáл|ь *м* Medaille [meˊdaljə] *f* -, -n; ***пáмятны ~ь*** Dénkmünze *f* -, -n; ***узнагарóдзіць ~ём*** mit éiner Medaille áuszeichnen; ◊ ***адварóтны бок ~я*** Kéhrseite der Medaille
медальён *м* Medaillon [medaˊljõ:] *n* -s, -s
медзведзяня́ *н* **1.** Bärenjunge *n* -n, -n; júnger [kléiner] Bär; Téddy(bär) *m* (*дзіцячая цацка*); **2.** *разм* (*пра чалавека*) kléiner Bär, únbeholfener (júnger) Mensch
медзеплавíльны Kúpferschmelz-; ~ ***завóд*** Kúpferhütte *f* -, -n; ~ ***цэх*** Kupfergießeréi *f* -, -en
мéдзісты kúpferig
медзь *ж тс хім* Kúpfer *n* -s; ***жóўтая ~*** Méssing *n* -s
медзякí *мн разм* Kúpfer *n* -s, Kúpfergeld *n* -(e)s; Kléingeld *n*
медíнстытýт *м* medizínische Hóchschule
медна-чырвóны kúpferrot
мéднік *м* Kúpferschmied *n* -(e)s, -e
мéдны kúpfern, Kúpfer-; ~ ***калчаáн*** *мін* Kúpferkies *m* -es, -e; ~ ***купарвáс*** *хім* Kúpfervitriol [-vi-] *m*, *n* -s, -e
медпýнкт *м* Sanitätsstelle *f* -, -n
медсанбáт *м* Sanitätsbataillon [-taˌljo:n] *n* -s, -e, Sanitätsstelle *f* -, -n
медсястрá *ж* Kránkenschwester *f* -, -n; Spréchstundenhilfe *f* -, -n (*якая дапамагае ўрачу ў час прыёму хворых*)
медýза *ж заал* Quálle *f* -, -n, Medúse *f* -, -n
медуні́ца *ж бат* Lúngenkraut *n* -(e)s
мéдык *м* **1.** (*урач*) Arzt *m* -es, Ärzte, Medizíner *m* -s, -; **2.** (*студэнт*) Medizíner *m*, Medizínstudent *m* -en, -en
медыкамéнт *м фарм* Medikamént *n* -(e)s, -e, Arznéi *f* -, -en, Arznéimittel *n* -s, -
медыкамéнтозн|ы *мед* medikamentös; ***~ае лячэ́нне*** medikamentöse Behándlung [Therapíe]
медытáцыя *ж* Meditatión *f* -, -en
мéдыум *м у розн. знач* Médium *n* -s, -di|en
медыцы́на *ж* Medizín *f* -, Héilkunde *f* -; ***судóвая ~*** geríchtliche Medizín, Geríchtsmedizin *f*
медыцы́нск|і, меды́чны *разм* medizínisch; ärztlich; ***~ія прóдкі*** Árznéimittel *pl*, Medikaménte *pl*, Arznéien *pl*; ***~ае пасвéдчанне*** ärztliches Attést, ärztliche Beschéinigung; ***~ая дапамóга*** ärztliche Hílfe; ***хýткая ~ая дапамóга*** (*установа*) Réttungsdienst *m* -es, -e; ***~ае абслугóўванне*** medizínische [ärztliche] Betréuung; ***~і пункт*** Sanitätsstelle *f* -, -n; ***~і рабóтнік*** Mítarbeiter des Gesúndheitswesens; ***~і персанáл*** medizínisches Personál
медыя́на *ж матэм, фін* Mediáne *f* -, -n
медыя́цыя *ж спец* Mediatión *f* -, -en
межава́нне *н* Ländvermessung *f* -, Féldvermessung *f*
межава́цца 1. grénzen *vi* (*з чым-н* an *A*); **2.** (*перамяжоўвацца*) (áb)wéchseln, aufeinánder fólgen *vi* (*s*)
межава́ць grénzen *vi* (*з чым-н* an *A*)
межавы́ Grenz-; ~ ***слуп*** Grénzpfahl *m* -s, -pfähle
мéзенец *м анат* kléiner Fínger (*на руцэ*); kléine Zéhe (*на назе*)
мекленбýргскі mécklenburgisch, Mécklenburg-
мексіка́нец *м* Mexikáner *m* -s, -
мексіка́нскі mexikánisch
мел *м* Kréide *f* -, -n; ***бялíць ~ам*** mit Kréide fárben [ánmalen], kréiden *vt*
меладрáма *ж літ, кіно, тс перан* Melodráma *n* -s, -men
мелады́чны 1. *муз* melódisch; **2.** wóhlklingend, wóhltönend, melódisch
меламáн *м* Musíkfan [-fɛn] *m* -s, -s, (léidenschaftlicher) Musíkliebhaber; Musík-Treak [tri:k] *m* -s, -s (*разм*)
мелáнж *м спец* Melánge [meˊlã:ʒ(ə)] *f* -, -en; Míschung *f* -, -en, Gemísch *n* -(e)s, -e
меланхалíчны melancholisch [-laŋˊko:-], schwérmütig
меланхóлік *м* Melancholiker [-laŋˊko:-] *m* -s, -
меланхóлія *ж* Melancholíe [-laŋko-] *f* -, Schwérmut *f* -; ◊ ***чóрная ~*** Depressión *f* -
мéлес *м с.-г* Melásse *f* -, -n
мелізнá *ж* níedriger Wásserstand; séichte Stélle
меліярацы́йны *с.-г* Melioratións-
меліярáцыя *ж с.-г* Melioratión *f* -
мелкавáта *прысл* zíemlich seicht
мелкавóддзе *н разм* níedriger Wásserstand; séichte Stélle (*мелкае месца*), Furt *f* -, -en
мелкавóдны *разм* seicht, mit níedrigem Wásserstand; wásserarm
мéлк|і 1. (*неглыбокі, плыткі*) seicht, nicht tief; flach (*пра посуд*); ***~ая ракá*** ein séichter Fluss; ***~ая талéрка*** flácher Téller; **2.** (*невялікі*) klein, Klein-; ***~ая жывёла*** Kléinvieh *n* -(e)s
мелóдыя *ж* Melodíe *f* -, í|en; Wóhlklang *m* -(e)s (*мілагучнасць*)
мел|ь *ж* Sándbank *f* -, -bänke; Úntiefe *f* -, -n; ***сéсці на ~ь*** stránden *vi* (*s*), auf éine Sándbank geráten*; *перан разм* in éine schwíerige Láge geráten* [kommen*]; ◊ ***сядзéць на мéлі*** auf dem Tróck(e)nen sítzen*
мéлькам *прысл разм* flüchtig; ***зірнýць ~*** flüchtig ánsehen*
мéльнік *м разм гл* млынар
мельхіёр *м спец* Néusilber *n* -s, Argentán *n* -s
мемарáндум *м паліт, дып* Memorándum *n* -s, -den *i* -da, Dénkschrift *f* -, -en
мемарыя́л *м* **1.** Gedénkstätte *f* -, -n; Dénkmal *n* -s, -mäler *i* -e (*помнік*); Máhnmal *n* -s, -e *i* -mäler (*помнік ахвярам трагічных падзей*); **3.** (*спартыўнае спаборніцтва*) Memoriál *n* -s, -s
мемарыя́льн|ы Gedénk-; ***~ая дóшка*** Gedénktafel *f* -, -n
мембрáна *ж спец* Membrán *f* -, -en, Membráne *f* -, -n
мемуáрны *літ* Memoiren- [meˊmwa:rən-]; ***~ная літаратýра*** Memoirenliteratur *f* -
мемуáр|ы *мн літ* Memoiren [meˊmwa:rən]
мéна *ж камерц* Tausch *m* -(e)s, -e
менавíта *часц* **1.** (*тс пры пераліку*) nämlich, und zwar; ***хто ~?*** wer denn?; ***калí ~?*** wann denn?, und zwar wann?; **2.** (*якраз*) geráde; ében; áusgerechnet; ~ ***пра гэ́та ідзе́ размóва*** geráde [ében] davón ist die Réde; ~ ***тамý*** ébendéshalb; ~ ***так*** genáuso; ~ ***гэ́ты*** ébendieser, ~ ***гэ́тая*** ébendiese; ~ ***гэ́та*** ebendíes; ***вось ~!*** das ist es ja ében, ganz recht!, genáuso ist es!
менавы́ Tausch-; ***~ая вáртасць*** *эк* Táuschwert *m* -(e)s, -e
мéнеджар *м* Manager [ˊmɛnɪdʒər] *m* -s, -, Geschäftsführer *m*, Léiter *m* -s, -
мéнеджмéнт *м эк* Management [ˊmɛnɪdʒ-] *n* -s, Geschäftsführung *f*
мéней *прысл гл* менш
мéнець wéniger wérden, sich verríngern
мензýрка *спец* Mensúr *f* -, -en
менíск *м анат* Menískus *m* -, -ken
менструáцыя *ж фізіял* Menstruatión *f* -, -en, Régel *f* -, -n, Periód*e f* -, -n
мента́льнасць *ж антр* Mentalität *f* -, -en
мéнтар *м* Méntor *m* -s, -tóren
мéнтарскі Méntor-, Schúlmeister-; ~ ***тон*** Schúlmeisterton *m* -s
ментóл *м фарм* Menthól *n* -s
менуэ́т *м муз* Menuétt *n* -(e)s, -e
менш *прысл* (*выш. ступ ад* мала) wéniger; mínder (*уст*); ~ **за ўсё** am (áller)wénigsten; ◊ ***не больш не ~ як...*** nicht mehr und nicht wéniger als...

ме́ншасць *ж* Minderheit *f*-, -en; ***нацыяна́льная ~*** nationále Mínderheit

ме́ншаць sich verríngern, kléiner wérden; zusámmenschrumpfen *vi* (*s*) (*скарачацца, скручвацца*); ábnehmen* *vi*, zurückgehen* *vi* (*s*) (*слабець*)

ме́нш|ы (*выш. ступ ад* малы) der kléinere; ***са́мы ~*** der kleinste; jünger (*малодшы*); ***~ая ча́стка*** der kléinere Teil; ***~ае зло*** das kléinere Übel; ◊ ***па ~ай ме́ры***, ***са́мае ~ае*** wénigstens, míndestens, zumíndest, zum Míndesten

меню́ *н* **1.** (*падбор страў*) Spéisenfolge *f*-, -n, Menü *n* -s -s; **2.** (*картка з пералікам страў*) Spéisekarte *f*-, -n, Menü *n*; **3.** *камп* Menü *n*; ***адкры́ць ~*** das Menü öffnen; ***радо́к ~*** Menüleiste *f*-, -n; ***спіс ~, які адкрыва́ецца ў праграме́*** das áufklappernde Menü

ме́р|а *ж* **1.** (*адзінка вымярэння*) Maß *n* -es, -e; Máßeinheit *f*-, -en; ***~а даўжыні́*** Längemaß *n*; **2.** (*памер*) Maß *n*, Ausmaß *n*; ***у по́ўнай ~ы*** in vóllem Máße, vollkómmen; ***найвышэ́йшая ~а пакара́ння*** höchstes Stráfmaß, Höchststrafe *f*-, -n; ***ве́даць*** [***знаць***] ***~у*** Maß hálten*; **3.** (*мерапрыемства*) Máßnahme *f*-, -n; Schritt *m* -(e)s, -e; ***антыінфляцы́йныя ~ы*** *эк* Antiinflatiónsmaßnahmen *pl*; ***тэрмі́новыя ~ы*** Sofórtmaßnahmen *pl*; ***~ы засця́ро́гі*** Sícherheitsmaßnahmen *pl*; ***прыня́ць ~ы*** Máßnahmen ergréifen* [tréffen*]; ***па ~ы таго́, як ...*** je nach...; je nachdém wie ...; ***па ~ы сі́л*** [***магчы́масці***] nach Möglichkeit, sowéit möglich; ***без ~ы*** máßlos, únmäßig; ***у ~у*** mit Maß; ***па ме́ншай ~ы*** wénigstens; ***звыш ~ы*** übermäßig, über die Máßen; ◊ ***усё до́бра, калі́ ў ме́ру*** álles hat sein Maß

мерапрые́мства *н* **1.** *гл* мера; **2.** (*зробленыя справы*) Veránstaltung *f*-, -en, Aktión *f*-, -en; ***спартыўнае ~*** Spórtveranstaltung *f*

ме́рацца sich méssen*; ***~ сі́лай з кім-н*** séine Kräfte mit *j-m* méssen*

ме́раць 1. méssen* *vt*; ***~ ме́трам*** nach dem Méter méssen*; ***~ на во́ка*** nach dem Áugenmaß bestímmen; **2.** (*прымярацъ*) ánprobieren *vt*; ◊ ***~ на свой аршы́н*** *разм* mit éigenem Maß méssen*

ме́ргель *м геал* Mérgel *m* -s, -

мерзлата́ *ж* Bódenfrost *m* -es; Verfróstung *f*-; ***ве́чная ~*** *геал* Dáuerfrost *m*, Dáuerfrostboden *m* -s, -böden

ме́рзлы gefróren; durchfróren, hart gefróren (*замерзлы*)

ме́рзнуць 1. fríeren* *vi*; **2.** (*гінуць ад холаду*) erfríeren* *vi* (*s*)

ме́рк|а *ж* Maß *n* -es, -e; ***зняць ~у*** Maß néhmen*; ◊ ***мераць усё*** [***усі́х***] ***адно́й ~й*** álles [álle] über éinen Kamm schéren*

меркава́нне *н* Háltung *f*-, -en, Ständpunkt *m* -es, -punkte; Überlégung *f*-, -en; Erwägung *f*-, -en; Betráchtungen *pl*

меркава́цца 1. *часцей безасаб* (*мецца на ўвазе*): ***мяркуецца, што...*** es ist ánzunehmen, dass...; voráussichtlich...; **2.** (*раіцца, дамаўляцца*) sich untereinánder beráten*, éinen Rat hálten*

меркава́ць 1. überlégen *vt*, erwägen* *vt*; úrteilen *vi* (*пра што-н* über *A*); spréchen* *vi*, réden *vi* (über *A*); **2.** (*рабіць высновы, дапушчэнні*) zum Schluss kómmen*, Schlússfolgerungen [Fólgerungen] zíehen*; ánnehmen* *vt*, vermúten *vt*

меркантыліза́м *м* Merkantilísmus *m* -

меркантыльна́сць *ж* Kleinkrämerei *f*-, Pfennigfuchserei *f*-

меркантыльны kléinlich, beréchnend

мёркнуць *разм* verblássen *vi* (*s*); erlöschen* *vi* (*s*); trübe [fahl] wérden; ***~ зо́ркі*** die Stérne verblássen

мёрна *прысл* geméssen, gléichmäßig; rhýthmisch

мёрнасць *ж* Geméssenheit *f*-

мёрн|ы 1. (*рытмічны, роўны*) geméssen; rhýthmisch; ***~ым кро́кам*** geméssenen Schrittes; **2.** *тэх* (*які служыць мерай чаго-н*) Maß-, Méss-; ***~ая стужка*** Máßband *n* -(e)s, -bänder

мёрці *разм* (*гінуць, паміраць*) stérben* *vi* (*s*); úmkommen* *vi* (*s*)

мерыдыя́н *геагр* Meridián *m* -s, -e, Míttagskreis *m* -es, -e, Längengrad *m* -es, -e

ме́рын *м заал* Wállach *m* -s, -e

мерыно́с *м* **1.** (*авечка*) Meríno *m* -s, -s, Merínoschaf *n* -(e)s, -e; **2.** (*воўна*) Merínowolle *f*-

ме́рыцца *разм* (*намервацца*) beábsichtigen *vt*, vórhaben *vt*, die Ábsicht háben; im Sínne háben

мёсіва *н* (*вадкая маса*) Gemísch *n* -es; Másse *f*-, Schlamm *m* -(e)s (*гразь*)

месія *м рэл, тс перан* Messías *m* -

мясніцтва *н* **1.** *гіст* Ámtsbesetzung *f*- nach Gebúrtsrecht; **2.** (*вузкамесніцкія інтарэсы*) Lokálpatriotismus *m* -, Kírchturmpolitik *f*-

мясны́: ***~ скло́н*** *грам* Lokatív *m* -s, -e, Präpositív *m* -s

ме́ста *н разм, гіст* Stadt *f*-, Städte

мястачко́в|ы Márktflecken-, Márkt-; ***~ае насе́льніцтва*** Bevölkerung éines Márktfleckens

ме́сц|а *н* **1.** Platz *m* -es, Plätze; Ort *m* -es, -e; Stélle *f*-, -n; Sitz *m* -es, -e, Sítzplatz *m* (*сядзення*); ***арандава́ць ~а*** *камерц* Stélle [Platz, Raum] míeten; ***прыбы́ць на ~а прызначэ́ння*** an Ort und Stélle ánlangen; ***~а прызначэ́ння*** Bestímmungsort *m*;***працо́ўнае ~а*** Árbeitsplatz *m*; ***~а рабо́ты*** Árbeitsstelle *f*; ***~а нараджэ́ння*** Gebúrtsort *m*; ***~а знахо́джання*** (*самалёта, судна і г. д*) Ständort *m*, Positión *f*-, -en; ***за́ла на сто ~аў*** ein Saal mit húndert Plätzen; ***у шмат які́х ~ах*** vielerorts; ***у по́ўных ~ах*** máncherorts; ***ні з ~а!*** nicht von der Stélle rühren!; ***заня́ць ~а*** (*для каго-н*) éinen Platz fréihalten* *аддз* (besétzen, reservieren [-ˊvi:-]); (*сесці*) Platz néhmen*; ***заня́ць пе́ршае ~а*** *спарт* den érsten Platz belégen; ***~а здаро́ння*** *юрыд* Tátort *m*, Ort des Geschéhens; ***злаві́ць на ~ы злачы́нства*** *юрыд* auf fríscher Tat ertáppen; ***~а сустро́чы*** Tréffpunkt *m* -(e)s, -e; ***ста́віць на пе́ршае ~а*** an die érste Stélle rücken [stéllen]; **2.** (*мясцовасць*) Gégend *f*-, -en; Gelände *n* -s, -; Ort *m*; ***балоцістае ~а*** Súmpfgebiet *n* -(e)s, Súmpfgelände *n*; **3.** *разм* (*служба, работа, пасада*) Stéllung *f*-, -en, Stélle *f*-, -n, Ánstellung *f*; Pósten *m* -s, -; ***вака́нтнае ~а*** fréie [únbesetzte] Stélle; ***займа́ць ~а*** ein Amt bekléiden; éinen Pósten éinnehmen* [bekléiden]; **4.** (*урывак твора*) Stélle *f*-, -n, Pássus *m* -, -; ***прачыта́й гэ́тае ~а яшчэ́ раз*** lies diese Stélle noch éinmal; **5.** (*багажная рэч*) Gepäckstück *n* -(e)s, -e, Stück *n*; ***два ~ы багажу́*** zwei Gepäckstücke; ◊ ***на го́лым ~ы*** (*зрабіць што-н*) aus dem Nichts heráus; ***ву́зкае ~а*** schwáche Stélle; ***душа́ не на ~ы*** kéine Rúhe finden können*; ***з ~а ў кар'е́р*** auf Ánhieb; ***паста́віць каго-н на*** (***сваё***) ***~а*** *j-n* zuréchtweisen* *аддз*, *j-n* in séine Schránken verwéisen*

месцажыха́рства *н* Wóhnort *m* -(e)s, -e; Wóhnsitz *m* -(e)s, -e, Áufenthaltsort *m*

месцазнахо́джанне *н* Áufenthaltsort *m* -(e)s, -e; Verbléib *m* -(e)s

ме́сцамі *прысл* stéllenweise; an éinigen Stéllen; strichweise, gebíetsweise (*пра надвор'е*)

месцапражыва́нне *н* Wóhnort *m* -(e)s, -e, Wóhnsitz *m* -(e)s, -e

ме́сцейка *ж разм памянш* Plätzchen *n* -s, -; ◊ ***цёплае ~*** vórteilhafter [gewínnbringender] Pósten; ***ён падшука́ў сабе́ цёплае ~*** er hat éine éinträgliche Stéllung gefúnden

мясці́ 1. (*ачышчаць ад пылу і г. д*) kéhren *vt*, fégen *vt*; **2.** *безас*: ***мяце́*** (*пра мяцеліцу, завею*) es stöbert

месьé *м* Monsieur [məˊsjø:] *m* -s, *pl* Messieurs [meˊsjø:]

мяся́ц *м* **1.** (*нябеснае цела*) Mond *m* -(e)s; ***по́ўны ~*** Vóllmond *m*; **2.** (*адрэзак часу*) Mónat *m* -(e)s, -e; ***бягу́чы ~*** láufender Mónat; ***насту́пны ~*** kómmender [nächster] Mónat; ***у пача́тку ~а*** am Mónatsanfang; ***у канцы́ ~а*** Énde des Mónats; ***~ таму́*** (***наза́д***) (heute) vor éinem Mónat; ◊ ***мядо́вы ~*** Flítterwochen *pl*

месяца́мі *прысл* mónatelang

месяцападо́бны móndförmig

мяся́чнік *м*: ***~ дзіця́чай кні́гі*** Mónat der Kínderbücher

мяся́чны 1. Mónats-; mónatlich (*штомесячны*); ***~ тэ́рмін*** Mónatsfrist *f*-, ein Mónat Zeit; **2.** (*які тычыцца нябеснага цела*) Mond-; **3.:** ***~я фізія́л*** *гл* менструацыя

ме́тад *м* Methóde *f*-, -n; Verfáhren *n* -s, -; ***~ рабо́ты*** Árbeitsweise *f*-; ***~ вымяра́ння*** Méssverfahren *n*; ***пато́чны ~*** Flíeßbandverfahren *n*, Táktverfahren *n*

метадалагі́чны methodológisch

метадало́гія *ж* Methodologíe *f* -, -i|en
метады́ст *м* **1.** Methódiker *m* -s, -; **2.** *рэл* Methodíst *m* -en, -en
метады́чны **1.** (*планамерны*) methódisch, plánmäßig; systemátisch; **2.** (*які мае адносіны да методыкі*) methódisch
мета́л *м* Metáll *n* -s, -e; ***каляро́вы*** ~ Búntmetall *n*, Níchteisenmetall *n* (*скар* NE-Metall); ***парашко́вы*** ~ Síntermetall *n*; ***высакаро́дны*** ~ Édelmetall *n*
металаапрацо́ўка *ж* Metállverarbeitung *f* -
металаапрацо́ўч|ы metállverarbeitend, Metáll-; ***~ая прамысло́васць*** Metállindustrie *f* -
металаёмістасць *ж эк* Metálleinsatz *m* -es, Metállverbrauch *m* -s, Metállintensität *f* -
металало́м *м* Schrott *m* -(e)s, Áltmetall *n* -s
металано́сны metállhaltig
металарэ́зны metállabhebend; spánabhebend; Zerspánungs-; metállzerspanend; ~ ***стано́к*** Metállbearbeitungsmaschine *f* -, -n, spánabhebende Wérkzeugmaschine *f* -, -n
металі́ст *м* Metállarbeiter *m* -s, -
металі́чны metállisch, metállen, Metáll-; ***~я гро́шы*** Metállgeld *n* -(e)s, Hártgeld *n*, Münzgeld *n*
металу́рг *м* Metallúrg *m* -en, -en; Hüttenwerker *m* -s, -, Hüttenarbeiter *m* -s, -
металургі́чны metallúrgisch, Hütten-; ~ ***заво́д*** Hüttenwerk *n* -s, -e
металу́ргія *ж* Metallurgíe *f* -; Hüttenkunde *f* -; ***чо́рная*** ~ Éisen- und Stáhlindustrie *f* -; ***парашко́вая*** ~ Púlvermetallurgie *f* -, Síntermetallurgie *f*
метамарфо́за *ж тс філас* Metamorphóse *f* -, -n, Verwándlung *f* -, -en; ***з ім адбыла́ся*** ~ er ist wie áusgewechselt
мета́н *м хім* Methán *n* -s, Methýlwasserstoff *m* -(e)s, Súmpfgas *n* -es, Grúbengas *n*
метані́мія *ж літ* Metonymíe *f* -, -i|en
метаста́з *м мед* Metastáse *f* -, -n
метатэ́за *ж лінгв* Metathése *f* -, -n, Metathésis *f* -, -sen
мета́фара *ж літ* Metápher *f* -, -n
метафары́чны *літ, маст* metaphórisch, bíldlich; ~ ***сэнс*** übertrágener Sinn, metaphórische Bedéutung
метафі́зіка *ж філас* Metaphysík *f* -n
метафізі́чны *філас* metaphýsisch
метафра́за *ж* Metaphráse *f* -, -n
ме́тка *ж* (*знак*) Zéichen *n* -s, -, Markíerung *f* -, -en; Mérkzeichen *n*, Kénnzeichen *n*
ме́ткі *разм гл* трапны
мето́дыка *ж* Methódik *f* -, -en; Methóden *pl*
метр I *м* (*адзінка даўжыні*) Méter *n* (*разм m*) -s, -; ***кубі́чны*** ~ Kubíkmeter *n* (*скар* m³); ***квадра́тны*** ~ Quadrátmeter *n* (*скар* m²); ***пагО́нны*** ~ láufender Méter; ***эталО́нны*** ~ Úrmeter *n*; **2.** (*лінейка, стужка*) Métermaß *n* -es, -e
метр II *м* **1.** *літ* Vérsmaß *n* -es, -e; Métrum *n* -s, -tren; ***ямбі́чны*** ~ Jámbus *m* -, -ben, jámbisches Vérsmaß; **2.** *муз* Táktmaß *n* -es, -e
метра́ж *м* **1.** (*даўжыня*) Méterzahl *f* -, Länge in Métern; **2.** (*плошча*) Größe in Quadrátmetern
метралагі́чны metrológisch
метрало́гія *ж* Metrologíe *f* -
метрано́м *м тс муз* Metronóm *n* -s, -e; Táktmesser *m* -s, -
метрапалітэ́н *м* Úntergrundbahn *f* -, -en, Ú-Bahn *f*
метрапо́лія *ж паліт* Metropóle *f* -, -n; Zéntrum *n* -s, Zéntren
метро́ *н* Ú-Bahn *f* -; Métro *f* -, -s; *гл тс* метрапалітэн
ме́трыка I *ж* (*пасведчанне аб нараджэнні*) Gebúrts|urkunde *f* -, -n
ме́трыка II *ж літ, тс перан* Métrik *f* -, -en
метры́чны I *літ* métrisch
метры́чн|ы II (*які мае адносіны да метрык*): ***~ае пасве́дчанне*** Gebúrtsurkunde *f* -, -n; ***~ая кні́га*** Gebúrtsregister *n* -s, -, Gebúrtsbuch *n* -(e)s, -bücher
метры́чн|ы III (*пра сістэму вымярэнняў*) métrisch; ***~ая сістэ́ма вымярэ́нняў*** métrisches Máßsystem
ме́тчык *м* **1.** (*чалавек*) Markíerer *m* -s, -, Stémpler *m* -s, -, Wárenstempler *m*, Zéichner *m* -s, -; **2.** (*інтрумент*) Gewíndebohrer *m* -s, -, Schnéidbohrer *m*
меты́л *м хім* Methýl *n* -s
меты́с *м* **1.** *біял* Míschling *m* -(e)s, -e; **2.** *антр* Mestíze *m* -n, -n
метэаралагі́чн|ы metereológisch; Wétter-; ***~ая слу́жба*** Wétterdienst *m* -(e)s; ***~ая ста́нцыя*** Wétterwarte *f* -, -n, metereológische Statión; ***~ая зво́дка*** Wétterbericht *m* -(e)s, -e
метэаралО́гія *ж* Meteorologíe *f* -, Wétterkunde *f* -
метэаро́лаг Meteorológe *m* -n, -n
метэары́т *м астр* Meteorít *m* -(e)s, -e
метэары́тны, метэО́рны *астр* meteórisch, Meteór-
метэО́р *м астр, тс перан* Meteór *m*, *n* -s, -e, Stérnschnuppe *f* -, -n; ◊ ***бліснУць ~ам*** wie ein Meteór áufleuchten
мех I *м* Sack *m* -(e)s, Säcke; Béutel *m* -s, -
мех II *м спец* (*прыстасаванне для напампоўвання паветра*) Blásebalg *m* -(e)s, -bälge
механізава́ны mechanisíert, mechánisch; ***~я во́йскі*** *вайск* motorisíerte Trúppen
механізава́ць mechanisíeren *vt*
механіза́тар *м* Mechanisátor *m* -s, -tóren
механіза́цыя *ж* Mechanisíerung *f* -; ***по́ўная*** ~ Vóllmechanisierung *f*, dúrchgehende Mechanisíerung
механізі́раваны *разм гл* механізаваны
механі́зм *м* **1.** *тэх* Mechanísmus *m* -, -men; Tríebwerk *n* -(e)s, -e, Vórrichtung *f* -, -en; ***гадзі́ннікавы*** ~ Úhrwerk *n*; ***перада́тачны*** ~ Kráftübertragung *f* -; ***пад'ёмны*** ~ Hébezeug *n* -(e)s, -e; **2.** *перан* Mechanísmus *m* -, -men; ~ ***зваро́тнай су́вязі*** Rückkoplungsmechanismus *m*
меха́нік *м* Mechániker *m* -s, -; ***інжынЕр-*** ~ Maschíneningenieur [-ˌnjø:r] *m* -s, -e
меха́ніка *ж* **1.** Mechánik *f* -; ***дакла́дная*** ~ Féinmechanik *f*; **2.** (*складаная сутнасць*) Zusámmenhang *m* -(e)s, -hänge; *разм* Máchwerk *n* -(e)s, -e; ***хі́трая*** ~ *разм* schláues Máchwerk
механі́чна *прысл;* **механі́чны 1.** *фіз, тэх* mechánisch, sélbsttätig, Maschínen-, maschinéll; ~ ***прЫвад*** Maschínenantrieb *m* -(e)s, -e; **2.** (*машынальны, аўтаматычны*) mechánisch, automátisch, únwillkürlich; ***~я ру́хі*** mechánische [únwillkürliche] Bewégungen
мЕ́ціцца *разм* **1.** (*цэліцца*) zíelen *vi* (*у што-н у каго-н* auf *A*); ~ ***з ружжа́*** das Gewéhr ánlegen; **2.** (*мець намер*) *гл* мерыцца
мЕ́ціць I (*намячаць*) markíeren *vt*; bezéichnen *vt*, zéichnen *vt*; ~ ***бялі́зну*** die Wäsche zéichnen
мЕ́ціць II *разм* **1.** (*цэліць*) zíelen *vi* (*у каго-н, у што-н* auf *A*); **2.** (*намякаць*) ánspielen *vi* (*на каго-н, у што-н, у каго-н* auf *A*); **3.** *разм* (*імкнуцца да чаго-н*) erzíelen *vt*, erstrében *vt*; ***~ высО́ка*** hoch hináus wóllen*; ***кудЫ ён ~?*** woráuf will er hináus?
мЕ́цца **1.** (*быць у наяўнасці*) háben* *vt*, besítzen* *vt*; **2.** (*адчуваць сябе*) sich fühlen; ***як мА́ешся?*** wie geht es dir? **3.:** ***мА́ецца*** es gibt, es bestéht, es ist vorhánden; ***мА́ецца магчЫмасць*** es bésteht die Möglichkeit, es gibt éine Möglichkeit; ***мА́юцца ўсе падста́вы*** wir háben állen Grund; ***мА́ецца на ўва́зе ...*** geméint ist...
мець háben *vt*; besítzen* *vt* (*валодаць*); im Besítz sein; verfügen *vi* (*распараджацца чым-н* über *A*); ~ ***пра́ва*** das [ein] Recht háben (*на што-н* auf *A*); ~ ***намЕр*** die Ábsicht háben; beábsichtigen *vt*; ◊ ~ ***галаву́ на плячА́х*** Grips im Kopf háben
мецэна́т *м* Mäzén *m* -s, -e
меч *м гіст, тс перан* Schwert *n* -(e)s, -er; ***вЫняць*** ~ das Schwert zíehen* [zücken]; ◊ ***аддА́ць агнЮ і мячУ*** mit Féuer und Schwert áusrotten; ***дамО́клаў*** ~ Dámoklesschwert *n*
мЕ́чаны gekénnzeichnet; markíert, gezéichnet
мешані́на *ж разм* Míschmasch *m* -(e)s, Kraut und Rüben
мЕ́шанка *ж разм* gemíschtes Fútter (*für Haustiere*)
мешкава́ты **1.** *разм* (*пра вопратку*) sáckartig, únförmig; zu weit; **2.** (*пра чалавека*) plump, únbeholfen
мешкаві́на *ж* Sáckleinen *n* -s, Sáckleinwand *f* -

мешчанін *м гіст* Kléinbürger *m* -s, -; **2.** *перан* Spießbürger *m*, Spießer *m* -s, -, Philíster *m* -s, -
мёд *м* **1.** Hónig *m* -s; ***со́тавы ~*** Schéibenhonig *m*; ***штýчны ~*** Kúnsthonig *m*; ***сало́дкі як ~*** hónigsüß; **2.** (*напой*) Met *m* -(e)s, Hónigwein *m* -(e)s
мёрзлы *гл* мерзлы
мёртванаро́джаны *тс перан* tot gebóren
мёртв|ы tot; ***~ы пункт*** *тэх* Tótpunkt *m* -(e)s, -e; tóter Punkt (*тс перан*); ***~ая пятля́*** *ав* Looping [ˊlu:-] *n* -s, -s; ◊ ***спаць ~ым сном*** wie ein Tóter schläfen*; ***~ы сезо́н*** Fláute *f* -; ***~ая гадзі́на*** Rúhestunde *f* -, -n
міг *м разм* Áugenblick *m* -(e)s, -e; Momént *m* -(e)s, -e; ***на ~*** für éinen Áugenblick; ***у адзі́н ~*** im Nu, im Áugenblick, im Hándumdrehen; *гл* імгненне
міга́лка *жс спец* Blínklampe *f* -, -n, Wárnleuchte *f* -, -n; Bláulicht *n* -es
мі́гам *разм* blítzschnell; in [mit] Windeseile, im Nu, im Hándumdrehen, in éinem Áugenblick
міга́нне *н* Blínzeln *n* -s, Zwínkern *n* -s
мігацо́нне *н* Flímmern *n* -s (*зорак*); Fláckern *n* -s (*свечкі, лямпы і г. д*)
мігацо́ць, міга́ць, мігну́ць fúnkeln *vi* (*пра зоркі*); fláckern *vi* (*пра свечку, пра лямпу*)
мігр(ы́р)ава́ць migríeren *vi*, wándern *vi*
мігра́цыя *жс* Migratión *f* -, -en; Wánderung *f* -, -en
мігро́нь *жс мед* Migräne *f* -
мігцо́ць 1. *гл* мігацець; **2.** (*хутка праносіцца, мільгаць*) vorbéisausen *vi* (*s*); ***~ пе́рад вача́мі*** an den Áugen vorbéiziehen* [vorbéijagen]
мі́дыя *жс заал* Míesmuschel *f* -, -n
між *прыназ гл* паміж
міжба́нкаўскі *эк, фін* Zwíschenbanken-
міжво́льна *прысл* únwillkürlich
міжво́льны 1. únwillkürlich; **2.** (*выпадковы*) zúfällig, Zúfalls-
міжгалі́но́вы *эк* branchenübergreifend [ˊbrãʃən-], zwíschenzweiglich
міжгаро́дні Fern-; Überland-; ***~ аўто́бус*** Überlandbus *m* -ses, -se
міжзана́льны interzonál, Interzónen-; ***~ га́ндаль*** *камерц* interzonáler Hándel, Interzónenhandel *m* -s
міжземнамо́рскі *геагр* míttelländisch
міжнаро́дн|ы internationál; ***~ыя су́вязі*** internationále Beziehungen; ***~ы агля́д*** internationále Úmschau; ***~ае пра́ва*** Völkerrecht *n* -(e)s, internationáles Recht; ***~ае аге́нцтва па а́тамнай эне́ргіі*** (*скар* МАГАТЭ) Internationále Átomenergie-Agentúr (*скар* IAEA)
міжнацыяна́льны *паліт, дып* **1.** Beziehungen zwíschen nationálen Grúppen betréffend; **2-** *гл* міжнародны
міжпарла́менцкі interparlamentárisch
міжплане́тны interplanetárisch; interplanetár; Raum -, Weltraum-
міжро́ўча *жс геагр* Zwíschenstromland *n* -(e)s, Gebíet zwíschen zwei Flüssen
міжура́давы *паліт, дып* zwíschenstaatlich
міжусо́біца *гіст, тс перан жс* Zwíst *m* -(e)s, -e, Zwístigkeit *f* -, -en, Konflíkt *m* -(e)s, -e
міжтэрытарыя́льны interterritoriál
мізантраті́чны misanthrópisch, ménschenscheu, ménschenfeindlich
мізантро́п *м* Misanthróp *m* -en, -en, Ménschenfeind *m* -(e)s, -e, Ménschenhasser *m* -s, -
мізо́рнасць *жс* Misére *f* -, Ärmlichkeit *f* -, Erbärmlichkeit *f* -
мізо́рны miserábel, ármselig, erbärmlich; ***~ кава́лачак*** wínziges Stückchen
міка́да *м гіст* Mikádo *m* -s, -s
мікрааргані́зм *м біял* Mikroorganísmus *m* -, -men
мікрааўто́бус *м* Mínivan [-ˌvɛn] *m* -s, -s; Kléinbus *m* -ses, -se
мікрабіялогія *жс* Míkrobiologie *f* -
мікраклі́мат *м спец* Míkroklima *n* -s, Lokálklima *n*
мікрапрацэ́сар *м камп* Mikroprozéssor *m* -s, -ssóren
мікрараён *м* (néues) Wóhnviertel [Stádtviertel]
мікраскапі́чны mikroskópisch
мікраско́п *м спец* Mikroskóp *n* -(e)s, -e; ***электро́нны ~*** Elektrónenmikroskop *n*
мікрафі́льм *м* Míkrofilm *m* -(e)s, -e
мікрафо́н *м спец* Mikrofón *n* -s, -e; ***за́піс з ~а*** Mikrofónaufnahme *f* -, -
мікрахва́лев|ы Míkrowellen-; ***~ая печ(ка)*** Míkrowellenofen *m* -s, -öfen
мікрахвалёўка *жс разм* Míkrowellenofen *m* -s, -öfen
мікраэлектро́ніка *жс* Mikro|elektrónik *f* -
мікраэлектро́нны mikro|elektrónisch
мікро́б *м біял* Mikróbe *f* -, -n
мікро́метр *м тэх* Mikrométer *n* -s, -
мікро́н *м* Mikrométer *n* -s, - (*скар* µm), Míkron *n* -s, - (*уст*)
мі́ксер *м* Míxer *m* -s
мікстýра *жс фарм, мед* Mixtúr *f* -, -en
мі́ла *прысл* líebenswürdig; rührend, zárt, zärtlich (*ласкава*)
мілава́цца schmúsen *vi*, kúscheln *vi*, einánder liebkósen
мі́лаваць (*дараваць віну*) begnádigen *vt*, *j-m* éine Stráfe erlássen*
мілава́ць (*любіць*) liebkósen *неаддз vt*
мілаві́днасць *жс* Líeblichkeit *f* -, Ánmut *f* -
мілавідны líeblich, nett, ánmutig
мілагу́чнасць *жс* Wóhllaut *m* -(e)s, Wóhlklang *m* -(e)s
мілагу́чны wóhlklingend
міласці́ва *прысл;* **міласці́вы** *кніжн* gnädig; wóhlwollend (*добразычлівы*)
мі́ласцін|а *жс* Álmosen *n* -s, -; ***прасі́ць ~у*** bétteln *vi*; um Álmosen bítten*
мі́ласц|ь *жс* **1.** (*ахвяраванне*) Gnáde -, -n, Gnádenbezeigung *f* -, -en, Gnádenbezeugung *f* -, -en; **2.** (*велікадушнае стаўленне*) Gnáde *f* -; Güte *f* -; ***Ва́ша ~ь*** *уст* Éuer Gnáden!; ◊ ***змяні́ць гнеў на ~ь*** Gnáde für [vor] Recht ergéhen lássen*; ***зда́цца на ~ь перамо́жцы*** sich dem Síeger auf Gnáde oder [und] Úngnade ergében*
міласэ́рна|сць *жс* Barmhérzigkeit *f* -, Wóhltätigkeit *f* -, Míldtätigkeit *f* -; ***сястра́ ~і*** *уст* Kránkenschwester *f* -, -n, barmhérzige Schwéster
міласэ́рны barmhérzig, míldtätig
мілата́ *жс* Hérrlichkeit *f* -; Glückseligkeit *f* -
мі́лачка *жс разм* (*зварот*) Líebchen *n* -s, -; Dárling *m* -s, -s
мілей́шы (*выш. ступ ад* мілы) *кніжн* líeber
мі́ленькі 1. nett (*сімпатычны*); níedlich (*прыгожанькі*); **2.** lieb, gelíebt; (*у звароце*) mein Herz; Líebling *m* -(e)s, -e; ◊ ***як ~ разм*** (*бясспрэчна*) óhne zu widerspréchen
мілі́грам *м* Milligrámm *n* (*скар* mg)
мілі́метр *м* Milliméter *n* -s, - (*скар* mm)
мілітарызава́ць *паліт* militarisíeren *vt*
мілітарыза́цыя *жс паліт* Militarisíerung *f* -
мілітары́зм *м паліт* Militarísmus *m* -
мілітары́сцкі *паліт* militärisch
мілі́цыя *жс* Milíz *f* -
міліцыяне́р *м* Milizionär *m* -s, -e, Polizíst *m* -en, -en
міліцэ́йскі Milíz-
няўхі́льны únentwegt; únbe|irrt; nicht ábweichend; stétig, únablässig (*бесперапынны*); ***~ рост прадукцыі*** das stéte Wáchstum der Produktión

няўце́шн|ы üntröstlich, tief betrübt; ***~ае го́ра*** grénzloses Leid

няўця́м *разм* únverständlich, nicht éinleuchtend: ***мне ~*** das kann ich nicht begréifen; *безас у знач выk* ***мне было́ ~*** es fiel mir nicht ein; es kam mir nicht in den Sinn

няўця́мна *прысл*; **няўця́мны** *разм* únverständlich, nicht éinleuchtend; úngereimt (*нязладны*)

няўча́с *прысл разм* úngelegen; zu únpassender [úngelegener] Zeit, im únangebrachten Áugenblick

няўча́сны 1. (*заўчасны*) vórzeitig, (zu) früh; **2.** (*які адбываецца ў неадпаведны момант*) nicht zur ríchtigen Zeit; nicht réchtzeitig

няха́й 1. *пабуджальная часц перадаецца дзеяслоўнымі формамі* lass, mag [möge (*высок*)], soll (+ *inf*); ***~ ён захо́дзіць!*** er soll [möge (*высок*)] heréinkommen* [éintreten*] !; ***~ бу́дзе так!*** so soll es sein; ***~ ён пачака́е!*** er soll [möge] wárten!; ***~ ён ро́біць, што хо́ча*** lass ihn tun, was er will; ***~ так!*** nun gut!, na gut!; ***~ бу́дзе, што бу́дзе!*** mag [soll] kómmen, was da will!; ***ну і ~!*** wénnschon!; **2.** *злучн уступальны* (*хоць*) wenn ... auch; mag, möge, soll es...; ***~ до́ждж, але́ я ўсё ро́ўна пайду́ дамо́ў*** soll es rúhig régnen, ich gehe trotzdém; **3.** *часц уступальная* (*выражае дапушчэнне*) es sei, néhmen wir an; ***~ ву́гал бу́дзе 30°*** néhmen wir an, der Wínkel sei 30°; ***~ жыве́!*** es lébe!; ***~ Бог кры́е*** [***рату́е, бароніць***] ***!*** Gott bewähre!

няхва́тка *ж разм* Mángel *m* -s (*чаго-н* an *D*), Féhlen *n* -s; Knáppheit *f* - (*мізэрнасць*)

няхі́тры 1. (*чалавек*) tréuherzig; **2.** (*просты, немудрагелісты*) éinfach

няхо́дкі *камерц* (*пра тавар*) nicht gefrágt

няцвёрда *прысл* nicht sícher, nicht fest, nicht vollkómmen; ***ён ў гэ́тым ~ ўпэ́ўнены*** er ist nicht ganz davón überzéugt, er ist darín nicht ganz sícher

няцвёрды 1. (*мяккі*) nicht hart; **2.** *перан* (*хісткі*) nicht fest; schwánkend, wánkend; wánkelmütig (*пра чалавека*); **3.** *перан разм* (*нерашучы*) únentschlossen, únschlüssig

няцо́тны *матэм* úngerade; ***~ лік*** úngerade Zahl

няця́жкі nicht schwer, leicht

няця́мкі, няця́млівы *разм* wénig áuffassungsfähig, schwer von Begríff, begríffsstutzig

нячаста́сты sélten

нячу́ласць Únempfindlichkeit *f* -; *перан* Gefühllosigkeit *f* -; Hártherzigkeit *f* -

нячу́лы únempfindlich (*да чаго-н* gégen *A*); *перан* (*неспагадлівы*) hártherzig; díckhäutig

нячу́тна *прысл*; **нячу́тны** únhörbar; léise

нячы́ст|ы 1. únrein, nicht rein, únsauber, únreinlich; schmútzig (*брудны*); **2.** (*з дамешкам чаго-н*) verúnreinigt, verschmútzt, verfälscht (*сфальсіфікаваны*); **3.** *перан* (*несумленны*): ***~ая спра́ва*** éine únsaubere Geschíchte; ***~ае сумле́нне*** schléchtes Gewíssen; **4.** (*не зусім правільны*) únrein, únsauber; ***~ае вымаўле́нне*** únsaubere Áussprache; ◊ ***быць ~ым на руку́*** lánge Fínger háben

нячы́сцік *м міфал, разм* Böse (*sub*) *m* -n, -n, Téufel *m* -s, -

нячэ́саны *гл* нечасаны **I, II**

няшко́днасць *ж* Únschädlichkeit *f* -, Hármlosigkeit *f* -

няшко́дны únschädlich; hármlos (*бяскрыўдны*)

няшма́т *прысл* nicht viel; ein wénig, étwas, ein bíss|chen; ***гэ́та зусі́м ~*** das ist gar nicht viel

няшта́тны nébenamtlich, nébenberuflich, nicht fest ángestellt, óhne Plánstelle; áußerordentlich (*напр пра прафесара*)

няшча́сны 1. únglücklich, únglückselig, Únglücks-; ***~ вы́падак*** Únglücksfall *m* -s, -fälle, Únfall *m*; **2.** (*злашчасны*) únselig, verdámmt

няшча́сц|е *н* Únglück *n* -s, -e, Míssgeschick *n* -(e)s, -e, Pech *n* -s (*няўдача*); Únheil *n* -(e)s (*бяда*); ***абры́нулася ~е*** ein Únheil brach heréin; ◊ ***на ~е*** zum Únglück, únglücklicherweise; ***ся́бар у ~і*** Léidensgefährte *m* -n, -n

няшчы́льна *прысл*; **няшчы́льны** úndicht; nicht fest

няшчы́расць *ж* Únaufríchtigkeit *f* -; Heucheléi *f* - (*крывадушнасць*)

няшчы́ры únaufrichtig, nicht óffen; héuchlerisch (*крывадушны*)

няя́касны mínderwertig, von schléchter Qualität

няя́ркі nicht grell; bleich, blass (*бледны*); matt, trübe (*тусклы*); glánzlos

няя́снасць *ж* Únklarheit *f*, Úndeutlichkeit *f* -

няя́сны 1. únklar, úndeutlich; **2.** (*не зусім зразумелы*) míssverständlich; ***сэнс прамо́вы быў ~*** dúnkel war der Réde Sinn

няя́ўка *ж* Níchterscheinen *n* -s; Férnbleiben *n* -s; Ábwesenheit *f* - (*адсутнасць*); ***~ ў суд юрыд*** Níchterscheinen vor Gerícht; ***~ з няўва́жнай прычы́ны*** únentschuldigtes Férnbleiben

О

о *выкл* **1.**: ***~ га́ньба!*** o Schánde!; o Schmach! (*высок*); **2.** (*пры выказванні здзіўлення*) oh!; **3.** (*пры выказванні спачування, смутку і г. д*) o weh!; au!; ojémine!

о́бер-бургамі́стр *м* Óberbürgermeister *m* -s, -

о́бер-лейтэна́нт *м вайск* Óberleutnant *m* -s, -e *i* -s

ого́ *выкл* oho!, ohá!; nanú! (*са здзіўленнем*)

о́да *ж* Óde *f* -, -n; Lóblied *n* -(e)s, -er

о́дум *м* Náchdenken *n* -s, Bedénken *n* -s

ой! *выкл* **1.** (*калі баліць*) au!, autsch!, au!; **2.** (*здзіўленне*) oh!, ei, ei!; **3.** (*спалох*) ach!

о́йча *кл. ф гл* айцец

о́канне *н лінгв* Áussprache des «o» in únbetonten Sílben

о́каць *лінгв* das «o» in únbetonten Sílben áussprechen*

ом *м эл* Ohm *n* -s, -

оммéтр *м эл* Óhmmesser *m* -s, -, Óhmmeter *n* -s, -

о́мнібус *м уст* Ómnibus *m* -ses, -se; *разм* Bus *m*

о́пера *ж* **1.** (*твор*) Óper *f* -, -n; **2.** (*тэатр*) Ópernhaus *n* -es, -häuser, Óper *f* -, -n

о́перны Ópern-; ***~ тэ́атр*** Ópernhaus *n* -es, -häuser

оперупаўнава́жаны *м у знач. наз* Operatiónsbeauftragte (*sub*) *m* -n, -n

о́пій *м хім* Ópium *m* -s

о́піум *м фарм* Ópium *n* -s (*тс перан*)

о́птам *прысл* en gros [ã´gro:]; im Gróßen; im Gróßhandel; ***~ і ў ро́зніцу*** en gros und en detail [ãde´taĭ], im Gróßen und im Kléinen

о́птык *м* Óptiker *m* -s, -

о́птыка *ж* Óptik *f* -

о́птымум *м* Óptimum *n* -s
о́пус *м муз* Ópus *n* -, *pl* Ópera (*скар* op.)
о́пцыя *ж спец* Optión *f*-, -nen
о́рган *м* **1.** *анат* Orgán *n* -(e)s, -e; ***~ы маўле́ння*** Spréchorgane *pl*; ***~ы пачу́ццяў*** Sínnesorgane *pl*; **2.** (*установа, арганізацыя*) Orgán *n* -(e)s, -e; Stélle *f*-, -n; Behörde *f*-, -n; ***ура́давыя ~ы*** Regíerungsstellen *pl*; Regíerungsbehörden *pl*; ***кіру́ючыя ~ы*** léitende Orgáne [Stéllen, Grémi|en]; **3.** (*перыядычнае выданне*): ***друка́рскі ~*** Présseorgan *n*; ***афіцы́йны ~*** offiziélles Orgán
о́ргія *ж* Órgi|e *f*-, -n
о́рдар I *м* (*дакумент*) Órder *m* -s, -; schríftliche Ánweisung, Bezúg(s)schein *m* -(e)s, -e (*на пакупку, заказ чаго-н*); ***~ на кватэ́ру*** Wóhnungszuweisung *f*-, -en, Éinweisungsschein *m*; ***~ на а́рышт*** *юрыд* Háftbefehl *m* -s, -e; *бухг, камерц* ***ка́савы ~*** Kássenanweisung *f*; ***плацёжны ~*** Záhlungsanweisung *f*; ***прыхо́дны ~*** Éinnahmebeleg *m*; ***расхо́дны ~*** Áusgabebeleg *m*
о́рдар II *м архіт* Säulenordnung *f*-, -en
о́рдэн I *м* (*узнагарода*) Órden *m* -s, -; ***узнагаро́дзіць каго-н ~ам*** *j-m* éinen Órden verléihen*; *j-n* mit éinem Órden áuszeichnen
о́рдэн II *гіст* (*арганізацыя*) Órden *m* -s, -; ***ЛівО́нскі ~*** Lívländischer Órden; ***ры́царскі ~*** Ritterorden *m*; ***Тэўто́нскі ~*** Déutscher Órden
о́рдэнск|і Órdens-; ***~ая сту́жка*** Órdensband *n* -(e)s, -bänder; ***~ая кало́дка*** Órdensschnalle *f*-, -n
ост *м марск* **1.** (*напрамак*) Ost *m* -es, Ósten *m* -s (*скар* O); **2.** (*вецер*) Ost *m* -(e)s, -e, Óstwind *m* -(e)s, -e
остго́ты *мн гіст* Óstgoten *pl*
остэахандро́з *м мед* Osteochondróse *f*-
от *часц разм, абл* da; hier; sieh da!; da ist; ◊ ***~ ду́рань!*** ist das áber ein Narr!; ***~ табе́ раз!*** da háben wir's!; ***~ і ўсё*** das ist das Énde vom Líed
оталарынго́лаг *м мед* Otológe *m* -n, -n
о́фіс *м* Büro *n* -s, -s, Vertrétung *f*-, -en, Níederlassung *f*-, -en
ох! *выкл* o weh!
о́хра *ж жыв* Ócker *m*, *n* -s

П

па *прыназ* **1.** (*на паверхні*) auf (*D*, *A*), über (*A*); ***е́хаць ~ по́лі*** über das Feld fáhren*; **2.** (*у галіне чаго-н*) in (*D*); auf dem Gebíet; ***спабо́рніцтва ~ ша́хматах*** Scháchwettkampf *m* -es, -kämpfe; ***экза́мен ~ матэма́тыцы*** Mathemátikprüfung *f*-, -en; ***камітэ́т ~ раззбрає́нні*** Ausschuss für Ábrüstung; **3.** (*дзеянне*) in (*D*), durch (*A*); (*A*) entláng; ***ісці́ ~ ву́лiцы*** die Stráße entláng géhen*; **4.** *канц* (*згодна, у адпаведнасці з*) laut (*D*), nach (*D*); auf (*A*); gemäß (*D*) (*пасля наз*); ***~ распараджэ́нні*** (*каго-н*) auf *j-s* Ánordnung; ***~ жада́нні*** auf Wunsch; **5.** (*пры дапамозе чаго-н*) mit (*D*), per (*A*); ***~ по́шце*** mit der Post; per Post; ***~ тэлебача́нні*** im Férnsehen; ***~ ра́дыё*** im Rúndfunk; ***паве́даміць ~ ра́дыё*** über Funk mítteilen; **6.** (*з лічэбнікам*): ***шэ́рагі ~ шэсць чалаве́к*** Réihen zu je sechs Persónen [Mann]; ***~ дво́е*** zu zweit; jéweils zwei; **7.** *рэдк* nach; ***па абе́дзе*** am Náchmittag; nach dem Míttagessen; **8.** (*з він. скл – па каго-н, па што-н*) nach (*D*), in (*A*); um *j-n* (*etwas*) zu hólen; ***хадзі́ць ~ грыбы́*** in die Pílze géhen*; ***пасла́ць ~ цыгары́ты*** nach Zigarétten schícken; ***пайсці́ ~ до́ктара*** den Arzt hólen; ***я ~ цябе́ зайду́*** ich hóle dich ab; **9.** (*з він. скл – пра канец адрэзку часу*) bis (*A*), bis zu (*D*); ***па ве́расень*** bis Septémber; ◊ ***~ ме́ншай ме́ры*** wénigstens; ***ямý было́ не ~ сабе́*** ihm war nicht recht wohl (zumúte); ***сумава́ць ~ дзе́цях*** sich nach den Kíndern séhnen
паабапа́л **1.** *прыназ* béiderseits (*G*); ***~ даро́гі*** béiderseits des Wéges; **2.** *прысл* béiderseits, von béiden Séiten; auf béiden Séiten
паабе́даць zu Míttag éssen*; das Míttagessen be|énden (*закончыць абед*)
паабе́дзенны *гл* пасляабедзенны
паабяца́ць verspréchen* *vt*
пааддава́ць (álles) vergében* *vt* (*каму-н D*)
па-англі́йску énglisch; auf Énglisch
паа́ркушна *прысл палігр* bógenweise
паартыкульна *прысл* paragráfenweise [paragráphenweise]; nach den Artíkeln
паасо́бку *прысл* **1.** (*па адным, не разам*) éinzeln; **2.** (*асобна, разлучыўшыся*) getrénnt
паасо́бны **1.** (*які існуе самастойна*) sélbstständig [sélbständig]; **2.** (*ізаляваны ад іншых*) getrénnt, isoliert
па-ашука́нску *прысл* betrügerisch
паба́віцца **1.** (*затрымацца; памарудзіць*) sich áufhalten*; zögern *vi*; **2.** (*пагуляць, пазабаўляцца*) sich éine Zeit lang amüsíeren
пабагаце́ць réicher wérden
пабажы́цца *разм* schwören* *vi*
па-бацько́ўску *прысл* väterlich
паба́чыцца sich séhen*, sich wíedersehen*; sich tréffen* (*сустрэцца*)
пабачы́нн|е *н*: ***да ~я!*** auf Wíedersehen; auf Wiederhören! (*па тэлефоне*); ***да ху́ткага ~я!*** *кніжн* auf báldiges Wíedersehen!; bis bald! (*разм*)
пабая́цца sich wágen
пабе́гаць (éine Zéitlang) láufen* *vi* (*s*), herúmlaufen* *vi* (*s*)
пабе́гчы **1.** (*пачаць бегчы*) (lós)rénnen* *vi* (*s*), (lós)láufen* *vi* (*s*); **2.** (*кінуцца наўцёкі*) die Flucht ergréifen*; flíehen* *vi* (*s*)
па-белару́ску *прысл* belarússisch, auf [zu] Belarússisch; ***размаўля́ць [пісáць] ~*** Belarússisch spréchen* [schréiben*]; ***як гэ́та бу́дзе ~?*** wie heißt das auf Belarússisch?
пабе́лка *ж* Wéiße(l)n *n* -s; Kálk|anstrich *m* -(e)s (*вапнай*)
паберагчы́ **1.** (*захаваць*) (áuf)bewáhren *vt*; verwáhren *vt*; **2.** (*зберагаць*) schónen *vt*; ***~ сваі́ сі́лы*** séine Kräfte schónen
пабі́цца **1.** (*разбіць*) zerschlágen* *vi* (*s*); **2.** (*пабіць адзін аднаго*) sich prügeln, sich schlágen*; einánder (sich *D*) in die Háare geráten*
пабі́ць **1.** schlágen* *vt*, prügeln *vt*; **2.** (*разбіць*) zerschlágen* *vt*, zertrümmern *vt*; **3.** (*забіць, перабіць*) erschlágen* *vt*, tótschlagen* *addz vt*; **4.** (*перасягнуць*) überbíeten* *vt*; besíegen* *vt* (*у гульні*); ◊ ***~ рэко́рд*** éinen Rekord schlágen* [bréchen*]; ***~ ка́рту*** éine Kárte schlágen* [stéchen*]
пабла́жк|а *ж разм* Náchsicht *f*-, Vergünstigung *f*-, -en; ***рабі́ць [дава́ць] ~у*** náchsichtig sein
пабла́жліва *прысл* gönnerhaft; náchsichtig
пабла́жлівасць *ж* Gútherzigkeit *f*-, Gróßherzigkeit *f*-; Gróßmut *f*-
пабла́жлівы **1.** (*нястрогі, непатрабавальны*) nicht streng, nicht viel fórdernd; **2.** (*мяккі, велікадушны*) gróßmütig, hóchherzig, gróßherzig
паблажэ́ць máger wérden; ábmagern *vi* (*s*)
паблі́зу I *прыназ* náh(e) (*D*), únweit (*G*, von *D*); ***~ во́зера*** únweit [in der Nähe] des Sees
паблі́зу II *прысл* in der Nähe; ***~ быць*** in der Nähe sein
па́блік рылэ́йшнз *мн камерц* Public Relations [Publicrelations] [ˈpablikri ˌleɪʃnz] *pl*, Öffentlichkeitsarbeit *f*-
паблісі́ці *н камерц* Publicity [paˈblisiti] *f*-
паблядне́лы bleich [blass] (gewórden)
паблядне́ць erbléichen* *vi* (*s*), bleich [blass] wérden; sich verfärben (*паблякнуць*)
паблякну́лы **1.** (*аб кветках*) verwélkt; **2.** (*пра фарбы*) verblíchen* *vi* (*s*); blass [matt] (gewórden)
пабо́жны fromm
паба́і *мн разм* **1.** (*удары*) Prügel *pl*, Háue *pl*, Schläge *pl*; **2.** (*кровападцёкі*) Blút|unterlaufungen *pl*
паба́йвацца sich (ein wénig) fürchten (*каго-н* vor *D*)
пабо́лей *прысл* (étwas) mehr

пабо́льваць *разм* von Zeit zu Zeit schmérzen [wéh tun*]
пабо́льшаць 1. (*колькасцю*) sich verméhren, sich vergrößern; **2.** (*велічынёй*) sich vergrößern, größer wérden; **3.** (*павысіцца*) stéigen* *vi* (*s*), zúnehmen* *vi*
пабо́льшваць *гл* павялічваць, павялічыць
пабо́льшыць 1. (*колькасцю*) vergrößern *vt*, verméhren *vt*; **2.** (*велічынёй, памерамі*) stéigern *vt*; erwéitern *vt* (*пашырыць*); **3.** (*на сіле*) verstärken *vt*
пабо́ры *мн разм* Ábgaben *pl*
пабо́чн|ы 1. (*другарадны, не істотны*) Nében-; nébensächlich; zwéitrangig; **~ы дахо́д** *камерц* Nébenverdienst *m* -(e)s, -e; **~ая ро́ля** Nébenrolle *f* -, -n; **2.** *разм* (*пазашлюбны*) únehelich; **~ы сын** únehelicher Sohn
пабра́згаць klírren *vi* (*чым-н металічным або шкляным*); kláppern *vi* (*чым-н* mit *D*)
пабра́тацца sich verbrüdern
пабраці́м *м*: **мы з ім ~ы** *разм* wir sind dícke Fréunde, wir sind Búsenfreunde; **го́рад-~** Pártnerstadt *f* -, -städte
пабра́ць 1. (*пажаніцца*) héiraten *vt*; **~ шлю́бам** éine Éhe schlíeßen; **2.: ~ за ру́кі** einánder [sich] an den Händen fássen
пабры́цца *разм* sich rasíeren (*самаму*); sich rasíeren lássen* (*у цырульніка*)
пабуджа́льны áufregend; **~ матыў** Beweggrund *m* -(e)s, -gründe
пабудзі́ць (áuf)wécken *vt*; aus dem Schlaf wécken; wáchrütteln *аддз vt*
пабу́дка *ж вайск* Wécksignal *m* -s, -e
пабудо́ва *ж* **1.** (*дзеянне*) Báuen *n* -s, Bau *m* -(e)s; Errichtung *f* -, -en; **2.** (*структура*) Struktúr *f* -, -en, Bíldung *f* -, -en; **~ ска́за** Sátzbildung *f*; Sátzbau *m*; **3.** (*будынак*) Bau *m* -(e)s, -ten, Gebäude *n* -es, -; **жылы́я ~** Wóhngebäude *n*; **прамысло́вая ~** industri|élle Ánlage; Industríegebäude *n*
пабуры́ць (*паламаць*) ábreißen* *vt*, ábbrechen* *vt*; zerstören *vt*
пабыва́ць, пабы́ць (*у каго-н, дзе-н*) sein* *vi* (*s*); áufsuchen *vt*, besúchen *vt*
пабы́ўк|а *ж*: **прые́хаць на ~у** auf éinen kúrzen Úrlaub kómmen*, eine Stíppvisite máchen
пабяднне́ць arm wérden; verármen *vi* (*s*)
пабяле́лы ábgeblasst; weiß [bleich, blass] (gewórden)
пабяле́ць weiß [bleich] wérden; erblássen *vi* (*s*) (*пабляднець*); ergráuen *vi* (*s*) (*пасівець*)
пабяліць wéißen *vt*, bléichen *vt*
па́ва *ж заал разм* Pfáu|henne *f* -, -n
пава́бнасць *ж* Ánziehungskraft *f* -; Faszinatión *f* -; Sympathíe *f* -, -i|en
пава́бны ánziehend; faszinierend
пава́г|а *ж* Áchtung *f* -; Respektíerung *f* -; Éhr|erbietung *f* - (*пачцівасць*); **карыста́цца ~ай** Áchtung genießen*, in (hóhem) Ánsehen stehen*; **вы́клікаць ~у да каго-н, ста́віцца з ~ай да каго-н** *j-n* áchten, vor *j-m* [für *j-n*] Áchtung háben [hégen]; für *j-n* Áchtung empfínden*
павадо́к *м* Léine *f* -, -n; **узя́ць саба́ку на ~** éinen Hund an die Léine néhmen*
павады́р *м*: **~ сляпо́га** Blíndenführer *m* -s, -; **саба́ка-~** Blíndenhund *m* -(e)s, -e
па-ваённаму *прысл* militärisch; **~ аддава́ць ча́сць** militärisch grüßen
паважа́ны 1. geáchtet, geschätzt; ángesehen; **~ чалаве́к** Respéktsperson *f* -, -en; geáchtete Persönlichkeit; **2.** (*у ветлівым звароце*) **~ спада́р** (sehr) geéhrter [veréhrter] Herr
паважа́ць áchten *vt*, éhren *vt*, respektíeren *vt*; schätzen *vt* (*цаніць*)
пава́жлівы éhrerbietig, áchtungsvoll
пава́жна *прысл*; **пава́жн|ы 1.** (*важны, уплывовы*) wíchtig, gewíchtig; mäßgebend; würdevoll; ernst; gedíegen; **~ая асо́ба** éine wíchtige [mäßgebende] Persón; **2.** (*няспешны, павольны*) lángsam; schwérfällig
пава́жнасць *ж* Getrágenheit *f* -, Geméssenheit *f* -; Gedíegenheit *f* -; Ernst *m* -es
пава́жыць *разм* (*узважыць*) ábwiegen* *vt*; **~ бага́ж** das Gepäck wíegen*
павалі́цца (úm)fállen* *vi* (*s*), (hín)stürzen *vi* (*s*)
павалі́ць I níederwerfen* *vt*, úmwerfen* *vt*; fällen *vt* (*дрэвы*); úmreißen* *vt* (*ветрам*); **~ каго-н на зямлю́** *j-n* zu Bóden strécken [schlágen*]
павалі|ць II *разм* **1.** (*пра народ*) strömen *vi* (*h, s*), stürzen *vi* (*s*); **2.: снег ~ў** es begánn in díchten Flócken zu schnéien
павальне́й *прысл*; **павальне́йшы** (*выш. ступ ад* павольна, павольны) lángsamer
паваро́т *м* **1.** (*дзеянне*) Dréhung *f* -, -en, Wéndung *f* -, -en; Umdréhung *f* -, -en (*кола, ключа*); **2.** (*ракі, вуліцы і г. д*) Krümmung *f* -, -en, Bíegung *f* -, -en; Kúrve [-və] *f* -, -n (*дарогі*); **3.** *перан* Wénde *f* -, -n, Wéndung *f* -, -en; **круты́ ~** Úmschwung *m* -s, -schwünge; **~ напра́ва** Réchtsruck *m* -(e)s; ◊ **лягчы́й на ~ах!** *разм* (*папярэджанне*) sáchte in der Kúrve!
паваро́тлівасць *ж разм* Flínkheit *f* -, Gewándtheit *f* -
паваро́тлівы (*увішны*) flink, behände, rührig; húrtig
паваро́тны Wénde-; **~ круг** чыг Dréhscheibe *f* -, -n; **~ пункт, ~ мо́мант** Wénde *f* -, -n, Wéndepunkt *m* -(e)s, -e; **~ пункт у гісто́рыі** éin histórischer Wéndepunkt
паварачаць *гл* вярнуць **I**
паварачвацца *гл* павярнуцца
паварачваць *гл* павярнуць
павартава́ць (éine Zéitlang) bewáchen *vt* [überwáchen *vt*, hüten *vt*]
паварушы́цца sich bewégen, sich rühren
паварушы́ць bewégen *vt*; rühren *vt*; **~ губа́мі** die Líppen bewégen; **~ вуглі́ ў пе́чы** die Kóhlen schüren; ◊ **па́льцам не ~** kéinen Fínger (dabéi, dafür) rühren; **~ мазга́мі** séinen Verstánd ánstrengen
паварчу́к *м разм* Küchenjunge *m* -n, -n
павар'яце́ць wáhnsinnig [verrückt] wérden
па-вар'я́цку *прысл* wáhnsinnig, únsinnig
павастро́ць spítzer [schärfer] wérden
па-ва́шаму *прысл* **1.** (*пра думку*) éurer [Íhrer] Méinung [Ánsicht] nach; **2.** (*пра жаданне*) nach éurem [Íhrem] Willen [Wunsch]; wie ihr wollt, wie Sie wóllen [wünschen]; **няха́й бу́дзе ~** es geschéhe, wie ihr wollt [wie Sie wóllen]
паваява́ць (éine Zéitlang) Krieg führen
паведа́міць mítteilen *vt*, mélden *vt*; benáchrichtigen *vt*, in Kénntnis sétzen (*каму-н, што-н j-n* über *A*)
паведамле́нне *н* **1.** (*дзеянне*) Mítteilung *f* -, Benáchrichtigung *f* -; **2.** (*вестка*) Mítteilung *f* -, -en; Náchricht *f* -, -en; Bekánntmachung *f* -, -en (*тс афіша*); **афіцы́йнае ~** offizi|élle [ámtliche] Mítteilung; **~ дру́ку** Préssemeldung *f* -, -en; **~ ўла́снага карэспандэ́нта** Éigenmeldung *f* -
павезці 1. fórtführen *vt*; fórtbringen* *vt*, fórtschaffen *vt*; mítnehmen* *vt* (*з сабою*); **2.** *разм* (*пашанцаваць*) glücken *vi* (*s*)
павек *прысл разм* auf éwig, auf [für] ímmer
павека *н анат* Áugenlid *n* -(e)s, -er
павелічальнік *м фота, спец* Vergrößerungsgerät *n* -(e)s, -e
павелічальн|ы Vergrößerungs-; vergrößernd; **~ае шкло** Vergrößerungsglas *n* -es, -gläser
павелічэ́нне *н* Vergrößerung *f* -, -en; Verméhrung *f* -, -en (*памнажэнне*); Erwéiterung *f* -, -en (*пашырэнне*); Zúnahme *f* -, -n, Stéigerung *f* -, -en, Zúwachs *m* -(e)s; Verstärkung *f* - (*сілы*)
павераны *наз м* Bevóllmächtigte (*sub*) *m* -n, -n; *дып* **~ ў спра́вах** Geschäftsträger *m* -s, Geschäftsführer *m* -s, -; **часо́вы ~ ў спра́вах** der interimístische Geschäftsträger, Geschäftsträger ad ínterim
павёрк|а *ж* (*пераклічка*) *вайск, тс перан* Appéll *m* -(e)s, -e; **на ~у** *разм* in Wírklichkeit
павёрсе *прысл* óben, auf der Ánhöhe; **ісці́ ~** óben géhen*

павéр|х *м* Stock *m* -(e)s, Stóckwerke; Stóckwerk *n* -(e)s, -e; Etáge [-ʒə] *f*-, -n, Geschóss *n* -es, -e; ***пéршы ~х*** Érdgeschoss *n* -es, -e, Parterre [-ˊtɛrə *i* -ˊtɛr] *n* -s, -s; ***жыць на пéршым ~се*** im Érdgeschoss wóhnen, Partérre wóhnen; ***другí ~х*** érster Stock; ***жыць на другíм ~се*** im érsten Stock wóhnen; ***жыць на чацвёртым ~се*** im drítten Stock wóhnen

павéрхневы Óberflächen-; *горн* Táges-

павéрхн|я *ж* Óberfläche *f*-, -n, Fläche *f*; ***зямнáя ~я*** Érdoberfläche *f*-; ***~я вады́*** Wásserspiegel *m* -s; ***падымáцца на ~ю*** an die Óberfläche dríngen*; ***трымáцца на ~і*** sich über Wásser hálten*

павéрыць gláuben *vt*, zu gláuben begínnen*

павéсіцца sich erhängen, sich áufhängen

павéсіць 1. áufhängen *vt*; ánhängen *vt*; **2.** (*пакараць*) erhängen *vt*, áufhängen *vt*, hénken *vt*, durch den Strang hínrichten; ◊ ***~ нос*** den Kopf hängen lássen*

павéсці führen *vt*, zu führen begínnen*

павéсціся *безас*: ***ужó так павялóся*** so ist es ében [mal] gebräuchlich [üblich]

павесялéць lústig [fröhlich, héiter] wérden

павесялíцца sich (ein wénig) vergnügen [amüsíeren]

павéт *м* Ländkreis *m* -es, -e; *гіст* Pawjét *m* -(e)s, -s, Pówiat *m m* -(e)s, -s

павéтка *ж гл* павець

павéтр|а *н* Luft *f*-, Lüfte; ***кандыцыянавáнае ~а*** klimatisíerte Luft; ***цёплае ~а*** Wármluft *f*; ***на вóльным ~ы*** an der fríschen Luft, im Fréien

паветраачышчáльнік *м тэх* Lúftfilter *m* -s, -

паветрадýўка *ж тэх* Gebläse *n* -s, -

павéтран|ы Luft-; ***~ая атáка*** Lúftangriff *m* -(e)s, -e; ***~ы бой*** Lúftkampf *m* -(e)s, -kämpfe; ***~ая прастóра*** Lúftraum *m* -(e)s, -räume; ***~ая трывóга*** Lúftalarm *m* -(e)s, -e, Flíegeralarm *m*; ***~ым шляхáм*** auf dem Lúftwege

паветраплáвальнік *м ав* Lúftschiffer *m* -s

паветраплáвальны *ав* Lúftschiffer-

паветраплáванне *н* Lúftfahrt *f*-

павéў|ў *м* Windstoß *m* -es, -stöße; *перан* Ausbruch *m* -s, -brüche; ***~вы рáдасці*** Fréudenausbruch *m*

павéць *ж* **1.** (*пляцоўка пад страхой*) Schútzdach *n* -(e)s, -dächer, Vórdach *n*; **2.** (*дрывотня*) Hólzschuppen *m* -s

павéшанне *н* Erhängen *n* -s, Tod durch Strang; ***прыгавáрыць да смярóтнай кáры праз ~*** zum Tóde durch den Strang [durch Erhängen] verúrteilen

павéшаны 1. gehängt, ángehängt; erhängt, áufgehängt (*пакараны*); **2.** *у знач наз м* Erhängte (*sub*) *m* -n, -n, Gehängte (*sub*) *m*

павéя|ць (*падзьмуць*) zu blásen [zu wéhen] begínnen* [ánfangen*]; ***~ў лёгкі вéтрык*** es kam ein léichter Wind auf

павíдла *н кул* Marmeláde *f*-

павíльён *м* Pavillon [ˊpavɪljɔŋ] *m* -s, -s; Fílmatelier [-ˌljeː] *m* -s, -s (*для кіназдымак*); Márkthalle *f*-, -n (*рыначны*); Áusstellungspavillon *m*, Áusstellungshalle *f* (*выставачны*)

павíнен (*мн* **павíнны**) *у знач. часткі вык* muss, soll; ***я ~ прачытáць гэ́тую кнíжку*** ich muss díeses Buch lésen; ***ты не ~ гэ́тага рабíць*** du sollst es nicht tun

павíнніцца *разм* séine Schuld éingestehen* [ánerkennen*]

павíннасць *ж* Verpflíchtung *f*-, -en, Pflicht *f*-, -en; ***вóінская ~*** Wéhrpflicht *f*; ***працóўная ~*** Árbeitspflicht *f*

павіншавáць beglűckwünschen *vt* (*каго-н, з чым-н j-n* zu *D*), gratulíeren *vi* (*j-m* zu *D*)

павісáць, павíснуць hängen bléiben* *vi* (*s*); herábhängen* *vi* (*s*) (*звíсаць*); ◊ ***~ у павéтры*** schwében *vi*; *перан тс* únentschieden sein

павíскванне *н* (dáuernde nicht zu láute)Winseléi

павітáцца (*паздароўкацца*) sich begrüßen

павітáць begrüßen *vt*, grüßen *vt*

павітýха *ж уст* Héb¦amme *f*-, -n

павíян *м заал* Pávian [-vĭaːn] *m* -s, -e

павóдзіны *мн* Erhálten *n* -s, Verháltensweise *f*- (*спосаб жыцця*); Betrágen *n* -s, Benéhmen *n* -s (*учынак*); ***адзнáка за ~*** Betrágenszensur *f*-, -en

павóдзіць 1. führen *vt*; bewégen *vt* (*галавою, рукою і г. д*); **2.:** ***~ сябé*** sich betrágen*, sich benéhmen*; sich verhálten* (*адносіцца, ставіцца*)

павóдка *ж* Hóchwasser *n* -s, Überschwémmung *f* -, -en

павóдкав|ы: *~ая вадá* Hóchwasser *n* -s, Flútwasser *n* -s

павóдле *прыназ* laut (*G*, nach *D*); gemäß (*D*) (*ставіцца звычайна пасля наз*); ***~ апóшняй мóды*** nach der létzten Móde

павóзка *ж* Fáhrzeug *n* -(e)s, -e, Wágen *m* -s, -; Fúhrwerk *n* -s, -e, Fúhre *f*-, -n; ***абóзная ~*** Trósswagen *m* -s, -; ***паракóнная ~*** Zwéispänner *m* -s, -

павóй *м бат* (*расліна*) Wínde *f*-, -n

павóлі *прысл* (*марудна*) lángsam; träge, lässig; allmáhlich (*паступова*)

павóльна *прысл* lángsam; óhne zu éilen; állmählich (*паступова*)

павóльнасць *ж* (*няспешнасць*) Lángsamkeit *f*-; Geméssenheit *f*- (*размеранасць*); Trägheit *f*- (*маруднасць*)

павóльн|ы 1. lángsam, nicht éilig; zögernd; **2.** (*спакойны, размераны*) geméssen; gléichmäßig; ***~ая хадá*** geméssener Gang

па-вóўчаму, па-вóўчы *прысл* wie ein Wolf

павузéць eng [énger] wérden

павýзіць veréngen *vt*; éinengen *vt*; énger máchen; zusámmenziehen* *vt*

павýк *м заал* Spínne *f* -, -n

павукападóбны 1. spínnenartig; éiner Spínne ähnlich; **2.:** ***~я*** *мн заал* Spínnentiere *pl*

павуцíна *ж* Spínn(en)gewebe *n* -s, -

павуцíнне *н* **1.** Spínn(en)gewebe *n* -s, -; **2.** (*у час бабінага лета*) *разм* Áltweiberfaden *m* -s, -fäden

павучáльнасць *ж* Beléhrung *f*-, -en

павучáльны 1. (*які можа быць прыкладам*) léhrhaft; schúlmeisterhaft (*непахв*); **2.** (*які ўтрымлівае павучанне*) léhrreich, beléhrend; áufschlussreich; wíssenswert

павучáнне *н* **1.** (*парада, настаўленне*) Beléhrung *f*-, -en, Unterwéisung *f*-, -en; **2.** (*казанне*) Prédigt *f*-, -en

павучáць *разм* (*каго-н*) beléhren *vt*, unterwéisen* *vt*; (*няўхвальна*) schúlmeistern *неаддз vt*

павучы́ны Spínnen-

павучэ́нне *н* Beléhrung *f*-, -en

павы́сіць erhöhen *vt*, stéigern *vt*, hében* *vt*; auf éinen höheren Stand bríngen*; hináufsetzen *vt*, heráufsetzen *vt* (*цэны, падаткі і пад.*); ***~ жыццёвы ўзрóвень*** den Lébensstandard hében* [erhöhen]; ***~ зарплáту*** das Gehált áufbessern; ***~ сваю кваліфікáцыю*** sich wéiterbilden *аддз*; ***~ па слýжбе*** befördern *vt*; ***~ гóлас*** die Stímme erhében*; láuter spréchen*

павы́шан|ы gestéigert, erhöht; ***~ая тэмпературá*** erhöhte Temperatúr

павышáцца sich erhöhen, sich hében*; stéigen* *vi* (*s*), zúnehmen *vi* (*s*) (*пра цэны*); ***~ па слýжбе*** áufrücken *vi* (*s*), avancieren [avɑ̃ˊsiːrən] *vi* (*s*)

павышáць *гл* павысіць

павышэ́нне *н* Erhöhung *f*-, -en, Stéigerung *f*-, -en; ***~ цэн*** *эк* Préissteigerung *f*-, -en; ***~ кваліфікáцыі*** Wéiterbildung *f*-, Fórtbildung *f*-, Qualifizíerung *f*-; ***~ жыццёвага ўзрóўню*** Erhöhung des Lébensniveaus [-voːs]

павявáнне *н разм гл* павеў

павя́зка *ж* Bínde *f*-, -n; Verbánd *m* -(e)s, -bände (*перавязка*); ***нарукáўная ~*** Ármbinde *f*; ***~ на галавý*** Kópfverband *m*; ***часóвая ~*** Nótverband *m*; ***жалóбная ~*** Tráuerflor *m* -s, -e

павялíчвацца größer wérden, sich vergrößern; zúnehmen* *vi*, an Größe zúnehmen*; sich verméhren (*памножыцца*); wáchsen* *vi* (*s*) (*вырасці*); stéigen* *vi* (*s*) (*павысіцца*)

павялíчваць, павялíчыць 1. (*колькасцю*) vergrößern *vt*, verméhren *vt*; stéigern *vt*; **2.** (*паводле сілы, інтэнсіўнасці*)

verstärken *vt*; ~ ***у тры разы*** auf das Dréifache vergrößern; ~ ***даходы*** die Éinnahmen verméhren; ~ ***колькасць армii*** die Armée [Trúppen] verstärken

павялічыцца größer wérden; sich vergrößern, zúnehmen* *vi*; sich verméhren (*памножыцца*); wáchsen* *vi* (*s*) (*вырасцi*); stéigen* *vi* (*s*) (*павысіцца*)

павя́лы welk, verwélkt

павя́нуць (ver)wélken *vi* (*s*), welk wérden

павянча́цца sich (kírchlich) tráuen lássen*

павянча́ць (kírchlich) tráuen *vt*

павярну́цца sich (úm)wénden*, sich (úm)dréhen; ~ ***спíнай да каго-н*** *j-m* den Rücken (zú)kéhren

павярну́ць 1. (*змяніць становішча*) wénden* *vt*, úmdrehen *vt*, (úm)kéhren *vt*; **2.** (*пра напрамак*) ábbiegen* *vi* (*s*), éinbiegen* *vi* (*s*); ~ ***направа*** nach rechts ábbiegen* [éinbiegen*]; ~ ***назад*** úmkehren *vi* (*s*); ◊ ~ ***кола гісторыі назад*** das Rad der Geschíchte [der Zeit] zurückdrehen; ~ ***аглóблі*** den Rückzug ántreten*

павярхóўна *прысл* óberflächlich

павярхóўнасць *ж* Óberflächlichkeit *f* -, -en, Flüchtigkeit *f* -, -en

павярхóўны óberflächlich; ~***я вéды*** óberflächliche Kénntnisse, óberflächliches Wíssen

павярхóдзіць 1. (*натаміць*) ermüden *vt*, ánstrengen *vt*; ~ ***вóчы*** die Áugen überánstrengen, sich die Áugen verdérben; **2.** (*пашкодзіць*) beschädigen *vt*; verlétzen *vt* (*параніць*)

па-вяскóваму wie auf dem Lánde, ländlich, dörflich

па-вяснóваму *прысл* frühlingsmäßig, wie im Frühling

павячэ́раць zu Ábend éssen*, Ábendbrot éssen*

пагаварыць spréchen* *vi*; réden *vi* (*з кім-н* mit *D*, *пра каго-н*, *што-н* von *D*, über *A*)

пагавóрва|ць: ~***юць, што ...*** es geht das Gerücht, daß ...; man múnkelt, daß ...

пага́да *ж рэл, архіт* (*будысцкі або індуісцкі храм*) Págode *f* -, -n

пагаджа́льн|ы Schlíchtungs -; ~***ая камíсія*** *палiт* Schlíchtungskommission *f* -, -en

пагаджа́ць (*прывесцi ў адпаведнасць*) in Überéinstimmung bríngen* (*з чым-н* mit *D*)

пагадзíнн|ы: ~***ая плáта*** *эк* Stúndenlohn *m* -(e)s

пагадзíцца, пагаджа́цца 1. (*згадзіцца на што-н*) éinwilligen *vi* (in *A*); éinverstanden sein (mit *D*); séine Zústimmung gében* (zu *D*); **2.** (*з кім-н, чым-н*) béistimmen *vi* (*D*), zústimmen *vi* (*D*); zúgeben* *vt* (*прызнаць*); ~ ***з яго прапанóвай*** séinem Vórschlag zústimmen; **3.** (*дамовіцца*) überéinkommen* *аддз vi* (*s*); veréinbaren *vt*; verábreden *vt*; ***мы пагадзíліся éхаць рáзам*** wir kamen überéin, geméinsam ábzufahren; **4.** (*памірыцца*) sich versöhnen (*з кім-н* mit *D*); **5.** (*прывыкнуць*) sich ábfinden* (*з чым-н* mit *D*)

пагадзíць 1. (*прывесцi ў адпаведнасць*) in Überéinstimmung bríngen* *vt* (*з чым-н* mit *D*); **2.** (*памірыць*) versöhnen *vt*

пагаднéнн|е 1. (*згода*) Überéinkunft *f* -, -künfte, Überéinkommen *n* -s, -, Éinverständnis *n* -ses, -se; Ábmachung *f* -, -en (*змова*); ~***е адбылóся*** das Überéinkommen kam zu Stánde [zustánde]; ***прыйсцí да ~я з кім-н*** sich mit *j-m* verständigen, mit *j-m* überéinkommen* *аддз*; ***павóдле ўзаéмнага ~я*** nach béiderseitigem Éinverständnis; ***павóдле ~я*** veréinbarungsgemäß; **2.** (*дамова*) Ábkommen *n* -s, -; ***двухбакóвае ~е*** bilaterales [zwéiseitiges] Ábkommen; ***урáдавае ~е*** Regíerungsabkommen *n*, Ábkommen auf Regíerungsebene; ***таéмнае ~е*** Gehéimabkommen *n* -s, -; ***шматбакóвае ~е*** multilaterales Ábkommen; ***удзéльнікі ~я*** Vertrágsparteien *pl*; **3.** (*прымірэнне*) Versöhnung *f* -; ***джэнтльмéнскае ~е*** *дып* Gentleman's Agreement [ˈdʒɛntlmənz əˈgri:mənt] *n* -, -, *pl* -, -s

пагалíцца sich rasíeren (*самаму*); sich rasíeren lássen* (*у цырульніка*)

пагалíць rasíeren *vt*

пагалóска *ж* **1.** (*чуткі, размовы*) Gerücht *n* -(e)s, -e; ***пайшлá ~*** es geht das Gerücht, das Gerücht ist im Úmlauf; **2.** (*рэха*) Écho *n* -s, -s

пагалóўе *н с.-г* Bestánd *m* -(e)s, -stände; ~ ***жывёлы*** Víehbestand *m*

пагалóўна *прысл*: ***усé*** ~ állesámt, samt und sónders, álle óhne Áusnahme, durch die Bank (*разм*)

пагáна *прысл гл* паганы

пагáнец *м груб* Dréckkerl *m* -s, -e, Schwéinehund *m* -(e)s, -e

пагáніць: ~ ***рýкі*** sich (*D*) die Hände besúdeln

пагáнка *ж бат* Gíftpilz *m* -(e)s, -e; ***блéдная ~*** grüner Knóllenblätterpilz *m*

пагáнскі héidnisch

пагáнства *н* Héidentum *n* -s

пагáн|ы 1. (*мярзотны, подлы, дрэнны*) ábscheulich, grässlich; geméin, níederträchtig; ékelhaft, ábscheulich, wíderlich; ~***ае надвóр'е*** schéußliches Wétter; **2.** (*ядавіты*) gíftig; ~***ы грыб*** Gíftpilz *m* -es, -e

паганя́ты *м* Tréiber *m* -s, -

паганя́ць ántreiben* *vt*

пагаравáць (éine Zéitlang) tráuern *vi*

па-гарадскóму *прысл* wie in der Stadt

пагарачы́цца sich erhítzen, sich eréifern, in Éifer geráten*

пагáрда *ж* Hóchmut *m* -(e)s, Dünkel *m* -s; Verachtung *f* -, Míssachtung *f* -

пагарджáнне *н* Verachtung *f* -; Míssachtung *f* -, Geríngschätzung *f* -

пагáрджáны verächtet; verächtenswert; verächtlich, missáchtet

пагарджá|ць missáchten [míssachten] (*part II* missáchtet *i* gemíssachtet) *vt*, verschmähen *vt*, verächten *vt*, vernáchlässigen *vt*; ***ён ~е маёй парáдай*** er verschmäht méinen Rat

пагáрдліва *прысл;* **пагáрдлівы** hóchmütig, dünkelhaft; geríngschätzig, verächtlich, náchlässig; ***пагáрдліва аднóсіцца*** [***стáвіцца***] ***да каго-н*** *j-n* verächtlich behándeln; *j-n* über die Áchsel [Schúlter] ánsehen*

пагáрдлівасць *ж* Geríngschätzigkeit *f* -, Verächtlichkeit *f* -, Níchtbeachtung *f* -

пагарчóць bítterer wérden

пагаршáцца *гл* пагоршаць

пагаршáць *гл* пагоршваць, пагоршыць

пагаршэ́нне *н* Verschléchterung *f* -, Verschlímmerung *f* -; ~ ***стасýнкаў*** Verschléchterung [Trübung] der Beziehungen

пагарóлец *м* Brándgeschädigte (*sub*) *m* -n, -n

пагарóць 1. (*пэўны час*) (éine Zéitlang) brénnen* *vi* (*s*); **2.** (*пра лес і г. д*) ábbrennen* *vi* (*s*); **3.** (*пра людзей*) durch Brand geschädigt sein [werden]; **4.** *перан разм* (*збанкрутаваць*) Bankrótt [Pléite] máchen; verkráchen *vi* (*s*); ábgebrannt sein

пагáс|нуць áusgehen* *vi* (*s*); erlöschen* *vi* (*s*) (*высок*); ***святлó ~ла*** das Licht ging aus

пагасíць 1. (*агонь*) (áus)löschen *vt*; **2.** *фін* (*пазыку і пад.*) tílgen *vt*, begléichen* *vt*, löschen *vt*; ~ ***пазы́ку*** ein Dárlehen ábzahlen [tilgen]; **3.:** ~ ***мáркі*** Márken entwérten [stémpeln]

па-гаспадáрску *прысл* wírtschaftlich, vom wirtschaflichen Ständpunkt aus

пагасцíць, пагасцявáць (éine Zéitlang) zu Gast [zu Besúch] wéilen

пагатóў *прысл* um so mehr; erst recht; ***ён ~ вінавáты*** er ist um so mehr schúldig [um so schúldiger]

пагашáць *гл* пагасіць **2.**

пагашэ́нн|е *н* (*пазык і пад.*) Tílgung *f* -, -en, Begléichung *f* -, -en; ~***е плацяжóў*** Begléichung der Záhlungen, Záhlungsausgleich *m* -es; ~ ***мáрак*** Stémpelung [Entwértung] *f* von Márken; ***тыражы ~я*** Tílgungsziehung *f* -, -en

па-геройску héldenhaft

пагíбе|ль *ж* (*смерць, гібель*) Úntergang *m* -(e)s, Verdérben *n* -s; Verfáll *m* -(e)s (*грамадства*); ***рыхтавáць ~ль*** *разм* éinen Strick dréhen (*каму-н D*); ◊ ***гнуць у тры ~лі*** *разм j-n* unterdrücken; ***сагнýцца ў тры ~лі*** *разм* sich zusámmenducken; éinen krúmmen Rücken máchen

пагíбельны verdérblich, únheilvoll; ~ ***ўплыў*** verdérblicher [verhéerender] Éinfluss

пагі́нуць úntergehen* *vi* (*s*); zu Grúnde [zugrúnde] géhen* (*у галечы і г. д*); ums Lében kómmen*, úmkommen* *vi* (*s*) (*гвалтоўна*); **~ *на вайне́*** (im Krieg) fállen* *vi* (*s*)

пагля́дзіць 1. (*лашчыць, мілаваць*) stréicheln *vt*; **~ *па галóўцы*** *перан* Náchsicht üben; **2.** (*адпрасаваць*) plätten *vt*, bügeln *vt*, glätten *vt*

пагладчэ́ць glátter wérden; dícker [vóller] wérden (*патаўсцець*)

пагліби́ць 1. (*стаць больш глыбокім*) sich vertíefen, tíefer wérden; **2.** *перан* sich vertíefen, sich versénken; éindringen* *vi* (*s*); **~ *ў кнíгу*** sich in ein Buch vertíefen [versénken]

пагліби́ць vertíefen *vt*, tíefer máchen

паглыбле́нне *н* (*дзеянне*) Vertíefung *f*-, Vertíefen *n* -s; **2.** (*упадзіна*) Vertíefung *f*-, -en

паглы́блены 1. (*больш глыбокі*) vertíeft; **2.** *перан* (*грунтоўны*) gründlich; éingehend, áusführlich

паглыбля́ць vertíefen *vt*

паглына́льнасць *ж* Absorptiónsfähigkeit *f*-, Áufnahmefähigkeit *f*-, Absorptiónsvermögen *n* -s

паглына́льнік *м спец* Absórber *m* -s, -, Absorptiónsmittel *n* -s, -, Sättiger *m* -s, -

паглына́льны absorbíerend; Absorptións-

паглына́нне *н* **1.** (*убіранне, уцягванне*) Áufsaugen *n* -s; Absorptión *f*-, -en, Absorbíerung *f*-; **2.** *перан* Verschlíngen *n* -s; Éinverleibung *f*-, -en (*уключэнне*)

паглына́ць 1. (*уцягнуць*) áufsaugen* *vt*, éinsaugen* *vt*, *хім* absorbíeren *vt*; **2.** *перан* verschlíngen* *vt*

паглядáць, паглядва́ць 1. (*на каго-н, на што-н*) (von Zeit zu Zeit) ánsehen* *vt* [hínsehen* *vi*]; **2.** (*за кім-н, за чым-н*) beáufsichtigen *vt*, überwáchen *vt*

паглядзе́цца sich beséhen*, sich beschäuen

паглядзе́ць 1. (*каб разглядзець, убачыць*) hínsehen* *vi*; ánblicken *vt*; éinen Blick wérfen* (*на каго, на што-н* auf *A*); **2.** (*панаглядаць*) áufpassen *vi* (*за кім-н, чым-н* auf *A*)

пагна́цца: **~ *за кім-н, чым-н j-m*** náchfolgen; *j-n* verfólgen; ◊ ***за двумá зайцáмі пагóнішся – нівóднага не злóвіш*** wer zwei Hásen zúgleich hetzt, fängt kéinen

пагна́ць (wég)tréiben* *vt*

пагні́сці, пагні́ць (nacheinánder) verfáulen *vi* (*s*)

пагóда *ж* gútes Wétter

пагóдлівы, пагóдны *разм* héiter; **~ *дзень*** ein héiterer Tag

пагóйдвацца leicht wánken, táumeln *vi*; zéitweilig hin und her scháukeln

пагóлены rasíert

пагóн *м вайск* Schúlterstück *n* -(e)s, -e (*афіцэрскі*); Schúlterklappe *f*-, -n (*салдацкі*)

пагóнны: **~ *метр*** *спец* láufendes Méter

пагóншчык *м* Tréiber *m* -s, -

пагóня *ж* **1.** (*дзеянне*) Verfólgung *f*-, Náchsetzen *n* -s; **2.** *зборн* (*тыя, хто пераследуе*) Verfólger *pl*; ***Пагóня*** *гіст* Pahónja *f*-, -s (*Reiter mit dem Schwert: historischer Wappen des Großfürstentums Litauen*); **3.** *перан* Verséssenheit *f*- (*за чым-н* auf *A*); **~ *за сенсáцыяй*** Sensatiónshascherei *f*-; **~ *за высóкімі пакáзчыкамі*** Jagd nach höheren Zíffern

пагóрак *м* Hügel *m* -s, -, Ánhöhe *f*-, -n

пагóркнуць bítter [ránzig] wérden; verdérben* *vi* (*s*) (*сапсавацца*)

пагóршаць sich verschléchtern, sich verschlímmern; sich zúspitzen (*пра адносіны*)

пагóршыць verschléchtern *vt*, verschlímmern *vt*; zúspitzen *vt* (*пра адносіны*)

пагóрысты Hügel-; hügelig; úneben (*няроўны*)

пагражáльны *гл* пагрозлівы

пагражáць dróhen *vi* (*каму-н D*), bedróhen *vt* (*чым-н* mit *D*)

пагранíчнік *м* Grénzsoldat *m* -en, -en, Grénzpolizist *m* -en, -en

пагранíчн|ы *гл* памежны

пагранíчча *н* Grénzgebiet *n* -(e)s, -e

пагрóз|а *ж* **1.** Dróhung *f*-, -en; Bedróhung *f*; Ándrohung *f*-; **2.** Gefáhr *f*-, -en (*небяспека*); **~ *а вайны́*** Kríegsgefahr-; ***пад ~ай вайны́*** únter Ándrohung éines Kríeges; **~ *а мíру*** Gefährdung des Fríedens; ***быць пад ~ай*** *чаго-н* in Gefáhr sein [schwében]; ***пастáвіць пад ~у*** gefährden *vt*, éiner Gefáhr áussetzen; ***~амі нічóга не даб'éшся*** [***не вóзьмеш***]! bánge máchen [Bángemachen] gilt nicht!; mit Dróhungen erréicht man gar nichts

пагрóзлівы 1. dróhend, bedróhlich; **~ *тон*** dróhender Ton; **2.** (*небяспечны*) gefährdet, bedróht

пагрóзны *гл* пагрозлівы **1.**

пагрóм *м гіст, тс перан* Pogróm -s, -e; Blútbad *m* -(e)s, Gemétzel *n* -s (*разня, бойня*)

пагрóмн|ы *тс гіст* Pogróm-; **~*ая прамóва*** Pogrómrede *f*-, -n

пагрузíцца 1. (*зрабіць пасадку*) éinsteigen* *vi* (*s*); an Bord géhen* (*на судна*); **2.** (*пайсці на дно*) versínken* *vi* (*s*); **3.** *перан* versínken* (*s*); **~ *ў сон*** in Schlaf (ver)sínken*

пагрýзк|а *ж камерц* Beláden *n* -s; Beládung *f*-, Verládung *f*-; Verláden *n* -s; Verschíffung *f*- (*на судна*); ***гатóвы да ~і*** ládebereit; ***ажыццяўля́ць ~у*** beláden*, Beládung dúrchführen; ***затры́мліваць ~у*** Beládung verzögern; ***зака́нчваць ~у*** Beládung fértig machen

пагрýзчык *м тэх* Ládemaschine *f*-, -n, Húbstapler *m* -s, -, Láder *m* -s, -; ***каўшóвы ~*** Scháufellader *m*

пагрýкваць von Zeit zu Zeit klópfen [klátschen]

пагрэ́бваць sich ékeln, Ékel [Ábscheu] empfínden* [verspüren]

пагрэ́цца sich étwas wärmen, sich áufwärmen; **~ *на сóнцы*** sich étwas sónnen

пагрэ́ць (ein wénig, étwas) wärmen *vt* [erwärmen *vt*, áufwärmen *vt*]

пагуля́ць 1. spazíeren géhen* *vi* (*s*); **2.** (*павесяліцца*) búmmeln *vi*; schwíemeln *vi* (*гульнуць*)

пагýтарыць *разм* sich ein wénig unterhálten* (*аб чым-н* über *A*, von *D*)

пагэ́туль *разм* bis hierhér, bishér

пад(а) *прыназ* **1.** únter (*A на пыт* «куды», *D на пыт* «дзе?»); **~ *зямлёй*** únter der Érde; ***паклáсці ~ рукý*** beréit [gríffbereit] légen; **2.** (*каля*) vor (*D*), bei (*D*); **~ *Мíнскам*** bei [vor] Minsk; **3.** (*у дачыненні да часу*) gégen (*A*), an (*A*), vor (*D*); **~ *вéчар*** gégen Ábend; **4.** (*для*) für (*A*); ***слóік ~ варэ́нне*** ein Konfitürglas *n* -es, -gläser, Marmeládeglas *n*; **~ *залóг*** gégen Kautión; ***не ~ сíлу*** über die Kräfte; **~ *рукóй*** gríffbereit; **~ *нóсам*** vor der Náse; **~ *дыктóўку*** nach Diktát

падабарóны *м юрыд* Kli|ént *m* -en, -en, Mandánt *m* -en, -en

падабáцца gefállen* *vi*; zúsagen *vi* (*быць да густу*)

падабéнства *н* **1.** Ähnlichkeit *f*-, -en, Gléichheit *f*-, -en; **~ *характáраў*** Gléichheit der Charaktére [ka-]; ***у яго ~ да бáцькі*** er ist séinem Váter wie aus dem Gesícht geschnítten; ***павóдле вóбразу і ~*** nach dem Bílde; **2.** *матэм* Ähnlichkeit *f*-, Analogíe *f*-

падабрáцца (*падкрасціся*) sich heránschleichen*; heránschleichen* *vi* (*s*); *паляўн* heránpirschen *vi* (*s*)

падабráць 1. (*падняць*) áufheben* *vt*; áufsammeln *vt* (*сабраць*); **~ (*па*)*ранéных*** die Verwúndeten áufsammeln [bérgen*]; **2.** (*выбраць*) áussuchen *vt*, pássend áuswählen; **~ *ключ*** den pássenden Schlüssel fínden*; **~ *акуля́ры*** sich (*D*) éine Brílle ánpassen; **3.** *разм* (*знайшоўшы, узяць з сабою*) mítnehmen* *vt*; **4.** (*прыўзняць уверх*) hóchheben* *addz vt*; **5.** (*схаваць пад што-н*) verstécken *vt*; únterschlagen* *vt*; **~ *пад сябé нóгі*** die Béine únterschlagen*; **6.** (*сабраць усё*) zusámmensammeln *vt*

падавáць *гл* падáць **II**

падавí|цца sich verschlúcken (*чым-н* an *D*); ***ён ~ўся кавáлкам*** er würgt an éinem Bíssen

падавíць 1. *разм* unterdrücken *vt*; **~ *паўстáнне*** éinen Áufstand unterdrücken; **~ *забастóўку*** éinen Streik níederschlagen* *addz* [unterdrücken]; **2.** *вайск* (*агнём*) níederschlagen* *addz vt*, bekämpfen *vt*

падагнáны ángepasst

падагнáць 1. (*прымусіць наблізіцца да каго-н, чаго-н*)

herántreiben* *vt*, ántreiben* *vt* (*прымусіць хутчэй ісці, бегчы, ехаць*) zur Éile ántreiben*; **2.** (*прыладзіць*) ánpassen *vt* (*да чаго-н D*); **~ *до́шку*** ein Brett ánpassen

падагну́ць 1. úmbiegen* *vt*, éinbiegen* *vt*; (nach unten) bíegen* *vt*; **2.** (*падабраць ногі, хвост*) únterschlagen* *vt*

пада́гра *ж мед* Gicht *f* -, Pódagra *n* -s

падаграва́льнік *м тэх* Vórwärmer *m* -s, -, Héizapparat *m* -(e)s, -e, Erhítzer *m* -s, -

падаграва́льны *тэх* Heiz-; **~ *прыбо́р*** Héizgerät *n* -(e)s, -e

падаграва́ць áufwärmen *vt*; vórwärmen *vt* (*папярэдне*)

пада́грык *м мед* Gíchtkranke (*sub*) *m* -n, -n

падагры́чны *мед* gíchtisch; podágrisch (*тк аб нагах*)

падагро́ць *гл* падаграваць

падагульне́нне *н* **1.** (*падлік*) Summíerung *f* -, -en; **2.** (*высновы*) Schlússfolgerung *f* -, -en

падагу́льніць 1. (*падлічыць суму*) summíeren *vt*; **2.** *перан* (*абагульніць*) Bilánz zíehen*, zusámmenfassen *vt*, áuswerten *vt*

пададдзе́л *м* Únterabteilung *f* -, -en

пада́дзены geréicht

падазрава́ць 1. (*каго-н*) *j-n* verdächtigen, *j-n* im Verdácht háben; gégen *j-n* Verdácht errégen (*высок*); **2.** (*дапускаць*) vermúten *vt*

падазро́на *прысл*; **падазро́ны** (*што выклікае падазронасць*) verdächtig; **2.** *у знач выказн.* ***гэ́та ~*** die Sáche kommt mir verdächtig vor; **3.** (*з падазронасцю*) mísstrauisch, árgwöhnisch, mit Árgwohn

падазро́насць *ж* **1.** Verdächtigkeit *f* -; **2.** (*недавер*) Mísstrauen *n* -s, Árgwohn *m* -s; **3.** (*падазрэнне*) Verdácht *m* -(e)s; Verdächtigung *f* - (*узяцце пад падазрэнне*)

падазро́нне *н* Verdácht *m* -(e)s; Verdächtigung *f* -; ***выкліка́ць ~ у каго-н*** bei *j-m* Verdácht errégen; ***наклі́каць на сябе́ ~*** sich verdächtig máchen, in Verdácht kómmen* [geráten*]

падако́ннік *м* Fénsterbrett *n* -(e)s, -er

пада́лей *прысл* étwas wéiter

пада́нн|е *н* (*апавяданне*) mündliche Überlíeferung, Ságe *f* -, -n, Legénde *f* -, -n; ***паво́дле ~я*** der Überlíeferung zufólge, laut Überlíeferung

падапе́чн|ы *юрыд* únter Tréuhand stéhend; Tréuhand-; ***~ая тэрыто́рыя*** Tréuhandgebiet *n* -(e)s, -e

падаплёка *жс кніжн* Bewéggrund *m* -(e)s, -gründe, Híntergrund *m*; der éigentliche Grund

падараżáнне *н* Vertéuerung *f* -

падараżáць, падараżы́ць vertéuern *vt*, im Préise stéigern [erhöhen]

падарва́цца 1. (*узарвацца*) explodíeren *vi* (*s*), detoníeren *vi*; **2.** *мед* sich verhében*

падарва́ць 1. (*разбурыць выбухам*) spréngen *vt*; **2.** *перан* untergráben* *vt*, unterwühlen *vt*; **~ чый-н *аўтарытэ́т*** *j-s* Autorität untergráben*; **~ *дове́р*** das Vertráuen untergráben*

падаро́жжа *н* Réise *f* -, -n; ***кругасве́тнае ~*** éine Réise um die Welt [Wéltreise]; ***бюро́ ~ў*** Réisebüro *n* -s, -s; ***зрабі́ць ~*** éine Réise máchen [unterném̈hmen*]; auf Réisen géhen*

падаро́жнік I *м* Réisende (*sub*) *m*, *f* -n, -n

падаро́жнік II *м бат абл гл* трыпутнік

падаро́жнічаць réisen *vi* (*h, s*), éine Réise máchen

падаро́жн|ы Réise-, ***~ыя ната́ткі*** Réisenotizen *pl*; ***~ы каця́м*** Réiseanzug *m* -(e)s, -züge

падару́нак *м* Geschénk *n* -(e)s, -e, Präsént *n* -(e)s, -e; ***мале́нькі ~*** (kléine) Áufmerksamkeit *f* -, -en; ***я атры́маў гэ́та ў ~*** ich habe das geschénkt [zum Geschénk] bekómmen

падару́нкавы Geschénk-; Präsént-; **~ *набо́р*** Geschénkpackung *f* -, -en, Präséntpackung *f*

падары́ць schénken *vt*, verschénken *vt*, zum Präsént máchen

падаси́навік *м бат* (*грыб*) Rótkäppchen *n* -s, -

падасла́ны I héimlich (zú)geschíckt (*з таемнай мэтай*); réchtzeitig [zur réchten Zeit] (zú)geschíckt (*своечасова*)

падасла́ны II (dar)úntergelegt (*падкладзены пад што-н*)

падасла́ць I (*з таенай мэтай*) (héimlich) (zú)schícken *vt*

падасла́ць II (*пакласці пасцілку*) únterlegen *vt*, únterbreiten *vt*; únterstreuen *vt* (*салому і пад.*)

падаспе́ць *разм* zur réchten Zeit kómmen*

пада́т|ак *м эк* Stéuer *f* -, -n; ***~ак з абаро́ту*** Úmsatzsteuer *f*; ***адзі́ны ~ак*** Éinheitssteuer *f*; ***грашо́вы ~ак*** Géldsteuer *f*; ***~ак на дада́ную ва́ртасць*** Méhrwertsteuer *f*; ***дадатко́вы ~ак*** Nébensteuer *f*, Náchsteuer *f*; zúsätzliche Stéuer; ***~ак на зарпла́ту*** Lóhnsteuer *f* ***~ак на звышпрыбы́так*** Stéuer auf Méhrgewinn; ***мясцо́вы ~ак*** Lokálsteuer *f*; ***натура́льны ~ак*** Naturálsteuer *f*, Naturálabgaben *pl*; ***~ак на нерухо́масць*** Immobíli|ensteuer *f*; ***падахо́дны ~ак*** Éinkommensteuer *f*; ***прагрэсі́ўны ~ак*** Progressívsteuer *f*; ***прамы́ ~ак*** dirékte Stéuer; ***~ак на прыбы́так*** Gewínnsteuer *f*, Gewínnabführung *f*; ***~ак на про́даж*** Verkáufssteuer *f*; ***уско́сны ~ак*** indirékte Stéuer; ***абкла́сці ~кам*** mit Stéuer belégen; ***збіра́ць ~кі*** Stéuern erhében* [éinziehen*]; ***зніжа́ць ~кі*** Stéuern herábsetzen [ermäßigen]; ***павыша́ць ~кі*** Stéuern erhöhen; ***плаці́ць ~кі*** Stéuern entríchten [(be)záhlen]; ***ухіля́цца ад вы́платы ~каў*** Stéuern hinterzíehen*; ***неабкладальны ~кам*** stéuerfrei; ***абкладанне насе́льніцтва ~камі*** die Bestéuerung der Bevölkerung; ***павялічэ́нне ~каў*** die wáchsende Bestéuerung

падаткаабкладанне *н фін* Bestéuerung *f* -, -en

падатказдо́льны stéuerfähig

падаткаплацёльшчык *м* Stéuerzahler *m* -s, -

падатко́вы *фін* Stéuer-; **~ *збор*** Bestéuerung *f* -, -en; **~ *прэс*** Stéuerschraube *f* -

пада́тлівасць *жс* Náchgiebigkeit *f* -, Gefügigkeit *f* -

пада́тлівы 1. (*пра матэрыял*) leicht zu beárbeiten; geschméidig; **2.** *перан* náchgiebig, gefügt; willfährig (*толькі пра чалавека*); **~ *хара́ктар*** ein wéicher Charákter [kɑ-]

падаўжа́цца sich verlängern, länger wérden

падаўжа́ць *гл* падоўжыць

падаўжэ́нне *н* Verlängerung *f* -, -en; **~ *тэ́рміну*** Frístverlängerung *f* -, -en, Termínverlängerung *f*; **~ *адпачы́нку*** Náchurlaub *m* -(e)s, -e

падаўжэ́ць länger wérden

падаўле́нне *н* **1.** Unterdrückung *f* -, -en, Níederwerfung *f* -, -en, Níederschlagung *f* -, -en (*паўстання, забастоўкі*); **2.** *вайск* Níederhalten *n* -s; **~ *агнём*** Níederhalten durch Féuer

пада́ўца *м разм* Überbrínger *m* -s, -, Gesúchsteller *m* -s, - (*заявы, прашэння і г. д*)

падафіцэ́р *м вайск кніжн* Únteroffizier *m* -s, -e

падахво́ці|цца sich erbíeten* (*высок*); sich ánbieten*; ***ён ~ўся паказа́ць даро́гу*** er erbót sich, den Weg zu zéigen (*высок*); er bot sich an, den Weg zu zéigen

падахво́ціць ánregen *vt*, ánspornen *vt*, veránlassen *vt*, bewégen* *vt* (*да чаго-н* zu *D*)

падахво́чванне *н* Ánregung *f* -, -en, Veránlassung *f* -, -en; Ántrieb *m* -(e)s, Ánsporn *m* -(e)s; Impúls *m* -es, -e

пада́|цца 1. (*саступіць*) náchgeben* *vi*, wéichen* *vi* (*s*); **2.:** **~ *напе́рад*** vórrücken *vi* (*s*); **~ *наза́д*** zurückweichen *vi* (*s*); **3.** *перан* (*здацца, прымроіцца*) schéinen* *vi*, dünken* *vi* (*безас зваротам з conj або з* als, als ob, als wenn + *conj*); ***мне ~ло́ся, бы́ццам не́хта прыйшо́ў*** mir schien, es wäre jémand éingetreten; mir schien, als wäre jémand éingetreten; mir schien, als ob [als wenn] jémand éingetreten wäre

па́да|ць I 1. fállen* *vi* (*s*); stürzen *vi* (*s*) (*імкліва*); **2.** (*руйнавацца*) éinfállen* *vi* (*s*), éinstürzen *vi* (*s*); **3.** (*зніжэнне*) fállen* *vi* (*s*), sínken* *vi* (*s*); ***бараметр ~е*** das Barométer fällt; ***цэ́ны ~юць*** die Préise sínken [fállen, géhen zurück]

пада́ць II réichen *vt*; **~ *руку́*** die Hand réichen [geben*]; **~ *каму-н палі́то*** *j-m* in den Mántel hélfen*; **~ *на стол*** áuftragen* *vt*; servíeren [-ˊ viː-] *vt*; **2.** (*заяву і г. д*) éinreichen *vt*; **~ *ска́ргу*** éine Beschwérde éinlegen; **~ *зая́ўку*** éinen Ántrag stéllen; **~ *ра́парт*** Méldung erstátten; **3.** *спарт* (*мяч*) ángeben* *vt*; ánstoßen* *vt* (*першая падача*); zúgeben* *vt*, zúspielen *vt*; **~ *го́лас*** éinen Laut von sich gében*; **~ *кама́нду*** ein Kommándo gében* [ertéilen]; **~**

дýмку éinen Gedánken éingeben*; ***не ~ вы́гляду*** *разм* sich (*D*) *etw.* nicht ánmerken lássen*

падýшка *ж* **1.** Kíssen *n* -s, -, Kópfkissen *n*; Pólster *n* -s, - (*на канапе*); **2.** *тэх* Láger *n* -s, -; *буд* Béttung *f* -, -en, Pólster *n*

падýшны: ***~ падáтак*** *гіст* Kópfsteuer *f* -, -n

падфарбóўваць *гл* падмалёўваць

падхалíм *м разм* Spéichellecker *m* -s, -

падхалíмскі *разм* spéichelleckerisch, kríecherisch, líebedienerisch

падхалíмства *н* Speichelleckeréi *f* -; Lobhudeléi *f* -

падхапíць 1. (*падняць*) hóchheben* *аддз vt*; **2.** (*злавіць*) áuffangen* *vt*; im Flug fássen; **3.** (*падтрымаць*): ***~ ініцыя́тыву*** die Initiatíve unterstützen; **4.** (*схапіць хваробу*) sich (*D*) zúziehen*; ***~ нáсмарк*** sich (*D*) éinen Schnúpfen hólen; **5.** (*пачаць падпяваць*) in den Chor [k-] éinstimmen

падхваліць, падхвáльваць *разм* leicht [ein wénig, ein biss|chen] lóben

падхінýць (*загарнуць край чаго-н унутр або пад што-н*) úmbiegen* *vt*, éinbiegen* *vt*, nach únten bíegen*

падцерабíць ábháuen* *vt*; (*сукí*) ábästen *vt*

падцíнаць *гл* падцяць

падцэ́ліць 1. *разм* (*добра трапіць у цэль*) tréffen* *vt*; ***~ у галавý*** [***лоб***] den Kopf [die Stirn] tréffen*; **2.** *перан* (*падлавіць момант*) ábpassen *vt*

падцягвацца 1. *спарт* sich hóchziehen* *аддз*; éinen Klímmzug máchen; **2.** (*пра дысцыпліну*) sich zusámmennehmen*; **3.** (*пра тых, хто адстаў*) sich béssern; áufholen *vi*; **4.** *вайск* áufrücken *vi* (*s*), áufschließen* *vi* (*s*)

падця́гнуты stramm; straff; diszipliníert; ~ ***выгляд*** strámmes Áussehen, strámme Háltung

падця́жкі *мн разм* Hósenträger *pl*

падця́ць **1.** (*адсячы, падрэзаць*) (von únten) ábhauen* *vt*, ábschneiden* *vt*, ábschlagen* *vt*; **2.** (*падагнуць пад сябе або прыціснуць да сябе*): ~ ***хвост*** den Schwanz éinziehen*; ~ ***пад сябе но́гі*** die Béine únterschlagen*; ~ ***гу́бы*** die Líppen zusámmen- [aufeinánder]préssen

падчапі|ць **1.** (*зачапіць, прычапіць*) ánhaken *vt* (*да чаго-н* an *A*); **2.** *разм* (*набыць*) sich (*D*) ánschaffen; áufgabeln *vt* (*каго-н*); ***дзе ты ~ла ягó?*** *разм* wo hast du ihn denn áufgegabelt?; **3.** *пе-ран разм* (*сказаць што-н з'едлівае*) nécken *vt* (*чым-н* mit *D*); hänseln *vt* (*пакепліваць*)

па́дчарка *ж* Stíeftochter *f* -, -töchter

падчар'ўе *н анат* Únterleib *m* -(e)s, -er

падчас **1.** *прысл кніжн* mánchmal, von Zeit zu Zeit; **2.** *прыназ* während (*чаго-н G*)

падчы́стка *ж* **1.** Áusputzen *n* -s; **2.** (*напісанага*) Radíeren *n* -s

падчэ́пліванне *н* Ánhaken *n* -s

падшалёўванне *н буд*: ~ ***да́ху*** Dáchverschalung *f* -

падшалёўваць, падшаля́ваць täfeln *vt*; ~ ***столь*** die Zímmerdecke täfeln [verschálen]

падшкля́ннік *м* Téeglasuntersatz *m* -es, -sätze, Úntersatz *m*

падшмаргну́ць *разм* hóchziehen* *addz vt*

падшпі|ць, падшпі́льваць mit Stécknadeln befestigen; ***я ~ю́ сту́жку шпі́лькай*** ich werde das Band mit éiner Stécknadel befestigen; áufstecken *vt*; ánstecken *vt* (*прымацаваць*); ***~іць валасы́*** die Háare áufstecken [hóchstecken]; ***~і́ць значо́к*** [***кве́тку***] ***да пінжака́*** ein Ábzeichen [éine Blúme] an das Jackétt ánstecken; ***~і́ць бант*** éine Schléife ánstecken

падштурхо́ўванне *н* Stóßen *n* -s, Ánstoßen *n*

падшука́ць sich úmsehen* (*што-н* nach *D*); ~ ***рабо́ту*** [***но́вае ме́сца, кват э́ру***] sich nach Árbeit [éiner néuen Stéllung, éiner Wóhnung] úmsehen*; áusfindig máchen; ***мне тр э́ба ~ сабе́ но́вую кват э́ру*** ich muss éine néue Wóhnung für mich áusfindig máchen

падшу́кванне *н* Súchen *n* -s (*чаго-н* nach *D*)

падшыва́нец *м разм* Wíldfang *m* -(e)s, -fänge, Schlíngel *m* -s, -

падшы́ўка *ж* **1.** (*папер*) Éinheften *n* -s; Ábheften *n* -s; **2.** (*газет*) Bündel zusámmengehefteter Zéitungen

падшэ́рхлы verhärtet (*зацвярдзелы*); étwas trócken (gewórden) (*падсохлы*); leicht gefróren (*падмёрзлы*)

падшэ́рхнуць **1.** (*зацвярдзець*) hart wérden; sich verhärten; **2.** (*падсохнуць*) trócken wérden, trócknen *vi* (*s*); **3.** (*падмерзнуць*) leicht gefríeren*

падшэ́ўка *ж* **1.** Únternähen *n* -s; 2. (*у вопратцы*) Saum *m* -(e)s, Säume

падшэ́фн|ы únter Pátenschaft stéhend; ***~ая шко́ла*** Pátenschule *f* -, -n

падыгра́ць (*каму-н*) *разм j-m* Vórschub léisten

падыма́нне *н* **1.** (*чаго-н з зямлі і г. д*) Áufheben *n* -s, **2.** (*магчымасць утрымаць што-н цяжкае, аддзяліўшы ад зямлі*) Hében *n* -s, Hébung *f* -; **3.** (*перамяшчэнне знізу ўверх*) Hóchheben *n* -s; ~ ***дзіця́ці*** das Hóchheben des Kíndes; **4.** (*перавод у вертыкальнае становішча*) Hébung *f*; ~ ***на́крыўкі*** die Hébung des Déckels; **5.** (*прыманне больш высокага становішча*) Erhébung *f* -

падыма́ць *гл* падняць

падзі́спад *прысл абл* nach únten; únter etwas (légen, stécken)

падзі́спадам *прысл абл* únten, ganz únten

падыспы́тны *м* Prüfling *m* -(e)s, -e, Examinánd *m* -en, -en

падысці́ **1.** (*наблізіцца*) sich nähern (*да каго-н, чаго-н D*), zúkommen* *vi* (*s*) (*да каго-н, чаго-н* auf *A*), heránkommen* *vi* (*s*) (*да каго-н, чаго-н* an *A*); ***да ягó не*** ~ es ist schwer, an ihn heránzukommen*; herántreten* *vi* (*s*) (*да каго-н, чаго-н* an *A*); **2.** (*быць адпаведным*) pássen *vi* (*каму-н, чаму-н D*); ***гэ́та сюды́ не падыхо́дзіць*** das passt nicht hierhér; ***ён не падыхо́дзіць дзе́ля гэ́тага*** er passt nicht dazú

падыхо́д *м* **1.** Ánsatz *m* -es, -sätze, Heránge hen *n* -s, Heránge hens-weise *f* -, -n; ***няпра́вільны ~ да рашэ́ння прабле́мы*** ein verkéhrter Ánsatz zur Lösung des Probléms; **2.** *ав* Ánflug *m* -(e)s, -flüge; ***быць на ~зе*** im Ánflug sein; **3.** (*заход у порт*) Ánlauf *m* -(e)s, -läufe, Ánlaufen *n* -s; **4.** (*пункт гледжання*) Éinstellung *f* -, -en; ***ста́віцца крыты́чна да ўсіх ~аў*** éine krítische Éinstellung zu állem háben; Ständpunkt *m* -(e)s, -e (*пункт гледжання*); Konzeptión *f* -, -en

падэ́шва *ж* Sóhle *f* -, -n; ~ ***нагі́*** Fúßsohle *f*; ~ ***чараві́ка*** Schúhsohle *f*

падэ́швенны Sóhlen-

пад'ю́джваць *разм* áufstacheln *vt*, áufhetzen *vt*; áufreisen *vt*

пад'язджа́ць *гл* пад'ехаць

пад'язн|ы́: ~ы́ шлях Zúfahrtsweg *m* -(e)s, -e; *чыг* Nébenbahn *f* -, -en, Zúfahrtsgleis *n* -es, -e; ***~а́я даро́га*** Ánfahrtsweg *m*, Zúfahrtsstraße *f* -, -n

пае́здк|а *ж* Fahrt *f* -, -en; Réise *f* -, -n (*вандроўка*); Áusflug *m* -(e)s, -flüge (*экскурсія*); ***вы́правіцца ў ~у*** auf Fahrt géhen*; ***шчасли́вай ~і!*** gúte Fahrt!; ***дзелава́я ~а*** Geschäftsreise *f*; ***вясёлая ~а*** Vergnügungsfahrt *f*; ***інспекцы́йная ~а*** Besíchtigungsreise *f*; ***~а па го́радзе*** Stádtrundfahrt *f*; ~ ***за го́рад*** Áusflug ins Grüne

пае́ха|ць **1.** (*ехаць*) fáhren* *vi* (*s*); ***яны́ ~лі дадо́му*** sie fúhren nach Háuse; **2.** (*пачаць рухацца*) lósfahren* *addz vi* (*s*), sich in Bewégung sétzen; ***едзь!*** fahr los!; **3.** *разм* (*саслізнуць*) ábgleiten* *vi* (*s*), ábrutschen *vi* (*s*)

паёк *м* (*харчовы*) Ratión *f* -, -en; ***ме́сячны*** ~ Mónatsration *f*; ***сухі́*** ~ Káltverpflegung *f* -, Márschverpflegung *f* -; ***спецыя́льны*** ~ Sónderzuteilung *f* -, Sónderration *f* -; ◊ ***трыма́ць*** *каго-н* ***на гало́дным пайку́*** *j-n* auf Húngerration sétzen

паж *м гіст* Páge [-ʒə] *m* -n, -n

пажада́на *прысл у знач. вык* es ist zu wünschen, es ist wünschenswert

пажада́насць *ж* Erwünschtheit *f* -

пажада́нн|е *н* **1.** Wunsch *m* -es, Wünsche; ***маё са́мае вялі́кае ~е*** mein séhnlichster Wunsch; ***па яго ~ю*** nach séinem Wunsch; ***у мяне́ ёсць ~е*** ich habe éinen Wunsch; Glückwunsch *m* (*віншаванне*); ***до́брае ~е*** Ségenswunsch *m*; **2.** (*патрабаванне*) Verlángen *n* -s (*чаго-н* nach *D*)

пажада́ны **1.** (*які адпавядае інтарэсам*) wünschenswert, erwünscht; **2.** (*прыемны*) ángenehm, gefällig

пажада́ць wünschen *vt*; ~ ***до́брага ве́чара*** guten Ábend wünschen

пажа́длівы **1.** fléischfressend; **2.** *перан* wóllüstig, sínnlich

пажа́ліцца *разм* sich beklágen (*каму-н* bei *D*, *на каго-н, што-н* über *A*); klágen *vi* (*каму-н D на каго-н, што-н* über *A*); sich beschwéren (*каму-н* bei *D*, *на каго-н, што-н* über *A*) (*паскардзіцца*)

пажа́р *м* Brand *m* -(e)s, Bände; Féuersbrunst *f* -, -brünste; ***патушы́ць*** ~ éinen Brand löschen [éindämmen]; ◊ ***як на*** ~ brándeilig, wie die Féuerwehr

пажа́рнік *м* Féuerwehrmann *m* -(e)s, -männer *i* -leute

пажа́рн|ы Féuer-; Lösch-; ***~ая кама́нда*** Féuerwehr *f* -, -en, Löschmannschaft *f* -, -en; ***~ая аўтамашы́на*** Löschfahrzeug *n* -(e)s, -e; ***~ая трыво́га*** Féueralarm *m* -(e)s, -e; ***~ае дэпо́*** Féuerwache *f* -, -n; ◊ ***на ўся́кі ~ы*** (***вы́падак***) für den Nótfall

пажа́рышча *н* Brándstätte *f* -, -n, Brándfläche *f* -, -n

пажаўце́ць gelb wérden

пажо́ўклы vergílbt

пажо́ўкнуць gelb wérden; vergílben *vi* (*s*); ~ ***ад ча́су*** im Lauf(e) der Zeit vergílben; ***кры́ху*** ~ leicht ángilben

пажыві́цца Vórteil zíehen*; séine Schäfchen ins Tróckne brín-gen*; ~ ***за чый-н кошт*** sich (*D*) auf *j-s* Kósten éinen gúten Tag máchen; ~ ***чужы́м ска́рбам*** sich (*D*) ein frémdes Gut áneignen

пажы́лы bejáhrt, betágt; ~ ***ўзрост*** vórgeschrittenes Álter; ***ён ужо́ ~ чалаве́к*** er ist schon ein älterer Mann

пажына́ць érnten *vt*; ◊ **~ ла́ўры** Lórbeeren éinheimsen; ***што пасе́еш – тое і пажне́ш*** wie die Saat, so die Érnte

пажы́т|ак *м* **1.** (*дробны скарб, хатнія рэчы*) Hábschaft *f* -, -en, Hábseligkeiten *pl*; ***сабра́ць (усё) сваё ~кі*** séine Síebensachen pácken; **2.** (*здабыча, пажыва*) Gewínn *m* -s, -e, Profít *m* -(e)s, -

пажы́тк|і *мн разм* Hábseligkeiten *pl*; ***з усі́мі ~амі*** mit Sack und Pack

пажы́ўнасць *ж спец* Nährwert *m* -(e)s

пажы́ўны náhrhaft

пажыццёвасць *ж* Lébenslänglichkeit *f* -

пажыццёв|ы auf Lébenszeit; lébenslänglich, lébenslang; ***прыгавары́ць да ~ага зняво́лення*** zu lébenslänglichem Zúchthaus [zu éiner lébenslänglichen Gefängnisstrafe] verúrteilen

паз *м тэх* Nut *f* -, -en; Falz *m* -es, -e; Zápfenloch *n* -(e)s, -löcher, Fúge *f* -, -n (*гняздо*)

па-за *прыназ* **1.** jénseits (*G*); hínter (*D*); **~ гара́мі** hínter den Bérgen; **2.** áußer(halb); **~ до́мам** áußer Haus, áuswärts; **~ко́нкурсам** áußer Konkurrénz; **~ ча́ргою** áußer(halb) der Réihe; **~ гульнёй** *спарт* ábseits, im Ábseits

пазабаўля́ць amüsíeren *vt*, belústigen *vt*; unterhálten* *vt* (*забавіць*) (*чым-н* mit *D*); Vergnügen beréiten (*каго-н D*)

пазабюджэ́тны áußerplanmäßig, áußer|etatmäßig

паза́ддзе *н* **1.** *с.-г* (*адкіды, астаткі пры малацьбе або веянні*) Ábfälle *pl*; **2.** *разм, пагард* (*паслугачы*) Hélfershelfer *pl*

паза́дкі *мн с.-г* (*адыходы пры малацьбе*) Dréschabfälle *pl*

пазайздро́сціць benéiden *vt* (*чаму-н* um *A*), néidisch wérden (*каму-н, чаму-н* auf *A*); missgönnen *vt*; **~ чыім-н по́спехам** *j-n* um séinen Erfólg benéiden, *j-m* séinen Erfólg missgönnen; ***я ямý не зайздро́шчу*** er ist nicht zu benéiden

пазаклáсавы áußerhalb der geséllschaftlichen Klássen (stéhend)

пазаклáсн|ы áußerunterrichtlich; **~ая рабо́та** áußerunterrichtliche Árbeit; áußerschulisch; áußerhalb des Únterrichts

пазалаці́ць vergólden *vt*; ◊ **~ пілю́лю** éine Pílle versüßen

пазале́тась *прысл* im vórletzten Jahr, im vórvorigen Jahr

пазале́ташні vórletzt, vórvorig

пазало́та *ж* Vergóldung *f* -; **з ~й** mit Góldauflage

па-замежнаму *прысл* wie im Áusland

пазамі́ну́лы vórvorig

пазапла́навы áußerplanmäßig

пазаслужбо́вы áußerdienstlich; áußer|amtlich (*неафіцыйны*)

пазасме́чваць (víele Stéllen) verúnreinigen

пазаўчо́ра *прысл* vórgestern

пазашко́льны áußerschulisch

пазашлю́бны áußerehelich, únehelich

пазашта́тны nébenamtlich, áußerhalb des Stéllenplans; **~ супрацо́ўнік** nicht fest ángestellter Mítarbeiter; **~ выкла́дчык** Léhrbeauftragte (*sub*) *m* -n, -n

пазбáвіцца 1. (*збавіцца*) lóswerden* *vt* (*s*); **~ ад няпро́шанага го́сця** éinen úngebetenen Gast lóswerden*; ***ён хо́ча ~ ад мяне́*** er will mich lóswerden*; ***я не магу́ ~ ду́мкі, што...*** ich werde den Gedánken nicht los, dass...; überwínden* *vt* (*пераадолеўшы*); **~ недахо́пу** [***збянтэ́жанасці, стра́ху***] die Mängel [Verlégenheit, Furcht] überwínden*; **2.** (*страціць*) verlíeren* *vt*, éinbüßen *vt*; **~ самастóйнасці** die Únabhängigkeit verlíeren*

пазбáвіць 1. (*адняць*) (wég)néhmen* *vt* (*каго-н D*); **~ маёмасці** das Éigentum wégnehmen*; entzíehen* *vt* (*каго-н D*); **~ сло́ва** das Wort entzíehen* (*каго-н D*); ráuben *vt*; **~ жыцця́** das Lében ráuben (*каго-н D*); **~ апо́шняй надзе́і** séine létzte Hóffnung ráuben (*каго-н D*); beráuben *vt* (*чаго-н*); **~ пра́ва го́ласу** des Stímmrechts beráubt sein; **~ свя́тасці** enthéiligen *vt*; **2.** (*вызваліць*) befréien *vt* (*ад каго-н, чаго-н* von *D*); **~ ад эксплуата́цыі** von der Áusbeutung befréien; erlösen *vt*, rétten *vt*; ◊ ***пазбáў нас ад злóга!*** erlöse uns von dem Bösen [Übel]!

пазбаўле́нне *н* **1.** (*чаго-н*) Entzúg *m* -(e)s, -züge; **2.** (*вызваленне*) Befréiung *f* -; Erlösung *f* -; Réttung *f* - (*выратаванне*)

пазбе́гнуць 1. (*ухіляцца*) (ver)méiden* *vt*; ***яны́ пазбягáюць адзі́н аднагó*** sie méiden einánder; sie géhen sich aus dem Weg; **~ памы́лкі** éinen Féhler verméiden*; entgéhen* *vi* (*чаго-н D*); **~ штра́фу** éiner Stráfe entgéhen* [entrínnen*]; **~ небяспе́кі** der Gefáhr (*D*) entrínnen*; áusweichen* *vi* (*каго-н, чаго-н D*); ***ён пазбягáе прамóга адкáзу*** er weicht éiner óffenen Ántwort aus; **2.** (*пазбаўляцца*) beséitigen *vt*, überwínden* *vt*; **~ цяжкасцей** Schwíerigkeiten beséitigen [überwínden*]; **~ ду́мкі, што...** den Gedánken nicht lóswerden*, dass...

пазбе́гчы *гл* пазбегнуць

пазбі́ра́ць sámmeln *vt*, áufheben* *vt*; áufsammeln *vt*; versámmeln *vt* (*склікаць*)

пазбы́цца 1. (*збавіцца, вызваліцца*) lóswerden* *vt*; sich befréien (*ад каго-н, чаго-н* von *D*); beséitigen *vt* (*устараніць*); **2.** (*страціць*) verlíeren* *vt*

пазбягáць *гл* пазбегнуць

пазванóк *м анат* Wírbel *m* -s, -; **шы́йны ~** Hálswirbel *m*; **спíнны ~** Rückenwirbel *m*

пазваночнік *м анат* Wírbelsäule *f* -, -n, Rückgrat *n* -(e)s, -e

пазваночны *анат* Wírbel-; **~я звяры́** Wírbeltiere *pl*

пазвáць *разм* rúfen* *vt*

пазвóдзіцца (*перастаць існаваць*) verschwínden* *vi* (*s*); áussterben* *vi* (*s*) (*вымерці*)

пазвóньваць (*час ад часу звінець*) von Zeit zu Zeit klíngeln [läuten]

пазздравéць erstárken *vi* (*s*); zu Kräften kómmen*, wíeder áufkommen* *vi* (*s*) (*пра хворага*)

па-здрáдніцку *прысл* verräterisch

пазелянéць grün wérden, ergrünen *vi* (*s*)

пазíраваць 1. (*мастаку*) Modéll stéhen*, *j-n* sítzen*; **2.** *перан* posíeren *vi*

пазірáць séhen* *vi* (*на што-н, каго-н* auf *A*); ánsehen* *vt*; **~ на малю́нак** ein Bild ánsehen*; **~ у люстэ́рка** in den Spíegel séhen*; **~ на со́нца** in die Sónne sehen*; **~ у акнó** aus dem Fénster [zum Fénster] (hináus)sehen*; schäuen (*на каго-н, што-н* auf *A*); **~ па бакáх** um sich schäuen; **~ час ад ча́су на што-н** von Zeit zu Zeit auf étwas sehen* [schäuen]

пазітрóн *м фіз* Pósitron *n* -s, -trónen

пазітывíзм *м філас* Positivismus [-ˊvɪ-] *m* -

пазіты́ў *м фота* Pósitiv *n* -s, -e

пазіты́ўны pósitiv

пазіцыйн|ы Stéllungs-; **~ая вайнá** *вайск* Stéllungskrieg *m* -(e)s, -e

пазíцы|я *ж* **1.** Stéllung *f* -, -en; Situatión *f* -, -en; Positión *f* -, -en; **губля́ць сваé ~і** séine Positiónen éinbüßen; **2.** *вайск* Stéllung *f* -, -en; Positión *f* -, -en; **перадавáя ~я** vórgeschobene Stéllung; **зыхóдная ~я** Áusgangsstellung *f*; **абарóнчая ~я** Vertéidigungsstellung *f*; **змéна ~й** Stéllungswechsel *m* -s, -; **заня́ць ~ю** Stéllung beziéhen*; **стая́ць на ~і** in éiner Stéllung líegen*; **пакідáць ~ю** éine Stéllung áufgeben* [räumen]; **3.** *перан* Ständpunkt *m* -(e)s, -e, Éinstellung *f*, Stéllungnahme *f* -; Háltung *f* -, -en; **аснóўная ~я** Grúndhaltung *f*; **ключавáя ~я** Schlüsselposition *f*, Schlüsselstellung *f*, führende Positión; **клáсавая ~я** Klássenstandpunkt *m*; **займáць я́сную** [***рэалісты́чную, варóжую***] **~ю** éine kláre [realístische, féindliche] Háltung éinnehmen*; **цвёрда стаяць на сваёй ~і** séine Positión behäupten; **стая́ць на пра́вільнай ~і** éine ríchtige Éinstellung háben

пазл *м* Puzzle [pazl *i* puzl] *n* -s, -s

пазмéнна *прысл* schíchtweise

пазмéнн|ы schíchtweise, Schicht-; wéchselweise, **~ая пра́ца** Schíchtarbeit *f* -

пазнавáльнасць *ж* Erkénnbarkeit *f* -

пазнавáльны 1. (*які служыць для пазнавання*) Erkénnbarkeits-, Erkénntnis-; **2.** (*які даступны пазнанню*) erkénnbar; **3.** (*разумовы*) kognitív

пазнавáнне *н* **1.** (*прызнанне знаёмага*) Erkénnen *n* -s; Identifizíerung *f* -, -en; **2.** (*вывучэнне з'яў*) Erkénntnis *f* -, -se

пазнава́ць *гл* пазнаць
пазнаёміцца **1.** Bekánntschaft schlíeßen* (*з кім-н* mit *D*); kénnenlérnen *vt*; **2.** (*азнаёміцца*) sich bekánnt máchen; sich vertráut máchen (*з чым-н* mit *D*) (*асвоіцца*)
пазна́нн|е *н філас* Erkénntnis *f* -; ***тэо́рыя ~я*** Erkénntnistheorie *f* -
пазна́ць **1.** (*прызнаць знаёмага або знаёмае*) erkénnen* *vt*; ***~ па пахо́дцы*** *разм* am Gang erkénnen*; ***~ павво́дле падабе́нства*** an der Ähnlichkeit erkénnen*; ***пазна́й самаго́ сябе́!*** erkénne dich selbst!; **2.** *філас* (*вывучыць з'явы*) erkénnen* *vt*; **3.** (*атрымаць уяўленне*) erfáhren* *vt* (*пра што-н* von *D*, über *A*); **4.** (*перажыць*) erlében *vt*
пазна́чыць bezéichnen *vt*, vermérken *vt* (*адзначыць*); ánstreichen* *vt* (*птушкай і пад.*); notíeren *vt* (*запісаць*); ***~ чысло́м*** datíeren *vt*; ***~ за́дні́м чысло́м*** zurückdatieren *vt*, náchdatieren *vt*
пазне́й *прысл*; **пазне́йшы** (*выш. ступ ад* позна, позні) später
пазні|цца **1.** (*з'яўляцца пазней*) sich verspäten, zu spät kómmen*; **2.** (*затрымлівацца*) sich lánge áufhalten*
пазно́гаць *м* Nágel *m* -s, Nägel; ***гры́зці пазно́гці*** an den Nägeln káuen; ***~ на руцэ́*** Fíngernagel *m*; ***~ на назе́*** Zéhennagel *m*
пазуме́нт *м* Posamént *n* -(e)s, -en, Besátzband *n* -(e)s, -bänder
па́зуха *ж анат* Höhle *f* -, -n; ◊ ***жыць як у Хрыста́ за ~й*** wie Gott in Fránkreich lében
пазы́к|а *ж фін, камерц* Ánleihe *f* -, -n, Dárlehen *n* -s, -, Dárleihe *f* -, -n; ***беспрацэ́нтная ~а*** zínslose Ánleihe; ***доўгатэрмі́но́вая ~а*** lángfristige Ánleihe; ***кароткатэрмі́но́вая ~а*** kúrzfristige Ánleihe; ***працэ́нтная ~а*** verzínsliche Anleihe; Dárlehen *n* -s, - (*субсідыя*); ***тэрмі́но́вая ~а*** befrístete Ánleihe; ***унýтраная ~а*** Ínlandsanleihe *f*; ***~а пад ні́зкія працэ́нты*** Dárlehen zu níedrigem Zínssatz; ***вы́пусці́ць ~у*** éine Ánleihe heráusgeben*; ***аб'яві́ць падпі́ску на ~у*** éine Ánleihe zur Zéichnung áuflegen; ***падпіса́цца на ~у*** éine Ánleihe zéichnen; ***вы́пуск ~і*** die Áuflage der Ánleihe; ***даць каму-н ~у j-m*** éine Ánleihe gewähren; ***узя́ць у каго-н ~у*** bei *j-m* éine Ánleihe máchen;
пазыкадава́льнік *м*, **пазыкада́ўца** *м* (*крэдытар*) Dárleh(e)nsgeber *m* -s, -, Géldverleiher *m* -s, -; Kredítor *m* -s, -tóren
пазыко́в|ы *фін, эк* Ánleihe-, Leih-, Schuld-; ***~ая аблігáцыя*** Ánleiheschein *m* -(e)s, -e; ***~ы капіта́л*** Léihkapital *n* -s, -e; ***~ае абавязáцельства*** Schúldschein *m* -(e)s, -e, Schúldverpflichtung *f* -, -en
пазыўны́я *мн радыё* Páusenzeichen *n* -s, -
пазыча́льнік *м камерц* Dárlehensnehmer *m* -s, -, Kredítnehmer *m*
пазыча́ць, пазы́чыць (áus)leihen* *vt*; bórgen *vt* (*разм*) (*каму-н D, у каго-н* bei, von *D*); ***ён пазы́чыў мне 1000 е́ўра*** er lieh [bórgte] mir 1000 Éuro; ***я пазы́чыў гэ́тыя гро́шы ў ся́бра*** ich habe díeses Geld bei éinem Freund gelíehen [gebórgt]
пазяме́льны Grund-, Bóden-, ***~ падато́к*** *эк* Gründsteuer *f* -, -n
пазяха́нне *н* Gähnen *n* -s
пазяха́ць gähnen *vi*
паі́лка *ж с.-г* (*для жывёл*) Tränke *f* -, -n; ***аўтаматы́чная ~*** Sélbsttränke *f*
паінфармава́ны informíert, benáchrichtigt
па-і́ншаму *прысл* ánders, ánderswie
паі́ць zu trínken gében*; ***~ жывёлу*** tränken *vt*
пай *м эк* Ánteil *m* -s, -e; Teil *m* (*частка*); ***кааператы́ўны ~*** Genóssenschaftsanteil *m*
па́йка *ж тэх* Löten *n* -s, Lötung *f* -
пайменава́ны mit Námen genánnt; áufgezählt, ángeführt (*пералічаны*)
пайме́нна *прысл* námentlich
пайме́нн|ы Námen(s)-; námentlich, ***~ы спіс*** Námenliste *f* -, -n Námenverzeichnis *n* -ses, -se; ***~ае галасава́нне*** námentliche Ábstimmung
пайсці́ **1.** géhen* *vi* (*s*); ***ён пайшо́ў у го́сці*** er ist *j-n* besúchen gegángen (*да каго-н*); er macht éinen Besúch; ***пайшлі!*** géhen wir!; ***не ~ на карысць*** kéinen Nútzen [Ségen] bríngen*; ***~ на што-н*** sich auf etwas éinlassen*; ◊ ***калі на то́е пайшло́*** wenn es drauf ánkommt; **2.** *перан* (*узяць пачатак*) stámmen *vi* (*s*), ábstammen *vi* (*s*), hérstammen *vi* (*s*), entstámmen *vi* (*s*) (*D*) (*быць родам*); ◊ ***далёка ~ перан*** es weit bríngen*
па́йшчык *м эк* Téilhaber *m* -s, -; Ánteilbesitzer ***m*** -s, -; Ákti|enbesitzer *m* -s, -; Aktionär *m* -(e)s, -e (*акцыянер*); ***~ кааператы́ва*** Genóssenschaftsmitglied *n* -(e)s, -er
пакава́нне *н* (*дзеянне*) Verpácken *n* -s, -, Éinpacken *n* -s
пакава́цца *зал. стан* gepáckt wérden
пакава́ць pácken *vt*, éinpacken *vt*, verpácken *vt*
пакаёв|ы Zímmer-, Stúben-; ***~ая раслі́на*** *бат* Zímmerpflanze *f* -, -n
пакаёўка *ж* Zímmermädchen *n* -s, -; Ráumpflegerin *f* -, -nen (*у гасцініцы*)
пака́з *м* **1.** Schau *f* -; Vórführung *f* -, -en, Demonstríerung *f* -; ***~ кінафі́льма*** Fílmvorführung *f*; ***~ по́спехаў*** [***дасягне́нняў***] Léistungsschau *f* -; ***~ мо́ды*** Móde(n)schau *f* -; ◊ ***вер не ска́зу, а ~у*** erst gescháut, dann getráut; **2.** (*спектакль*) Vórstellung *f* -, -en, Vórführung *f*
паказа́|цца sich zéigen, sich séhen lássen*; erschéinen *vi* (*s*) (*наявіцца*); ***~ ўрачу́*** sich dem Arzt zéigen
паказа́льнік *м* **1.** (*што служыць для паказвання чаго-н*) Zéiger *m* -s, -, Ánzeiger *m*; Schild *n* -(e)s, -er; ***~ даро́г*** Wégweiser *m* -s, -; **2.** (*даведачная кніга, даведачны спіс*) Náchschlagewerk *n* -(e)s, -e; Regíster *n* -s, -; Verzéichnis *n* -ses, -se; ***бібліяграфі́чны ~*** Literatúrverzeichnis *n*, Literaturnachweis *m*
паказа́льны **1.** (*узорны*) Múster-, mústergültig; Schau-; ***~ уро́к*** Músterstunde *f* -, -n; **2.** *юрыд*: ***~ суд*** [***працэ́с***] Scháuprozess *m* -es, -e; **3.** (*характэрны*) kénnzeichnend, charakterístisch
паказа́нн|е *н* **1.** (*прылады*) Ángabe *f* -, -n; Ánzeige *f* -, -n, Ánzeigewert *m* -(e)s, -e; **2.** *мед* Indikatión *f* -, -en, Héilanzeige *f* -, -n; **3.** (*у судзе і пад.*) Áussage *f* -, -n; ***~ све́дкі*** Zéugenaussage *f*; ***~і бако́ў*** Áussagen der Partéien; ***дава́ць ~і*** áussagen *vt*, éine Áussage máchen
паказа́ць **1.** (*даць магчымасць убачыць*) zéigen *vt*; ***~ кні́гу*** [***даро́гу***] ein Buch [den Weg] zéigen; ***~ па́льцам*** mit dem Fínger zéigen (*на каго-н, што-н* auf *A*); **2.** *перан*: ***~ сябе́*** sich zéigen; ***~ зу́бы*** die Zähne zéigen; ***не ~ [пада́ць] ві́ду*** sich (*D*) nichts ánmerken lássen*; ***~ пры́клад*** ein Béispiel gében*; ***я ямý пакажý, дзе ра́кі зімýюць*** ≅ ich werde ihm zéigen, was éine Hárke ist; vórzeigen *vt*; ***~ па́шпарт*** den Pass vórzeigen; hínweisen* *vt*; **3.** (*прадэманстраваць*) vórführen *vt*, áufführen *vt*; ***~ фі́льм*** éinen Film vórführen; ***~ п'е́су*** ein Theáterstück áufführen [vórführen]; **4.** (*даць паказанні на допыце*) áussagen *vt* (*супраць каго-н* gégen *A*, *на карысць каго-н* für *A*)
паказны́ Schein-; zum Schein; ***мець ~ хара́ктар*** vórgespielt sein
паказу́ха *ж пагард* Schau *f* -, Show [ʃou] *f* -, vórgetäuschte Léistungen; ◊ ***гэ́та адна́ то́лькі ~!*** das ist doch bloß Fassáde!
пака́зчык *м* **1.** (*прыкмета, сведчанне чаго-н*) Mérkmal *n* -s, -e; Kénnzeichen *n* -s, -; **2.** (*весткі, атрыманыя ў ходзе дзеяння*) Ergébnis *n* -ses, -se; Léistung *f* -, -en; **3.** (*лічба, якая паказвае ступень*) Índex *m* -es -e *і* -dízi|en, Exponént *m* -en, -en
пакале́нн|е *н* Generatión *f* -, -en; ***з ~я ў ~е*** von Generatión zu Generatión; ***маладо́е ~е*** júnge Generatión
пакале́ць erfríeren* *vi* (*s*); éinige Zeit [éine Zeit lang] fríeren*
пакале́чаны verstümmelt, verkrüppelt
пакале́чыць verstümmeln *vt*; ***ягó стрáшна пакале́чылі*** er ist schrécklich verstümmelt (worden); zum Krüppel máchen
пакалыхну́цца in Bewégung geráten*
пакаме́чыць zerkníttern *vt*; ***~ ліст папе́ры*** [***кашу́лю***] ein Blatt Papíer [ein Hemd] zerkníttern; zerknüllen *vt* (*скомкаць*)
пакара́нн|е *н* Stráfe *f* -, -n; Bestráfung *f* -, -en (*дзеянне*); ***заслугбу́ваць ~я*** die Stráfe verdíenen; ***адбы́ць ~е*** die Stráfe verbüßen [ábbüßen]; ***пазбе́гнуць ~я*** der Stráfe (*D*) entgéhen*; ***вы́звaліць ад ~я*** die Stráfe erlássen*
пакара́цца *разм гл* скарацца

пакара́ць 1. stráfen *vt*, bestráfen *vt* (*за што-н* für *A*, wegen *G*); ~ ***сме́рцю*** mit dem Tóde bestráfen; 2. *разм гл* скарыць

пакаро́чваць, пакараці́ць kürzer máchen; verkürzen *vt*; (áb)kürzen *vt* (*тс пра тэрмін*)

пакары́цца *разм гл* скарыцца

пакары́ць *разм гл* скарыць

пакаро́нне *н разм* Er|óberung *f* -, -en (*заваяванне*); Unterwérfung *f* -, Únterordnung *f* - (*падпарадкаванне*)

пака́тасць *ж* Ábschüssigkeit *f* -; Ábhang *m* -(e)s, -hänge

пака́ты ábschüssig, ábfallend; ~ ***лоб*** flíehende Stirn

пакаўзну́цца áusgleiten* *vi* (*s*), áusrutschen *vi* (*s*)

пакаха́ць lieb gewínnen* *vt*

пака́шліванне *н* Hüsteln *n* -s

пака́шліваць hüsteln *vi*

пакаштава́ць schmécken *vt*, kósten *vt*

пакая́нне *н* 1. *рэл* Búße *f* -, -n; Béichte *f* -, -n (*споведзь*); 2. *пеpан* Réue *f* -; ***чыстасардо́чнае*** ~ áufrichtige [von Hérzen kómmende] Réue; ◊ ***адпусці́ць душу́ на*** ~ *j-n* in Rúhe lássen*

пакая́нны réuevoll, Buß-; ~***я сло́вы*** Wórte der Réue

пака́яцца bekénnen* *vt*, Búße tun*, béichten *vt*

паква́піцца sich verlócken lássen* (*на што-н* auf *A*); erpícht sein (auf *A*)

пакварта́льна *прысл* víerteljährlich, quartálsweise

пакга́ўз *м спец* Páckhaus *n* -es, -häuser, Lágerhaus *n*; ***чыгу́начны*** ~ Güterschuppen *m* -s, -, Spéicher *m* -s, -; ***мы́тны*** ~ Zóllspeicher *m* -s, -, Zólldepot [-po:] *n* -s, -s

пакеп(лі)ванне *н* Spötteléi *f* -, -en

пакеп(лі)ваць sich lústig máchen (*з каго-н, чаго-н* über *A*), spötteln *vi* (*з каго-н, чаго-н* über *A*)

пакет *м* 1. Pakét *n* -(e)s, -e; ***атрыма́ць*** ~ ein Pakét bekómmen* [erhálten*]; ***пасла́ць*** ~ ein Pakét schícken; ***здаць*** ~ ein Paḳét áufgeben*; ***зайсці́ па*** ~ ein Pakét ábholen; ***пашто́вы*** ~ Póstpaket *n* -(e)s, -e; 2. *фін*: ***кантро́льны*** ~ ***а́кцый*** Ákti|enkontrollpaket *n*

пакеці́к *м памянш* Päckchen *n* -s, -;Tüte *f* -, -n (*харчовы*)

пакіда́ць, пакі́нуць 1. lássen* *vt*; ~ ***у спако́і*** in Rúhe lássen*; (*не звяртаць увагі*) áußer Acht lássen*; ~ ***гэ́ты свет*** (*памерці*) das Lében lássen*; ***пакі́нь гэ́та!*** lass das!; ***я пакі́нуў свой сшы́так до́ма*** ich habe mein Heft zu Hause líegen lássen; 2. (*адмовіцца, спыніць*) áufhören *vi* (*што-н* mit *D*); ~ ***рабо́ту*** áufhören zu árbeiten; 3. verlássen* *vt*; im Stich lássen* (*пакінуць без дапамогі*); ~ ***усё*** álles stéhen und líegen lássen*; ~ ***ха́ту*** [***го́рад, бацько́ў***] das Haus [die Stadt, die Éltern] verlássen*; ***сі́лы пакіда́юць яго́*** ihn verlässt die Kraft; 4. (*пакінуць пасля сябе*) hinterlássen* *vt*

пакіста́нец *м* Pakistáner *m* -s, -

пакіста́нскі pakistánisch

пакла́ды *мн* Vórkommen *pl*, Láger *pl*, Lágerstätte *f* -, -n; ~ ***на́фты*** [***каме́ннага вугалю***] Vórkommen an Érdöl [Stéinkohle]; *гл тс* радовішча

пакла́ж|а *ж* Gepäck *n* -(e)s, -e; ***ручна́я ~а*** Hándgepäck *n*; ***прыём ~ы*** Gepäckannahme *f* -, -n; ***адпраўле́нне ~ы*** Gepäckabfertigung *f* -, -en; ***пла́та за перавО́зку ~ы*** Gepäckfracht *f* -, -en; ***здава́ць ~у*** das Gepäck ábfertigen; ***размясці́ць ~у ў вагО́не*** das Gepäck im Wágen verstáuen; ***ка́мера захо́ўвання ручно́й ~ы*** Gepäckaufbewahrung *f* -, -en

пакланне́нне *н* 1. Ánbetung *f* -; Kult *m* -(e)s, -e (*культ*); 2. (*глыбокая пашана*) Veréhrung *f* -

пакланя́цца sich vernéigen, sich verbéugen (*каму-н* vor *D*)

пакла́сці *гл* палажыць; ◊ ***дале́й пакладзе́ш, бліжэ́й вО́зьмеш*** ≅ güte Hut erhält das Gut

пакле́іць beklében *vt*; tapezíeren *vt* (*шпалерамі*)

пакле́п *м* Verléumdung *f* -, -en; ***узве́сці ~ на*** *каго-н j-n* verléumden [verlästern]; *j-m* Übles náchreden [náchsagen]; *j-n* verlästern

пакле́пнік *м* Verléumder *m* -s, -, Intrigánt *m* -en, -en

пакле́пніцк|і verléumderisch; ***~ая кампа́нія*** Verléumdungskampagne [-njə] *f* -, -n

пакле́пніцтва *н* Verléumdung *f* -

пакле́пнічаць (*на каго-н*) verléumden *vt*; *j-m* Übles náchreden [náchsagen]

пакліка́нне *н* 1. ínnerer Trieb, Néigung *f* -, -en, Zúneigung *f*; ***адчува́ць ~*** sich berúfen fühlen; 2. (*прызначэнне*) Berúfung *f* -, -en, Bestímmung *f* -, -en, Mission *f* -, -en, Berúf *m* -(e)s, -e

пакліка́ны: ***быць ~м да*** *чаго-н* zu *etw.* (*D*) berúfen sein

пакліка́ць 1. rúfen* *vt*; 2. kómmen lássen*

паклО́н *м* 1. Verbéugung *f* -, -en; 2. (*прывітанне*) Gruß *m* -es, Grüße; ***перада́ць ~ каму-н j-m*** éinen Gruß bestéllen [áusrichten], *j-n* grüßen lássen*; ***зямны́ ~*** tíefe Verbéugung bis zur Érde; ◊ ***ісці́ на ~ да*** *каго-н*, ***бі́ць ~ы*** *каму-н j-n* um *etw.* ergébenst [knìefällig] bítten*

паклонні́к *м кніжн* Veréhrer *m* -s, -; Líebhaber *m* -s, - (*аматар*); ~ ***маста́цтва*** Künstliebhaber *m*; Ánbeter *m* -s, - (*часцей рэл*)

пакля́сціся schwören* *vt*, *vi*; ~ ***го́нарам*** bei séiner Éhre schwören*; ~ ***ў ве́рнасці*** Tréue schwören*; ~ ***адпо́мсціць*** Ráche schwören* (*каму-н D*,); ***урачы́ста ~*** hoch und héilig schwören*; ~ ***на Бі́бліі*** auf die Bíbel schwören*

пако́і *мн уст* 1. Gemächer *pl*; 2. *разм* (*прасторнае памяшканне*) geräumige Wóhnung, Lúxuswohnung *f* -, -en

пако́й *м* Zímmer *n* -s, -; ~ ***выхо́дзіць во́кнамі ў двор*** das Zímmer geht auf [in] den Hof hináus; ***зня́ць ~*** ein Zímmer míeten; ***здава́ць ~*** ein Zímmer vermíeten

пако́лванне *н* (léichtes) Stéchen *n* -s

пако́лваць: *у мяне́ пако́лвае ў спі́не* ich habe stéchende Schmérzen im Rücken, ich habe Rückenstechen

пако́лькі *злучн* insoférn, da

пако́нчыць *разм* 1. (*з чым-н*) be|énd(ig)en *vt*, ábschließen* *vt*, erlédigen *vt*, mit *etw.* (*D*) Schluss máchen; éinen Schlúss|strich únter *etw.* (*A*) zíehen*; ***з гэ́тым пако́нчана*** das ist vorbéi [ábgehakt]; 2. (*з кім-н – забіць*) erlédigen *vt*; *j-n* zur Strécke bríngen*; ~ ***з саба́й***, ~ ***жыццё самагу́бствам*** sich (*D*) das Lében néhmen*, Sélbstmord begéhen*

пако́раны *кніжн* unterwórfen; úntergeordnet (*падпарадкаваны*); eróbert (*заваяваны*); bezwúngen (*утаймаваны*)

пако́рліва *прысл;* **пако́рлівы** ergében; únterwürfig, démütig (*цярплівы, маўклівы*); gefügig, fügsam, hörig (*падатлівы*)

пако́рлівасць *ж* Ergébenheit *f* -; Únterwürfigkeit *f* -, Démut *f* - (*цярплівасць, маўклівасць*)

пако́рна *прысл;* **пако́рны** *гл* пакорліва

пако́рнасць *ж гл* пакорлівасць

пако́с *м с.-г* 1. (*сенакос*) Mähen *n* -s, Héumahd *f* -; 2. (*луг*) Héuschlag *m* -(e)s, -schläge

пако́ст *м спец* Ölfirnis *m* -ses, -se

пако́ўны geräumig; mit gróßem Fássungsvermögen (*ёмісты – пра пасудзіны*)

пако́ша *ж с.-г* (áb)gemähte Wíese

пакпі́ць verhöhnen *vt*, verspótten *vt*, spótten *vi* (*з каго-н чаго-н* über *A*)

пакра́жа *ж* 1. Díebstahl *m* -(e)s, -stähle; 2. (*скрадзенае*) Gestóhlene *n* -s, Díebesgut *n* -(e)s

пакрамса́ць *разм* 1. zerfétzen *vt*, zerschníppeln *vt*; 2. (*рукамі і г. д*) entstéllen *vt*, verdérben *vt*

пакра́пваць ab und zu tröpfeln

пакро́|й *м кравец* Schnitt *m* -(e)s, -e; Schníttform *f* -, -en; ***адно́лькавага ~ю*** von gléichem Schnitt; ◊ ***лю́дзі адно́лькавага ~ю*** *разм* Ménschen von sélbem Schlag

Пакро́вы *мн рэл* (*свята*) Mariä-Schútzpatronin-Fest *n* -(e)s

пакро́іць 1. zúschneiden* *vt*; 2. *гл* рэзаць, парэзаць

пакруча́ст|ы 1. (*які завіваецца – пра расліны*) ránkend, ránkenartig, Schling-; lóckig, kraus, wéllig (*пра валасы*); 2. (*звілісты*) gewúnden, geschlängelt; ***~ая даро́га*** Serpentínenstraße *f* -, -n, kúrvenreiche [-vən-] Stráße

пакрыва́ла *н* Décke *f* -, -n; Schléier *m* -s, - (*вэлюм*)

пакрыва́цца sich bedécken, sich zúdecken, sich überzíehen*; ~ ***скары́нкай*** verkrústen *vi*; ~ ***шэ́ранню*** beréifen *vi*; ~ ***льдом*** veréisen *vi* (*s*); ~ ***хма́рамі*** sich bewölken

пакрыва́ць 1. bedécken *vt*; zúdecken *vt*; **~ *дом*** (*дахам*) das Haus décken; **~ *зямлёй*** mit Érde bedécken; **2.** *разм* (*адлегласць*) zurücklegen *vt*; **3.** (*доўг, выдаткі*) begléichen* *vt*, bestréiten* *vt*; ábdecken *vt*, tílgen *vt* (*запазычаннасць*); **4.** (*наносіць*): **~ *фа́брай*** Fárbe áuftragen*; überstréichen* *vt*; **~ *ла́кам*** lackíeren *vt*; **5.** *разм* (*утойваць*) verdécken *vt*, verstécken *vt*, verschléiern *vt*; **~ *злачы́нства*** ein Verbréchen décken; **~ *таямні́цай*** in Gehéimnis hüllen; **6.** *карт* stéchen* *vt*; **7.** *вет* (*жывёлу*) décken *vt*

пакрыві́цца 1. sich verbíegen*, sich krümmen, verkrümmt [krumm, schief] wérden; **2.** (*пра твар і г. д*) sich verzíehen*, sich verzéhren

пакрысе́ *прысл* **1.** (*патроху, у невялікай колькасці*) ein wénig, ein bíss|chen; **2.** (*паступова, павольна*) allmählich, nach und nach

пакры́ўджаны beléidigt, gekränkt

пакры́ўдзіцца übel néhmen* *vt*, beléidigt sein, sich beléidigt fühlen

пакры́ўдзіць 1. kränken *vt*, beléidigen *vt*; **2.** *разм* (*абдзяліць*) übervórteilen *vt*, benáchteiligen *vt*

пакры́ўлены 1. (*сагнуты*) verbógen, verkrümmt, gekrümmt; **2.** (*скажоны*) verzógen, verzérrt; verwáchsen

пакрыццё 1. Déckung *f* -; **2.** *фін* (*пазык і пад.*) Ábdeckung *f* -, -en, Begléichung *f* -, -en; Tílgung *f* -, -en (*пагашэнне*); **3.** *спец* (*верхні слой*) Ánstrich *m* -(e)s, -e; Belág *m* -(e)s, Beläge; ***антыкаразійнае ~*** *спец* Róstschutzanstrich *m*; **4.** (*дарог*) Décke *f* -, -n; Stráßenbelag *m*; (***аўтамабі́льныя***) ***даро́гі з цвёрдым ~м*** Áutostraßen mit féster Áutobahn

пакры́ць *гл* пакрываць

пакры́шка *ж* Déckel *m* -s, -; Ballhülle (*мяча*); ***веласіпе́дная ~*** Fáhrraddecke *f* -, -n; **~ *аўтамабі́льнай шы́ны*** Mántel *m* -s, - Mäntel; Réifen *m* -s, -

пакро́ктваць von Zeit zu Zeit [ab und zu] ächzen [stöhnen]

пакт *м* Pakt *m* -(e)s, -e, Vertrág *m* -(e)s, -träge; **~ *аб ненапа́дзе*** *дып, паліт* Níchangriffspakt *m*; ***не звяза́ны з ~ам*** níchtpaktgebunden

паку́лле *н зборн* Werg *n* -(e)s

паку́ль I *прысл* vórläufig; éinstweilen (*тым часам*); **~ *што*** vórerst, vórläufig, unterdéssen; ***~!*** *разм* bis nachhér!, bis dann!

паку́ль II *злучн* **1.** (*у той час як*) während, solánge; ***пагавары́ з і́м, ~ ён тут*** sprich mit ihm, solánge er da ist; **2.** (*да таго часу, пакуль*) bis; ***пачака́й, ~ ён прыйдзе*** wárte, bis er kommt

пакульга́ць hínken *vi*, láhmen *vi*

пакуме́каць *разм гл* падумаць

паку́нак *м* Rólle *f* -, -n; Pakét *n* -(e)s, -e; Tüte *f* -, -n (*пакет*)

паку́начак *м гл* пакецік

пакупа́цца *разм* báden *vi*; ein Bad néhmen*

паку́пк|а *ж* Kauf *m* -(e)s, Käufe; Éinkauf *m*; Besórgung *f* -, -en, Ánschaffung *f* -, -en; ***выпадко́вая ~*** Gelégenheitskauf *m*; ***рабі́ць ~і*** Éinkäufe máchen

пакупні́к *м* Käufer *m* -s, -; Kúnde *m* -n, -n; ***ста́лы [заўсёдны] ~*** Stámmkunde *m*

пакупні́цкі Käufer-

пакупн|ы́ *эк* Kauf -; *эк* ***~а́я цана́*** Káufpreis *m* -es, -e, Káufgeld *n* -(e)s, -er; ***~а́я здо́льнасць*** Káufkraft *f*

пакуса́ць béißen* *vt*; stéchen* *vt* (*пра насякомых*)

паку́та *ж* Qual *f* -, -en, Pein *f* -; Márter *f* -, -n (*наўмысна прычыненая*)

паку́таваць léiden* *vt*, *vi*; ***ён павінен быў шмат ~*** er hat viel léiden müssen*; sich (áb)quälen, sich (áb)plágen (*мучыцца – над чым-н* mit *D*); **~ *ад хваро́бы*** [***на хваро́бу***] an éiner Kránkheit léiden*; **~ *ад вайны́*** durch den Krieg léiden*; **~ *ад хо́ладу*** únter der Kälte léiden*; ***ён му́сіць ~ па сваёй віне́*** er muss durch séine éigene Schuld léiden

паку́тліва *прысл* péinlich; léidvoll

паку́тлівасць *ж* Pláge *f* -, -n, quälendes Gefühl

паку́тлівы 1. (*які прычыняе пакуты*) quálenreich, quälend; **2.** (*выкліканы пакутай*) léidend, léidvoll, quálvoll

паку́тнік *м* Dúlder *m* -s, -; *рэл* Märtýrer *m* -s, -

паку́тніцкі léidend, gequält, Dúlder-; Märtýrer-; **~ *вы́гляд*** Léidensmiene *f* -, -n

паку́тніцтва *н рэл* Märtýrertum *n* -(e)s; Märtýrium *n* -s, -en (*за веру, ідэю*)

палаве́ць gelb wérden, vergílben *vi* (*s*); gelb schímmern

палаві́к *м разм* Ábstreicher *m* -s, -e (*для выціра́ння ног*); Läufer *m* -s, - (*дарожка*)

палаві́на *ж* Hälfte *f* -, -n; Mítte *f* -, -n

палаві́ніст|ы únbestimmt (*нявызначаны*); únentschlossen (*нявырашаны*); ***~ае рашэ́нне*** ein hálber Entschlúss

палаві́нка *ж* (*дзвярэй*) Tűrflügel *m* -s, -; (*акна*) Fénsterflügel *m*

палаві́нны halb

палав|ы́ *анат, фізіял* Geschléchts-, geschléchtlich, sexu|éll; ***~ы́я о́рганы*** Geschléchtsteile *pl*, Genitáli|en *pl*; ***~ы́я зно́сіны*** Geschléchtsverkehr *m* -s; ***~а́я спе́ласць*** Pubertät *f* -, Geschléchtsreife *f* -

палагаднець *разм* fügsamer, [náchgiebiger, úmgänglicher, verträglicher] wérden

пала́дзіць sich verständigen

пала́дый *м хім* Palládium *n* -s

палажы́ць *разм* (hín)légen *vt*, stécken *vt*

палажэ́нн|е *н* **1.** (*тэзіс*) Satz *m* -s, Sätze; Léitsatz *m*; Thése *f* -, -n; ***навуко́вае ~е*** Léhrsatz *m*, Thése *f*; ***метадычныя ~і*** methódische Grúndlagen; **2.** (*статута і пад.*) Verórdnung *f* -, -n, Órdnung *f*, Bestímmung *f* -, -n; ***~е аб вы́барах*** Wáhlordnung *f*; ***агу́льныя ~і*** Bestímmungen *pl*

паланэ́нне *н* **1.** (*дзеянне*) Gefángennehmen *n* -s; **2.** (*палон*) Gefángenschaft *f* -

паланёны gefángen, gefángen genómmen

паланіць 1. (*узяць у палон*) gefángen néhmen* *vt*; **2.** *перан* (*зачараваць*) fésseln *vt*, bezáubern *vt*; gefángen néhmen* *vt*

паланкі́н *м* Sänfte *f* -, -n

паланцін *м* (*футравы*) Pélzstola *f* -, -len

паланэ́з *м муз* Polonése [Polonaise] [-ˊnɛ:-] *f* -, -n

паласа́ *ж* **1.** Stréifen *m* -s, -; Band *n* -(e)s, Bänder; ***пагранічная ~á*** Grénzstreifen *m*; ***абаро́нчая ~á*** Vertéidigungszone *f* -, -n; **~ *á перашко́д*** *спарт* Híndernisbahn -, -en; ***узлётна-пасáдачная ~á*** *ав*: Píste *f* -, -n, Stárt- und Lándebahn *f* -, -en; **2.** *с-г.* Áckerstreifen *m*; **3.** (*прамежак часу*) Zéitspanne *f* -, -n, Perióde *f* -, -n; **4.** *палігр* Kolúmne -, -n; ***артыкул на ўсю ~ý*** ein gánzspaltiger Artíkel

паласа́ты gestréift, stréifig; ***~ая мато́рыя*** Stréifenstoff *m* -(e)s, -e

паласка́льніца *ж* Spülnapf *m* -(e)s, -näpfe, Spűlgefäß *n* -es, -e

паласка́нне *н* **1.** (*дзеянне*) Spülen *n* -s, Spülung *f* -; Gúrgeln *n* -s (*горла*); **2.** (*вадкасць*) Múndwasser *n* -s, Gúrgelwasser *n*

паласка́ць spülen *vt*; **~ *бялі́зну*** Wäsche spülen; **~ *го́рла*** gúrgeln *vt*

пала́та 1. (*заканадаўчая*) Kámmer *f* -, -n; **~ *ло́рдаў*** (*у Англіі*) Óberhaus *n* -es; **~ *абшчы́н*** (*у Англіі*) Únterhaus *n* -es; **~ *прадстаўні́коў*** (*у ЗША*) Repräsentántenhaus *n* -es; **~ *наро́дных прадстаўні́коў*** Kámmer der Vólksvertreter; **2.** (*дзяржаўная ўстанова*) Amt *n* -es, Ämter, Kámmer *f* -, -n; **~ *мер і ва́гі*** Éichamt *n*, Amt für Máße und Gewíchte; ***гандлёвая ~*** Hándelskammer *f*; ***судо́вая ~*** Kámmer éines Gerichtes; **3.** (*у шпіталі*) Kránkensaal *m* -(e)s, -säle, Kránkenzimmer *n* -s, -; **~ *на аднаго́ чалаве́ка*** Éinzelzimmer *n*; **~ *на дво́ух чалаве́к*** Zwéibettzimmer *n*

пала́тальны *фан* palatál, Palatál-, Vórdergaumen-; **~ *гук*** Palatállaut *m* -(e)s, -e, Vórdergaumenlaut *m*

пала́тачны Zélt-; **~ *рышту́нак*** Zéltgerät *n* -(e)s, -e; **~ *гарадо́к*** Zéltstadt *f* -, -städte; **~ *ла́гер*** Zéltlager *n* -s, -, Cámping [ˊkɛmpiŋ] *n* -s, -s

пала́тк|а *ж* Zelt *n* -(e)s, -e; ***разбі́ць ~у*** ein Zelt áufschlagen*; ***згарну́ць ~у*** ein Zelt ábbrechen*; ***жыць у пала́тцы*** zélten *vi*; ***гандлёвая ~а*** Verkáufsstand *m* -(e)s, -stände; *гл тс* намёт

палатне́ць *разм* verblássen *vi* (*s*)
палатно́ *н* **1.** *тэкст* Léinwand *f*-, Léinen *n* -s, -; ***прасці́ннае ~*** Béttléinen *n*; ***штáпельнае ~*** Zéllwollgewebe *n*; **2.** (*карціна*) Gemälde *n* -s, -; **3.** *чыг* Báhnkörper *m* -s, -; Gléisbett *n* -(e)s, -en; **4.** *спец* (*стужка ў механізме і г. д*) Band *n* -(e)s, Bänder; ***гýсенічнае ~*** Ráupenband *n*; ***~ транспарцёра*** Fördertuch -(e)s, -tücher; ***~ пілы́*** Sägeblatt *n* -(e)s, -blätter; ***дзвярно́е ~*** Tűrflügel *n* -s, -
палатня́н|ы léinen, Léinen-; ***~ая бялі́зна*** Léinen *n* -s, -; ***~ая сарóчка*** Léinenhemd *n* -(e)s, -en
палахлі́васць *ж* Fúrchtsamkeit *f*-; Scheu *f*- (*нясмеласць*); ***перамагчы́ ~*** séine Scheu áblegen
палахлі́вец *м* Féigling *m* -(e)s, -e, Ángsthase *m* -n, -n; Ángstmeier *m* -s, -; Mémme *f*-, -en (*разм*)
палахлі́вы fúrchtsam; scheu (*нясмелы*)
пала́ц *м* Palást *m* -es, Paläste, Schloss *n* -es, Schlösser; Palais [-ˊlɛ:] *n* - (*высок*); ***~ з'ездаў*** Kongrésspalast *m*; ***~ культу́ры*** Kultúrpalast *m*; ***~ спóрту*** Spórtpalast *m*; ***~ Рэспýблікі*** Palást der Republík
пала́цавы Palást-; Schloss-; ***~ парк*** Schlósspark *m* -s, -s; ***~ перавaрóт*** Palástrevolution [-v-] *f*-, -nen
пала́ціць *спец* (*пакласці дошкі*) vergíttern *vt*
пала́ць (*гарэць*) **1.** lódern *vi*, brénnen* *vi*, in Flámmen stehen* (*пра будынак пры пажары*); glühen *vi* (*ад жару*); **2.** (*ярка свяціцца*) glänzen *vi*, fúnkeln *vi*, léuchten *vi*; **3.** (*рабіцца чырвоным ад прыліву крыві*): ***~ ад сóраму*** vor Scham vergéhen*; ***шчóкі пала́юць*** (*ад жару*) die Wángen glühen [brénnen*]; **4.** *перан* (*быць ахопленым пачуццём*): ***~ жада́ннем*** den brénnenden Wunsch háben, vor Verlángen brénnen*
пала́чка *ж* **1.** Stöckchen *n* -s, -, Stäbchen -s, -; ***дырыжóрская ~*** Dirigéntenstab *m* -(e)s, -stäbe, Táktstock *m* -(e)s, -stöcke; ***бараба́нная ~*** Trómmelschlägel -s, -; ***чарóўная ~*** Záuberstab *m*; **2.** *біял, мед* Baktéri|e *f*-, -n, Baktérium *n* -s, -ri|en, Bazíllus *m* -, -llen; ◊ ***~-выручáлачка*** (*гульня*) Versték mit Ánschlag
пала́ш *м вайск гіст* Pálasch *m* -(e)s, -e; Háudegen *m* -s, -
пала́яцца *разм* sich zerstréiten* (*з кім-н* mit *D*); ***~ праз што-н*** sich durch *etw.* (*A*) auseinánder bríngen lássen*; sich wégen *etw.* (*G*) zerstréiten* [verkráchen]
палеанталагі́чны paläontológisch
палеанталóгія *ж* Paläontologíe *f*-
палéгчы 1. (*напр спаць*) sich (schláfen) légen; **2.** (*пра збажыну*) sich légen; **3.** (*быць забітым у баі*) fállen* *vi* (*s*)
палéгчыць 1. erléichtern *vt*; ***~ прáцу*** die Árbeit erléichtern; **2.** (*боль і г. д*) míldern *vt*, líndern *vt*
палéзці *гл* лезці
палемізава́ць polemisíeren *vi*
палéмік|а *ж* Polémik *f*-; ***уступíць у ~у*** sich in [auf] éine Polémik éinlassen*
палемі́чны polémisch
палéна *н* Hólzscheit *n* -(e)s, -e
паленава́цца kéine Lust háben [bekómmen*]
палéнне *н* **1.** (*дзеянне*) Brénnen *n* -s; **2.** *тэх* Glühen *n* -s, Brénnen *n* (*цэглы і г. д*)
пáлены gebránnt; brandig, verbrannt
палéпшаны verbéssert; verédelt (*акультураны*)
палéпшаць sich béssern, sich verbéssern, bésser wérden
палéпшыць verbéssern *vt*; verédeln *vt* (*надаваць высакародныасць, акультурваць*)
палесці́нскі palästinénsisch, palästínisch
палéтак *м с.-г* Ácker *m* -s, Äcker; ***яравы́ ~*** Sómmeracker *m*
пáлец *м* **1.** *анат* (*на руцэ*) Fínger *m* -s, -; (*мезенец*) der kléine Fínger; ***шырынёй на тры пáльцы*** drei Fínger breit; ***паднéсці ~ да губ*** den Fínger an die Líppen légen; ***пакáзваць пáльцам*** mit dem Fínger zéigen (*на каго-н, што-н* auf *A*); ***пералíчыць на пáльцах*** an den Fíngern ábzählen; (*на назе*) Zéhe *f*-, -n; ***хадзíць на пáльчыках*** auf den Zéhenspitzen [auf den Zéhen] géhen*; ◊ ***абвéсці вакóл пáльца*** *каго-н j-n* um den Fínger wíckeln; ***вы́смактаць з пáльца*** aus der Luft gréifen*; **2.** *тэх* Dáumen *m* -s, -
палёгка *ж* **1.** (*пачуццё заспакаення*) Erléichterung *f*-; **2.** (*вызваленне ад выканання якіх-н абавязкаў*) Privilég [-v-] *n* -(e)s, -i|en, Vergünstigung *f*-, -en
палёт *м* Flug *m* -(e)s, Flüge; ***~ дýмак*** der Flug der Gedánken; ***у палёце*** im Flug
палёўка *ж заал* Féldmaus *f*-, -mäuse, Wühlmaus *f*
пáліва I *н* Brénnstoff *m* -(e)s, -e, Brénnmaterial *n* -s, -i|en, Héizmaterial *n*
палíва II *ж кул* Zúckerguss *m* -es, -güsse; *тэх* Glasúr *f*-, -en
палівáны glasíert
палівáць *гл* паліць **II**
палівáчка *ж* Gíeßkanne *f*-, -n
палігамíчны *антр* polygám; víelweibisch
палігамія *ж антр* Polygamíe *f*-, Vielweiberéi *f*-
палігло́т *м* Polyglótte *m*, *f*-n, -n
палігóн *м* **1.** *вайск* Trúppenübungsplatz *m* -es, -plätze, Schíeßplatz *m*; Erpróbungsgelände *n* (*выпрабавальны*); ***артылеры́йскі ~*** Artileríeschießplatz *m*; ***ракéтны ~*** Rakétenversuchsgelände *n* -s, -; *марск* Übungsgebiet *n* -(e)s, -e; **2.** *матэм* Polygón *n* -(e)s, -e, Víereck *n* -(e)s, -e
паліграфíчны polygráphisch *i* polygráfisch
палігра́фія *ж* Polygrafíe [Polygraphié] *f*-, -i|en
паліклíніка *ж мед* Póliklinik *f*-, -en
паліклíнічны póliklinisch
палінéіць lini|íeren *vt*
палінялы verblíchen; ábgefärbt, verschóssen
палíп *м* **1.** *заал* Polýp *m* -en, -en; Tíntenfisch *m* -(e)s, -e; **2.** *мед* Polýp *m*; ***~ у нóсе*** Násengewuchs *n* -es, -e; (Násen)polýp *m*
паліраваны políert *vt*
паліраваць *спец* políeren *vt*
палірóўка *ж спец* Políeren *n* -s
палірóўшчык *м* Políerer *m* -s, - (*тс пераи*)
палісáд *м гіст* Palisáde *f*-, -n
палістáт *м тэх* Fláschenzug *m* -(e)s, -züge, Róllenzug *m*, Séilzug *m*
паліталóгія *ж* Politíkwissenschaft *f*-, Politologíe *f*-
палітзанáткі *мн* polítischer Únterricht, polítische Schúlung
палітó *н* Mántel *m* -s, Mäntel; ***купíць*** [***прымéрваць, шыць, апранáць, зняць, павéсіць***] ~ éinen Mántel káufen [ánprobieren, nähen, ánziehen*, áblegen, áufhängen]; ***здаць ~ ў гардэрóб*** den Mántel an der Garderóbe ábgeben*; ***жанóчае*** [***дáмскае***] ~ Dámenmantel *m*; ***мужчы́нскае ~*** Hérrenmantel *m*; ***дапамагчы́ апрану́ць ~ каму-н j-m*** in den Mántel hélfen*; ***~ на фýтры*** pélzgefütterter Mántel; ***фýтравае ~*** Pélzmantel *m*; ***дэмісезóннае ~*** Übergangsmantel *m*
палітóлаг *м* Politológe *m* -n, -n
палíтра *ж* Paléttе *f*-, -n
палітýра *ж спец* Politúr *f*-, -en
палíтык *м* Polítiker *m* -s, -
палíтык|а *ж* Politík *f*-, -en; ***~а сíлы*** Politík der Stärke; ***~а адчы́неных дзвярóй*** Politík der óffenen Tür(en); ***~а бізунá і пéрніка*** Politík des Zúckerbrotes und der Péitsche; ***правóдзіць ~у*** éine Politík (be)tréiben* [dúrchführen, verfólgen]
палітыкáн *м разм пагард* Politikáster *m* -s, -; ***спры́тны ~*** gewíegter Politikáster
палíтычна *прысл*; **палíтычн|ы** polítisch; ***займáцца ~ай дзéйнасцю*** polítisch tätig sein; ***палíтычна маласвядóмыя лю́дзі*** polítisch wénig bewánderte [gebíldete] Ménschen, únpolitische Léute
палíў *м* Begíeßen *n* -s; Bewässerung *f*-, -en; ***~ вýлiц*** Spréngen der Stráßen
пáліўн|ы I Heiz-; ***~ая пóмпа*** *спец* Héizölpumpe *f*-, -n; ***~ы бак*** Kráftstoffbehälter *m* -s, -
палíўны II künstlich bewässert; berieselt
палíц|а *ж* **1.** (*дошка*) Fach *n* -(e)s, Fächer; Regál *n* -s, -e; ***на ~ах***

кнíгарняў in den Regálen der Búchhandlungen; **2.** (*частка плуга*) Ábleger *m* -s, -

палíцыя *ж* Polizéi *f* -; ***кóнная ~*** beríttene Polizéi

палíцыянт *м* Polizíst *m* -en, -en

палíць I 1. (*знішчыць агнём*) verbrénnen* *vt*; **2.** (*падтрымліваць агонь у печы*) brénnen* *vi*; **3.** (*апрацоўваць агнём*) verbrénnen* *vt*; **4.** *разм* (*страляць*) schíeßen* *vi*

палíць II 1. (*намачыць*) begíeßen* *vt*, bespréngen *vt*; **2.** (*пачаць ліць*) begínnen zu gíeßen* *vi*; **3.** (*трошкі, пэўны час ліць*) ein wénig [éine Zeit lang] gíeßen* [bespréngen]

палíцэйскі 1. Polizéi-, polizéilich; **~ *ўчáстак*** Polizéirevier [-viːr] *n* -s, -e; **~ *нагля́д*** Polizéiaufsicht *f* -; **2.** *гл* паліцыянт

палíчыць 1. (*падрахаваць*) (zusámmen)zählen *vt*, áufzählen *vi*; **2.** (*прыняць за што-н*) hálten* *vt* (*за што-н* für *A*); betráchten *vt* (als *A*); ánsehen* *vt*, der Ánsicht sein; **~ *за свой абавя́зак*** es für séine Pflicht hálten*; **~ *неабхóдным*** es für nótwendig hálten*

пáлк|а *ж* Stock *m* -(e)s, Stöcke, Stab *m* -(e)s, Stäbe; Stiel *m* -(e)s, -e (*у рыдлёўкі і г. д*); ◊ ***~а з двумá канцáмі*** das ist ein zwéischneidiges Schwert; ***устаўля́ць* [*ста́віць*] *~і ў калёсы*** ≅ *j-m* Knüppel zwíschen die Béine wérfen*, *j-m* Híndernisse [Stéine] in den Weg légen; ***з-пад ~і*** erzwúngen; únter der Fúchtel (*разм*)

пáлк|і féurig, flámmend, hítzig; léidenschaftlich; ínbrünstig (*страсны*); ***~ая прамóва*** éine flámmende Réde

палкавóдзец *м вайск* Féldherr *m* -(e)n, -(e)n

палкав|ы *вайск* Regiménts-; ***~áя артылéрыя*** Regiméntsartillerie *f* -

пáлкасць *ж* Léidenschaftlichkeit *f* -; Féurigkeit *f* -

палкóўнік *м вайск* Óberst *m* -en, -en *i m* -es, -en

палóва *ж* Hälfte *f* -, -n; (*гульні*) *спарт* Hálbzeit *f* -, -en

палóмнік *м рэл, тс перан* Pílger *m* -s, -

палóмніцкі pílgerhaft, Pílger-

палóмніцтва Pílgerschaft *f* -, -en, Pílgerung *f* -, -en; Pílgerreise *f* -, -n, Wállfahrt *f* -, -en (*тс перан*)

палóмнічаць wállfahren* *неаддз vi* (*s*), pílgern *vi* (*s*)

палóн *м вайск* Gefángenschaft *f* -; ***узя́ць у ~*** gefángen néhmen*; ***тры́маць у ~*** in Gefángenschaft geráten*; ***здáцца ў ~*** in Gefángenschaft géhen*

палóній *м хім* Polónium *n* -s

палóнка *ж* **1.** (*незамёрзлы ўчастак*) óffene Stélle auf dem veréisten Fluss [See], éine nicht zúgefrórene Stélle; **2.** (*дзірка ў лёдзе*) Éisloch *n* -(e)s, -löcher

палóнны 1. gefángen; **2.** *у знач. наз м* Gefángene (*sub*) *m* -n, -n

палóса *ж* Stréifen *m* -s, -; (*нешырокі ўчастак ворнай зямлі*) Áckerstreifen *m* -s, Lándstrich *m* -(e)s, -e

палóха|цца erschrécken* *vi*(*s*), in Schrécken geráten*, sich ängstigen; Angst [Furcht] háben; schéuen *vi* (*пра коней*); ***ён усягó ~ецца*** er hat vor állem Angst

палóхаць erschrécken *vt*, schrécken *vt*; mit Dróhungen schrécken; Angst éinjagen; in Schrécken versétzen

палóць *с.-г* jäten *vt*

пáлуб|а *ж марск* Deck *n* -(e)s, -e *i* -s; ***нíжняя ~а*** das érste Deck; ***сярóдняя ~а*** das zwéite Deck; ***вéрхняя ~а*** das drítte Deck; ***на ~е*** auf [an, über] Deck; ***пайсцí на ~у*** an Deck géhen*

сцягну́цца 1. (*злучыцца*) sich zúziehen*; **2.** (*пра войскі і г. д*) sich zusámmenziehen*; **3.** *разм* (*пайсці куды-н*) sich fórtschleppen, fórtgehen* *vi* (*s*); **4.** (*быць знятым*) mit (gróßer) Mühe áusgezogen [ábgenommen] wérden (*пра адзенне, абутак і г. д*)

сцягну́|ць 1. (*туга перавязаць*) zusámmenziehen* *vt*, fest bínden*, zúschnüren *vt*; **2.** (*войскі*) zusámmenziehen* *vt*; **3.** (*зняць адкуль-н*) herúnterziehen* *vt*; **4.** *разм* (*скрасці*) stéhlen* *vt*, stíbitzen *vt*, kláuen *vt*; **5.** *безас, разм* zusámmenziehen* *vt*, zusámmenkrampfen *vt*, krümmen *vt* (*пра сутаргу*); **ямý ~ла рукý** er hat(te) éinen Krampf im Arm; **ад хóладу ~ла пáльцы** die Fínger sind steif vor Kälte; **6.** (*сабраць у адным месцы*) zusámmenschleppen *vt*; **7.** (*зрушыць*) ábziehen* *vt*, wégziehen* *vt*, zur Seite rücken

сцягня́к *м разм гл* сцягно

сцяжка *ж* **1.** *тэх* (*злучэнне*) Kúpplung *f* -, -en, Verbíndung *f* -, -en; Zusámmenfügen *n* -s, - (*злучэнне, звязка, счапленне*); **2.** *буд* Verschlúss *m* -es, -schlüsse

сцяжо́к *м* Fähnchen *n* -s, -

сцяжы́на *ж высок*, **сцяжы́нка** *ж гл* сцежка

сцякáцца 1. zusámmenfließen* *vi* (*s*); sich veréinigen (*пра рэкі*); **2.** *пераn* zusámmenströmen *vi* (*s*), zusámmenlaufen* *vi* (*s*)

сцякáць *гл* сцячы

сцяміць *разм* begréifen* *vt*, kapíeren *vt*; dahínterkommen* *vi* (*s*)

сцямнé|ць *безас* dämmern *vi*, dúnkel wérden, dúnkeln *vi*; **~ла** es ist dúnkel gewórden; **хýтка ~е** es wird bald dämmern, es wird bald dúnkel

сцян|á *ж* **1.** Wand *f* -, Wände; Máuer *f* -, -n (*мур*); Hólzwand *f* (*драўляная*); Schéidewand *f* (*перагародка*); **жыць ~á ў ~ý** Wand an Wand (mit *j-m*) wóhnen; **гóлыя сцéны** léere [káhle] Wände; **2.** *пераn* (*перашкода*) Wand *f*, Schéidewand *f*; **між чатырóх сцен** *разм* in séinen vier Wänden; ◊ **прыпéрці да ~ы** *каго-н j-n* an die Wand drücken; *j-n* in die Énge tréiben*; **стáць ~óю** sich wie ein Mann erhében*

сцярвя́тнік *м заал* Áasgeier *m* -s, -

сцярпéць 1. (*стрымацца*) sich behérrschen; **2.** (*вытрымаць*) áushalten* *vt*, ertrágen* *vt*, dúlden *vt*, erdúlden *vt*; sich (*D*) *etw.* gefállen lássen* (*мірыцца з чым-н, цярпліва пераносіць*); **~ крыўду** éine Kränkung hínnehmen* [über sich (*A*) ergéhen lássen*]

сцяцца (*скурчыцца*) zusámmenschrumpfen *vi* (*s*); sich zusámmenziehen*, sich (zu éinem Knäuel) zusámmenrollen (*сабрацца ў камяк*)

сцяць I (*зняць, ссячы і г. д*) ábschlagen* *vt*, ábhauen* (*impf* háute ab) *vt*; ábholzen *vt*, fällen *vt* (*дрэвы*)

сця|ць II *разм* (*сціснуць*) zusámmenpressen *vt*; **~ зýбы** die Zähne zusámmenbeißen*; **ад стрáху ў ягó ~ла гóрла** die Angst schnürte ihm die Kéhle zu

сцячы́ ábfließen* *vi* (*s*), áblaufen* *vi* (*s*), áusfließen* *vi* (*s*); ábtropfen *vi* (*s*) (*па кроплях*)

сцячы́ся *гл* сцякацца
счака́ць ábwarten *vt*, ábpassen *vt*; ~ ***зру́чнага вы́падку*** éine pássende Gelégenheit ábwarten
счапі́цца 1. sich ineínánder verháken [verkrállen]; sich kúppeln, gekúppelt wérden (*злучыцца, сашчапіцца*); **2.** *разм* (*пасварыцца*) sich in die Háare geráten*, (héftig) aneínánder geráten*
счапі́ць zusámmenhaken *vt*; (zusámmen)kúppeln *vt* (*вагоны і г. д*)
счапле́нне *н* **1.** *тэх* Ko|häsión *f*-, -en; **2.** *чыг, аўта* Kúpplung *f*-, -en; ***уключы́ць*** ~ éinkuppeln *vi*; ***вы́ключыць*** ~ áuskuppeln *vi*
счапля́цца *гл* счапіцца
счапля́ць *гл* счапіць
счарве́ць *разм* wúrmstichig [mádig] wérden
счарне́лы schwarz gewórden
счарне́ць schwarz wérden; dúnkel wérden, sich verdúnkeln (*пра неба і г. д*)
счарні́ць 1. (*зрабіць чорным*) schwärzen *vt*, schwarz máchen, verkóhlen *vt* (*агнём*); **2.** *разм, перан* (*зняславіць і г. д*) ánschwärzen *vt*, in Verrúf bríngen*; verléumden *vt* (*паклёпнічаць*); **3.** *разм* (*збіць*) verprügeln *vt*; níederknüppeln *аддз vt* (*дручком*)
счарсцве́лы 1. trócken, vertrócknet; áltbacken (*пра хлеб*); **2.** *перан* hart, verhärtet
счарсцве́|ць 1. trócken wérden, vertrócknen *vi* (*s*); ***хлеб ~ў*** das Brot ist vertrócknet; **2.** *перан* sich verhärten, hart wérden
счаса́ць I 1. (*вычасаць*) áuskämmen *vt*; **2.** *тэкст* (*лён і г. д*) hécheln *vt*, kämmen *vt*; **3.** (*руку, нос і г. д*) verkrátzen *vt*
счаса́ць II (*дрэва*) beháuen* *vt*, zúhauen* *vt*, ábstemmen *vt*
счáхнуць *разм* **1.** (*змарнець*) verkümmern *vi* (*s*), dahínsiechen *vi* (*s*), dahínschwinden* *vi* (*s*); ~ ***ад маркоты*** sich vor Séhnsucht verzéhren, vor Séhnsucht vergéhen* (*па кім-н, чым-н* nach *D*); **2.** (*зрабіцца хворым, схуднець і г. д*) krank wérden, ábmagern *vi* (*s*); versíegen *vi* (*s*) (*пра сілы*)
счырване́ць rot wérden, erröten *vi* (*s*); ~ ***да вушэ́й*** bis hínter die Óhren erröten
счы́рканы *разм* bekrítzelt, vóllgekritzelt, an víelen Stéllen (áus)gestríchen
счы́ркаць *разм* (an víelen Stéllen) (áus)stréichen*; bekrítzeln *vt*, voll krítzeln
счыта́ць, счы́тваць 1. (*прачытаць з чаго-н* von *D*) áblesen* *vt*; **2.** (*зверыць з арыгіналам*) kollationíeren *vt*; áblesen* *vt*
счышча́ць ábputzen *vt*, säubern *vt*; réinigen *vt*; schälen *vt* (*шалупінне і г. д*)
счэп *м* **1.** (*дзеянне*) Ánhängen *n* -s, -, Kúppeln *n* -s, -; **2.** (*прылада*) Kúpplung *f*-, -en, Kúppelvorrichtung *f*-, -en; **3.** (*счэпленыя транспартныя машыны*) Wágenzug *m* -(e)s, -züge; *с.-г* Aggregát *n* -s, -e; **4.** *тэх* Ko|häsión *f*-, -en
счэ́плівацца *гл* счапіцца
счэ́пліваць *гл* счапіць
счэ́пшчык *м чыг* Wágenkuppler *m* -s, -, Rangíerer [rã´ʒi:-] *m* -s, -
счэ́рчваць ábzeichnen *vt*
сша́ркаць *разм* zerkrátzen *vt* (*падлогу*)
шарэ́ць 1. (*рабіцца шэрым*) grau wérden, vergráuen *vi* (*s*); **2.** *безас* (*падыход змроку*) dämmern *vi*, dúnkel wérden
сшатрава́ць (*зерне*) *с.-г* enthülsen *vt*, schrúppen *vt*
сшо́ргаць *разм* **1.** (*сапсаваць паверхню*) zerkrátzen *vt*; **2.** (*сцерці*) ábreiben* *vt*, zerréiben* *vt*
сшыва́лка *жс палігр* Búchbindemaschine *f*-, -n; Héfter *m* -s, -
сшыва́ць, сшыць 1. nähen *vt*; sich (*D*) *etw.* nähen lássen* (*заказаць пашыць што-н*); **2.** (*сшыць разам*) zusámmennähen *vt*; zúnähen *vt*; héften *vt* (*кнігі, часопісы*)
сшы́так *м* Heft *n* -(e)s, -e; ***чарнавы́*** ~ Schmíerheft *n*; Kládde *f*-, -n (*для якіх-н запісаў*); ~ ***для малява́ння*** Zéichenheft *n*; ***но́тны*** ~ Nótenheft *n*; ~ ***у кле́тку*** karíertes Heft; ~ ***у лі́нейку*** lin(i)íertes Heft
сшэ́рх|нуць (*здранцвець*) erstárren *vi* (*s*), steif wérden; (*знямець*) gefühllos wérden, únempfindlich wérden; ***у яе ~лі но́гі*** die Füße sind ihr éingeschlafen
сы́варатка *ж мед* Sérum *n* -s, -ren *i* -ra; Héilserum *n* (*для лячэння*); Ímpfstoff *m*-(e)s, -e (*для прышчэпкі*); ***супрацьслупняко́вая*** ~ Tétanusserum *n*
сыгра́ць spíelen *vt*; áufspielen *vt*, vórspielen *vi* (*выканаць*); ~ ***ро́лю*** *тэатр, кіно, тс перан* éine Rólle spíelen; ~ ***пе́ршую скры́пку*** *муз, тс перан* die érste Géige spíelen
сык *м разм*, **сы́канне** *н* **1.** Zíschen *n* -s, Gezísch(e) *n* -(e)s; **2.** *перан* (*нездавальненне*) Geréiztheit *f*-, Míssvergnügen *n* -s, Únzufriedenheit *f*-
сы́каць, сы́кнуць 1. (*утвараць глухія гукі*) zíschen *vi*; **2.** *разм* (*злоснічаць*) gehässig [bóshaft] sein; wüten *vi*; **3.** *разм* (*гаварыць злосным голасам*) mit geréizter Stímme sprechen*; schímpfen *vi*; ~ ***на*** *каго-н j-m* über den Mund fáhren*
сын *м* Sohn *m* -(e)s, Söhne; ◊ ***блу́дны*** ~ *бібл, тс перан, жарт* der verlórene Sohn
сыно́к *м памянш* Söhnchen *n* -s, -
сыно́ўскі Sóhnes-; ~ ***абавя́зак*** Sóhnespflicht *f*-, -en
сыно́чак *м памянш* Söhnchen *n* -s, -
сып *м мед* Áusschlag *m* -(e)s, -schläge; ***з'яўле́нне ~у*** Eruptión *f*-, -en
сы́п|ацца verschüttet [áusgeschüttet] wérden (*рассыпацца*) herábrieseln *vi* (*s*), herúnterrollen *vi* (*s*), herábfallen* *vi* (*s*) (*падаць*); ***тынк ~лецца*** der Stuck fällt ab, der Mörtel ríeselt herúnter; ***~ацца гра́дам*** hágeldicht régnen [níedersausen, prásseln]; ***папро́кі ~аліся гра́дам*** es hágelte Vórwürfe
сы́па|ць, сып(а)ну́ць 1. schütten *vt*; stréuen *vt*, áusstreuen *vt*, áusschütten *vt*; verschütten *vt* (*міма*); ***ці́ха ~ў дождж*** léise ríeselte [fiel] der Régen; **2.** *перан разм* (*імкліва бегчы, ехаць*) schnell láufen* [fahren*]; ◊ ***~ць грашы́ма*** mit Geld um sich wérfen*; ***~ць цыта́тамі*** mit Zitáten um sich wérfen*; ***~ць тра́пнымі жа́ртамі*** Witze réißen*
сы́пкі Streu-, Flug-, stréubar; ~ ***пяско́к*** Flúgsand *m* -(e)s, Tríebsand *m*; ***ме́ры ~х цел*** Hóhlmaße *pl*
сыпны́: ~ ***тыф*** (***ус***) *мед* Flécktyphus *m* -
сыпня́к *м разм мед* (*сыпны тыф*) Flécktyphus *m*
сыпу́чы *гл* сыпкі
сыр *м кул* Käse *m* -s, -; Quárkkäse *m* (*з тварагу*); ***пла́ўлены*** ~ Schmélzkäse *m*; ***зялёны*** ~ Kräuterkäse *m*; ◊ ***пла́ваць*** [***кача́цца***] ***як сыр у ма́сле*** ≅ wie die Máde im Speck sítzen*, lében wie der Gott in Fránkreich
сыраві́р *м*, **сыраро́б** *м* Käsemacher *m* -s, -, Käser *m* -s, -
сыраві́рня *ж спец* Käsefabrik *f*-, -en, Käseréi *f*-, -en
сырава́ты *разм* **1.** (*вільготны*) étwas feucht; féuchtnass (*пра бялізну і г. д*); **2.** (*незгатаваны, недасмажаны, недавараны і г. д*) étwas roh; hálbgar; nicht ganz dúrchgebacken (*непрапечаны*)
сыравіна *ж у розн. знач* Róhmaterial *n* -(e)s; Róhstoff *m* -(e)s, -e; ***другасная*** ~ Sekundärrohstoff *m*, Áltstoff *m*, Áltmaterial *n*; ***выхо́дная*** ~ Ausgangsrohstoff *m*, Ausgangsmaterial *n*, Grúndstoff *m*; ***сельскагаспада́рчая*** ~ Agrárrohstoffe *pl*
сыравінн|ы Róhstoff-; *спец* ***~ая ба́за*** Róhstoffbasis *f*-; ***~ыя рэсу́рсы*** Róhstoffquellen *pl*, Róhmaterialvorräte *pl*
сырадо́й *м с.-г* kúhwarme Milch
сырадзі́ля *ж бат* Kláuenschote *f*-, -n
сырае́жка *ж бат* (*грыб*) Täubling *m* -(e)s, -e
сыракваша *ж кул* sáure Milch, Díckmilch *f*-, Sáuermilch *f*
сырамя́тн|ы wéißgegerbt; ***~ая ску́ра*** wéißgegerbtes [wéißgares] Léder
сы́расць *ж разм* Féuchtigkeit *f*-
сыр-бо́р *разм*: ***праз гэ́та ~ разгарэ́ўся*** *разм* déshalb ist der gánze Streit entbránnt
сы́рнік *м кул* Quárkpfannkuchen *m* -s, -
сы́рны Käse-; käsig
сыро́ватка *ж кул* (*малочная*) Mólke *f*-, -n
сыро́к *м кул*: ***пла́ўлены*** ~ Schmélzkäse *m* -s, -
сыр|ы́ *разм* **1.** (*вільготны*) feucht; ***~óе дрэ́ва, ~ыя дро́вы*** násses Holz; **2.** (*недавараны, недапечаны*) schlecht dúrchgebacken;

nicht gar; **3.** (*які не варыўся, не смажыўся*) roh; **4.** *тэх* (*неканчаткова выраблены*) roh, únbearbeitet; **5.** *перан* nicht fértig, nicht gar, nicht beárbeitet

сыро́ц *м спец* (*не да канца выраблены*): ***шоўк-~*** Róhseide *f* -; ***скýра-~*** úngegerbtes Léder, Róhleder *n* -s;

сыро́ць féucht wérden; schwítzen *vi* (*пакрывацца вільгаццю, напр пра сцены*)

сысу́н *м*, **сысуно́к** *м* Säugling *m* -(e)s, -e

сысуны́ *мн заал* Säugetiere *pl*

сысці́ 1. (*спусціцца*) hinúntergehen* *vi* (*s*), herúntersteigen* *vi* (*s*), herábsteigen* *vi* (*s*); **2.** (*пакінуць*) verlássen* *vt*, fórtgehen* *vi* (*s*); ***~ з даро́гі*** den Weg verlássen*, vom Wég ábweichen*; ***~ з ро́зек*** entgléisen *vi* (*s*); ***~ з дыста́нцыі*** *спарт* áusscheiden* *vi* (*s*); **3.** *знікнуць* (*пра плямы*) verschwínden* *vi* (*s*); **4.** *разм* (*быць прынятым за каго-н*) ángesehen wérden (für *A*); **5.** *разм* (*апынуцца прыдатным*) nützlich [díenlich, táuglich, bráuchbar] sein, zustátten kómmen*, zu gebráuchen sein; **6.** (*выйсці*) áussteigen* *vi* (*s*) (*пра пасажыраў*); **7.** *тэатр* (*перастаць ставіцца*) (von der Bühne) ábtreten* *vi* (*s*); **8.** (*пра скуру, фарбу і г. д*) ábgehen* *vi* (*s*), sich áblösen; ábbröckeln *vi* (*s*); **9.** *разм* (*прайсці, закончыцца*) zu Énde sein, énden *vi*; áblaufen* *vi* (*s*) (*пра тэрмін*); **10.** (*выцечы*) áusfließen* *vi* (*s*), heráusfließen* *vi* (*s*) (*пра вадкасць, газ і г. д*); ***~ кро́ўю*** verblúten *vi* (*s*); ◊ ***гэ́та не сы́дзе ямý з рук*** das wird ihn téuer zu stehen kómmen; ***~ на ні́што́*** zunichte wérden

сысці́ся 1. (*сабрацца*) sich versámmeln, zusámmenkommen* *vi* (*s*), zusámmentreffen* *vi* (*s*); zusámmentreten* *vi* (*s*); **2.** (*сустрэцца*) einánder tréffen*, (sich) begégnen; aufeinánder stóßen* (*сутыкнуцца*); **3.** (*пра адзенне*) zúgehen* *vi* (*s*); ***по́яс не сыхо́дзіцца*** der Gürtel geht nicht zu; **4.** (*пасябраваць*) sich befréunden, Fréundschaft schlíeßen*; ***яны́ не сышлі́ся хара́ктарамі*** sie pássen nicht zueinánder; sie können sich nicht vertrágen; **5.** *разм* (*пра інтымныя сувязі*) ein Verhältnis éingehen* (*з кім-н* mit *D*); miteinánder leben; geschléchtlich verkéhren; **6.** *перан* (*прыйсці да згоды*) überéinkommen* *аддз vi* (*s*) (*у чым-н* in *D*), sich éinigen (*адносна чаго-н* über *A*), sich verständigen (über *A*); ***яны́ сышлі́ся ў цане́*** sie háben sich über den Preis [bezüglich des Préises] verständigt; **7.** (*супасці*) zusámmenfallen* *vi* (*s*), sich décken; ***усе́ паказа́нні сышлі́ся*** alle Áussagen stímmten überéin; ***раху́нак не сыхо́дзіцца*** die Réchnung stimmt nicht; **8.** (*злучыцца*) sich verbínden*, sich veréinigen (*пра горы і г. д*)

сы́тасць *ж* Sáttheit *f* -

сы́тнасць *ж* Sáttheit *f* -; Náhrhaftigkeit *f* - (*пажыўнасць*)

сы́тны sättigend; náhrhaft (*пажыўны*); réichlich (*шчодры, напр абед*)

сы́ты 1. (*які наеўся*) satt; **2.** *разм* (*укормлены*) wóhlgenährt; **3.** (*багаты*) réichlich (*пра ежу*); **4.** *гл* сытны; ◊ ***~ гало́днага не разуме́е*** der Sátte verstéht den Húngrigen nicht; ≅ wer im Tróckenen sitzt, lacht über den Régen

сыхо́дзіцца *гл* сысціся

сыхо́дзіць 1. *гл* сысці; **2.** *перан* (*размяшчацца, нахільна*) ábsteigen* *vi* (*s*); **3.** (*з адмоўем* «не») (*пастаянна знаходзіцца дзе-н*) immer dabéi sein, nicht verlássen*; ***не ~ з языка́*** auf der Zúnge líegen*

сыхо́дн|ы 1. (*які паніжаецца*) ábsteigend, (áb)fallend; ***ро́дзічы на ~ай лі́ніі*** Verwándte ábsteigender Líni|e; **2.** *фан* (*пра мелодыку*) fállend, terminál, ábschließend; ***~ы рух то́ну*** (*голасу*) termínale [fállende] Tónführung [Melodíe]; **3.** *матэм* (*які супадае*) kongruíerend, einánder déckend

сыце́ць dick wérden, zúnehmen* *vi*; verfétten *vi*, Fett ánsetzen (*тлусцець*)

сыць|ь *ж* (*сытасць*) Sáttheit *f* -; ***нае́сціся да ~і*** sich satt éssen* (*чаго-н* an *D*); sich zum Bérsten [Plátzen] satt éssen* (*разм*); ◊ ***~ Бо́жа!*** gúten Appetít!

сыч *м заал* Kauz *m* -es, Käuze

сы́шчык *м уст* Detektív *m* -(e)s, -e, Spítzel *m* -s, -; Gehéimpolizist *m* -en, -en

сэкс *м* Sex *m* -

сэксуа́льна *прысл*; **сэксуа́льн|ы** sexu|ell, Sexuál-; ***~ае злачы́нства*** Sexuálverbrechen *n* -s; *юрыд* Sittlichkeitsdelikt *n* -(e)s

сэксуа́льнасць *ж* Sexualität *f* -

сэнс *м* Sinn *m* -(e)s; Bedéutung *f* -, -en (*значэнне*); ***прамы́ ~*** der éigentliche [dirékte] Sinn; Gründbedeutung *f*; ***перано́сны ~*** der übertrágene Sinn, die übertrágene Bedéutung; ***у шыро́кім ~е*** im wéiten [wéiteren] Sinn(e); ***адпаве́дны ~у*** sínngemäß; ***у по́ўным ~е сло́ва*** im wáhrsten Sinn(e) des Wórtes; ***у по́ўным ~е*** in gewíssermaßen Sinn; ***здаро́вы ~*** gesúnder Ménschenverstand; ***нямá ~у*** (*не трэба*) es hat kéinen Sinn, es ist sínnlos, es lohnt sich nicht; ***у ~е*** (*у дачыненні да чаго-н*) in Hínsicht auf (*A*), im Hínblick auf (*A*)

сэ́нсав|ы Sínn-; Bedéutungs-; ***~ая памы́лка*** Bedéutungsfehler *m* -s, -

сэр *м* (*зварот*) Sir [sø:r] *m* -s, -s

сэ́рвіс *м* Kúndendienst *m* -(e)s, Service [ˊzø:rvis] *m* -s, *pl* -s [ˊzø:rvis]; ***эксплуатацы́йны ~*** Betríebsservice *m*, Betríebs|erwartung *f*

сэ́рц|а *н* **1.** Herz *n* -ns, -en; ***хваро́ба ~а*** Hérzkrankheit *f* -; ***мя́ккае ~а*** wéiches Herz; ***у мяне́ шчымі́ць ~а*** mein Herz ist beklómmen, mein Herz krampft sich zusámmen; ***у мяне́ адлягло́ ад ~а*** mir wurde léichter ums Herz, ein Stein ist mir vom Hérzen gefállen; ***скарэ́ць чыё-н ~а*** *j-s* Herz gewínnen*; ***ад усяго́ ~а*** von gánzem Hérzen, von Hérzen gern; ***у мяне́ ця́жка на ~ы*** mir ist schwer ums Herz; ***узя́ць што-н бліза́ка да ~а*** sich (*D*) *etw.* zu Hérzen néhmen*; ***не прыма́ць чаго-н бліза́ка да ~а*** *etw.* auf die léichte Schúlter néhmen*; ***накла́ўшы руку́ на ~а*** Hand aufs Herz; ***~а не ляжы́ць да каго-н, чаго-н*** kein Gefállen an *j-m*, an *etw.* (*D*) fínden*; **2.** (*у звоне*) Klöppel *m* -s, -; **3.** (*засаўка ў замку*) Ríegel *m* -s, -; Stéckbolzen *m* -s, -

сэрцабіццё *н мед, тс перан* Hérzklopfen *n* -s

сэрцаве́д *м разм* Ménschenkenner *m* -s, -

сэрцае́д *м разм* Hérzensbrecher *m* -s, -, Schwérenöter *m* -s, -; Don Juan [ˊdɔnxwan] *m* -s, -s

сэт *м гл* сет

сэ́тар *м гл* сетар

сюдо́й, сюдо́ю *прысл абл* díeses Wéges

сюды́ *прысл* hierhér; ***туды́ і ~*** hin und her

сюды́-туды́ *прысл* **1.** (*у той і другі бок*) hin und her; **2.** (*у некаторыя месцы*) híerhin und dórthin; ***мне тро́ба яшчэ́ ~ схадзі́ць*** ich hábe noch éinen Gang vor; **3.** (*ніштавата, дапушчальна*) léidlich, passábel; ***днём яшчэ́ ~*** am Táge ist es noch erträglich ...

сюжэ́т *м літ, маст, тс перан* Ínhalt *m* -(e)s -e, Fábel *f* -, -n, Gégenstand *m* -(e)s, -stände, Sujet [sʏˊʒe:] *n* -s, -s

сюжэ́тны *літ, маст* Fábel-, Ínhalts-

сюзерэ́н *м* **1.** *гіст* Suzerän *m* -(e)s, -e, Óberlehnsherr *m* -(e)n, -(e)n; **2.** *дып* (*у міжнародным праве*) Suzerän *m*; ein Staat, der die Suzeränität über éinen ánderen áusübt

сюі́та *ж муз* Suite [ˊsʏi:tə] *f* -, -n

сюрпры́з *м* Überráschung *f* -, -en

сюррэалі́зм *м маст, літ* Surrealísmus *m* -

сюррэалі́сты́чны *маст, літ* surrealístisch

сюсю́канне *н* Gelíspel *n* -s, -

сюсю́каць líspeln *vi*

ся́бар *м* Freund *m* -es, -e; ***~ дзяці́нства*** Spíelgefährte *m* -n, -n; ***~ юна́цтва*** Júgendfreund *m*; ***баявы́ ~*** Kámpfgefährte *m* -n, -n; ***неразлу́чны [шчы́ры] ~*** Búsenfreund *m*

сябе́ *зваротны займ* sich (*пры дзейніку ў 3-й асобе*); mich, mir, uns (*пры дзейніку ў 1-й асобе*); dich, dir, euch (*пры дзейніку ў 2-й асобе*); ***я ~ до́бра ве́даю*** ich kénne mich gut; ***ён ве́дае ~*** er kennt sich; ***у ~ до́ма*** bei sich (*D*) zu Hause; ***вы́йсці з ~*** áußer sich (*D*) geráten*; aus dem Häus|chen geráten* (*разм*); aus der Haut fáhren* (*разм*); ***вы́весці каго-н з ~ j-n*** aus der Fássung bríngen*, *j-n* in Wut versétzen [bríngen*]; ***гаварыць ад ~*** im éigenen Námen spréchen*

сябелю́б *м разм* Egoíst *m* -en, -en
сябелю́бнасць *ж* Sélbstsucht *f* -, Egoísmus *m* -; Sélbstliebe *f* -
сябелю́бны sélbstsüchtig, egoístisch
сябелю́бства *н* Sélbstsucht *f* -, Egoísmus *m* -, Sélbstliebe *f* -
ся́бра *м кл. ф гл* сябар
сябрава́ць befréundet sein, Fréundschaft hálten* (*з кім-н* mit *D*)
сябро́ўка *ж* Fréundin *f* -, -nen; Gefährtin *f* -, -nen (*тс спадарожніца*); ~ ***дзяці́нства*** Spíelgefährtin *f* -, -nen; ~ ***жыцця́*** Lébensgefährtin *f* -, -nen
сябро́ўск|і fréundschaftlich, Fréundes-, Fréundschafts-; ***~і шарж*** fréundschaftliche Karikatúr; ***~ая паслу́га*** Fréundschaftsdienst *m* -es, -e; ***~ія адно́сіны*** [***стасу́нкі***] fréundschaftliche Beziehungen [Verbíndungen]; ***~ая сустрэ́ча*** *спарт* Fréundschaftsspiel *n* -(e)s; ***мець ~ія пачу́цці да каго-н*** für *j-n* fréundschaftliche Gefühle hégen
сябро́ўства *н* Fréundschaft *f* -; ***з нагоды*** ~ aus Fréundschaft
сябру́к *м разм гл* сябар
сябры́на *ж разм* Fréundeskreis *m* -es, -e; Fréundesparty [-pa:rti] *f* -, -s [-pa:rti:s] (*вечарынка*)
сявец *м с.-г* Sämann *m* -(e)s, -männer
сяга́ць (*прасцірацца*) sich erstrécken, sich áusdehnen, réichen *vi* (*да чаго-н* bis zu *D*)
сяго́лета *прысл абл* in diesem Jahr, dieses Jahr (*у гэтым годзе*); jetzt (*цяпер*)
сяго́летак *м* Júngvieh *n* -(e)s
сяго́летні *абл* (*гэтага года*) jétzig, héutig, gégenwärtig; dieses Jáhres, díesjährig
сяго́ння *гл* сёння
сяго́нняшні *гл* сённяшні
сяда́лішча *н анат* Gesäß *n* -es, -e
сяда́лішчн|ы *анат* Gesäß-; ***~ы нерв*** Hüftnerv *m* -(e)s; ***~ая ко́стка*** Gesäßbein *n* -(e)s, -e, Sítzbein *n*
сяда́ць sich (hín)setzen, Platz néhmen*
сядзе́лка *ж* Kránkenpflegerin *f* -, -nen
сядзе́нне *н* **1.** (*дзеянне*) Sítzen *n* -s; **2.** (*тое, на чым сядзяць*) Sitz *m* -es, -e; ***адкідно́е*** ~ áufklappbarer Sitz, Kláppsitz *m*; ~ ***ўні́таза*** Kloséttbrille *f* -, -n, Klóbrille *f*
сядз|е́цца *безас разм*: ***ямў не ~і́цца до́ма*** [***ў ха́це***] es treibt ihn aus dem Háus, er kann nicht zu Háuse sítzen; ***ямў не ~і́цца на ме́сцы*** er hat kein Sítzfleisch
сядзе́ць **1.** sitzen* *vi*; ***заста́цца*** ~ sitzen bléiben*; ~ ***на кані́*** zu Pférde sitzen*; ~ ***за стало́м*** am Tisch sitzen*; zu [bei] Tisch sitzen* (*за ежай*); ~ ***на ку́кішках*** hócken *vi*; káuern *vi*; ~ ***за кні́гамі*** über den Büchern sitzen*; ◊ ~ ***пад замко́м*** hínter Schloss und Ríegel sitzen*, éingesperrt sein; **2.**:***суке́нка сядзі́ць до́бра*** das Kleid sitzt gut; ◊ ~ ***на мялі́*** auf dem Tróck(e)nen sitzen*; ~ ***на я́йках*** auf den Éiern sitzen*; brüten *vi*; ~ ***сі́днем*** *разм* zu Háuse hócken, ein Stúbenhocker sein
сядзі́ба *ж* **1.** Hof *m* -(e)s, Höfe; ***сялянская*** ~ Báuernhof *m*, Gehöft *n* -es, -e; Hófland *n* -(e)s (*прысядзібны ўчастак*); ~ ***памешчыка*** Gut *n* -(e)s, Güter, Gútshof *m* -(e)s, -höfe; **2.** (*рэзідэнцыя, месцазнаходжанне*) Sitz *m* -es, -e
сядзі́бны zum Báuernhof [Gútshof] gehörig
сядла́нне *н* Sátt(e)lung *f* -, -en; Sátteln *n* -s, -
сядла́ць sátteln *vt*
сядло́ *н* **1.** Sattel *m* -s, -; **2.** *тэх* Sitz *m* -es, -e
сядо́к *м разм* **1.** (*коннік*) Réiter *m* -s, -; **2.** (*у карэце і г. д*) Fáhrgast *m* -es, -gäste, Ínsasse *m* -n, -n
сядўн *м разм* (*нерухавы, бяздзейны чалавек*) Stúbenhocker *m* -s, -
сяды́-тады́ *прысл* mánchmal, zéitweise; von Zeit zu Zeit, hin und wíeder
сяк *прысл, разм*: (***і***) ***так і*** ~ auf jéde mögliche Wéise; auf jéde Art, auf verschíedene Art und Wéise, so und so, auf díese und jéne Wéise
сяка́ч I *м спец* Háckebeil *n* -(e)s, -e; Háckmesser *n* -s, -, Kráuteisen *n* -s, -; **2.** (*для торфа*) Tórfziegelschneider *m* -s, -
сяка́ч II *м заал* Kéiler *m* -s, - (*дзік*); Séebärmännchen *n* (*марскі коцік*)
сяке́р|а *ж* **1.** Beil *n* -(e)s, -e, Axt *f* -, Äxte; **2.** *гіст* Stréitaxt *f*; ◊ ***хоць ~у ве́шай*** die Luft ist hier zum Schnéiden
сякі́-такі́ *займ разм* **1.** (*некаторы*) gewíss; ***там ёсць ~я-~я за́пісы*** dort gibt es gewísse Notízen; ***~я-~я ве́ды*** éinige [wénige] Kénntnisse; **2.** (*нязначны*) únbedeutend, geríngfügig; únerheblich; ***я ма́ю не́калькі ~х-~х заўва́г*** ich hábe ein paar únbedeutende Bemérkungen; **3.** (*які́ заўго́дна*) írgendein, belíebig, der érste Béste
сяк-так *прысл, разм* **1.** (*ледзь-ледзь, з цяжкасцю*) mit Mühe und Not, mit Ach und Krach; schlecht und recht; **2.** (*так, што можна трываць*) erträglich, passábel, ertrágbar, léidlich; **3.** (*нядбайна*) náchlässig, flüchtig
сяку́чая *у знач. наз ж матэм* Sekánte *f* -, -n, Schníttlini|e *f* -, -ni|en
сяліба *ж* Síedlung *f* -, -en, Ánsiedlung *f* -; Órtschaft *f* -, -en, Dorf *n* -(e)s, Dörfer
сяліцца sich ánsiedeln, sich níederlassen* *аддз*; ***ён се́ліцца да нас*** er zieht zu uns
сяліць ánsiedeln *vt*
сял|о́ *н* **1.** Dorf *n* -es, Dörfer; **2.** (*сельская мясцовасць*): ***на ~е́*** auf dem Lande; ◊ ***ні к ~ю́ ні к го́раду*** únpassend; sínnlos; ≅ das passt wie die Faust aufs Áuge
сяльча́нін *м кніжн* Ländmann *m* -(e)s, -leute, Dórfbewohner *m* -s, -
сяля́нка *ж* Bäuerin *f* -, -nen
сяля́нскі Báuern-, bäuerlich; ***~я во́йны*** *гіст* Báuernkriege *pl*
сяля́нства *н зборн* Báuernschaft *f* -, Báuern *pl*
сям *прысл*: ***то там, то*** ~ bald hier, bald dort [da]; ***там і*** ~ hier und dort, hier und da
сямёйнасць *ж разм* Vétternwirtschaft *f* -, Nepotísmus *m* -, Günstlingswirtschaft *f* -
сямёйнік *м разм* Famíli|enangehörige (*sub*) *m* -n, -n
сямёйн|ы Famíli|en-, familiär; ***~ы чалаве́к*** Famíli|envater *m* -s, -väter; ***~ае жыццё*** Famíli|enleben *n* -s; ***~ае ко́ла*** Famílienkreis *m* -es; ***~ыя абста́віны*** Famíli|enverhältnisse *pl*; ***~ыя спра́вы*** Famíli|enangelegenheiten *pl*; ***~ае стано́вішча*** Famíli|enstand *m* -(e)s; ***па ~ых абста́вінах*** *канц* aus familiären Gründen; ***ён ~ы чалаве́к*** er hat Famíli|e
сямёйства *н* **1.** *разм, жарт гл* сям'я; **2.** *біял* Famíli|e *f* -, -en; ~ ***зла́кавых*** Gräserfamili|e *f*
сямёра *ліч* síeben; ~ ***брато́ў*** síeben Brüder; ***нас было́*** ~ wir waren síeben (Mann)
сямёрка *ж* Síeben *f* -, -en; ~ ***трэ́фаў*** [***крыжо́ў***] *карт* Treff-Síeben *f*
сямігадзі́нны síebenstündig
сямігадо́вы síebenjährig
сяміго́дак *м* ein síeben Jáhre áltes [síebenjähriges] Kind, ein Kind von síeben Jáhren
сяміго́ддзе *н* síeben Jáhre, ein Zéitraum von síeben Jáhren; der síebenjährige Gebúrtstag (*дзень нараджэння*)
сяміго́дка *ж* **1.** *разм* ein Mädchen von síeben Jáhren; **2.** (*школа*) *уст* Síebenklassenschule *f* -, -n, síebenklassige Schúle
сямідзёнка *ж разм* Síebentagewoche *f* -, -n, ein Zéitraum von síeben Tágen
сямідзённы síebentägig
сяміклі́снік *м* Schüler der síeb(en)ten Klásse, Síebtklässler *m* -s, -
сяміпавярхо́вы séchsstöckig, síebengeschossig
сямітго́нка *ж разм* (*машына*) Síebentonner *m* -s, -, Síebentonnenlastwagen *m* -s, -
сямна́ццат|ы *ліч* der síebzehnte; ***~ага лю́тага*** am síebzehnten Februar; ***~ы ну́мар*** Númmer síebzehn
сямна́ццаць *ліч* síebzehn
сям-та́м *прысл* hier und da, stéllenweise; an éinigen Stéllen; mánchenorts, mánchenorts
сям'|я́ *ж* Famíli|e *f* -, -n; ***член ~і́*** Famíli|enangehörige (*sub*) *m* -n,

-n; Famíli|enmitglied *n* -(e)s, -er; ***~я́ з пяці́ чалаве́к*** éine fünfköpfige Famíli|e; ***усёй ~ёй*** mit der gánzen Famíli|e; mit Kind und Kégel; ***сярэ́дняя ~я́*** Dúrchschnittsfamili|e *f*; ***дру́жная ~я́*** éine éinträchtige Famíli|e

сяна́ж *м с.-г* Sílofutter *n* -s, Siláge [-ʒə] *f* -

сяннік *м* Héusack *m* -(e)s, -säcke, Stróhsack *m*

ся́ння *абл гл* сёння

сярдзі́ты 1. böse, zórnig; áufgebracht, ärgerlich; ***ве́льмі ~*** bítterböse; ***быць ~м на каго-н*** auf *j-n* böse [zórnig] sein, gégen *j-n* áufgebracht sein; **2.** *разм* (*моцны*) stark, streng, scharf; ***~ маро́з*** grímmige [schnéidende] Kälte

сяржа́нт *м вайск* Sergeant [-ˊʒant] *m* -en, -en

сярмя́га *ж уст* Báuernrock *m* -(e)s, -röcke (*з грубага сукна*)

сярмя́жка *ж памянш гл* сярмяга; ◊ ***свая́ ~ не ця́жка*** ≅ Éigene Lst ist nicht schwer

сярмя́жны 1. Báuernrock-; **2.** *перан* (*бядняцкі, сялянскі*) (kléin)bäuerlich; arm

сярні́сты *хім* schwéflig, Schwéfel-; ***~ на́трый*** Schwéfelnatríum *n* -s

сярні́чка *ж разм* Stréichholz *n* -es, -hölzer

сяро́д *прыназ* **1.** mítten (auf *D*, in *D*); inmítten (*G*); ***~ ву́ліцы*** mítten auf der Stráße; ***~ пако́я*** inmítten des Zímmers, mítten im Zímmer; ***~ но́чы*** mítten in der Nacht; **2.** (*у ліку, у акружэнні*) únter (*D*); ***~ нас*** únter uns; ***~ бе́лага дня*** am héllichten Tage

сярэ́брацы *гл* срэбны

сярэ́дзін|а *ж* **1.** Mítte *f* -, -n; ***у са́май ~е*** genáu in der Mítte; **2.** *разм* (*паясніца*) Kreuz *n* -es, -e, Lénde *f* -, -n; ***боль у ~е*** Kréuzschmerzen *pl*; ◊ ***залата́я ~а*** der góldene Míttelweg; die góldene Mítte

сярэднеазія́цкі míttelasiatisch

сярэдневяко́вы, сярэднявечны míttelalterlich

сярэдневяко́ўе *н*, **сярэднявечча** *н* Míttelalter *n* -s

сярэднегадо́вы Jáhresdurchschnitts-, Jáhresmittel-; ***~ прыбы́так*** das Dúrchschnittseinkommen im Jáhre

сярэ́днееўрапе́йскі mítteleuropäisch; ***~ час*** mítteleuropäische Zeit

сярэднестаты́стычны statístischer Míttelwert, statístische Dúrchschnittsgröße

сярэднеязы́чны *фан* Míttelzungen-; ***~ гук*** Míttelzungenlaut *m* -es, -e

сярэ́дн|і 1. Míttel-, míttler; ***жанчы́на ~яга ро́сту*** éine míttelgroße Frau; **2.** (*узяты ў сярэднім*) Míttel-, Dúrchschnitts-, dúrchschnittlich; ***~яя вялічы́ня*** [***лі́чба***] *матэм, эк* Míttelwert *m* -es, -e, Dúrchschnittsgröße *f* -, -n; Dúrchschnittszahl *f* -, -en; ***~яя гадзі́нная ху́ткасць*** *фіз* Stundéngeschwindigkeit *f* -; ***~ія да́ныя*** Míttelwerte *pl*, Dúrchschnittswerte *pl*, Dúrchschnitte *pl*; ***~і ўзрост*** Dúrchschnittsalter *n* -s; **3.** *разм* (*пасрэдны*) míttelmäßig; mäßig; ***~і па́лец*** Míttelfínger *m* -s, -; ***~яе ву́ха*** *анат* Míttelohr *n* -(e)s; ***~яя шко́ла*** Míttelschule *f* -, -n; Óberschule *f*; ***~яя адука́цыя*** *пед* Míttelschulbildung *f* -; ***~ія вякі*** *гіст* Míttelalter *n* -s

сярэднямяся́чн|ы Mónatsdurchschnitts-; ***~ая выпрацо́ўка*** Mónatsdurchschnittsleistung *f* -, -en

сярэднясу́тачн|ы Tágesmittel-, Tágesdurchschnitts-; ***~ая вы́працо́ўка*** tägliche Dúrchschnittsarbeit *f* -, dúrchschnittliche Tágesarbeit; ***~ая тэмпературá*** Tágesdurchschnittstemperatur *f* -, -en

сястра́ *ж* **1.** Schwéster *f* -, -n; ***стрые́чная ~*** Kusíne *f* -, -n; **2.** (*у лячэбнай установе*): ***медыцы́нская ~*** Kránkenschwester *f* -, -n; ***патрана́жная ~*** Fürsorgerin *f* -, -nen, Fürsorgeschwester *f*; ***пала́тная ~*** Statiónsschwester *f*

сястры́нскі Schwéstern-; schwésterlich

сястры́ца *ж разм памянш* Schwésterchen *n* -s, -; Schwésterlein *n* -s, -

сястры́чка *ж памянш* kléine Schwéster; Schwéster *f* -, -n (*зварот да медсястры*)

сятча́тка *ж анат* Nétzhaut *f* -, -häute

сятча́ты *спец* Nétz-; nétzartig; ***~ фі́льтр*** Síebfilter *m* -s, -

сяўба́ *ж с.-г* Saat *f* -, Áussaat *f* -; Sáatzeit *f* -, -en (*пара сяўбы*); ***веснава́я ~*** Frühjahrsbestellung *f ß*

сяўру́га *ж заал* Stérnhausen *m* -s, -

сячкарня *ж с.-г* Häckselmaschine *f* -, -n, Stróhhackmaschine *f*, Stróhschneider *m* -s, -

сяч|ы́ 1. (*дрэвы*) fällen *vt*, ábhauen* *vt*; hólzen *vt*; **2.** (*дровы*) háuen* *vt*, hácken *vt*, klein máchen; **3.** (*капусту, мяса*) schnéiden* *vt*, hácken *vt*; **4.** (*шабляй*) niedersäbeln *addz vt*; **5.** (*біць*) péitschen *vt*, háuen* *vt*, prügeln *vt*, zusámmenhauen* *vt*; schlágen* *vt*; **6.** *разм* (*моцна ліцца*) strömen *vi*; sich ergíeßen*; ***до́ждж ~ э́ ў вакно́*** der Régen schlägt [trómmelt] gégen das Fénster; ***дождж ~э́*** es régnet in Strömen; **7.** *спец* (*абчэсваць*) ábhauen* *vt*

сячы́ся 1. (*рабіцца пасечаным*) bréchen* *vi* (*s*); sich zerfásern (*пра шоўк*); **2.** (*ламацца, расшчапляцца*) sich spálten, sich bréchen*; ***валасы́ сяку́цца*** das Haar ist [wird] brüchig; **3.** *разм* (*біцца, весці бой*) sich schlágen*, kämpfen *vi*; ***~ ша́блямі*** die Säbel schwíngen*

сячэ́нне *н спец* Schnitt *m* -(e)s, -e; ***падо́ўжнае ~*** Längsschnitt *m*; ***папяро́чнае ~*** Quérschnitt *m*; ***кані́чнае ~*** *матэм* Kégelschnitt *m*; ***залато́е ~*** *маст* der góldene Schnitt; ***ке́сарава ~*** *мед* Káiserschnitt *m*

Т

таба́ка *ж разм* Schnúpftabak *m* -s

табакёрка *ж* Tábak(s)dose *f* -, -n

та́бар *м* Láger *n* -s, -; ***цыга́нскі ~*** Zigéunerlager *n*; ***размясці́цца ~ам*** ein Láger áufschlagen*

та́барны Láger-

таба́чны *разм* Tábak-

та́бель *м* **1.** (*спіс*) Kontrólliste *f* -, -n; **2.** (*дошка, кніга для ўліку прыходу на работу і адыходу з работы*) Kontróllbrett *n* -es, -er; Kontróllbuch *n* -s, -bücher; ***~ аб ра́нгах*** Rángtafel *f*

та́бельны Kontról-

та́бельшчык *м*, **та́бельшчыца** *ж* Kontrolleur [-ˊlø:r] *m* -s, -e, der éine Kontrólltafel überwácht

табле́тка *ж фарм, тс перан* Tablétte *f* -, -n; Pílle *f* -, -n

табліца *ж* Tabélle *f* -, -n; ***~ мно́жання*** *матэм* Einmaléins *n* -; ***звадна́я ~*** Áufstellung *f* -, Verzéichnis *n* -ses, -se; *бухг* ***~ марыфных ста́вак*** Tarífsatzverzeichnis *n*; *камерц* ***~ по́пыту*** Náchfragetabelle

табліч|ка *ж* **1.** (*дошчачка з надпісам*) (kléines) Schild *n* -es, -er; ***фі́рменная ~*** Fírmenschild *n*; **2.** (*памянш ад* таблiца) Täfelchen *n* -s, -; Tabéllchen *n* -s, -

таблічны Tabéllen-, tabellárisch

табло́ *н* (*на вакзале*) Informatiónstafel *f* -, -n; (*на стадыёне*) Ánzeigetafel *f*, ***светлавóе ~*** Léuchttafel *f*

табу́ *н* Tabú *n* -s, -s

табуля́тар *м спец* Tabulátor *m* -s, -tóren

табу́н *м* Pférdeherde *f* -, -n (*коней*); Hírschherde *f* -, -n (*аленяў*)

табурэ́т *м*, **табурэ́тка** *ж* Schémel *m* -s, -

тавáр *м камерц* Wáre *f* -, -n; Artíkel *m* -s, - (*выраб*); ***заляжа́лы ~*** überlágerte [líegengebliebene] Wáre, Ládenhüter *m* -s, -; ***наяўны ~*** Wárenbestand *m*; ***расфасава́ны ~*** ábgewogene und ábgepackte Wáre; ***дастаўля́ць ~*** Wáre ánliefern [líefern, zústellen]; ***закупля́ць ~ гу́ртам*** [*о́птам*] Wáre über den Gróßhandel beziéhen* [en gros [ã'gro:] káufen]; ***укараня́ць ~ на ры́нку*** Wáre auf dem Markt éinführen

тавараабаро́т *м гл* тавараzварот

тавараабме́н *м эк* Wárenaustausch *m* -(e)s

тавараадпраўні́к *м*, **тавараадпра́ўшчык** *м камерц* Wárenabsender *m* -s, -; Wárenabfertiger *m* -s, -
тавараатрыма́льнік *м камерц* Wárenempfänger *m* -s, -
тавараве́д *м*, **тавараzна́ўца** *м* Wárensachverständige (*sub*) *m*, Wárenexperte *m* -n, -n; Wárenkundler *m* -s, -
тавараўтво́рца *м эк* Wárenproduzent *m* -en, -en
тавараzваро́т *м камерц* Wárenumsatz *m* -es, Wárenverkehr *m* -s
тавараzна́ўства *н* Wárenkunde *f* -
тава́ра-пасажы́рскі: ~ ***цягні́к*** *чыг* gemischter Zug
тава́рнасць *ж камерц* Wárencharakter [-kɑ-] *m* -s, Wárenform *f* - (der Produkte); Márktfähigkeit *f* - (*прадукта*)
тава́рн|ы Wáren-; ***~ая вытво́рчасць*** *эк* Wárenproduktion *f* -, Márktproduktion *f*; ***~ая ста́нцыя*** Güterbahnhof *m* -s, -höfe
таварня́к *м чыг* Güterzug *m* -s, -züge
тава́ры *мн* Wáren *pl*, Artíkel *pl*, Güter *pl*; ***~ма́савай вытво́рчасці*** Mássenproduktionswaren *pl*; ***спажывецкія ~*** Konsúmgüter *pl*, Verbráuchsgüter *pl*, Gebráuchs|artikel *pl*; ***~ шырокага спажыва́ння*** Mássenbedarfs|artikel *pl*, Gebráuchsgüter
тавары́скасц|ь *ж* Kamerádschaft *f* -; Kamerádschaftlichkeit *f* -; Kollegialität *f* -; ***~ па зброі*** Wáffenbrüderschaft *f* -
тавары́скі fréundschaftlich, kamerádschaftlich; kollegiál; ***~ суд*** Éhrengericht *n* -es, -e
тавары́ства *н* **1.** (*адносіны*) Kamerádschaft *f* -, Kollegialität *f* -; **2.** (*аб'яднанне*) Genóssenschaft *f* -, -en; Geséllschaft *f* -, -en, Geméinschaft *f* -, -en; ***Тавары́ства белару́скай мо́вы*** Geséllschaft der belarússischen Spráche; *камерц* ***каманды́тнае ~*** Kommandítgesellschaft *f*; ***кааператы́ўнае ~*** Genóssenschaft óhne Náchschusspflicht; ***~ з абмежава́най адка́знасцю*** Geséllschaft mit beschränkter Háftung (GmbH); ***~ з неабмежава́най адка́знасцю*** Geséllschaft mit únbeschränkter Háftung (GmuH)
тава́рыш *м* Kamerád *m* -en, -en, Fréund *m* -es, -e, Kollége *m* -n, -n; (*пра жанчыну*) Kollégin *f* -, -nen (*на працы*); Genósse *m* -n, -n (*зварот да члена левай партыі*)
тавары́шава́ць befréundet sein (*з кім-н* mit *D*)
таве́рна *ж* Tabérne *f* -, -n, Taverne [-ˊvɛr-] *f* -, -n, Schénke *f* -, -n
тагасве́тн|ы jénseitig; überirdisch (*незямны*); ***~ае жыццё*** Jénseits *n* -
тагача́сны *разм* dámalig
таджы́к *м* Tadschíke *m* -n, -n
таджы́кск|і tadschíkisch; ***~ая мо́ва*** die tadschíkische Spráche, das Tadschíkische (*sub*)
тады́ *прысл* **1.** (*у той час*) dámals; **2.** *злучн.* (*пасля таго; у такім разе*) da, dann; **3.**: ***~ як*** *злучн* während
тады́-сяды́ *прысл* mánchmal, von Zeit zu Zeit
тае́мна *прысл* gehéimnisvoll, gehéim
тае́мнасць *ж* das Gehéimnisvolle (*sub*)
тае́мн|ы héimlich, gehéimnisvoll; gehéim, Gehéim-; ***~ае галасава́нне*** gehéime Ábstimmung
таёжны Táiga-
таз *м* **1.** (*пасудзіна*) Schüssel *f* -, -n; Wáschschüssel *f* - (*для мыцця*); **2.** *анат* Bécken *n* -s, -
та́інства *н рэл* Sakramént *n* -(e)s, -e; ***~ хрышчэ́ння*** [***хро́сту***] das Sakramént der Táufe; ***~ шлю́бу*** das Sakramént der Éhe; ***~ прыча́сця*** Kommunión *f* -
таіцца sich verstécken, sich verbérgen*
таіць verbérgen* *vt*, verhéhlen *vt*, verhéimlichen *vt* (*ад каго-н* vor *D*)
тайга́ *ж геагр* Táiga *f* -
тайко́м *прысл разм* héimlich, insgehéim, im Stíllen
тайм *м спарт* Hálbzeit *f* -, -en
та́йн|а I *ж разм гл* таямніца
та́йна II *прысл разм* gehéim, héimlich
та́йнапіс *м* Gehéimschrift *f* -
тайні́к *м* Verstéck *n* -s, -e; Gehéimfach *n* -s, -fächer (*у стале*)
та́йн|ы *разм* gehéim, héimlich, Gehéim-; ***~ая паліцыя*** Gehéimpolizei *f* -
тайфу́н *м метэар* Taifún *m* -s, -e
так 1. *прысл* (*такім чынам, спосабам*) so, auf díese Wéise, auf so(lch) éine Art und Wéise; derárt; ***~ каб ...*** so, dass ...; ***пішы ~, каб ко́жны мог прачыта́ць*** schreib so, dass jéder es lésen kann; ***~ жа*** (***як***) wie; ***ён размаўля́е ~ добра, як і яна́*** er spricht ébenso gut wie sie; (*настолькі*) so, dermáßen; ***ён ~ падро́с, што ...*** er ist so [dermáßen] gewáchsen, dass ...; **2.** *сцвярджальная часціца кніжн* ja, fréilich; ***менавіта ~*** fréilich, ganz so, es stimmt; ***ці ~?*** stimmt es?; ***ці не ~?*** nicht wahr?; **3.** *у спалучэнні са злучн* «што»: ***~ што*** so dass, denn, da, weil; *са злучн* «як»: ***як... ~ і...*** sowóhl ... als auch; ***ужо было́ по́зна, ~ што я не змог з ім пагавары́ць*** es war schon spät, so dass ich ihn nicht spréchen kónnte; ***як мы, ~ і яны*** sowóhl wir als auch sie; ***~ і сяк*** auf verschíedene Art und Wéise; ***~ ці іна́кш*** sowiesó; so óder so; ***~ зва́ны*** so genánnt; ***~ сабе́*** so lalá; ***~ то́чна!, ~ ёсць!*** *вайск* jawóhl!, zu Beféhl!
такава́нне *н біял* Bálzen *n* -s
такава́ць *біял* bálzen *vi*
такавішча *н біял* Balz *f* -, -en
така́рнічаць *спец* als Dréher (*на метале*) [Dréchsler (*на дрэве*)] tätig sein
така́рны *спец* Dreh-; ***~ стано́к*** *тэх* Dréhbank *f* -, -bänke
така́рня *ж уст спец* Dreherei *f* -, -en
такела́ж *м марск* Tákelwerk *n* -(e)s, Takeláge [-ʒə] *f* -, -n
так|і *займ* **1.** (*перад наз*) solch, so ein, ein sólcher, solch ein; ***~і вучань*** so ein Schüler, ein sólcher Schüler; **2.** (*перад прым*) so; so sehr; ***ён ~і до́бры*** er ist so gut; ***што ~о́е*** (***здарылася***)? was gibt's?, was ist los [passíert]?; ***~і і ~і*** der und der; ein bestímmter, ein gewísser; ***спра́вы ідуць сёння ~ім чы́нам, што ...*** die Dínge líegen héute so [derárt], dass ...; ***~ім чы́нам*** auf so(lch) éine Wéise
такі-сякі nicht von hóher Qualität; únbrauchbar
тако́ўскі *разм* besónder, éigenartig; sólcher|art
та́кса I *ж камерц* (*расцэнка*) Táxe *f* -, -n
та́кса II *ж* (*сабака*) Dáchshund *m* -es, -e; Dáckel *m* -s, -
таксама́ *прысл* auch; gléichfalls, ébenfalls
таксапа́рк *м* Táxizentrale *f* -, -n
таксі́ *н* Táxi *n* -s, -s
таксіко́з *мед* Toxizität *f* -
таксі́н *м спец* Toxín *n* -s, -e, Gíftstoff *m* -(e)s, -e
таксі́ст *м* Táxifahrer *m* -s, -
таксі́чнасць *ж* Gíftigkeit *f* -, Toxizität *f* -
таксі́чны (*ядавіты*) *спец* tóxisch, gíftig
таксо́метр *м* Taxaméter *m*, *n* -s, -, Fáhrpreisanzeiger *m* -s, -
так-сяк *прысл* **1.** (*з намаганнямі*) mit Müh(e) und Not, mit Ach und Krach, schlecht und recht; **2.** (*абы як*) náchlässig, flüchtig
такт I *м* **1.** *муз* Takt *m* -es, -e; ***трыма́ць ~*** den Takt hálten*, im Takt bléiben*; **2.** *тэх* Takt *m* -es, -e; Árbeitsgang *m* -es, -gänge
такт II *м* (*далікатнасць*) Takt *m* -(e)s, Táktgefühl *n* -(e)s
такто́ўна *прысл* táktvoll
такто́ўнасць *ж* Féinfühligkeit *f* -; Táktgefühl *n* -(e)s; ***~ ва́шых павво́дзін*** Ihr táktvolles Benéhmen
такто́ўн|ы táktvoll, féinfühlig; ***быць ~м*** Táktgefühl besítzen*
та́ктыка *ж* Táktik *f* -, -en
тактычны táktisch
та́л|ы áufgetaut; ~ ***снег*** táuender Schnee; ***~ая вада́*** Schnéewasser *n* -s
талака́ *ж разм* Geméinschaftshilfe *f* -; geméinsame Árbeit; Zusámmenarbeit *f* -
талакно́ *н* (gestóßenes) Háfermehl *n* -s
тале́р|ка *ж* Téller *m* -s, -; ***глыбо́кая ~ка*** tíefer Téller, Súppenteller *m*; ***ме́лкая ~ка*** flácher Téller; ◊ ***быць не ў сваёй ~цы*** sich nicht wohl in séiner Haut fühlen
таленавіта *прысл* gekónnt
таленавіты talentíert, begábt
та́лент *м* Talént *n* -s, -e; Begábung *f* -, -en (*адоранасць*); ***прыро́дны ~*** Natúrtalent *n*; ◊ ***закапа́ць свой ~*** sein Licht únter den Schéffel stéllen

та́лер *м гіст* Táler *m* -s, - (*пасля ліч pl* -)
талера́нтнасць *ж* Toleránz *f* - (*тэх pl* -en)
талера́нтны toleránt
тале́рачка *ж памяні* Téllerchen *n* -s, -
та́лі|я *ж* Taille [ˊtaljə] *f* -, -n; ***абня́ць за ~ю*** umármen *vt*, um die Taille fássen; ***палі́тó ў ~ю*** taillierter [talˊji:-] Mántel
талі́сма́н *м* Tálisman *m* -s, -e
талко́ва *прысл разм* vernünftig; zusámmenhängend (*зразумела*); wie es sich gebührt, gebührend
талко́в|ы *разм* geschéit; verständig; vernünftig; éinsichtsvoll (*кемлівы*); ***гэ́та ~ая прапано́ва*** dieser Vórschlag hat Hand und Fuß
талму́д *м рэл* Tálmud *m* -(e)s, -e
тало́н *м* Márke *f* -, -n; Talon [-ˊlõ:] *m* -s, -s; Gút|schein *m* -s, -e (*на атрыманне тавару*); Éssenmarke *f* -, -n (*на абед і г. д*); ***гарантыйны ~*** Garantíeabschnitt *m* -(e)s, -e
тальк *м мін* Talk *m* -(e)s; Tálkum *n* -s (*парашок*)
там *прысл* dort, da; ***~са́ма, ~ жа*** ébenda (*скар* ebd.)
тамага́ўк *м* Tómahawk [-hɑ:k] *m* -s, -s
тамада́ *м* Tamadá *m* - (*Tischmeister bei Festessen*)
тама́т *м* **1.** *бат, с.-г* Tomáte *f* -, -n; **2.** *кул* (*паста*) Tomátenmark *n* -(e)s
тама́тн|ы *кул* Tomáten-; ***~ая па́ста*** Tomátenmark *n* -(e)s; ***~ы со́ус*** Tomátensoße [-sauce] *f* -, -n; ***~ы сок*** Tomátensaft *m* -(e)s, -säfte
та́машні *разм* dórtig
та́мбур *м* **1.** *буд* Víndfang *m* -(e), -fänge, Vórraum *m* -(e)s, -räume; **2.** *чыг* Víndfang *m*; **3.**: ***~ газасхо́вішча*** Gásschleuse *f* -, -n
тамбурі́н *м муз* Tamburín *n* -s, -e, Schéllentrommel *f* -, -n
тамі́цца schmáchten *vi*; ***~ ад смагі*** dürsten *vi*, Durst háben
тамі́ць ermüden *vt*, ánstrengen *vt*, erschöpfen *vt*; ***~ во́чы*** die Áugen überánstrengen
тамо́жнік *м разм* Zóllbeamte (*sub*) *m* -n, -n
тамо́жня *ж гл* мытня
тампо́н *м мед* Tampón [Támpon] *m* -s, -s, Túpfer *m* -s, -; Wáttebausch *m* -(e)s, -e *i* -bäusche (*з ваты*)
там-сям *прысл* bald hier, bald da
тамта́м *м муз* Tamtám *m* -s, -s, Gong *m*, *n* -s, -s
таму́ **1.** *прысл* darúm, déshalb, déswégen; ***і ~ ében*** [geráde] darúm; **2.** *злучн*: ***~ што*** weil, da, denn
тана́ж *м* **1.** *марск* Tónnengehalt *m* -(e)s, -e; Tonnáge [-ʒə] *f* -; **2.** (*грузападымальнасць*) Ládefähigkeit *f* -
тана́льнасць *ж муз* Tónart *f* -, -en, Tonalität *f* -, -en
тана́льны *муз* tónartig
та́нга *н муз* (*танец*) Tángo *m* -s, -s
танда́м *м* **1.** *тэх* (*размяшчэнне ў адной лініі*) Tándemanordnung *f* -, -en; **2.** *спарт* (*веласіпед*) Tándem *n* -s, -s, Tándemfahrrad *n* -s, -räder
танда́т *м разм* Pfusch *m* -es, Pfúscharbeit *f* -, -en
танда́тны Pfusch-
тане́й *прысл*; **тане́йшы** (*выш. ступ ад* тонка, тонкі) dünner
та́н|ец *м* Tanz *m* -es, Tänze; ***наро́дны ~ец*** Vólkstanz *m*; ***ба́льны ~ец*** Geséllschaftstanz *m*; ***пляцо́ўка для ~цаў*** Tánzfläche *f* -, -n, Tánzboden *m* -s, - *i* -böden; ***да́мскі ~*** Dámenwahl *f* -, -en
тане́ць dünn wérden; ábmagern *vi* (*s*), máger wérden (*худзець*)
танзу́ра *ж* Tonsúr *f* -, -en
танізава́льны, танізу́ючы tonisíerend
танізава́ць tonisíeren *vt*
тані́чн|ы **1.** *літ* tónisch, akzentuíerend; ***~ае вершаскладáнне*** akzentuíerender Vérsbau; **2.** *мед* tónisch; ***~ыя сро́дкі*** tónische Míttel
танк *м* **1.** *вайск* Pánzer *m* -s, -, Pánzerkampfwagen *m* -s, -; **2.** (*рэзервуар, бак*) Tank *m* -s, -s *i* -e, Zistérne *f* -, -n
та́нкав|ы *вайск* Pánzer-; ***~ая ата́ка*** Pánzerangriff *m* -(e)s, -e; ***~ая часць*** Pánzer|einheit *f* -, -en; ***~ыя во́йскі*** Pánzertruppen *pl*
та́нкер *м марск, камерц* Tánkschiff *n* -(e)s, -e, Tánker *m* -s, -
танке́тка *ж вайск* léichter Pánzer, Kléinkampfwagen *m* -s, -
танкі́ст *м вайск* Pánzersoldat *m* -en, -en
ТАН-код *м фін* (*кліента банка*) TÁN-Code [ˌko:t] *m* -s, -s
та́нна *прысл* billig, préiswert, préisgünstig, níedrig im Preis
та́ннасць *ж* Billigkeit *f* -, Préisgünstigkeit *f* -
таннéй *прысл*; **таннéйшы** (*выш. ступ ад* танна, танны) billiger
таннéць bílliger wérden
та́нны billig; préiswert; níedrig (*пра цану*)
тану́ць ertrínken* *vi* (*s*), úntergehen* *vi* (*s*) (*пра судна*); ***~ у спра́вах*** *разм* (vor Árbeit) nicht wíssen, wo éinem der Kopf steht
танцава́льны Tanz-; ***~ ве́чар*** Tánzabend *m* -s, -e, Tánzveranstaltung *f* -, -en
танцава́ць tánzen *vi*, *vt*
танцо́р *м*, **танцо́ўшчык** *м* Tänzer *m* -s, -
танцо́рка *ж*, **танцо́ўшчыца** *ж* Tänzerin *f* -, -nen
танцпляцо́ўка *ж* Tánzdiele *f* -, -n, Tánzboden *m* -s, - *i* -böden
та́нчыць *разм гл* танцаваць
танчэ́й *прысл*; **танчэ́йшы** (*выш. ступ ад* тонка, тонкі) dünner
танчэ́ць *гл* танець
тапаграфі́чн|ы topográphisch [topográfisch]; *вайск* Vermés-sungs-; ***~ая здымка*** Lándesaufnahme *f* -, -n, topográfische Áufnahme; ***~ы ўмо́ўны знак*** Kártenzeichen *n* -s, -, topográfisches Zéichen
тапагра́фія *ж* Topographíe *f* -, -phí|en, Topografíe *f*, Geländekunde *f* -
тапа́з *м мін* Topás *m* -es, -e; ***дымчаты ~*** Ráuchtopas *m*
тапало́гія *ж* Topologíe *f* -
тапані́міка *ж* **1.** Órtsnamen *pl*, Órtsnamenschatz *m* -es; **2.** *лінгв* Toponomástik *f* -, Órtsnamenkunde *f* -
тапары́шча *н* Áxtstiel *m* -s, -e, Béilstiel *m* -s, -e
та́пачкі *мн*, **та́пкі** *мн* Spórtschuhe *pl*, Túrnschuhe *pl*; Háusschuhe *pl*, Níedertreter *pl*, Schläppen *pl* (*хатнія*)
тапе́лец *м*, **тапе́льніца** *ж* Ertrúnkene (*sub*) *m*, *f* -n, -n
тапі́р *м заал* Tápir *m* -s, -e
тапі́цца I (*гінуць у вадзе*) sich ertränken
тапі́цца II (*пра воск і г. д*) schmélzen* *vi*
тапі́ць I **1.** ertränken *vt*; versénken *vt*, in den Grund bóhren (*судна*); ◊ ***~ го́ра ў віне́*** den Kúmmer im Wein ertränken; **2.** (*губіць*) zugrúnde [zu Grúnde] ríchten; ins Verdérben stürzen (*толькі пра чалавека*)
тапі́ць II (*воск, тлушч і г. д*) áuslassen* *vt*; schmélzen *vt*
тапля́к *м спец* (*бервяно*) Sénkholz *n* -es
тапо́ля *ж* Páppel *f* -, -n; ***пірамідáльная ~*** pyramídenförmige Páppel
тапо́р *м разм* Axt *f* -, Äxte; Beil *n* -s, -e; ◊ ***за камаро́м не ганя́йся з тапаро́м*** ≅ nach [auf] Spátzen schießt man nicht mit Kanónen
тапо́рны *разм* (*грубы*) grob; úngehobelt (*пра чалавека*)
тапта́ць stámpfen *vi*; tráppeln *vi*, hin- und hértreten*; ***~ на ме́сцы*** von éinem Fuß auf den ánderen tréten*; *перан* auf der Stélle tréten*; nicht vom Fleck [von der Stélle] kómmen*
тапта́ць **1.** (*прымінаць нагамі*) zertréten* *vt*, zerdrücken *vt*; stámpfen *vt* (*трамбаваць*)
тапту́н *м разм* Tólpatsch *m* -es, -, plúmper [úngeschickter] Mensch
тапчáн *м* Líegebett *n* -(e)s, -en; Couch [kautʃ] *f* -, -s *i* -en (*кушэтка*)
тапы́рыцца **1.** sich sträuben; ábstehen* *vi* (*h, s*) (*пра матэрыю і г. д*); **2.** *перан* (*упарцíцца, наравíцца*) láunisch [láunenhaft] sein, Láunen háben
тапы́рыць sträuben *vt*
та́ра *ж камерц* **1.** (*упакоўка*) Tára *f* -, -ren, Verpáckung *f* -, -en; **2.** (*вага ўпакоўкі*) Táragewicht *n* -(e)s, -e
тараба́ніць **1.** (*грукатаць*) póltern *vi*, krächen *vi*; **2.** *разм* (*несці*) schléppen *vt*
тараба́ршчына *ж* Káuderwelsch *n* -(s)

тарака́н *м зоол* (schwárze) Schábe *f*-, -n; Küchenschabe *f*, Kákerlak *m* -s *i* -en, -en, Kakerláke *f*-, -n
тара́н *м спец* Máuerbrecher *m* -s, -; Stúrmbock *m* -s, -böcke (*mc перан*)
тара́ніць rámmen *vt*
тара́нтул *м зоол* Tarántel *f*-, -n
тарара́м *м разм* Durcheinánder *n* -s, Wírrwar *n* -s, Tohuwabóhu *n* -s, -s; ***учыні́ць ~ у ха́це*** [***до́ме***] das Haus auf den Kopf stéllen, das Únterste zuóberst kéhren
тарата́йка *ж разм* zwéiräd(e)riger Wágen
тарато́рыць *разм* pláppern *vi*, schwätzen *vi*
тара́шчыцца glótzen *vi*; die Áugen áufsperren [áufreißen*]
тарбахва́т *м* bestéchlicher [käuflicher] Mensch; Ráffer *m* -s, -
таргава́цца 1. *камерц* (*пра цану*) händeln *vi*; **2.** *разм* (*спрачацца з-за чаго-н*) féilschen *vi* (um *A*)
тарга́нуцца (krámphaft) zúcken *vi*
тарга́нуць zúpfen *vt*, zíehen* *vi* (*чым-н* mit *D*, *за што-н* an *D*); ***~ за рука́ў*** am Ärmel zúpfen [zíehen*]
таргі́ *мн камерц, фін* Ausschreibung *f*-, -en; Auktión *f*-, -en, Verstéigerung *f*-, -en; ***міжнаро́дныя ~*** [***то́ндары***] internationále Áusschreibung, internationáler Ténder; ***публі́чныя ~*** öffentliche Verstéigerung; ***тае́мныя*** [***сакро́тныя***] ~ geschlóssene Áusschreibung, geschlóssener Ténder; ***прызнача́ць ~*** éine Áusschreibung ánkündigen; ***правядзі́ць ~*** éine Áusschreibung ábhalten*
та́рка *ж* Réib|eisen *n* -s, -
тармажэ́нне *н* **1.** *тэх* Brémsen *n* -s, Brémsung *f*-, Hémmung *f*-; ***аварыйнае ~*** Nótbremsung *f*; ***плаўнае ~*** stóßfreies Brémsen *n*; **2.** *псіхал*: ***~ рэфле́ксаў*** die Hémmung der Refléxe; ***ахо́ўнае ~*** Schútzhemmung *f*
тармазі́ць 1. brémsen *vt*, hémmen *vt*; **2.** *перан* híndern *vt*, hémmen *vt*; Híndernisse [Stéine] in den Weg legen
тармазн|ы́ *тэх* Brems-; ***~ая калёдка*** Bremsklotz *m* -es, -e, Bremsbacke *f*-, -n, Brémsschuh *m* -(e)s, -e
тармасі́ць *разм* **1.** zúpfen *vt*, zérren *vt*; **2.** *разм* (*надакучваць*) nécken *vt*, stören *vt*, *j-m* kéine Rúhe gében*
тарна́да *м метэар* Tornádo *m* -s, -s
тарапо́пкі hástig, éilfertig
тарпа́ *ж с.-г* Schóber *m* -s, -; Héuschober *m* (*сена*); Stróhfeimen *m* -s, - (*саломы*)
тарпава́ць *с.-г* in (Héu-, Stróh-)Schober zusámmenlegen (*сена, салому*)
тарпаты́на *ж разм хім* Terpentín *m* -s
тарпе́да *ж вайск* Torpédo *m* -s, -s
тарпедава́ць 1. *вайск марск* torpedíeren *vt*; **2.** *перан* torpedíeren *vt*; unterminíeren *неаддз vt*
тарпе́дн|ы *вайск марск*: ***~ы апара́т*** Torpédorohr *n* -(e)s, -e; Torpédosatz *m* -es, -sätze (*многатрубны*); ***~ая ата́ка*** Torpédoangriff *m* -(e)s, -e; ***~ы ка́тар*** Torpédoschnellboot *n* -(e)s, -e, Schnéllboot *n*
тарта́к *м спец* Sägewerk *n* -(e)s, -e; *разм* Sägemühle *f*-, -n
тарфя́нік *м* **1.** *геагр* (*наклады торфу*) Tórflager *n* -s, -; **2.** (*марфяні́шча*) Tórfboden *m* -s, - *i* -böden
тарфян|ы́ Torf -; ***~ы мох*** Tórfmoos *n* -es; ***~ое балó та*** Tórfmoor *n* -(e)s, -e; ***~ы брыке́т*** Tórfbrikett *n* -s, -s *i* -e; ***~ая распрацо́ўка*** Tórfstich *m* -(e)s, -e; ***~ы пыл*** Tórfmull *m* -s
тарцава́ць *тэх* plándrehen *vt*
тарцо́в|ы *спец* **1.** Holz-; ***~ы брук*** Hólzpflaster *n* -s, -; **2.** Stirn-; ***~ая фрэ́за*** Stírnfräser *m* -s
таршэ́р *м* Stéhlampe *f*-, -n
та́ры-ба́ры *разм* Schwatz *m* -es; Geschwätz *n* -es; Geplápper *n* -s; ◊ ***пайшлі́ ~*** die Zúngen lösten sich
тары́раваць *фіз, камерц* éichen *vt*, taríeren *vt*
тары́ф *м камерц* Taríf *m* -s, -e; Tarífsatz *m* -es, -sätze; Preis *m* -es, -; Gebühr *f*-, -en; ***агéнцкі ~*** Vertrétertarif *m*; ***гну́ткі ~*** beweglicher [flexíbler] Taríf; ***забаро́нны ~*** Spérrtarif *m*; ***ільго́тны ~*** Vórzugstarif *m*, Sóndertarif *m*; ***мы́тны ~*** Zóllgebühr *f*-, -en; ***згóдна з ~ам*** taríflich, tarífgemäß; ***апла́чваць згóдна з ~ам*** nach Taríf bezáhlen; ***вызнача́ць ~*** éinen Taríf féstsetzen [féstlegen] ***скасо́ўваць ~*** éinen Taríf kündigen
тарыфіка́ваць *бухг* tarifíeren *vt*
тарыфіка́цыя *ж бухг* Tarifíeren *n* -s
тары́фн|ы *камерц* Taríf-; ***~ая ста́ўка*** Tarífsatz *m* -(e)s, -sätze; ***~ая зо́на*** Tarífzone *f*-, -n; ***забаро́нная ~я сі́стэма*** Prohibitívsystem *n* -s, -e
тары́ць *высок* áustreten* *vt*; báhnen *vt*
тарэадо́р *м* Stíerkämpfer *m* -s, -, Toreadór *m* -s *i* -en, -e(n) (*коны*); Toréro *m* -(s), -s (*пешы*)
тарэ́ц *м спец* Stírnseite *f*-, -n, Kópf|ende *n* -s, -n
тасава́ць *карті, mc перан* míschen *vt*; ***~ ка́рты*** Kárten míschen
тасёмка *ж*, **тасьмá** *ж* Band *n* -es, Bänder; Bórte *f*-, -n
та́та *м* Pápa *m* -s, -s; Pápi *m* -s, -s; Váter *m* -s, Väter, Váti *m* -s, -s
таталіза́тар *м спец* Totalisátor *m* -s, -tóren, Tóto *m, n* -s, -s
таталіта́рны *паліт* totalitär
тата́льнасць *ж* Totalität *f*-, -en
тата́льн|ы Totál-, totál; ***~ая вайна́*** totáler Krieg
тата́рка *ж* Tatárin *f*-, -nen
тата́рск|і tatárisch; ***~ая мо́ва*** die tatárische Spráche, das Tatárische (*sub*); ***~ае і́га*** *гіст* Tatárenherrschaft *f*-, Mongólenherrschaft *f*
тата́рын *м* Tatár *m* -en, -en
та́тачка *м*, **та́тка** *м памянш* Väterchen *n* -s, -
тату́ *м нескл* Tattoo [tɛ´tu:] *m, n* -s, -s
татуі́раваць tätowíeren *vt*
татуі́ро́ўка *ж* Tätowíerung *f*-, -en
татэ́м *м антроп, міфал* Tótem *n* -s, -s
таўкатня́ *ж* Gedränge *n* -s, Gestóße *n* -s
таўка́ч 1. *м* Stampfer *m* -s, -; **2.** *разм* Tólpatsch *m* -es, -e
таўку́чка *ж разм* **1.** (*таўкатня*) Gedränge *n* -s; **2.** (*рынак*) Trödelmarkt *m* -(e)s, -märkte
таўрава́ць (*жывёлу*) brándmarken *неаддз vt*
таўро́ *н* Brándmal *n* -s, -e *i* -mäler, Stémpel *m* -s, -; Gestütsbrand *m* -(e)s, brände (*у коней*); ***накла́сці ~*** brándmarken *неаддз vt*
таўсма́ты korpulént; stämmig, untersétzt
таўставáты zíemlich dick
таўстамо́рды díckbackig, díckwangig
таўстапу́зы *разм* díckbäuchig, díckwanstig
таўстасу́м *м разм* Géldsack *m* -(e)s, -säcke, Géldprotz *m* -en *i* -es, -en *i* -e
таўсташчо́кі díckwangig
таўсту́ха *ж*, **таўсту́шка** *ж* Dícke (*sub*) *f* -n, -n; Díckchen *n* -s, -, Díckerchen *n* -s, -
таўсту́н *м* Dícke (*sub*) *m* -n, -n
таўсцёйшы (*выш. ступ ад* тоўсты) dícker, stämmiger
таўсцéць dick wérden; zúnehmen* *vi*
таўтало́гія *ж* Tautologíe *f*-, -í|en
таўхані́на *ж зл* таўкатня
таўха́ць stóßen* *vt*, drängen *vt*; púffen *vt* (*разм*)
таўхе́ль *м* Puff *m* -(e)s, -e *i* Püffe
таўчо́нік *м кул* (*блін з тоўчанай бульбы*) (éine Art von) Kartóffelpuffer *m* -s, -
таўчы́ 1. (zer)stóßen* *vt*; zerkléinern *vt*; ◊ ***~ вадý ў сту́пе*** Wásser mit éinem Sieb schöpfen; **2.** (*наносіць пабоі*) prügeln *vt*, héftig schlágen*
таўчы́ся 1. zerbröckeln *vi* (*s*); **2.** *разм* (*бадзяцца*) herúmlungern *vi*, sich (müßig) herúmtreiben* *vi* (*s*)
таўшчыня́ *ж* Dícke *f*-; Stärke *f*-, -n (*сцяны, пліты і г. д*); Úmfang *m* -(e)s, -fänge (*у аб'ёме*); ***~ льду*** Éisstärke *f*-
таўшчэ́зны sehr dick
тафта́ *ж тэкст* Taft *m* -(e)s, -e; ***ядвáбная ~*** Séidentaft *m*
та́хкаць *разм* (rhýthmisch) pulsíeren *vi*
тахо́метр *м тэх* Tachómeter *n* -s, -, Geschwíndigkeitsmesser *m* -s, -
тахта́ *ж* Ottománe *f*-, -n

тача́нка *ж*: ***кулямётная ~*** *гіст вайск* Maschínengewehrwagen *m* -s, -

та́чка *ж* Schúbkarren *m* -s, -, Kárren *m* -s, -

тачы́ла *ж спец* Schléifstein *m* -(e)s, -e

тачы́льны *спец* Schléif-, Wétz-; ***~ брусо́к*** [***ка́мень***] Schléifstein *m* -(e)s, -e; ***~ стано́к*** Schléifmaschine *f* -, -n

тачы́льня *ж спец* Schleiferéi *f* -, -en, Schléifwerkstatt *f* -, -stätten

тачы́льшчык *м* **1.** Schléifer *m* -s, -; **2.** *заал* (*жук*) Klópfkäfer *m* -s, -

тачы́ць 1. (*на такарным станку*) dréhen *vt* (*метал*); dréchseln (*дрэва*); **2.** (*прагрызаць, пашкоджваць што-н*) nágen *vt* (*пра грызуноў*); zerfréssen* *vt* (*пра чарвяка і г. д*); ◊ ***по́мста ягó то́чыць*** die Ráche verzéhrt ihn [zehrt an ihm, frisst an ihm]

тачэ́нне *н* Schléifen *n* -s; Dréhen *n* -s (*на такарным станку*), Ábdrehen *n* -s (*інструментаў*); Dréchseln *vt* (*дрэва*); Wétzen *n* -s (*на тачыле, тачыльным камяні, бруску*)

таэквандо́ *н нескл спарт* Taekwóndo [tɛ-] *n* -

таямні́ц|а *ж* Gehéimnis *n* -ses, -se; ***захо́ўваць ~у*** ein Gehéimnis wáhren; ***трыма́ць у* (*глыбо́кай*) *~ы*** (streng) gehéim hálten*

таямні́ча *прысл*; **таямні́чы 1.** gehéimnisvoll, gehéimnisreich; mysteriös (*загадкавы, незразумелы*); **2.** übernatürlich (*па-за мяжой пазнання*); **3.** (*тайны, заборонны*) gehéim, héimlich

таямні́часць *ж* das Gehéimnisvolle (*sub*)

тва́ністы súmpfig, mórastig

тваé *гл* твой

тваё *гл* твой

твань *ж* (*дрыгва, балота*) Súmpfland *n* -(e)s, -länder, Mórast *m* -es, -e; Bruch *m* -(e)s, Brüche, súmpfige [mórastige] Stélle

твар *м* Gesícht *n* -(e)s, -er; Ángesicht *n* -(e)s, -e(r); **~ у ~** [***~ам у ~, ~ам да ~у***] von Ángesicht zu Ángesicht; ***гэ́та вам да ~у*** das steht Íhnen (gut), das kléidet Sie; ◊ ***не ўда́рыць*** [***не ўпа́сці***] ***~ам у гразь*** *разм* sich nicht blamíeren [blóßstellen], die Próbe beständen*; ***ён змяні́ўся з ~у*** er sieht ganz verstört aus; ***ве́даць у ~ каго-н*** *j-n* vom Séhen [dem Ánsehen nach] kénnen*; ◊ ***~ бе́лы, а душа́ чо́рная*** ≅ schöne Haut, hässliche Gedánken

твaро́г *м* Quark *m* -s

твaро́жнік *м* Quárkpfannkuchen *m* -s, -

твaро́жны Quark-, quárkig

твaро́жысты quárkig; verkäst

тва́рык *м памяншг* Gesíchtchen *n* -s, -, Gesíchtlein *n* -s, -, ***прыго́жы ~*** éine hübsche Lárve [-və] *f* -, -n (*разм*)

тварыцца *разм* vórgehen* *vi* (*s*), geschéhen* *vi* (*s*); ***што тут тво́рыцца?*** was geht hier vor?

тварыць 1. (*ствараць*) schäffen* *vt*; **2.** (*здзяйсняць, рабіць*) máchen *vt*, tun* *vt*; verríchten *vt*; erzéugen *vt*; ***~ цуд*** (***ы***) Wúnder wírken [vollbríngen*]

твaрэ́ц *м* Schöpfer *m* -s, -; Gestálter *m* -s, -

твaя́ *гл* твой

твіст *м муз* (*танец*) Twist *m* -s, -s

твой *займ* **1.** dein (*f* déine, *n* dein, *pl* déine); der (die, das) déine, der (die, das) déinige (*без наз*); ***гэ́та твaё*** das gehört dir; das ist dein (*высок*); **2.** *у знач наз н*: ***твaё*** (*уласнасць*) das Déine, das Déinige; **3.** *у знач наз мн*: ***твае*** (*радня, сваякі*) die Déinen; ***твaé прыéхалі ўжо?*** sind die Déinigen schon gekómmen?; ◊ ***гэ́та твaя спра́ва*** das ist déine Sáche

твор *м* (*прадукт творчай працы*) Werk *n* -(e)s, -e, Erzéugnis *n* -ses, -se; ***маста́цкі ~*** Kúnstwerk *n*; ***літаратýрны ~*** literárisches Werk; ***вы́браныя ~ы*** áusgewählte Wérke

твóрны: **~ скло́н** *грам* Instrumentál(is) *m* -, -les

твóрца *м гл* творэц

твóрча *прысл* schöpferisch, kreatív

твóрчас|ць *ж* **1.** (*дзейнасць*) Schäffen *n* -s; **2.** (*сукупнасць усяго створанага кім-н*) Werk *n* -(e)s, -e; ***наро́дная ~*** Vólkskunst *f* -, Vólksschaffen *n*; ***у ~ці Яку́ба Ко́ласа*** in Wérken von Jakúb Kólas

твóрч|ы schöpferisch, kreatív; Schäffens-; ***~ая сі́ла*** schöpferische Kraft, Schäffenskraft *f*; ***~ыя ме́тады*** sélbstschöpferische Methóden; ***~ы шлях пісьме́нніка*** Schäffensweg des Schrífstellers

тка́лля *ж паэт гл* ткачыха

ткані́на *ж тэкст* Stoff *m* -(e)s, -e; Wébstoff *m*, Gewébe *n* -s, -

тка́нка *ж біял* Gewébe *n* -s, -

тка́нне *н тэкст* (*дзеянне*) Wében *n* -s, Weberéi *f* -

тка́ны *тэкст* gewébt

тка́цк|і Wéb(e)-; Wéber-; ***~ая спра́ва*** Weberéi *f* -; ***~і варшта́т*** Wébstuhl *m* -s, -stühle

тка́цтва *н* Weberéi *f* -

ткаць wében *vt*

ткач *м* Wéber *m* -s, -

ткачы́ха *ж* Wéberin *f* -, -nen

ткнуць 1. (*уткнуць*) (hinéin)stóßen* *vt*; (hinéin)stéchen* *vt*; **2.** (*запіхнуць*) stécken *vt*; stópfen *vi*; ◊ ***~ но́сам*** *j-n* mit der Náse daráuf stóßen*

тлен *м* Staub *m* -(e)s, Ásche *f* -

тлéннасць *ж філас* Vergänglichkeit *f* -

тлéнне *н* **1.** (*гніенне*) Fäulnis *f* -, Verwésung *f* -, Módern *n* -s; **2.** (*гарэнне*) Glímmen *n* -s, Schwélen *n* -s

тлéнны verdérblich; únheilvoll, únheilbringend; **~ *пах*** Fäulnisgeruch *m* -(e)s, -gerüche

тлець 1. (*гніць*) fáulen *vi*, verwésen *vi* (*s*); **2.** (*слаба гарэць*) glímmen* (*і па слаб. спр*) *vi*

тло *н* **1.** *гл* тлен; **2.** *кніжн* Híntergrund *m* -(e)s, -gründe; ***на тле чаго-н*** mit *etw.* (*D*) im Híntergrund

тлум *м* **1.** *разм* (Ménschen)ménge *f* -, -n (*натоўп*); **2.** (*вэрхал*) (übergroße) Geschäftigkeit; (viel) Áufsehen *n* -s

тлумача́льнік *м* Kommentátor *m* -s, -tóren

тлумача́льн|ы erklärend, erläuternd; ***~ы слóўнік*** erklärendes Wörterbuch, Glossár *n* -(e)s, -e *i* -i|en; ***~ая ната́тка*** [***запíска***] schriftliche Erklärung

тлума́чыцца *зал. стан* erklärt [erläutert] wérden; ***гэ́та ~ пры́кладам*** das wird an éinem Béispiel erklärt [erläutert]

тлума́чыць erklären *vt*, erläutern *vt*

тлумачэ́нне *н* **1.** (*дзеянне*) Erklärung *f* -, -en, Áuslegung *f* -, -en, Déutung *f* -, -en; ***літара́льнае ~*** wörtliche Áuslegung; ***няпра́вільнае*** [***памылко́вае***] ~ Míssdeutung *f*; **2.** (*тлумачальны тэкст*) Kommentár *n* -s, -e, Erläuterung *f* -, -en

тлумíць täuschen *vt*, föppen *vt*; *разм* bláuen Dunst vórmachen; *j-m etw.* vórmachen

тлýмны 1. (*які прыводзіць да адурэння*) benébelnd, betäubend, ábstumpfend; **2.** (*шумны, гаманлівы*) lärmend, laut

тлýстасць *ж* **1.** (*утрыманне тлушчу*) Féttgehalt *m* -(e)s; **2.** (*паўната*) Féttleibigkeit *f* -

тлýст|ы fett; dick (*моўсты*); ***~ая зямля́*** fétte [frúchtbare] Érde; ***~ы кава́лак*** ein fétter Háppen

тлусцéць fett [dick] wérden, verfétten

тлушч *м* Fett *n* -(e)s, -e; ***ры́бін ~*** Físchtran *m* -(e)s, Lébertran *m*

тлýшчав|ы Fett-; ***~ая тка́нка*** *біял* Féttgewebe *n* -s; ***~ая пля́ма*** Féttfleck *m* -(e)s, -e

тля *ж заал* Blátttlaus *f* -, -läuse

то *злучн* so, dann; sodánn; ***то ..., то ...*** bald ... bald; **~ *тут,* ~ *там*** bald hier, bald dort; **~ *адно́,* ~ *другóе*** bald dies, bald jénes; ◊ ***~-та ж!*** das ist es ja ében!

то́га *ж гіст* Tóga *f* -, -gen

то́еснасць *ж* **1.** *філас* Identität *f* -; Überéinstimmung *f* -; **2.** *матэм* Gléichheit *f* -

то́есны *у розн. знач* idéntisch, gléichbedeutend, überéinstimmend

той *займ* jéner (*f* jéne, *n* jénes, *pl* jéne); **~ *дом*** jénes Haus; ***у тым до́ме*** in jénem Haus; ***з таго́ ча́су*** [***тых часо́ў***] seitdém, seit jéner Zeit; ***тым са́мым*** dadúrch; ***між тым*** inzwíschen; ***páзам з тым*** bei áll(e)dem; ***год таму́*** (***наза́д***) vor éinem Jahr; ***тым бо́льш*** um so mehr; ***не без таго́*** da ist was dran; ***без таго́*** ohnehín; sowiesó; ***ні з таго́, ні з сягó*** mir nichts, dir nichts; óhne jéden Grund; ◊ ***ні то́е, ні сёе*** ≅ wéder Fisch noch Fleisch

ток I *м эл* Strom *m* -(e)s, Ströme; **~ *высо́кага напру́жання*** Hóchspannungsstrom *m*; ***перамéнны*** ~ Wéchselstrom *m*; ***пастая́нны*** ~ Gléichstrom *m*; **~ *высо́кай частаты́*** Hóchfrequenzstrom *m*; ***трохфа́зны*** ~ Dréhstrom *m*

ток II *м с.-г* (*месца абмалоту*) Ténne *f* -, -n, Dréschboden *m* -s, - *i* -böden

токапрыёмнік *м эл* Strómabnehmer *m* -s, -

то́кар *м* Dréher *m* -s, - (*па метале*); Dréchsler *m* -s, - (*па дрэве*)

тол *м вайск* (*выбуховае рэчыва*) Trinitrotoluól *n* -s

то́левы *буд* Papp-, aus Dáchpappe

толк *м* **1.** (*сэнс*) Sinn *m* -(e)s; **2.** (*карысць, вынік*) Nútzen *m* -s, Vórteil *m* -(e)s; ***з ~ам*** verständig; mit Sinn und Vórteil; ***без ~у*** sínnlos, únvernünftig; nútzlos, vergébens (*без карысці, дарма*)

то́лкам *прысл разм* vernünftig; zusámmenhängend (*зразумела*); wie es sich gehört (*як належыць*)

толь *м буд* Dáchpappe *f* -, Téerpappe *f*

то́льк|і 1. *прысл* nur, alléin, bloß; erst (*у дачыненні да часу*); ~ ***што*** so|ében; ***у мяне́ ~ два сшы́ткі*** ich hábe nur zwei Héfte; ***цяпе́р ~ пяць гадзі́н*** es ist jetzt erst fünf Uhr; ***~ цяпе́р*** erst jetzt; **2.** *злучн* (*ледзь*) kaum; ***~ ён увайшо́ў*** kaum war er éingetreten; ***як ~*** sobáld, kaum; ***не ~..., але́*** nicht nur ..., sóndern auch; ◊ ***чаго́ тут [там] ~ не было́!*** was es da nicht álles gab; ***ягó ~і ба́чылі!*** und fort war er!; ***паспрабу́й ~ гэ́та зрабі́ць!*** versúch das nur!

том *м* Band *m* -(e)s, Bände (*скар* Bd., Bde); ***у трох тама́х*** in drei Bänden

тон *м* **1.** Ton *m* -(e)s, Töne; Tónart *f* -, -en (*тональнасць*); **2.** (*колер, адценне*) Tönung *f* -, -en; ◊ ***зні́зіць*** ~ séinen Ton mäßigen, éinen beschéideneren Ton ánschlagen*; ***задава́ць*** ~ den Ton ángeben*; ***тра́піць [патра́піць] у ~*** den ríchtigen Ton finden* [ánschlagen*]; ***не размаўля́йце са мной таки́м ~ам*** ich verbítte mir díesen Ton; ***зялёнага ~у*** in grünem Fárbton

то́н|а *ж* Tónne *f* -, -n; ***за ~у*** pro Tónne; für einé Tónne

то́нік *м* (*напой*) Tónic [-k] *n* -s, -s

то́ніка *ж муз* Tónika *f* -, -ken, Grúndton *m* -s, -töne, Háuptton *m*

то́нка *прысл* **1.** dünn; in dünnen Schéiben (*тонкімі лустачкамі, скібачкамі*) **2.** (*вытанчана*) fein, subtíl; ◊ ***дзе ~, там і рве́цца*** wo der Fáden dünn ist, da reißt er

то́нкасц|ь *ж* **1.** Dünne *f* -; Dünnheit *f* -, -en; Féinheit *f* - (*нітак, матэрыі і г. д*); Schlánkheit *f* - (*фігура*); Verféinerung *f* - (*смаку*); **2.** *перан* Féinheit *f* -, -en; Finésse *f* -, -n; ***да ~і*** aufs Genáueste; ***ве́даць да ~яў*** sich bis ins Kléinste áuskennen* (*што-н* in *D*)

то́нкі dünn; fein; zart (*пяшчотны, ласкавы*); schlank (*хударлявы, стройны*); ~ ***шоўк*** dünne Séide; ***~я па́льцы*** féine [zárte, schlánke] Fínger; ***~я ры́сы твару*** féine (Gesíchts)züge; ***~ го́лас*** féine [dünne, zárte] Stímme; **2.** (*далікатны*) fein, verféinert; ~ ***пах*** féiner [léichter] Gerúch; ◊ ***~ смак*** féiner [áusgesuchter] Geschmáck; **3.** (*чуллівы – пра органы пачуццяў*): ***~ слых*** schárfes [féines] Gehör; ◊ ***~ намёк*** éine léise Ánspielung [Ándeutung]; ein Wink mit dem Záunpfahl (*іран*); **4.** (*гнуткі, праніклівы*) fein, spítzfindig; **5.** (*які добра разбіраецца*) ***~ ро́зум*** schárfer Verstánd; ~ ***зна́ўца*** profúnder Kénner; ~ ***пали́тык*** gewíefter Polítiker

то́нус *м фізіял, мед* Tónus *m* -

то́ня *ж* **1.** (*месца*) Físchplatz *m* -es, -plätze, Fischeréi *f* -, -en; **2.** *рыб* (*закід невада*) Físchzug *m* -(e)s, -züge

то́пка *ж* (*частка печы*) Féuerung *f* -, -en; Féuerungsvorrichtung *f* -, -en

то́плен|ы: ***~ае малако́*** im Ófen gedämpfte Milch; ***~ае ма́сла*** Schmélzbutter *f* -, geschmólzene [áusgelassene] Bútter

тор *м рэдк* Rádspur *f* -, -en

то́рб|а *ж* Béutel *m* -s, -; Sack *m* -(e)s, Säcke; Béttelsack *m* (*жабрака*); ◊ ***хадзі́ць з ~ай*** bétteln géhen*; ***насі́цца як з пі́санай ~ай з кім-н, чым-н*** ein großes Getue mit *j-m* [mit *etw.*] máchen

то́рбачка *ж памяньш* Säckchen *m* -s, -, Béutelchen *n* -s, -

торг *м* **1.** Hándel *m* -s; **2.** (*месца гандлю*) Markt *m* -(e)s, Märkte; **3.** *мн гл* тарг

то́ргацца *гл* таргануцца

то́рга|ць 1. zúpfen *vt*; rücken *vt* (*рухаць*); zíehen* *vi* (*за што-н* an *D*); **2.** (*пра боль*): ***у мяне́ ~е па́лец*** ich habe ein Réißen im Fínger

то́ркацца berühren *vt*, ánrühren *vt* (*чым-н* mit *D*)

то́ркаць 1. (*каго-н*) stóßen* *vt*; ánstoßen* *vt*; **2.** (*пра рыбу*) béißen* *vt*; **3.** (*усоўваць што-н вострае*) (hin)éinstoßen* *vt*, (hin)éinstecken *vt*

то́рмаз *м* **1.** Brémse *f* -, -n; **2.** *перан* Hémmschuh *m* -(e)s, -e, Híndernis *n* -ses, -se

то́рны: ***~ шлях*** befáhrene [éingefahrene] Stráße

торп *м гл* тарпа

торс *м* Rumpf *m* -(e)s, Rümpfe, Tórso *m* -s, -s *i* -si

торт *м кул* Tórte *f* -, -n

торф *м* Torf *m* -(e)s, -e; ***нарыхто́ўка ~у*** Tórfaufbereitung *f* -

торфараспрацо́ўка *ж* **1.** (*дзеянне*) Tórfgewinnung *f* -; **2.** (*месца распрацоўкі*) Tórfbruch *m* -(e)s, -brüche, Tórflager *n* -s, -

тост *м* Toast [to:st] *m* -es, -e, Tránkspruch *m* -(e)s, -sprüche; ***прапанава́ць*** ~ éinen Toast [Tránkspruch] áusbringen*; toasten [ˊto:-] *vi*

то́ўпіцца sich (zusámmen)drängen, sich häufen

то́ўст|ы 1. dick; beléibt (*пра чалавека*); ***~ая кі́шка*** *анат* Díckdarm *m* -(e)s, -därme; **2.** *у знач. наз м* Dícke *m* (*sub*) -n, -n; ◊ ***пако́ль ~ы ссо́хне, худы́ здо́хне*** ≅ indéssen das Gras wächst, verhúngert der Gaul

то́ўчаны zerstóßen, zerkléinert

то́ўшча *ж гл* таўшчыня

то́чаны 1. geschlíffen; gedréht; ábgedreht; **2.** (*пра рысы твару і г. д*) wie (aus dem Stein [Mármor]) geméißelt

тпру! *выкл* halt!, brr!; ◊ ***ні ~, ні но!*** wéder vor noch zurück können*; nicht ein noch aus wíssen*

трав|а́ *ж* Gras *n* -es, Gräser; Kraut *n* -es, Kräuter (*тс бацвінне*); ***марска́я ~а́*** Séegras *n*; ***духмя́ныя ~ы*** dúftende [aromátische] Gräser [Kräuter]

травае́дн|ы grásfressend; ***~ая жывёла*** *заал* grásfressendes Tier, Grásfresser *m* -s, -

тра́вень *м* Mai *m* -(e)s *i* -

тра́веньскі Mai-

тра́верс 1. *вайск* Schúlterwehr *f* -, -en, Quérwand *f* -, -wände, Traverse [-ˊvɛr-] *f* -, -n; ***ты́льны*** ~ Rückenwehr *f* -; **2.** *буд* Quérbalken *m* -s, -, Quérträger *m* -s, -; Traverse [-ˊvɛr-] *f*; **3.** *марск, ав*: ***на ~е*** víerkant; quérab

травесці *н тэатр, літ* Travestíe [-vɛs-] *f* -, -tí|en

трави́нка *ж памяньш* Gräs|chen *n* -, s-, Hälmchen *n* -s, -

трави́ць 1. (*рабіць патраву*) ábweiden *vt*, ábgrasen *vt*; **2.** *разм* (*цкаваць*) hétzen *vt*; **3.** *тэх* ätzen *vt*, korrodíeren *vt*

травяні́сты 1. Gras-; Kraut-; **2.** (*падобны да травы*) grás|artig; kráutartig; **3.** (*парослы травой*) grásbewachsen

травяны́ 1. Gras-; **2.** (*які зарос травою*) mit Gras bewáchsen

траге́дыя *ж* **1.** *літ* Tragödi|e *f* -, -n, Tráuerspiel *n* -s, -e; **2.** *перан* Tragödi|e *f* -, -n

трагі́зм *м* Trágik *f* -; ~ ***станові́шча*** die Trágik der Láge

трагікаме́дыя *ж тэатр, літ, тс перан* Tragikomödi|e *f* -, -n

трагікамі́чны tragikómisch

трагі́чна *прысл* trágisch; ***ско́нчыцца ~*** trágisch énden; ~ ***ста́віцца да чаго-н*** étwas trágisch néhmen*

трагі́чны trágisch; ~ ***вы́падак*** ein trágischer Vórfall [Únglücksfall]; ~ ***лёс*** ein trágisches [erschütterndes] Schícksal

траглады́т *м геол* Troglodýt *m* -en, -en, Höhlenbewohner *m* -s, -

традыцы́йна *прысл*; **традыцы́йны** traditionéll, überlíefert, hérkömmlich

трады́цы|я *ж* Traditión *f* -, -en, Überlíeferung *f* -, -en; ***па ~і*** traditiónsgemäß; ***пару́шыць ~ю*** mit der Gepflógenheit bréchen*

траекто́рыя *ж* Flúgbahn *f* -, -en, Trajektóri|e *f* -, -n

траісты dréifältig; Drei(er)-
траіцца: ***у ягó ў вачáх*** ~ er sieht álles dréifach
трайнік *м эл* T-Stück *n* -(e)s, -e, T-Glied *n* -(e)s, -er; Ábzweigstück *n*
трайн|ы dréifach; ***~óе прáвіла*** *матэм* Dréisatzrechnung *f* -, Dréisatz *m* -es; ***у ~м памéры*** dréimal so viel, um das Dréifache; ~ ***скачóк*** *спарт* Dréisprung *m* -(e)s, -sprünge
трайняты *мн разм* Dríllinge *pl*
трайчáсты 1. dréiteilig; **2.**: ~ ***нерв*** *анат* Trigéminus *m* -, dréiastiger Hírnnerv
трак *м тэх* Kéttenglied *n* -(e)s, -er
тракт *м* Stráße *f* -, -n, Trakt *m* -(e)s, -e
трактавáць (*абмяркоўваць*) behándeln *vt*, erörtern *vt*; (*тлумачыць*) déuten *vt*, áuffassen *vt*
трáктар *м тэх* Tráktor *m* -s, -tóren; Schlépper *m* -s, -; ***гýсенічны*** ~ Ráupenschlepper *m*, Ráupentraktor *m*; ***працавáць на ~ы*** éinen Tráktor fahren*
трáктарны Tráktor-; ~ ***завод*** Traktórenwerk *n* -(e)s, -e
трактарыст *м* Traktoríst *m* -en, -en, Tráktorführer *m* -s, -
трактáт *м* **1.** (*навуковы*) Traktát *m*, *n* -(e)s, -e, Ábhandlung *f* -, -en; **2.** *дып* (*пагадненне*) Vertrág *m* -(e)s, -träge; ***мíрны*** ~ Fríedensvertrag *m*
трал *м* **1.** *рыб* Trawl [trɔ:l] *n* -s, -s; Schléppnetz *n* -es, -e; **2.** *спец* (*для даследавання дна*) Bágger *m* -s, -; **3.** *вайск* (*для выяўлення мін*) Mínensucher *m* -s, -; Mínenräumgerät *n* -(e)s, -e (*для знішчэння мін*)
тралéйбус *м* Óbus *m* -ses, -se, Óberleitungs(omni)bus *m*, Trolleybus [ˊtrɔli-] *m*
тралéнне *н рыб* Schléppnetzfischerei *f* -; ~ ***мін*** *вайск марск* Mínensuchen *n* -s, Mínenräumen *n* -s
трáліць *рыб* mit dem Schléppnetz físchen; ~ ***міны*** *вайск марск* Mínen súchen [räumen]
трáльшчык *м* **1.** *вайск марск* Mínensuchboot *n* -(e)s, -e, Mínenräumboot *n*; **2.** Trawler [ˊtrɔ:lər] *m* -s, -; ***рыбáцкі*** ~ Schléppnetzboot *n*
тралявáць (*лес*) ábschleppen *vt*, zíehen* *vt*, rücken *vt*
трамбавáць (*зямлю і г. д*) féststampfen *addz vt*
трамбаніст *муз* Posauníst *m* -en, -en, Posáunenbläser *m* -s, -
трамбóн *м муз* Posáune *f* -, -n
трамбóз *м мед* Thrombóse *f* -
трамвáй|ы *м* Stráßenbahn *f* -, -en; Tram *f* -, -s (*разм*); ***éхаць у ~і*** mit der Stráßenbahn fáhren*; ***сéсці на ~й*** in die Stráßenbahn stéigen*; ***вы́йсці з ~я*** aus der Stráßenbahn áussteigen*
трамвáйн|ы Stráßenbahn-; ***~ы білéт*** Stráßenbahnfahrschein *m* -s, -e; ***~ы прыпы́нак*** Stráßenbahnhaltestelle *f* -, -n; ***~ая сýвязь*** Stráßenbahnverkehr *m* -s
трамплíн *м спарт, тс перан* Sprúngbrett *n* -(e)s, -er, Sprúngschanze *f* -, -n, Skisprungschanze [ˊʃi:-] *f* (*лыжны*); ◊ ***карыстáцца*** *чым-н* ***як ~ам*** *etw.* als Sprúngbrett benútzen
транжы́рыць *разм* vergéuden *vt*, verschwénden *vt*
транзíстар *м фіз* Transístor *m* -s, -tóren
транзíстарны Transístor-
транзíт *м спец* Transít *m* -s, Dúrchgang *m* -(e)s, Dúrchfuhr *f* -; *камерц* ***перавóзіць ~ам*** als Transítgut [Transítware] befördern; ***перавóзіцца ~ам*** als Transítware [Transítgut] ábgefertigt wérden
транзíтны *камерц* Transít-, Dúrchgangs-; ***~ы тавáр*** Transítgut *m* -(e)s, -güter, Transítware *f* -, -en; ***~ая мáкса*** Dúrchgangszoll *m* -(e)s, -zölle; ***~ая вíза*** Transítvisum [-vi-] *n* -s, -sa, Dúrchreisevisum *n*
транс *м разм*: ***быць у ~е*** in Verzwéiflung geráten*; míssgestimmt sein
трансáкцыя *ж фін* Transaktión *f* -, -en
трансатлантычны transatlántisch
трансвестыт *м мед, псіхал* Transvestít [-vɛs-] *m* -en, -en; Transvestísmus [-vɛs-] *m* - (*псіхічнае адхіленне*)
трансгéнны *спец* transgén
транскрыбíраваць *лінгв* transkribíeren *vt*
транскрыпцыя *ж лінгв* Transkriptión *f* -, -en
трансліраваць, трансляваць sénden *vt*; übertrágen* *vt*
транслітарáцыя *ж лінгв* Transliteratión *f* -, -en
трансля́цыя *ж радыё, тэл* Übertrágung *f* -; Translatión *f* -, Séndung *f* -, Fúnksendung *f* -
трансмíсія *ж тэх* Transmissión *f* -, Übertrágung *f* -, -en, Tríebwerk *n* -(e)s, -e
транспазíцыя *ж мед, матэм* Transpositión *f* -, -en
транспанавáць, транспанíраваць *матэм, мед, муз* transponíeren *vt*, übertrágen* *неаддз vt*
транспарáнт *м* **1.** Transparént *n* -(e)s, -e, Sprúchband *n* -(e)s, -bänder; **2.** (*для пісьма*) Líni|enblatt *n* -(e)s, -blätter
трáнспарт *м* **1.** (*перавозка*) Transpórt *m* -(e)s, Beförderung *f* -; Transpórtwesen *n* -s, Verkéhrswesen *n* -s (*служба руху*); ***вóдны*** ~ Wássertransport; ***рачны́ і марскí*** ~ Binnen- und Séeschifffahrt *f* -; ***павéтраны*** ~ Lúfttransport *m* -s; ***аўтамабíльны*** ~ Kráftwagenverkehr *m* -s, Automobílverkehr *m*; ***гужавы́*** ~ Wágentransport *m*; **2.** (*партыя грузаў і г.д*) Partíe *f* -, -tí|en; Séndung *f* -, -en; **3.** *марск* Transpórtschiff *n* -(e)s, -e, Trósssschiff *n*; Transpórter *m* -s, -
транспартáбельны transportábel, transpórtfähig
транспартавáнне *н* Beförderung *f* -, -en; Transportíerung *f* -, -en; Transpórt *m* -(e)s
транспартавáць befördern *vt*; versénden* *vt* (*і па слаб. спр*); transportíeren *vt*
трáнспартнік *м* Transpórtarbeiter *m* -s, -; Éisenbahner *m* -s, - (*чыгуначнік*)
трáнспартн|ы *камерц* Transpórt-; ***~ае сýдна*** Transpórt|schiff *n* -(e)s, -e; ***~ыя срóдкі*** Transpórtmittel *pl*
транспартыróўка *ж гл* транспартаванне
транспарцёр *м тэх* Förderer *m* -s, -, Beförderungsfahrzeug *n* -(e)s, -e, Transpórter *m* -s, -; ***стýжачны*** ~ Gúrtförderer *m*, Förderband *n* -(e)s, -bänder
транспарцíр *м* Transporteur [-ˊtø:r] *m* -s, -e, Grádbogen *m* -, -; Wínkelmesser *m* -s, - (*вугламер*)
трансплантáцыя *ж мед* Transplantatión *f* -, -en, Gewébeverpflanzung *f* -, -en
трансфармавáць úmformen *vt*, transformíeren *vt*, úmwandeln *vt*
трансфармáтар *м эл* Úmformer *m* -s, -, Úmspanner *m* -s, -, Strómwandler *m* -s, -, Transformátor *m* -s, -, -tóren
трансфармáцыя *ж* **1.** Transformatión *f* -, -en, Verwándlung *f* -, -en; **2.** *эл* Úmformung *f* -, Transformatión *f*
трансфéрт *фін* Transfér *m* -s, Übertrágung im Géldverkehr, Verréchnung *f* -, -en; ***бáнкаўскі*** ~ Bánküberweisung *f* -, -en
трансцэндэнтнасць *ж філас* Transzendénz *f* -
трансцэндэнтны 1. *філас* transzendént, übersinnlich; **2.** *матэм*: ***~я лíкі*** transzendénte Záhlen
трáнт|ы *мн разм* Lúmpen *pl*; ***у ~ах*** zerlúmpt
траншэ́я *ж* **1.** *вайск* Schützengraben *m* -s, -gräben, Gráben *m*; **2.** *буд* Gráben *m*, Kanál *m* -s, -näle; **3.** *горн* Éinschnitt *m* -(e)s, -e; **4.** *с.-г*: ***сíласная*** ~ Sílogrube *f* -, -n
трап *м марск* (*сходы*) Stéigleiter *f* -, -n; ***забóртны*** ~ Fállreep *n* -(e)s, -e
трапáць 1. (*лён*) bréchen* *vt*; **2.** *разм* (*пра вопратку, абутак і г. д*) ábtragen* *vt*, strapazíeren *vt*; **3.** (*ласкава пагладжваць*) stréicheln *vt*; **4.** (*пра вецер*) flátttern *vi*; ◊ ~ ***нéрвы*** *разм* die Nérven áufreiben* [zerrütten]; ~ [***мянцíць, малóць***] ***языкóм*** *разм* schwátzen *vi*, séiner Zúnge fréien Lauf lássen*
трапéцыя *ж* **1.** *матэм* Trapéz *n* -es, -e; **2.** *спарт* Trapéz *n*, Schwébe|reck *n* -(e)s, -e (*уст*)
трáпіцца, трапля́цца 1. (*здарыцца*) (zúfällig) geschéhen* *vi* (*s*), passíeren *vi* (*s*) **2.** (*выпадкова сустрэцца*) einánder begégnen (*D*), (sich) tréffen*; ◊ ~ ***пад рукý*** únter die Hand kómmen*, in die Fínger kriegen
трáпіць, трапля́ць 1. (*папасці*) tréffen* *vt*; **2.** (*пранікнуць*) dúrchdringen* *vi* (*s*), éindringen* *vi* (*s*); **3.** (*апынуцца ў якіх-н*

умовах) sich befínden*, (hín)geráten* *vi* (*s*); ◊ **~ у бядý** ins Únglück [in die Klémme] geráten*; **~ на вóчы** [**вóка**] únter die Áugen kómmen*; ◊ **~ у крóпку** den Nágel auf den Kópf tréffen*; ins Schwárze tréffen*

трапíчн|ы *геагр* trópisch; Trópen-; **~ы пóяс** die trópische Zóne, der trópische Gürtel; **~ая ліхамáнка** [**трáсца**] Trópenfieber *n* -s

трапло́ *н* **1.** *тэх* Schwínge *f* -, -n; Fláchsschwinge *f* (*для лёну*); Hánfschwinge *f* (*для канопляў*); **2.** *перан* (*пра чалавека*) Schwätzer *m* -s, -, Quátschkopf *m* -(e)s, -köpfe

трáпна *прысл* tréffend, schlágend

трáпнасць *ж* **1.** Tréffsicherheit *f* -; **~ збрóі** *вайск* Tréffsicherheit der Wáffen; **2.** *перан* Schlágfertigkeit *f* -, Schlágkraft *f* -

трáпн|ы 1. sícher, scharf; **2.** *перан* tréffend, schlágend; **~ае параўнáнне** tréffender Vergléich

трапятáцца zúcken *vi*; záppeln *vi*; flácken *vi* (*пра агеньчык*)

трапятáць 1. (*дрыжаць*) zíttern *vi*, bében *vi*; **2.** (*пра агонь, святло*) flácken *vi*; **3.** (*біцца*) záppeln *vi*; zúcken *vi*

трапяткí 1. (*які дрыжыць*) zítternd, zítt(e)rig, bébend; flácken d (*пра агонь, святло*); **2.** (*усхваляваны, спалоханы*) scheu, ángstvoll, ángsterfüllt

трáса *ж* Trásse *f* -, -n

трасáнт *м фін* Trassánt *m* -en, -en, Wéchselaussteller *m* -s, -

трасíраваць trassíeren *vt*; ábstecken *vt* (*адзначаць тычкамі*)

трасíруюч|ы *вайск* Leucht-; **~ая кýля** Léuchtkugel *f* -, -n

траскá *ж заал* (*рыба*) Dorsch *m* -(e)s, -e, Kábeljau *m* -s, -e *i* -s

траскатáць *разм* prásseln *vi*; knáttern *vi* (*пра страляніну*); zírpen *vi* (*пра конікаў*)

траскатня́ *ж* **1.** Prásseln *n* -s, Geprássel *n* -s; Knáttern *n* -s, Geknátter *n* -s (*ружэйная*); **2.** *разм* (*балбатня*) Geschwätz *n* -es, Geplápper *n* -s

траскýчы 1. knísternd; schnéidend, schrill (*гук, голас*); **~ марóз** schnéidende Kälte; **2.** (*беззмястоўны*): **~я фрáзы** schmétternde [schwülstige] Phrásen

трáсца *ж мед, тс перан* Fíeber *n* -s, -, Malária *f* -; Wéchselfieber *n*; *гл тс* скулле

трасяні́на *ж* Schütteln *n* -s, Rütteln *n* -s; Geschüttel *n* -, Gerüttel *n* -s

трáта I *ж* Áusgabe *f* -, -n; Áufwendungen *pl* (*расход, выдатак*)

трáта II *ж фін* Trátte *f* -, -n

тратуáр *м* Fúßsteig *m* -(e)s, -e, Fúßweg *m* -(e)s, -e, Bürgersteig *m* -s, -e

трáўка *ж памяніш гл* трава

траўлéнне *н тэх* Ätzen *n* -s, Béizen *n* -

трáўлер *м марск* Trawler [ˊtrɔ:lər] *m* -s, -

трáўма *ж мед, тс перан* Tráuma *n* -s, -men *i* -ta

траўматы́чны *мед* traumátisch

траўмíраваны *мед, тс перан* verlétzt, verwúndet

траўмíраваць verwúnden *vt*, verlétzen *vt*

трафарэ́|т *м* **1.** (*мадэль, шаблон*) Schablóne *f* -, -n; **2.** *перан* Schablóne *f*, Schéma *n* -s, -s *i* -ta; **па ~це** schablónenmäßig, schemátisch

трафе́й *м* Trophäe *f* -, -n, Béutestück *n* -(e)s, -e; *вайск* Béute *f* -, -n

трафе́йны *вайск* Béute-; erbéutet

трах! *выкл.* krach!, pardáuz!

траха́ *прысл разм* kaum, beináhe, fast

трахе́й *м літ* Trochä|us *m* -, -chäen

трахе́я *ж анат* Trachée *f* -, -n, Lúftröhre *f* -, -n

тра́хнуць 1. (stark) schlágen*, stóßen* *vt*; **2.** (*выстраліць*) éinen Schuss ábgeben*; **3.** *разм* (*выпіць спіртных напояў*) ein Schnäps|chen trínken*

трацéйск|і Arbitráge- [-ʒə], Schíeds-; *юрыд* **~і суд** Schíedsgericht *n* -(e)s, -e; **~ае рашэ́нне** Schíedsspruch *m* -(e)s, -sprüche; **~і суддзя́** Schíedsrichter *m* -s, -

трáціцца *разм* Geld áusgeben* [verschwénden]; Áusgaben máchen; *зал. стан* veráusgabt [áusgegeben] wérden; *гл* траціць

трáціць 1. *разм* (*расходаваць*) áusgeben* *vt*; veráusgaben *vt*, verlíeren* *vt* **2.** (*сяброў і г. д*); **~ аўтарытэ́т** die Autorität verlíeren* [éinbüßen]; (*час і г. д*) vergéuden; ***мáрна ~ час*** séine Zeit verlíeren* [vergéuden, vertrödeln]; ◊ **~ глéбу пад нагáмі** den Bóden unter den Füßen verlíeren*; **3.** **~ сíлу** *юрыд* (*за даўнасцю*) verjähren *vi* (*s*)

трацíчны *геал* Tertiär-; **~ перы́яд** Tertiärzeit *f* -

трашч|áць 1. krächen *vi* (*лопацца, грукатаць*); knácken *vi* (*хрусцець*); knístern *vi*, prásseln *vi* (*пры гарэнні*); **2.** *разм* (*гаварыць без патрэбы*) schwátzen *vi*, pláppern *vi*; **3.** (*быць перапоўненым*) überfüllt wérden, voll gestópft sein, zum Bérsten voll sein; ◊ **у мяне́ галавá ~ыць ад бóлю** mir platzt [brummt] der Kopf; **у мяне́ ~ыць галавá ад спраў** ≅ ich weiß nicht, wo mir der Kopf steht; **~áць па ўсіх швах** in állen Fúgen krächen, aus állen Nähten plátzen

трашчóтка *ж* **1.** *тэх* Rátsche *f* -, -n; **2.** (*у вартавога*) Knárre *f* -, -n; Klápper *f* -, -n, Rássel *f* -, -n; **3.** *разм перан м, ж* (*пустамеля*) Pláppermaul *n* -s, -mäuler, Pláppertasche *f* -, -n

траю́радн|ы: ~ы брат Vétter zwéiten Grádes; **~ая сястрá** Kusíne zwéiten Grádes

траяк *м разм* Dréirubelschein *m* -(e)s, -e

траяка *прысл разм* auf dréierlei Art [Wéise]

траякі dréierlei

траянскі trojánisch; ◊ **~ конь** das Trojánische Pferd

траячка *ж разм гл* траяк

трóе *ліч зборн* zu dritt; drei; **нас былó ~** wir waren drei [zu dritt]

трóечнік *м* (*вучань*) Dúrchschnittsschüler *m* -s, -

трóйка *ж* **1.** (*лічба, адзнака*) Drei *f* -, -en; **2.** (*коней*) Dréigespann *n* -(e)s, -e, Tróika *f* -, -s

Трóйца *ж рэл* Pfíngsten *n* -, - ◊ **Бог лю́біць трóйцу** ≅ áller gúten Dínge sind drei

трóйчы dréimal, dréifach

троль *м міфал* Troll *m* -(e)s, -e

тромб I *м мед* Thrómbus *m* -, -ben

тромб II *м метэар* (*смерч*) Trómbe *f* -, -n, Windhose *f* -, -n

трóмкаць *разм* klímpern *vi*

трон *м* Thron *m* -(e)s, -e

трóнка *ж* (*ручка нажа, відэльца і г. д*) Heft *n* -(e)s, -e, Griff *m* -(e)s -e

троп *м* **1.** *літ* Trópe *f* -, -n, Trópus *m* -, -pen; **2: збіць з ~у** verwírren *vt*

трóпік *м геагр* Wéndekreis *m* -(e)s, -e; **~ Рáка** Wéndekreis des Krébses; **~ Казярóга** Wéndekreis des Stéinbocks

трос *м* (*канат*) Tau *n* -(e)s, -e, Seil *n* -(e)s, -e; Léine *f* -, -n; Kábel *m* -s, -; **сталёвы ~** Dráhtseil *n*, Dráhtstahltau *n*

трохбóр'е *спарт* Dréikampf *m* -(e)s, -kämpfe

трохвалéнтны *хім* dréiwertig

трохвóсевы *аўта* dréiachsig

трохвугóльнік *м* **1.** *матэм, тс перан* Dréieck *n* -(e)s, -e; **прамавугóльны ~** réchtwinkliges Dréieck; **раўнабéдраны ~** gléichschenkliges Dréieck; **роўнабакóвы ~** gléichseitiges Dréieck; **2.** *муз* Triángel *m* -s, -

трохвугóльны *матэм* dréieckig

трохгадóв|ы 1. (*што працягваецца тры гады, разлічаны на тры гады*) dréijährig; **2.** (*ва ўзросце трох гадоў*) dréijährig, von drei Jáhren; **~ае дзіця́** ein dréijähriges Kind

трохгóддзе *н* **1.** (*тэрмін*) Zéitraum von drei Jáhren; **2.** (*гадавіна*) der drítte Jáhrestag; **святкавáць ~** (*якой-н падзеі*) das dréijährige Jubilä|um (éines Eréignisses) féiern

трохгрáнны *матэм* dréiflächig, dréikantig; **~ напíльнік** *тэх* Dréikantfeile *f* -, -n, dréieckige Féile

трохзнáчны *матэм* dréistellig

трохі *прысл* ein wenig, etwas, ein bíss|chen

трохкóлавы dréiräd(e)rig; **~ веласіпéд** Dréirad *n* -(e)s, -räder *тс матэм*

трохкóлерны dréifarbig; Dréifarben-; **~ друк** Dréifarbendruck *m* -(e)s

трохкýтны dréieckig; Dréieck-

трохме́рны dréidimensional
трохме́сячн|ы dréimonatig; **~ае дзіця́** ein Kind von drei Mónaten, ein drei Mónate áltes Kind
трохпавярхо́вы zwéistöckig; dréigeschossig
трохпакаёвы Dréizimmer-
трохпо́лле *н с.-г* Dréifeldwirtschaft *f* -
трохра́дка *ж муз* dréireihige Zíehharmonika
трохразо́вы (*што паўтараецца тры разы*) dréimalig; (*павялічаны ў тры разы*) dréifach; **~ чэмпіён** dréifacher Méister
трохсо́ты *ліч* der dréihundertste; **~ ну́мар** Númmer dréihundert
трохсто́пны *літ* dréifüßig; **~ верш** dréifüßiger Vers
тро́ху *прысл разм гл* трохі
трохчле́нн|ы trinómisch, dréigliedrig; **~ае ўраўне́нне** *матэм* dréigliedrige Gléichung
трох'я́русны **1.** *тэатр* dréirangig; **2.** *геал* dréischichtig, dréistufig, Dréistufen-
тро́шачкі, тро́шкі, тро́шку *прысл разм* ein (klein) wénig, ein (klein) bíss|chen; éine Kléinigkeit
труб|а́ *ж* **1.** Rohr *n* -(e)s, -e; Röhre *f* -, -n; **аэрадынамі́чная ~ а́** Víndkanal *m* -s, -näle; **падзо́рная ~а́** Férnrohr *n*; **~а́ арга́на** Órgelpfeife *f* -, -n; **2.** *муз* Trompéte *f* -, -n; ◊ **вы́лецець у ~ý** *разм* ruiníert sein; **прайсці́ (праз) агóнь, вадý і мéдныя ~ы** ≅ mit állen Wássern gewáschen sein; mit állen Húnden gehétzt sein
трубаду́р *м маст, літ* Troubadour [truba´du:r] *m* -s, -e *i* -s; *перан іран* Apóstel *m* -s, -
трубаправо́д *м спец* Róhrleitung *f* -, -en
трубач *м муз* Trompéter *m* -s, -
трубі́ць **1.** posáunen *vi*, trompéten *vi*, blásen *vi*, *vt*; **~ у трубу́** trompéten *vi*, posáunen *vi*; **~ у рог** das Horn blásen*; **~ у ражо́к** túten *vi*; **2.** *разм* (*аб кім-н, чым-н*) ásposaunen *vt*, áustrompeten *vt*; *etw.* (*A*) an die gróße Glócke hängen*
тру́бка *ж* **1.** Röhre *f* -, -n, Röhrchen *n* -s, -, Rohr *n* -s, -e; *мед* Hörrohr (*стэтаскоп*); **тэлефо́нная ~** Hörer *m* -s, -; **2.** (*розных прыбораў і органаў арганізма*) Röhre *f* -, -n; **рэнтге́наўская ~** Róntgenröhre *f*
тру́бчаты Róhr-, Röhren-, róhrenförmig; *мед* tubulär; **~ вал** *мед* Róhrwelle *f* -, -n
трудзі́ць *разм* ermüden *vt*, ánstrengen *vt*, erschöpfen *vt*; ◊ **~ сабе́ во́чы** sich die Áugen überánstrengen
трудзя́га *м разм* (tüchtiger) Árbeiter [Mensch]
трук *м* **1.** (*акрабатычны*) Trick *m* -s, -s; Kniff *m* -(e)s, -e; Kúnstgriff *m* -(e)s, -e (*прыём, хітрасць*); **2.** (*нечаканы ўчынак*) Kúnststück *n* -(e)s, -e, Stréich *m* -(e)s, -e
трум *м марск* Schíffsraum *m* -s, -räume, Kíelraum *m*, Láderaum *m*; **у ~е** únter Deck
трумо́ *н* Trumeau [try´mo:] *m* -s, -s; Pféilerspiegel *m* -s, -
трун|а́ *ж* Sarg *m* -(e)s, Särge; Báhre *f* -, -n (*насілкі*); ◊ **загна́ць [увагна́ць, звёсці] у ~у** ins Grab bríngen*
труп *м* Léiche *f* -, -n, Léichnam *m* -s, -e
тру́па *ж тэатр* Trúppe *f* -, -n
трупяне́ць ábsterben* *vi* (*s*)
трупя́рня *ж* Léichen(schau)haus *n* -es, -häuser, Léichenhalle *f* -, -n, Tótenkammer *f* -, -n
трус *м* **1.** *заал* (*жывёла*) Kaníinchen *n* -s, -; **2.** (*баязлівец*) Féigling *m* -s, -e; Hásenfuß *m* -es, -füße, Ángsthase *m* -n, -n, Ángstmeier *m* -s, -; Mémme *f* -, -n (*пагард*)
трусагадо́ўля *ж с.-г* Kaníinchenzucht *f* -
трусі́ха *ж* Kaníinchenweibchen *n* -s, -
трусі́цца **1.** *абл* (*трэсціся, едучы па няроўнай дарозе*) hólpern *vi*; **2.** (*растрасацца*) sich zerstréuen
тру́сіць **1.** *разм* (*палохацца*) Angst háben (*каго-н, чаго-н* vor *D*), sich fürchten (vor *D*); féige [kléinmütig] sein; **~ пе́рад не́бяспе́кай** sich vor der Gefáhr verkríechen*; **2.** (*сыпкае*) schütten *vt*; **3.** (*бегчы трушком*) tráben *vi* (*h, s*); **4.** (*растрасаць*) zerstréuen *vt*; **5.** (*трэсці*) schütteln *vt*, rütteln *vt*
трусі́ць *разм* im Trott géhen*
трускáлка *ж* Gártenerdbeere *f* -, -n, Érdbeere *f*
трусы́ *мн* (*бялізна*) Männerslip *m* -s, -s; (*спартыўныя*) Túrnhose *f* -, -n, Bóxer-Shorts [ʃɔ:rts] *pl*, Kníehose *f* -, -n, Spórthose *f*; (*плаўкі*) Bádehose *f*, Schwímmhose *f*
труся́тнік *м* Kaníinchenstall *m* -(e)s, -ställe
труся́ціна *ж* Kaníinchenfleisch *n* -(e)s
тру́фель *м бат, кул* Trüffel *f* -, -n
трух *м* Léichttraben *n* -s
тру́хам, трушко́м *прысл*: **éхаць ~** im léichten Trab réiten*
трухле́ць, трухля́вець vermórschen *vi* (*s*)
трухля́васць *ж* Báufälligkeit *f* -
трухля́вы verfáult, mürbe, morsch; wúrmstichig (*чарвівы*)
трухля́к *м* verfáultes [mórsches] Zeug
трухля́ціна *ж разм* Fäulnis *f* -, Fäule *f* -
тру́цень *м* **1.** *заал* Dróhne *f* -, -n; **2.** *перан* Schmarótzer *m* -s, -; Fáulenzer *m* -s, -, Bärenhäuter *m* -s, -
труці́цца sich vergíften
труці́ць vergíften *vt*
труш|о́к *м разм* léichter Trab; **~ко́м** im léichten Trab
трушчо́б|а *ж* **1.** Élendsviertel *n* -s, -, Ármenviertel *n*, Slums [slamz] *pl*; **жыць у ~е** in éinem Loch [in éiner jämmerlichen Wóhnung] lében; **2.** (*глуш*) Krähwinkel *m* -s, -, Provínznest [-´vints-] *n* -(e)s, -er; **3.** (*густы лес*) Díckicht *n* -(e)s, -e
тру́шчыць (zer)krümeln *vt*, zerbröckeln *vt*, zerstückeln *vt*
тры *ліч* drei
тры́а *н нескл* Trío *n* -s, -s
трыбу́н *м* Tribún *m* -s *i* -en, -e *i* -en; **наро́дны ~** Vólkstribun *m*
трыбу́н|а *ж* Tribüne *f* -, -n; **гаварыць з ~ы** von der Tribüne herábsprechen*
трыбуна́л *м* Geríchtshof *m* -(e)s, -höfe; Tribunál *n* -s, -e (*высок*); **Міжнаро́дны ~** der Internationále Geríchtshof
трыбу́х *м разм* **1.** (*страўнік*) Mágen *m* -s, -; **2.** *іран* (*жывот*) Bauch *m* -(e)s, Bäuche; *груб* Wanst *m* -(e)s, Wänste; **3.:** **~і́** *мн* Éingeweide *pl*; ◊ **~ кáжа го́дзе, а во́чы - яшчэ́** man füllt léichter den Bauch als die Áugen
трыбуха́ты *разм* díckbäuchig, díckwanstig
трыбуха́ч *м разм* Dicke (*sub*) *m* -n, -n, Díckwanst *m* -(e)s, -wänste
трыбуш|ы́ць **1.** (*патрашыць*) die Éingeweide áusnehmen*; áusweiden *vt* (*дзічыну*); **2.** *разм* (*разварочваць, рабіць вобыск*) úmwühlen *vt*; durcheinánder werfen*; durchstöbern *vt*, durchwühlen *vt*
трыва́|ць **1.** (*цярпліва пераносіць*) sich gedúlden, sich in Gedúld fássen; **2.** (*вытрымліваць*) ertrágen* *vt*, erdúlden *vt*; **3.** (*працягвацца*) dáuern *vi*, fórtdauern *vi*; sich hínziehen* (*зацягнуцца*); ◊ **час не ~е** die Zeit drängt; es ist kéine Zeit zu verlíeren*
трыва́ла *прысл*; **трыва́лы** **1.** (*моцны*) háltbar, dáuerhaft; verschléißfest (*носкі*); **2.** *перан* dáuerhaft, fest; beständig, stétig (*устойлівы*); **~ мір** dáuerhafter Fríeden
трыва́ласць *ж* Háltbarkeit *f* -, Féstigkeit *f* -; Dáuerhaftigkeit *f* -
трыва́нне *н* **1.** (*здольнасць трываць*) Gedúld *f* - (*цярпенне*); Lángmut *f* - (*доўгацярплівасць*); **2.** *грам* Aspékt *m* -(e)s, -e; **зако́нчанае ~** volléndeter Aspékt, perfektíve Aktiónsart; **незако́нчанае ~** únvollendeter Aspékt, imperfektíve Aktiónsart
трывіяльны trivial [-´vĭa:l], platt
трывó́г|а *ж* **1.** (*неспакой*) Únruhe *f* -, Áufregung *f* -; Besórgnis *f* -; **2.** (*сігнал небяспекі*) Alárm *m* -(e)s, -e; Alármsignal *n* -s, -e (*асцярога, боязь, заклапочанасць*); **падня́ць ~у** alarmíeren *vt*; **біць ~у** Alárm schlágen*; **баявáя ~а** Geféchtsalarm *m*; **фальшы́вая ~а** blínder Alárm; **павéтраная ~а** Lúftalarm *m*, Flíegeralarm *m*
трывó́жн|ы **1.** (*усхваляваны*) be|únruhigend, bedénklich, alarmíerend, únruhig; **~ая вéстка [навіна́]** alarmíerende Náchricht; **~ае станóвішча** besórgniserregende Lage
трывó́жыцца sich be|únruhigen; sich (*D*) Gedánken [Sórgen] máchen (*аб чым-н* um *A*)
трывó́жыць **1.** (*парушаць спакой*) be|únruhigen *vt*; stören *vt*; **2.** (*выклікаць трывогу*) áufregen *vt*, in Sórge versétzen

трыганаметры́чны *матэм* trigonométrisch; **~я фу́нкцыі** trigonométrische Funktiónen; **~ пункт** *геад* trigonométrischer Punkt
трыганаме́трыя *ж* Trigonometríe *f* -
трыдзявя́ты: **у ~м ца́рстве** *фалькл* sehr weit, in der Férne
трыёд *м радыё* Trióde *f* -, -n
трыёль *ж муз* Tríole *f* -, -n
тры́зна *ж* Tótenfeier *f* -, -n, Léichenschmaus *m* -es, -schmäuse
трызне́нне *н* **1.** (*хвораго*) Fíeberwahn *m* -(e)s, Fíeberphantasie *f* -, -si¦en; **2.** (*галюцынацыя*) Halluzinatión *f* -, -en, Sínnestäuschung *f* -, -en; Trúgbild *n* -(e)s, -er (*ілюзія, фантом*); **3.** (*мроі*) Phantasíe *f* -, -í¦en, Tráumbild *n* -(e)s, -er, Traum *m* -(e)s, Träume
трызні́ цца *безас* schéinen* *vi* (*s*); **яму ~** ihm dünkt
тры́зніць 1. (*у ліхаманцы*) im Fíeber spréchen*, írrereden *аддз vi*; **2.** (*мроіць*) träumen *vt*, *vi*; **~ наяве́** wáchend träumen
трыкатáж *м* **1.** (*матэрыя*) Trikot [tri´ko:] *m* -s; **2.** *зборн* (*вырабы*) Trikotágen [-ʒən] *pl*; Wírkwaren *pl*; Óbertrikotagen *pl* (*верхні*), Úntertrikotagen *pl* (*ніжні, сподні*)
трыката́жніца *ж* Wírkerin *f* -, -nen
трыката́жны Trikotáge- [-ʒə-]; gewírkt; **~я вы́рабы** Wírkwaren *pl*, Stríckwaren *pl*, Trikotagen *pl*
трыко́ *н* **1.** (*тканіна*) Trikot [-´ko:] *n*, *m* -s; Wírkstoff *m* -, Stríckstoff *m* -s; **2.** (*вопратка*) Spórthosen *pl*, Trainingshosen [´trɛ:-] *pl* (*спартыўнае*); lánge Únterhosen *pl*, Ski-Únterhosen [ʃi:-] (*што надзяецца пад вопратку*)
тры́лер *м* Thriller [´ɵrı-] *m* -s, -
трыло́гія *ж літ* Trilogíe *f* -, -í¦en
трыльён *м ліч* Billión *f* -, -en
трыма́льнік *м* Besítzer *m* -s, -; Ínhaber *m* -s, - (*фірмы і г. д*)
трыма́|цца 1. (*за што-н, каго-н*) sich an *j-n*, an *etw.* (*A*) hálten*; **~цца за галаву́** sich an den Kopf fássen; **2.** (*на чым-н*) hálten* *vi*; hängen* *vi*; **~цца на нага́х** sich auf den Béinen hálten*; **3.** (*прытрымлівацца*): sich hálten* (*чаго-н* an *A*); **~цца по́гляду, што ...** der Ánsicht [Méinung] sein, dass ...; **4.** (*паводзіць сябе*) sich hálten*, sich benéhmen*; **5.** (*утрымлівацца, захоўвацца – пра вайск*) dúrchhalten* *vi*, áusharren *vi*; ◊ **~йся!** hálte aus!, dúrchhalten!; **цяпе́р ~йся!** pass auf!
трыма́ць 1. hálten* *vt*; **2.** (*утрымліваць*) nicht fórtlassen*, bei sich behálten*; ◊ **~ у рука́х** in der Hand [Gewált] háben; **так ~!** recht so!; **~ напра́ва** [**нале́ва**] (sich) rechts [links] hálten; **~ сло́ва** (sein) Wort hálten*; ◊ **~ вуха во́стра** auf der Hut sein; **ён уме́е сябе́ ~** er verstéht sich gut zu benéhmen; **~ язы́к за зуба́мі** den Mund [Schnábel] hálten*; **~ у абцуга́х** streng [kurz] hálten*
трымце́ць zíttern *vi*, bében *vi*; fláckern *vi* (*пра полымя*)
трына́ццаты *ліч* der dréizehnte ..., der Dréizehnte
трына́ццаць *ліч* dréizehn
тры́нкаць *разм* klímpern *vi*
трына́га *ж* Dréibein *n* -(e)s, -e
трына́жак *м* Dréifuß *m* -es, -füße
трына́жыць kóppeln *vt*, fésseln *vt*
тры́пер *м мед* Trípper *m* -s, Gonorrhö(e) [-´rø:] *f* -, -en [-´rø:ən]
трыпці́х *м маст, літ* Tríptychon *n* -s, -en; *царк тс* Flügelaltar *m* -s, -täre
трыснёг *м* Schilf *n* -(e)s, -e; Röhricht *n* -(e)s, -e (*зараснік*); **цукро́вы ~** Zúckerrohr *n* -(e)s, -e
трысняго́вы Schílf-, Rohr-, **~ цу́кар** Róhrzucker *m* -s
тры́ста *ліч* dreihúndert
трысцё *н гл* трысцёг
трысці́на *ж* Schílfrohr *n* -(e)s, -e; dünnes Rohr
трыто́н *м* **1.** *заал* Molch *m* -(e)s, -e; **2.** *міфал* Tríton *m* -ónen, -ónen; **3.** *фіз* Tríton *n* -s, -ónen
трыу́мф *м* Tri¦úmph *m* -(e)s, -e; **з ~ам** tri¦umphíerend; im Tri¦úmph
трыумфава́нне *н* Tri¦umphíeren *n* -s
трыумфава́ць tri¦umphíeren *vi*
трыумфа́льн|ы Tri¦úmph-; tri¦umphál; **~ая а́рка** Tri¦úmphbogen *m* -s, -, Tri¦úmphpforte *f* -, -n
трыумфа́тар *м гіст* Tri¦umphátor *m* -s, -tóren
трыхі́на *ж заал* Trichíne *f* -, -n
трыхіно́зны *мед* trichinös
трыццáт|ы *ліч* der dréißigste; **~ага сакавіка́** am dréißigsten März; den dréißigsten März (*на пісьме*); **~ы ну́мар** Númmer dréißig; **~ыя гады́** die dréißiger Jáhre; **ёй пайшло́ў ~ы год** sie steht im dréißigsten Lébensjahr
тры́ццаць *ліч* dréißig
тры́ядa *ж* Trías *f* -, -
тро́ба 1. (*абавязкова*): **мне ~ ісці́ на пра́цу** ich muss [soll] zur Árbeit géhen*; **2.** (*патрэбна*): **на го́та ~ сто рублёў** man braucht [benötigt] dazú húndert Rúbel; **што вам ~?** was wünschen Sie?; **мне нічо́га не ~** ich bráuche nichts; **не ~ ба́яцца** man braucht sich nicht zu fürchten; **не ~ злава́цца** man muss sich nicht ärgern; **~ было́ ба́чыць, як ...** man músste sehen*, wie ...
тро́бнік *м царк* Agénde *f* -, -n, Altárbuch *n* -(e)s, -bücher
тро́йдар *м камерц* Händler *m* -s, -; Börsenmakler *m*
трэк *м спарт* Rénnbahn *f* -, -en; Rádrennbahn *f*; **закры́ты ~** Wínterbahn; **го́нкі па ~у** Báhnrennen *n* -s, -
трэл|ь *ж муз* Tríller *m* -s, -
трэльяж *м* (*люстэрка*) dréiteiliger Spíegel
тро́ма *ж лінгв* Tréma *n* -s, -s *або* -ta, Trénnungszeichen *n* -s, -
трэма́ла *н муз* Trémolo *n* -s, -s
трэнажо́р *м* Trainer [´trɛ:- *i* ´tre:-] *m* -s -, Trainingsgerät *n* -(e)s, -e; *касм, ав* Simulátor *m* -s, -tóren
трэнд *м спец* Trend *m* -s, -s
тро́нер *м спарт* Trainer [´trɛ-] *m* -s, -; Tráinerin *f* -, -nen (*пра жанчыну*); **ста́ршы ~** Chefrtrainer [´ʃɛftrɛ:nər] *m*
тро́нерскі Trainer- [´trɛ:- *i* ´tre:-]; **~ саве́т** Trainerrat *m* -es, -räte
тро́нзель *м* Trénse *f* -, -n
тро́нінг *м* Training [´trɛ:nıŋ] *n* -s, -s
трэніраванца 1. *спарт* trainíeren [trɛ- *i* tre-] *vi*; **~ у каго-н** bei *j-m* trainíeren, von *j-m* trainíert wérden; **2.** (*практыкавацца ў чым-н*) üben *vt*, sich üben (in *D*)
трэніраваць 1. *спарт* trainíeren [trɛ- *i* tre-] *vt*; **~ кама́нду** éine Mánnschaft trainíeren *vt*; sich üben (in *D*); (*навыкі і г. д*) éinüben *vt*; **~ па́мяць** sein Gedächtnis trainíeren
трэнірово́чны 1. Übungs-; *спарт* Trainings- [´trɛ:- *i* ´tre:-]; **~ палёт** *ав* Übungsflug *m* -(e)s, -flüge; **~ забе́г** *спарт* Trainingslauf *m* -(e)s, -läufe; **2.** (*для заняткаў спортам*) Trainings- [´trɛ:- *i* ´tre:-]; **~ касцю́м** Trainingsanzug *m* -(e)s, -züge
трэнірó ў|ка *ж* **1.** (*дзеянне*) Training [´trɛ:- *i* ´tre:-] *n* -s, Trainíeren *n* -s, Übung *f* -, -en; **аўтагенна́я ~ка** autogénes Training; **дасягну́ць** *чаго-н* **~кай** étwas durch Training erréichen; **2.** *спарт* (*заняткі*) Training erlángen; **2.** *спарт* (*заняткі*) Training *n* -s, -s; **~ка па пла́ванні** Schwímmtraining *n*; **на ~цы** beim Training; **на ~ку** zum Training; **3.** (*натрэніраванасць*) Trainíertheit *f* -; (*спартыўны стан*) Kondítión *f* -, Fítness *f* -
трэ́нн|е *н* **1.** Réibung *f* -; **сі́ла ~я** *фіз* Réibungskraft *f* -, -kräfte; **2.** *мн разм*: **~і** (*сутыкненні*) Réibungen *pl*, Únstimmigkeiten *pl*, Zusámmenstöße *pl*; Méinungsverschiedenheiten *pl*
трэ́нькаць *гл* трымцець
трэпанава́ць *мед* trepaníeren *vt*
трэпана́цыя *ж мед* Trepanatión *f* -, -en; **~ чэ́рапа** Schädelbohrung *f* -, -en Schädeltrepanation *f*
трэск *м* Knall *m* -s, -e, Krächen *n* -s; Knístern *n* -s, Gekníster *n* -s (*агню, сукоў*); Táckern *n* -s (*кулямёта*); ◊ **з ~ам** (*выгнаць і г. д*) mit großem Krach
трэ́ска *ж* Span *m* -(e)s, Späne; ◊ **худы́ як ~** spindeldürr
трэ́скаць, трэ́снуць 1. (*стварыць трэск*) krächen *vi*, knácken *vi*; knístern *vi*, prásseln *vi* (*пры гарэнні*); **2.** (*лопнуць*) zerschéllen *vi* (*s*), sich spálten, bérsten* *vi* (*s*); **3.** *груб* (*ударыць*) (ver)háuen* *vt*; (*j-m* eins) áuswischen
трэст *м эк* Trust [trast *i* trust] *m* -(e)s, -e
трэ́сці 1. schütteln *vt*; rütteln *vt*; **2.** (*рабіць вобыск*) durchstöbern

vt, durchsúchen *vt*; **3.** (*выклікаць дрыжыкі*): ***ягó трасé ад хóладу*** er zíttert vor Kälte; ***мянé трасé гарáчка*** [***ад гарáчкі***] ich hábe Schüttelfrost, das Fíeber schüttelt mich; ~ ***рукý*** die Hand drücken [schütteln]

трэ́сціся 1. sich schütteln, zíttern *vi*; **2.** (*дрыжаць*) zíttern *vi*, bében *vi*; **3.** (*спрачацца, разм*) sich zánken, sich stréiten*; **4.** (*хвалявацца*) sich sórgen, besórgt sein (um *A*)

трэ́ц|і *ліч* der drítte ...; der Drítte; ***~яя гадзíна*** es geht auf drei [es ist drei]; ***~яга дня*** vórgestern; ~ ***стан***; ***~яе саслóўе*** der drítte Stand

трэц|і́раваць malträtíeren *vt*; misshándeln *неаддз vt*

трэць *ж* Dríttel *n* -s, -

трэ́цяе *у знач. наз н* (*страва, дэсерт*) Náchtisch *m* -(e)s, -e, Dessert [-´sɛ:r] *n* -s, -s

трэш *м* Trash [trɛʃ] *m* -s

трэ́шчын|а *ж* Riss *m* -(e)s, -e; Sprung *m* -(e)s, Sprünge (*на посудзе*); Rínne *f* -, -n (*на лёдзе*); ◊ ***даць ~у*** éinen Riss bekómmen*

туале́т *м* **1.** (*вопратка*) Toilétte [twa-] *f* -, -n; Kléidung *f* -, -en; **2.** (*прыбіральня*) Toilétte [twa-] *f* -, -n

туале́тн|ы Toilétten- [twa-]; ***~ае мыла*** Toiléttenseife *f* -; ***~ая вадá*** Dúftwasser *n* -s

ту́ба *ж муз* Túba *f* -, -ben

туберкулёз *м мед* Tuberkulóse *f* - (*скар* Tbc), Schwíndsucht *f* - (*сухоты*); ***хварэ́ць на*** ~ Tuberkulóse háben, tuberkulös sein

туберкулёзны 1. tuberkulös; ~ ***хво́ры*** Tuberkulöse (*sub*) *m* -n, -n; ~ ***дыспансе́р*** Tb(c)-Berátungsstelle *f* -, -n; ~ ***санато́рый*** Sanatórium für Lúngenkrankheiten, Tuberkulósensanatorium *n* -s, -ri|en, Lúngenheilstätte *f* -, -n; **2.** *наз м* Tuberkulósekranke (*sub*) *m* -n, -n

ту́былец *м*, **ту́былка** *ж* Éingeborene (*sub*) *m*, *f* -n, -n

ту́бульск|і éingeboren, éinheimisch; ***~ае насе́льніцтва*** éingeborene [éinheimische] Bevölkerung; ***~ія звы́чаі*** [***но́равы***] éinheimische Sítten [Gebräuche]

ту́га I *прысл* straff; fest; stramm

тугá II *ж* Gram *m* -(e)s, Schwérmut *f* -; Tráuer *f* -

